VII

Палімпсэст,
або
Ўратуе нітка, што ня будзе рвацца

Ёсьць рукапісы, зьмест якіх сьцярты́
ледзь знаць,
Ці нат' другі напісан сэнс бязбожна.
Іх палімпсэстамі прынята здаўна зваць,
І першы іхні змысл пайме ня кожны.
Уладзімер Жылка

Нажаль, гэтую кнігу аўтар ўжо не пагартае....

Творы, выбраныя ім самім для публікацыі і зьмешчаныя ў зборніку «Хмары над Бацькаўшчынай», -- толькі невялікая частка напісанага Міколам Цэлешам. Аднак яны дазваляюць ня толькі адчуць адметнага пісьменьніка са сваёй тэмай і сваім мастацкім бачаньнем, але й гаварыць пра тую ролю, якую мелі й будуць мець яго апавяданьні -- рэалістычныя замалёўкі жыцьця -- у аднаўленьні гістарычнай праўды.

Канец 20-х і 30-я -- гады, што пакінулі жахлівы сьлед у лёсе беларускага народу. Нацыянальны ўздым, які абяцаў сапраўднае адраджэньне беларускае мовы й беларускае культуры й даў шэраг таленавітых працаўнікоў на ніве народнай, узнавіў надзеі на лепшую долю, -- зьмяніўся ганеньнем на ўсё нацыянальнае, спусташэньнем сялянства, зьнішчэньнем інтэлігенцыі, трыумфам таталітарызму й вялікадзяржаўнага шавінізму.

Як шмат напісана ў беларускай савецкай літаратуры пра гэты час, і як мала ў гэтым праўды! Няма сэнсу казаць пра тых, хто адкрыта фальсыфікаваў рэчаіснасьць, падмяняў праўду жыцьця непрыхаванай прапагандысцкай маной. Тыя-ж, хто меў вочы, ня меў голасу, бо цэнзурна-ідэалягічная машына да апошняга ўшчэнт руйнавала нават падабенства праўды. А між тым, не зразумеўшы таго, што адбылося, не данёсшы гэтую праўду да людзей, нельга спадзявацца на новы пасьпяховы ўздым нацыянальнай самасьвядомасьці, на ліквідацыю вынікаў тых трагічных гадоў: хто забывае, не асэнсоўвае мінулае -- асуджаны зноў перажыць яго.

VIII

Мікола Цэлеш быў Сьведкам. Ён бачыў, як ідзе заняволеньне сялян, як вытраўляецца з чалавека гаспадар, як планамерна нішчыцца нацыянальная інтэлігенцыя, як рабуюць і расьцягваюць багацьце зямлі беларускай. Нельга сказаць, што сэнс падзей даўся яму лёгка, што разуменьне прыйшло як прасьвятленьне. Але ці не самы цяжкі быў шлях да мужнасьці белае зваць белым, чорнае -- чорным. Так сфармуляваў для сябе Цэлеш прызначэньне інтэлігента, пісьменьніка, беларуса.

Адкрыты ліст Міколы Цэлеша ў рэдакцыю газэты «Бацькаўшчына» (16.6.48)

Усякі народ шануе сваю інтэлігенцыю: паэтаў, пісьменьнікаў, артыстаў, мастакоў... Былі ў гісторыі ня раз прыклады, што народ разьбіваў вязьніцы й вызваляў сваіх інтэлігентаў. Былі й такія прыклады, калі каралі й князі хавалі ў сваіх палацах таго ці іншага паэта ці пісьменьніка, які адважыўся сказаць праўду й гэтым выклікаў нянавісьць у пэўнай часткі грамадства.

Такая пашана да гэтых людзей не таму, што яны рэдкія, іх мала, а таму, што яны, як ніхто больш, бачаць патрэбы свайго народу, бачаць няпраўду і сваёй працай, сваімі творамі стараюцца вывесьці людзей на сьветлы і праўдзівы шлях. У няшчасьці, якое спадае на цэлы народ, гэтыя людзі перажываюць найвастрэйшы боль і нясуць нярэдка сваё жыцьцё на алтар змаганьня за волю і шчасьце ***свайго народу...***

Мы, беларусы, увесь наш народ, перажываем цяпер такое няшчасьце. Невялікая частка з нас выкінута за межы нашай зямлі, сярод іх ёсьць колькі паэтаў, пісьменьнікаў, артыстаў і г. д. Ніхто ня скажа, што каму-колечы з нас, эмігрантаў, лёгка. Аднак найцяжэй ім, паэтам, тварцам культуры, найменш прыстасаваным у жыцьці. Няма на сьвеце большай асалоды для іх, як жыць разам з народам, у сваім краі і -- тварыць, тварыць для шчасьця ўсіх.[1]

Самы раз аддаць тут належнае эміграцыі, рэху народу, па словах П.Крэчэўскага, сказаць пра тую надзвычай важную ролю, якую адыграе літаратура эміграцыі ў гісторыі кожнай нацыі. Вядомы той надзвычайны росквіт, якога дасягнула творчасьць Адама Міцкевіча,

[1] Арыгіналы лістоў захоўваюцца ў Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва (Нью-Ёрк). Архіў Міколы Цэлеша.

IX

Юліуша Славацкага, Зыгмунта Красіньскага ў выгнаньні пасьля паўстаньня 1831 года, той уплыў, які аказалі іх творы на ўсё наступнае жыцьцё польскага грамадства. Добра вядома выключная роля Аляксандра Герцэна і яго свабоднай рускай прэсы ў жыцьці рускага грамадства. Зусім нядаўна ў рускую літаратуру вярнуліся Іван Бунін, Уладзімер Набокаў, Уладыслаў Хадасевіч і многія іншыя выдатныя пісьменьнікі. А зь імі вярнуўся велізарны, зусім не раскрыты або аднабакова асьветлены, пласт расейскага жыцьця.

Пакуль немагчыма поўнасьцю ацаніць зробленае беларускай эміграцыяй. Яе гісторыя яшчэ чакае сваіх дасьледчыкаў. Але ўжо й сёньня можна сказаць, што многія пісьменьнікі-выгнанцы, адарваныя ад роднай зямлі, асуджаныя ўладай і названыя афіцыйнай прапагандай здраднікамі, і ў такой якасьці вядомыя на Радзіме, кожным сваім радком служылі ёй, захоўвалі й перадавалі дзецям і ўнукам нацыянальныя традыцыі, не дазвалялі нікому абражаць і ганьбіць сваю Бацькаўшчыну.

Юрка Віцьбіч -- Міколу Цэлешу (8.1.55)

Занадта дарагая для ўсіх нас Бацькаўшчына, каб дазваляць каму-небудзь тут, на эміграцыі, брахаць на Яе.

Юрка Віцьбіч, Натальля Арсеньнева, Уладзімер Дудзіцкі, Майсей Сяднёў, Алесь Салавей, Міхась Кавыль, Уладзімер Клішэвіч і іншыя захавалі й вярнулі грамадству народнае слова, самабытнае й непаўторнае, адрознае ад той выхалашчанай беларускай літаратурнай мовы, якая ў выніку шматгадовай русіфікацыі стала ўспрымацца як расейскі дыялект. Пісьменьнікі захавалі на чужыне талерантнасьць -- слова, забытае на Бацькаўшчыне. Там ня было падзелу: «першае мейсца», «другі па значэньню створанага, напісанага й па таленту», нельга сказаць, што нехта меў «сваё мейсца», а хтосьці «не пакінуў больш-менш прыкметнага сьледу». Гэта катэгорыі заганнага літаратуразнаўства. Людзі, часам адметныя па мастацкім гусьце, розныя ў палітычных поглядах і ўхілах, рабілі адну справу, плён якой становіцца сёньня здабыткам усёй нацыі. Доўгія дзесяцігодзьдзі, калі нават сама думка пра дзяржаўную незалежнасьць Беларусі была пахавана, толькі ў асяродзьдзі эмігрантаў не спынялася праца на аднаўленьне гістарычнай праўды. Скрупулёзна зьбіраліся дакумэнты, асэнсоўваліся факты, сьведчаньні сучасьнікаў, фармаваліся архівы, публікаваліся навуковыя дасьледваньні, публіцыстычныя й мастацкія творы. Усё гэта было служэньнем далёкай, але такой блізкай Бацькаўшчыне.

Юрка Віцьбіч -- Міколу Цэлешу (11.2.61)

X

Зь вялікай прыемнасьцю прачытаў у «Бацькаўшчыне» пачатак Вашага апавяданьня -- «Ярылаў агонь». Хоць мы паходзім із розных бакоў нашае Беларусі, але й на маёй Віцебшчыне таксама ёсьць і Гарадцы, і Швэдавы магілкі, і Ярылавы капцы і... Раманкі. Асабліва апошнія, якія з маленства замілаваныя ва ўсё першае. Ня можа існаваць Ярылавых капцоў без Раманкі, як і Раманкі бязь іх...

А таксама прыемна, калі бачыш здаўна знаёмы і адпаведны добраму твору подпіс: Мікола Цэлеш. Хоць і пад псэўдонімам Вы напісалі ладне добрага, але цяпер такім чынам праклалі мост да свайго ранейшага -- знаёмага шырокім чытацкім колам там.

Эмігранты не рабілі кар'еры, не здабывалі славы й грошай, бо літаратурная праца не давала сродкаў для існаваньня. Кожнаму прыходзілася зарабляць на хлеб заняткам, далёкім ад творчасьці. Выратоўвала Ідэя, магчымасьць служэньня краіне, любоў да якой непадуладна аніякай уладзе ці рэжыму.

Юрка Віцьбіч -- Міколу Цэлешу (10.5.55)

Шчыра спачуваю Вам з прычыны Вашае цяжкае фізычнае працы, аб характары якое бяз слоў сьведчыць почырк Вашага ліста ад 7.5.55 г. Усё-ж няхай суцяшэньнем нам станецца тое, што, па-першае, нашая тутэйшая праца ва ўсіх адносінах лепшая за працу на Калыме, да якое мы ўсе завочна прысуджаныя, а па-другое, не нагадваем тых асобаў, якія, каб толькі спажываць з розных больш ці менш сьмярдзючых фондаў, тройчы на дзень адмовяцца і ад Бацькаўшчыны і ад роднага бацькі.

Я астатнім часам працую на фабрыцы паблізу Саут-Рыверу. Праца сталая начная, параўнальна нялёгкая -- каля канвэеру, але чыстая і ў памяшканьні... Удзень адсыпаюся, маючы для гэтага спрыяльныя ўмовы, і застаецца яшчэ 5-6 вольных гадзінаў для творчасьці, ліставаньня й рознага іншага...

Але й данесьці створанае, напісанае да Бацькаўшчыны няпроста: магчымасьці друкавацца былі вельмі абмежаваныя.

Юрка Віцьбіч -- Міколу Цэлешу (22.3.55)

З грашыма на выданьні ў нас небагата, бо бальшыня літаратараў нічым не нагадвае «тараканаў у саладусе», як і не прадаецца тым ці іншым інстытуцыям з грашыма. Напрыклад, я ўжо восем месяцаў як ня маю працы, Кавыль -- адзіны заработашнік на сям'ю, што жыве на

XI

дзьвюх кватэрах і г. д. Тым ня менш, і я, і Кавыль ахвяравалі па 5 даляраў.

Пісьменнікі-эмігранты выкарыстоўвалі й старонкі ангельскіх, рускіх, украінскіх выданьняў, каб ажыцьцявіць, мажліва, сваю галоўную задачу -- стварыць летапіс часу, расказаць пра трагэдыю, сьведкамі якой яны былі. Разам з тым, яны ўзбагацілі беларускую літаратуру нечаканымі тэмамі, новымі вобразамі, іншым мастацкім бачаньнем.

Волею лёсу апынуўшыся ў эміграцыі, Цэлеш стварае люстэрка падзей тых часоў. Творы Міколы Цэлеша, аб'яднаныя ў зборніку, малююць бязрадасную, але праўдзівую карціну жыцьця савецкага грамадства перадваенных гадоў. Нішчыцца да тла нажытае цяжкай працай і ў Богуша («У імя догмы»), і ў Матузка («На межах»), і ў Гарася («Дзікі вецер»); б'ецца ў ціскаx галечы, жыве ў паўсядзённай трывозе абы не спазьніцца (бо трапіш на чорную дошку) і абы не захварэць (бо, калі ня будзе высокай тэмпэратуры, доктар ня дасьць вызваленьня, а за прагул пойдзеш пад суд) Маўра, удава салдата, загінуўшага на фінскай вайне («Пёрка й іншыя»); ходзіць жабраваць Аўгіньня, якая ратуе ад голаду сваіх трох унукаў (тамсама).

І ўсё гэта на фоне зьдзічэлага прапагандысцкага ляманту пра ўсенароднае шчасьце: «Ніколі й нідзе ня траціласа столькі чалавечай энэргіі на доказ вольнасьці, роўнасьці, сацыяльнага дабрабыту і іншых атрыбутаў наземнага раю, як у "сацыялістычнай бацькаўшчыне"... Вось урачыстасьці кастрычніцкай рэвалюцыі... Да гэтага дня рыхтуюцца тысячы розных брашураў, артыкулаў, выступленьняў, успамінаў, апісаньняў... Партрэты, сьцягі, лёзунгі, транспаранты, ілюмінацыі -- усё ў чырвоным колеры -- і ўсё гэта мусіць сьведчыць аб дасягненьнях, аб волі, аб шчасьці пад савецкай зоркай...» («Янка сеяў -- людзі жалі»)

Пад гэты прапагандысцкі грукат тварылася безьліч чорных спраў. Жахлівая намаляваная Цэлешам карціна высылкі «кулакоў» у апавяданьні «У імя догмы». Маўклівы адчай выгнаньнікаў, плач дзяцей, стогны і сьлёзы тых, хто застаецца, і над усім гэтым -- поўная, неабмежаваная ўлада энкавэдыстаў. Але становішча на самой справе больш страшнае й сымбалічнае; прыгадаем, што гэта была толькі адна зь першых спробаў масавай дэпартацыі. Зь Беларусі, Украіны, цэнтральных раёнаў Расіі, з Паўночнага Каўказу тады былі вывезены ў Сібір і Сярэднюю Азію мільёны сялян, залічаных да «эксплуататараў». Гэты нялюдскі вопыт быў пашыраны ўладамі, і хутка ўсьлед за «кулакамі» пайшлі другія мільёны людзей, а потым, у 1943, у 1944, -- і цэлыя народы. Апакаліпсісным паўторам створанай Цэлешам карціны

XII

гучаць расказы ўдзельнікаў тых падзей. Менавіта тая маса «кулакоў», абяздоленых, пазбаўленых маёмасьці і ўсіх правоў, паклала пачатак спэцпасяленьням -- аракчэеўскім селішчам XX ст., у якіх потым мадзела большая частка краіны. А зрабіць чалавека кулаком -- што было прасьцей!.. Дастаткова перагарнуць афіцыйныя дакумэнты тых гадоў, каб пераканацца, як беспасьпяхова спрабавалі партыйныя тэарэтыкі сфармуляваць паняцьце «кулак» і як шырока тлумачылі яго практыкі. Неабходна пры гэтым улічыць меркаваньне беларускага гісторыка Ўсевалада Ігнатоўскага, які пісаў: «Беларусь амаль ня ведае тыпу рускага кулака-міраеда, які, як павук, аплятаў усю вёску даўгавымі абавязацельствамі»[1]. І таму ахвярамі калектывізацыі на Беларусі сталі ня толькі сяляне, якія карысталіся наёмнай працай, але й безьліч іншых, агулам «раскулачаных» па тых або іншых прычынах, як той самы Богуш.

Мікола Цэлеш -- Вітаўту Тумашу (10.12.75)

Вы правідлова адзначылі «трагічную ролю беларускай вёскі». Аўтар разумеў гэта добра: сіла беларускага народу менавіта ў вёсцы, і вось чаму з такой садысцкай нянавісьцю сталінізм наваліўся на яе. Что-ж цяпер? Вёска голая, разьдзетая, разутая дый галодная...

А партыйна-дзяржаўны друк штурхаў, пагражаў і пераконваў: «лепш перагнуць, каб потым не абвінавацілі ў правым уклоне», гэта значыць, у абароне кулака. І «перагіналі»... Тым больш, што нямала людзей было зацікаўлена ў набыцьці чужой маёмасьці: і жыхары тых-жа вёсак, што шукалі, раскрывалі «кулакоў», паведамлялі пра іх уладам, а потым удзельнічалі ў «раскулачваньні» (падобна Зьмітрачку з апавяданьня «Дзікі вецер»), бо, акрамя маральнага задавальненьня -- магчымасьці разьлічыцца з суседам, -- атрымлівалі й матэрыяльную ўзнагароду; і мясцовыя партыйныя й дзяржаўныя ўлады, якія дзякуючы такому імпэту павышалі сваю палітычную надзейнасьць і свой імідж у вачах вышэйшага начальства; і кіраўнікі калектыўных гаспадарак, якім маёмасьць «кулакоў» дазваляла пакрываць заганы й няўдачы свайго гаспадараньня й рапартаваць «наверх» пра дасягнутыя «посьпехі». Няўжо, сапраўды, старшыня райвыканкому і раённы ўпаўнаважаны па палітычных справах ня ведаюць, што нават па самых жорсткіх мерках

[1] Усевалад Ігнатоўскі. Гісторыя БССР. Менск, 1926, б. 233.

XIII

Гарась («Дзікі вецер») ня кулак? «А ты ведаеш,-- гаворыць упаўнаважаны Зьмітрачку, -- што гэта амаль што здрада -- сваяцтва з кулакамі?!» І тут-жа дабаўляе: «Ха-ха! Не палохайся! Сам ведаеш: ня кулак ён! Але хай будзе так, каб застрашыць "праваслаўных"... (Так ён заўсёды называў сялян)». Але калі ўжо ніяк нельга залічыць селяніна ў кулакі, то заўсёды застаецца магчымасьць зрабіць яго «памагатым кулакоў», як гэта і здарылася зь бедняком Матузком («На межах»). А выселіць сям'ю, абвінавачаную ў кулацтве, наогул было простай справай: дастаткова пастановы пракурора й нават сельскага савета.

Зразумела, што ў краіне з такімі «законамі», асоба -- меншая за нуль, яна велічыня адмоўная. Адгарніце любое апавяданьне Цэлеша і вы ўбачыце, які нявымоўна малы перад уладай чалавек, як ім пагарджаюць, зьдзекуюцца зь яго, прыніжаюць і зьнішчаюць. Бяз суда і сьледства трапляе ў лягер Кузьма Вальтэр толькі за чытаньне верша Янкі Купалы («Янка сеяў -- людзі жалі»), зьнікае за неасьцярожна сказанае слова Базыль («Пёрка й іншыя»), траціць розум зьняважаны й растаптаны Матузок («На межах»). Што для Шашка, які адчувае сябе гаспадаром жыцьця, Сымонка? («Дзе шукаць праўду») «Галота», -- як ён кажа. І ня дзіва, што Сымонка, безабаронны перад шашкамі, ня ведае, дзе шукаць праўду й жыве легендай.

Праз усе творы Цэлеша праходзіць думка пра супрацьстаяньне народу й дзяржавы, пра павіннасьць людзей перад дзяржавай і поўнай безадказнасьці дзяржавы перад народам. Натуральна, што сяляне, даведзеныя да адчаю, кідаліся на ўзброены супраціў уладам. Вось так, загнаны ў кут, пастаўлены перад выбарам: пагібель ці барацьба, герой апавяданьня «Дзікі вецер» Гарась бярэцца за сякеру. І гэта быў не такі ўжо рэдкі выпадак, а, як яшчэ нядаўна пісалі,-- тыповы пэрсанаж. Вядомыя, напрыклад, сялянскія паўстаньні 1929 года ў Касьцюковіцкім раёне Магілёўскай вобласьці, у Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласьці, Веліжскае паўстаньне, Слуцкае... Няма патрэбы казаць, што падаўляліся гэтыя паўстаньні з выключнай жорсткасьцю, а ўдзельнікі выстаўляліся «бандытамі» і «паслугачамі». Хіба трэба казаць, што тыя людзі былі сапраўднымі слугамі свайго народу?!

У імкненьні зразумець сутнасьць і прычыны калектывізацыі, героі апавяданьня «Хмары над Бацькаўшчынай» у разгубленасьці пытаюцца: «Але для чаго гэта мае быць рабіцца?» І пачуўшы адказ адукаванага чалавека: «Людзі жывуць няроўна: адзін бедны, другі багаты -- хочуць зрабіць усіх роўнымі...», з горкім сьмехам прыгадваюць легенду аб Пракрусьце, які хацеў перарабіць усіх людзей на адзін капыл. Савецкая ўлада дзейнічала больш тонка за міфічнага Пракруста, дый капыл у яе

XIV

іншы: ёй ненавісныя людзі свабодалюбівыя, пасьлядоўныя ў сваіх памкненьнях, тыя, што карыстаюцца павагай свайго асяродзьдзя. І гэта выдатна ўсьведамляюць усе «стукачы», зайздросьнікі, з душою на шэлег, якія атрымалі нарэшце магчымасьць расквітацца са сваімі ворагамі. «У князі з гразі», «не памыўшы пятак», казалі пра іх у народзе. Вось так той-жа Зьмітрачок помсьціць Марыне, якая адмовіла яму, і ў сваім даносе на яе бацьку ўпірае на аўтарытэт апошняга сярод сялян: «... калі яго не ліквідаваць, як клясу, дык калектывізацыя ў раёне зь мейсца ня зрушыцца. На яго глядзяць усе, бо ён аўтарытэт у іх... яму вераць! Не запішацца ён, ніхто пісацца ня стане». І ён мае рацыю: такіх людзей улады бязьлітасна зьнішчалі. Вось што піша ў сваіх успамінах «На крыжавой дарозе» Аўген Калубовіч (разьдзел «У гомельскім ГПУ»):

««...» Найбольш мяне ўзрушыў расстрэл Корзунаў.

Калі іх прывялі ў маю "адзіночку", было ўжо далёка за поўнач. Па шыбах вакна сьцёбаў буйны дождж. Яны былі мокрыя, зь іх цякло. Бацька й сын. З-пад Васілевічаў. Абодвы малыя ростам, худыя. Бацьку -- гадоў 40, сыну -- 16.

Іх прывялі да сьледчага ГПУ, які крычаў на іх: "Вашае сяло ня йдзе ў калгас, бо ты ня йдзеш. Мы расстраляем цябе й сына, тады ўсё сяло пойдзе... Нам нужно сломать сопротивление. И мы ни перед чем не остановимся..."

Гэта быў іхны першы й апошні "допыт".

Корзун -- ня "кулак", яго нат' не "раскулачылі"...»[1]

Усе гэтыя ненавісныя ўладам людзі мелі рэдкі дар -- асабісты прэстыж. Гэта якасьць, незалежная і ад займаемай пасады і ад высокіх званьняў і чыноў. Такі прэстыж мае вельмі абмежаванае кола людзей. Яны здольныя ўплываць на сваё асяродзьдзе, нягледзячы на роўны з усімі сацыяльны статус і адсутнасьць традыцыйных сімвалаў улады. І зусім ня мае значэньня колькасьць людзей, якім яны вядомыя, важна, што яны набываюць вядомасьць менавіта дзякуючы ўласьцівай ім унутранай сіле. І другую якасьць маюць гэтыя людзі -- *стрыжань душы*, паводле вобразнага азначэньня Ул. Г. Караленкі, што не дае чалавеку гнуцца пры любым націску, які прыдае душы ўстойлівасьць, дазваляе ў самых страшных і нялюдскіх умовах зьберагчы годнасьць і гаварыць сваё «не» ў адказ на меркаваньні ўласнай выгады.

---

[1] Аўген Калубовіч. На крыжавой дарозе. Успаміны. Кліўленд, 1986, б. 53-54

XV

Раскулачваньне й калектывізацыя ішлі поруч са зьнішчэньнем нацыянальнай інтэлігенцыі. Наогул падазронасьць і няпрыхільнасьць да інтэлігенцыі былі ў кампартыі ў крыві. Колькі зьдзеклівых і зьняважлівых слоў сказалі тэарэтыкі марксызму пра інтэлігенцыю! А з устанаўленьнем савецкай улады ў грамадскую сьвядомасьць сталі ўкараняць думку пра інтэлігентаў як пра часовых «папутчыкаў». З нацыянальнай інтэлігенцыяй партыя й савецкая ўлада мелі свае разьлікі: менавіта інтэлігенцыя ўзначаліла нацыянальна-вызваленчы рух і тым была небясьпечная. Прыгадаем, што на Беларусі 1920-1927 гады былі гадамі актыўнай беларусізацыі, што самай актуальнай задачай у нацыянальнай палітыцы была менавіта беларусізацыя.

«Пад беларусізацыяй у шырокім сэнсе гэтага слова, -- адзначалася Цэнтральнай Нацыянальнай Камісіяй ЦВК БССР, -- трэба разумець:

1) разьвіцьцё беларускай культуры (школы, ВНУ на беларускай мове, беларуская літаратура, выданьне беларускіх кніг, навукова-дасьледчая праца па ўсебаковым вывучэньні Беларусі і г. д.);

2) вылучэньне беларусаў на партыйную, дзяржаўную, прафесійную і грамадскую працу;

3) перавод партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага, каапэратыўнага апаратаў і часьцей Чырвонай Арміі на беларускую мову».[1]

Колькасьць супрацоўнікаў розных арганізацый, якія карысталіся беларускай мовай, да 1927 года дасягнула 70-80 працэнтаў[2], і ўсё больш беларуская мова станавілася мовай штодзённага ўжытку. У гэтым культурным будаўніцтве роля нацыянальнай інтэлігенцыі была галоўнай і вядучай.

Калі да гэтага дадаць яшчэ дзьве заўвагі: па-першае, што ў адпаведнасьці зь дзейнай у тыя гады Канстытуцыяй прызнаваліся раўнапраўнымі беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы[3]; а па-

---

[1] Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч.1. Белоруссизация. По материалам Центральной Национальной Комиссии ЦИК БССР. Менск, 1927, б. 9.

[2] Тамсама, б. 16.

[3] Арт. 21. Усе грамадзяне Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі маюць права вольна карыстацца роднаю моваю на зьездах, у судзе, у дзяржаўным кіраўніцтве і ў грамадскім жыцьці.

Нацыянальным меншасьцям забясьпечваецца права і рэальная магчымасьць вучыцца ў школе на роднай мове.

другое, што посьпехі гаспадарчай палітыкі, у прыватнасьці, у сельскай гаспадарцы, сталі даволі прыкметнымі (так, напрыклад, валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі Беларусі ў 1925-1926 гадах перавысіла даваенную на 12,2 %[1]), і пры гэтым улічыць, што правядзеньнем суцэльнай калектывізацыі палітыка партыі і савецкай улады на мейсца шматмоўя паставіла адну мову -- рускую, нацыянальныя культуры замяніла адной, дзяржаўнай, а эканамічны ўздым -- голадам 30-х гадоў, то стане відавочны той жах, які абрушыўся на людзей рэпрэсіямі супраць «кулакоў» і «нацдэмаў».

Прычыны жорсткіх мер супраць нацыянальнай інтэлігенцыі ўсьведамляюць многія героі Цэлеша. Вось якая размова адбываецца паміж апавядальнікам і яго кампаньёнам у творы «Хмары над Бацькаўшчынай», які й даў назву зборніку:

«-- Выцерабяць нас нанава, як у 1863! Прышчэпава ніяк нельга залічыць у ворагі народу -- ён патрыёта й не абы які! -- адукаваны, паезьдзіўшы па Эўропе, нагледзіўшыся на сельскую гаспадарку ў Данii, шмат чаго перадумаўшы... Ягоная зямельная палітыка ў стасунку да нашых умоў вельмі ўдалая -- зірнем на тых, хто прыняў яе. Пачалося зусім іншае жыцьцё!

-- Дык, кажаш, выцерабяць?

-- А ты што, ня бачыш і ня чуеш? "... Адсячы галаву нацдэмаўскай гадзіне..." Заклік: выбіць нашу інтэлігенцыю, пакінуць народ без кіраўнікоў...»

Шырокую сетку закінулі рэпрэсіўныя органы. У першую чаргу, былі арыштаваныя выкладчыкі і студэнты ВНУ і тэхнікумаў, навуковыя супрацоўнікі Акадэміі Навук, пісьменьнікі й работнікі Белдзяржвыдавецтва, супрацоўнікі наркаматаў і іншыя. Адзін з

У дзяржаўных і грамадскіх установах і арганізацыях Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі ўстанаўліваецца поўная раўнапраўнасьць беларускае, яўрэйскае, рускае і польскае моў.

Арт 22. Дзякуючы значнай перавазе ў Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі насельніцтва беларускай нацыянальнасьці, беларуская мова выбіраецца, як мова пераважная для зносін паміж дзяржаўнымі, прафэсіянальнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі.

Арт. 23. Важнейшыя заканадаўчыя акты публікуюцца на беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай мовах.

Канстытуцыя (Асноўны закон) Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі. Выд. ЦВК БССР. Менск, 1927.

[1] А. П. Врублевский, Т. С. Протько. Из истории репрессий против белорусского крестьянства 1929-1934 гг. Минск, 1992, б. 10.

выкрывальнікаў «нацдэмаўшчыны» пісаў: «Нацдэмаўскі ўплыў на культурнае будаўніцтва праводзіўся па двух, галоўным чынам, каналах: першым каналам былі розныя курсы настаўніцтва, вышэйшыя курсы беларусазнаўства і г. д. Другім каналам была выдавецкая дзейнасьць, падручнікі для школ, мастацкая літаратура і г. д. «...» Што датычыцца мастацкай літаратуры, дык мы ўжо ведаем пра такія вылазкі нацдэмакратызму, як рэакцыйныя творы Зарэцкага, Пушчы, Дубоўкі ды інш.».[1]

Іншыя разглядалі пытаньне «шырэй»: «Амаль да апошняга часу мы мелі такога роду факты, калі Акадэмія Навук была сапраўдным плацдармам нацыянал-дэмократызму, разгарнуўшага там «навучную» работу пад прыкрыцьцём «...» прэзыдэнта Акадэміі Ігнатоўскага. Той-жа малюнак яшчэ нядаўна быў у Белдзяржвыдавецтве. «...» лінія партыі на фронце асьветы самым наглым чынам скажалася былым наркомам па асьвеце Баліцкім. «...» па лініі Наркамзему нацдэмы павялі атаку на лінію партыі мэтадам насаджэньня кулацкіх хутарскіх гаспадарак...»[2]

Некаторыя з інтэлігентаў адразу-ж, а некаторыя з часам, зразумелі, як будзе праходзіць «ідэалягічная барацьба». Здольнасьць савецкай тайнай паліцыі, якую-б назву яна ні абрала, да ўтварэньня «змоў» была ўжо вядома самым праніклівым ці самым дасьведчаным. Паказальныя словы Цішкі Гартнага ў турэмнай камэры: «Вы бачыце, гаварыў ён, што зараз ідзе зьнішчэньне ўсяго беларускага, ідзе зьнішчэньне духоўнага жыцьця гэтага народу, больш таго -- ідзе яго фізычнае зьнішчэньне... Дзеля гэтага і створана сягоньня ворганамі НКВД нацдэмаўская арганізацыя. Сябраў гэтай арганізацыі будуць цяжка абвінавачваць у дзяржаўнай здрадзе. Нікому з нас ня будзе літасьці. Гэта ў адносінах да так званых "прыкметных" нацдэмаў. А далей пойдуць арышты "няпрыкметных" нацдэмаў -- сялян і іншых. Нельга-ж, каб гэтая арганізацыя не абапіралася на нізы, на "масу". Таму трэба гэтую "масу" зьнішчыць».[3]

Падставы для арыштаў былі самыя неверагодныя. І якое багацьце фантазыі пры гэтым! Узяць, да прыкладу, амаль анэкдатычны «літаратуразнаўчы аналіз» верша Янкі Купалы «Янка сеяў -- людзі

---

[1] А. Зюзькоў. Крывавы шлях беларускай нацдэмократыі. Менск, 1931, б. 49.

[2] Супроць контррэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмократызму. Менск, 1931, б. 65.

[3] Масей Сяднёў. Ахвяры бальшавізму. Выданьне Беларускага Аб'яднаньня ў Беластоку, 1944, б. 15.

жалі», які робіць загадчык спэцадзьдзелу Падкаблук: «Па-першае, высьмейваньне калгаснага будаўніцтва -- адчыненае, нахабнае... Вось нейкі Янка сеяў, а прыйшлі людзі й зжалі! Хіба гэта не намёк на беднату й не абарона кулака? Па-другое, у той час, як Янка сеяў, зязюлька кукавала. Якая яна, гэтая птушка?! А птушка яна такая, што не клапоціцца аб сваім дабрабыце -- ня робіць сабе гнязда, а забіраецца ў чужыя... Хіба тут, у гэтай бяздомнай птушцы, не відавочны намёк на пралетарскую клясу, вясковую беднату й ліквідацыю прыватнай уласнасьці на аднэй шостай зямной кулі? Не працуюць, ня дбаюць, а як Янка пасее, сажнуць! Так, Янка Купала -- народны паэта, адзначаны ордэнам, пакінем яго ў баку, хай жыве сабе на здароўе, пакуль што... »

Але, па праўдзе кажучы, у большасьці выпадкаў і ня трэба было аніякіх адмысловых падстаў: слова «нацдэмаўшчына» ўжо ўсё абымала, усё тлумачыла, бо яшчэ на сакавіцкім пленуме (1924) ЦК КП(б)Б была дадзена характарыстыка асноўных момантаў нацыянал-демакратычнай ідэалёгіі, што заключаліся «ў адмаўленьні дыктатуры пралетарыята і ў імкненьні да палітычнага раўнаваньня сялянства з рабочай клясай, у стаўцы на кулацкія элемэнты ў вёсцы, у адмаўленьні клясавага расслаеньня ў ёй, у імкненьні да ўплыву з боку інтэлігенцыі на дзяржаўны апарат, у правядзеньні беларускага шавінізму».[1]

Зірнем, як гэтыя ўказаньні выкарыстоўвалі потым улады, калі прыступілі да зьнішчэньня «нацдэмаўшчыны». Аўтар артыкула пра «нацдэмаўшчыну» ў Белдзяржвыдавецтве пасьля многіх і гучных абвінавачваньняў агульнага характару абурана пісаў: ««...» якія пасьля гэтага выходзілі падручнікі, відаць з такога прыкладу: БДВ выдае 5-цьцю выданьнямі чытанку Самковіча і Пратасэвіча «Родны шлях» (**адна назва чаго варта!**)».[2]

Гэта заўвага, вартая «навуковых вышукаў» Падкаблука, надзвычай паказальная: на адданасьць сваёй Бацькаўшчыне глядзелі нядобразычліва, імкнуліся замяніць яе «сацыялістычным патрыятызмам», які, у сапраўднасьці, азначаў поўнае ўхваленьне ўсяго таго, што, прыкрываючыся імем народу, рабілі кампартыя й савецкая ўлада. І, бязумоўна, уладаносцы дасягнулі шмат чаго: хто падлічыць

---

[1] А. П. Врублевский’ Т. С. Протько. Из истории репрессий против белорусского крестьянства 1929-1934 гг. Минск’ 1992’ с. 81.

[2] Супроць контррэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмократызму. Менск, 1931, б. 90.

XIX

колькасьць тых, каго Цэлеш пагардліва называе «ападкамі», хто выракаецца сваёй мовы, культуры, традыцыяў і звычаяў... «Божа! І цяпер, -- гаворыць адзін з герояў твора «Партыйны таварыш», -- калі ўжо фізычна выразана наша **другая эліта**, вырасшая **на новых пачатках**, пляскаюць у далоні й крычаць: "Хвала! Патапіць нацдэмаў!" Быццам-бы не разумеюць, што, па сутнасьці, ніякіх нацдэмаў, як ворагаў, ня было -- быў **страх у акупанта перад растучай нашай сілай**...»

Былі сярод гэтых «ападкаў» і тыя, якія пад канец жыцьця пачыналі ўсьведамляць, што прадалі першародства за сачавічную поліўку, і вярталіся памяраць дадому, у родныя мясьціны. («Вярнуўся чалавек») Але, па словах Уладзімера Дудзіцкага, «сьмерцю жыцьця не паправіш...»

На шчасьце, нягледзячы на вялізныя намаганьні, кампартыя ня здолела ператварыць усіх у *пустадомкаў,* як назваў такіх людзей вялікі майстар трапных характарыстык Фёдар Янкоўскі. У «Партыйным таварышы» некалькі чалавек едуць на паляваньне, і ў машыне адбываецца наступная размова:

«-- Вы зь беларускага паходжаньня, зразумела?

-- Для мяне, як для члена партыі, падобнай праблемы не павінна было-б існаваць. Аднак, ці я мушу крывіць душой? Корань маіх продкаў ідзе глыбака ў вякі гэтае зямлі! І я сам нарадзіўся тут, атрымаў ад маіх бацькоў гарт жыцьця, вырас тут, усмактаў у сябе пах гэтых цудоўных волатаў-сосен! -- зірнуў на лес. -- Гэта мая Бацькаўшчына! Люблю я яе ўсімі фарбамі мае душы! А іншыя землі, народы, гэта толькі суседскі двор для мяне -- мушу быць у кантакце зь ягонымі жыхарамі для агульнай карысьці...

-- Дробна-мяшчанскі перажытак... -- ціха прамовіў партыйны таварыш».

Зусім натуральна ўзьнікаюць у Цэлеша тэмы маральнай спустошанасьці пануючых улад і раскраданьня багацьцяў беларускай зямлі. Гэта, уласна, адна вялікая праблема, непасрэдна зьвязаная з раскулачваньнем, калектывізацыяй і ліквідацыяй «нацдэмаўшчыны». Менавіта тут хаваюцца вытокі шматлікіх балючых і нявырашаных праблем сёньняшняй Беларусі. Вось яны -- тыя, каму было дадзена права распараджацца лёсам людзей: фабрычны прапагандыста Падкоўнік («Пёрка і іншыя»), Шашок («Дзе шукаць праўду»), партыйны таварыш Галякоў («Партыйны таварыш»), картыга, выпівака, хабарнік сакратар партыйнай ячэйкі Янук Бізун («У імя догмы») і іншыя. Уражвае сваёй звычайнасьцю эпізод дзяльбы

мясцовымі начальнікамі маёмасьці Богуша. А прыслухаемся да слоў прадстаўніка ДПУ («Дзікі вецер»), гэта-ж адпрацаваная схэма дзеяньняў савецкіх карных ворганаў, але гэта і дакладная копія плану налёту бандытаў-крымінальнікаў: «Пасьпеем! Часу яшчэ -- уга колькі! -- прадстаўнік дастае з кішэні гадзіньнік. -- За сем мінут дванаццатая. Для нашых спраў найлепш -- другая або трэцяя, верце мне! Чалавек усьпіцца, часам дзікія сны, бо чуткі-ж -- чуткамі зямля поўніцца! -- і пабуджаны зьнянацку, як ачумелы. Крыкнеш, ногі падгінаюцца й у нагавіцы не пападаюць... І золатца! Золатца, калі ёсьць, не пасьпее прыхаваць... Ха-ха!»

Прыкрываючыся рэвалюцыйнай тэрміналёгіяй, гэтыя людзі, у сапраўднасьці, усюды й заўсёды дбалі толькі пра сваю карысьць. Паказальная ў гэтым сэнсе пахвальба Галякова («Партыйны таварыш»), як ён, «будучы ваенкомам палка, уласнаручна застрэліў свайго найлепшага таварыша, падазраючы яго ў здрадзе». Без вялікай цяжкасьці яго спадарожнік Барута выкрывае сапраўдную прычыну гэтага «рэвалюцыйнага акту».

Ці маглі такія людзі хварэць душой за захаваньне багацьцяў краіны? Яшчэ менш былі зацікаўлены ў гэтым тыя, што стаялі над імі, што выпрацоўвалі і праводзілі такую палітыку.

«Спачатку йшлі краем засекі. Усюды ляжаў павалены лес: і ў шуртах і проста калодамі на зямлі. Там-сям ужо пакрыўся грыбком, спарахнеў, гніў...

-- Правая рука ня ведае, што робіць левая, -- капануўшы нагой гнілое палена, прамовіў Балевіч. -- Плян нарыхтовак лесу нашы бюракраты склалі, у Маскве зацьвердзілі й перадалі ЛесБелу для выкананьня, а пра тое, што няма каму й няма на чым вывезьці лес, забыліся... І ляжыць цяпер, грыбком аброс, гніе... а ў горадзе няма чым кватэру абагрэць... » («Партыйны таварыш»)

А потым безгаспадарлівасьць, руйнаваньне роднай зямлі перастала абураць людзей. Да гэтага прывыклі, прынялі, як нешта звычайнае й непазьбежнае. А калі хто адважваўся падняць голас, сказаць праўду, -- яму нядоўга заставалася быць на свабодзе. Апошнім часам шмат напісана правільнага й глыбокага пра вынішчэньне ў селяніне спрадвечнай цягі да зямлі, пра разбурэньне традыцыйнай працоўнай і гаспадарчай маральнасьці. Карціна Беларусі перадваенных гадоў, намаляваная Цэлешам, узнаўляе важны этап выхаваньня краіны ў духу інфантылізму. Звычайна гавораць пра інфантыльнасьць асобнага чалавека. Але грамадства, выхаванае ў перакананьні, што ёсьць нехта, хто ведае лепш за ўсіх і, тым больш, за «нас»; грамадства, якое

XXI

вырасьціла ў кожным сваім грамадзяніне рабскае пачуцьцё згоды й маўчаньня; грамадства, у якім той, хто прымае рашэньне, не нясе ніякай адказнасьці, а той, хто адказвае, нічога не вырашае, -- такое грамадства інфантыльнае. І калі не вярнуць чалавеку пачуцьцё грамадзянскай адказнасьці за ўсё, што адбываецца ў краіне, пакуль ён не адчуе сябе гаспадаром і грамадзянінам, -- краіну не падняць.

Для Цэлеша ўсё ўпіраецца ў аднаўленьне дзяржаўнай самастойнасьці Беларусі. Героі яго твораў зноў і зноў вяртаюцца да абмеркаваньня вытокаў залежнасьці то ад Масквы, то ад Варшавы. Асэнсоўваючы дзень сёньняшні, забіраюцца ў глыб гісторыі. Гаспадарчая дзейнасьць крывічоў і дрыгавічоў; Вялікае Княства Літоўскае й тагачасная дзяржаўная мова; трагэдыя Люблінскай уніі 1569 года; паўстаньне 1863 года; становішча Беларусі пры царызме і пры бальшавіках -- і многае, многае іншае зацікаўлена абмяркоўваецца людзьмі розных сацыяльных слаёў. «Гэтакія гамонкі, -- гаворыць Кастусь у нясконча най аповесьці «Першыя цаглінкі», -- першыя цаглінкі на новы падмурак для нашае Бацькаўшчыны, каб яна стала сапраўды вольнай!»

Ішлі гады эміграцыі. Адзінота, сьмерць сына, развал сям'і, старасьць, адарванасьць ад Бацькаўшчыны (як ён хацеў быць хаця-б пахаваным у роднай зямлі!), супрацьстаяньне дзяржаў параджалі пэсімізм, нявер'е ў тое, што даведзецца ўбачыць незалежную Беларусь. Апускаліся рукі, сьвет здаваўся чужым і варожым. Гэты настрой знайшоў адбітак у ліставаньні Цэлеша. Але не ў мастацкіх творах.

Мікола Цэлеш -- Юрку Віцьбічу (20.11.67)

Ня пішу цяпер нічога, хаця задумана й навет пачата досыць шмат; не спадзяюся скончыць -- пісаць няма ніякай ахвоты, калі падумаеш, што ўсё гэта да нічога й да нікога; ня толькі сярод нас, беларускіх эмігрантаў, пануе цяпер апатыя да творчасьці ва ўсіх галінах чалавечага духу, але і ўва ўсіх і ўсюды -- сьвет імчыцца поўным тэмпам да катастрофы, бо «не адзіным хлебам жыве чалавек» і не адзінымі ракетамі можна змагацца із злом, напроціў -- ракеты павялічаюць зло!..

У зборнік уключана аўтарам і некалькі апавяданьняў, якія адрозьніваюцца ад разгледжаных. Яны дазваляюць ацаніць разнастайнасьць творчасьці Цэлеша і ў тэматычных і ў жанравых адносінах. Тут і апавяданьне з часоў нямецкай акупацыі «Акупанты», і «Шчупак» з сэрыі паляўніча-рыбацкіх замалёвак -- асноўнага жанру

даваенных твораў пісьменьніка, і гістарычны нарыс «Летапісная Нямізa і ейнае мейсца на мапе» -- прыклад майстэрства Цэлеша -- журналіста й гісторыка, і аповесьць «Курылка», бадай, самы вядомы з апублікаваных да вайны яго твораў і адзіны, уключаны ў зборнік, акрамя вылучаных аўтарам. У гэтай аповесьці Цэлеш ня толькі расказаў пра свае ўражаньні аб дарэвалюцыйнай школе, але й намаляваў прывабныя вобразы вясковых дзяцей.

Юрка Віцьбіч -- Міколу Цэлешу (10.3.62)

Мне прыемна, што Вам спадабаўся мой артыкул «О широте российских просторов»... Можа, гэта й таму, што ў ім згадваюцца Вашыя ўлюбёныя героі -- беларускія вясковыя школьнікі, аб якіх Вы пісалі гэтак сардэчна, як ні адзін беларускі пісьменьнік.

Творы, аб'яднаныя ў зборніку, дазваляюць убачыць творчую мэтоду Міколы Цэлеша. Перад намі рэаліст і ў адборы жыцьцёвага матэрыялу, і ў яго падачы. Адсутнасьць эфэктных сцэн, стрыманая манера выражэньня, скупасьць мастацкіх сродкаў побач з верагоднасьцю падзей надаюць апавяданьням Цэлеша асобую пераканаўчасьць. Апавяданьні пакідаюць уражаньне адзінства жыцьцёвага матэрыялу. Чытач бачыць як-бы фрагмэнты адной цэльнай карціны. Гэтаму спрыяе й кампазыцыя, бо ў большай частцы твораў яна пазбаўлена ярка выражанай кульмінацыі, крутых сюжэтных ходаў, штучных пабудоў. І чытач ўспрымае ўсе творы Цэлеша, асабліва апавяданьні, прысьвечаныя Беларусі 30-х гадоў, як часткі адзінага вялікага палатна. Цэлеш удала стварае эфэкт прысутнасьці. Гэтаму ў значнай ступені служыць вобраз апавядальніка. Але ня толькі. Выкарыстаньне цяперашняга часу замест прошлага й побач з прошлым пры апісаньні падзей стварае нават нейкую кінонагляднасьць: «Зьмітрачок вярнуўся з раёна радасна ўсхваляваны. "Так, пачынаецца! Ну, вось і дачакаўся". Цяпер ён ні аб чым іншым ня думаў, як толькі аб тым, як ён прыйдзе да Гарасёвых, як абвесьціць ім пра пастанову раёну аб высылцы і як яны будуць гэтым прыгнебены... "Во, упэўніліся, што азначае маленькі Зьмітрачок!" (Так называў яго, бывала, Гарась). Зласьлівая радасьць абхоплівае сэрца Зьмітрачка...

Кідае на брудны ложак сваю будзёнаўку, запальвае сьвятло ў пакоі й садзіцца за стол... Сэрца ягонае перапоўнена злосьцю. Ён хоча ўбачыць сьлёзы бацькі й маці Марыны. Як соладка будзе глядзець яму ў гэты час на іх. "Сьмерць! Усім ім сьмерць; усім такім, хто супроць яго, Зьмітрачка! Не, не раптоўная сьмерць, а цяжкія павольныя мукі -- там, у зьледзянелай поўначы, дзе ня сьвеціць сонца, а потым ужо

XXIII

сьмерць... пад цяжкім паленам, дзе-небудзь... Вось вам усім: буду ў вас на языках, аж да вашага скананьня..."

Дастае з кішэні пакамечаны кавалак паперы. Разгортвае й глядзіць у яго. Чытае.. Глядзіць угару, на партрэт правадыра: вусаты твар сурова ўхмыляецца. -- Так-так! Грамі ворага!

-- Зьмітрачок задаволена хіхікае. Падсоўвае лямпу, чытае далей... Глядзіць на гадзіннік. Яшчэ рана! Комкае паперу й засоўвае яе зноў у кішэню. Кладзецца на ложак, выцягвае ногі й глядзіць угару: там бездапаможна дзынкае ў павуціньні муха. Непамерна падкручаная лямпа хліпае, агеньчык падымаецца, робіцца мутным і гасьне... »

Кожнае апавяданьне Цэлеша мае своеасаблівую рытмічную структуру, якая зь першых радкоў стварае пэўны настрой. Параўнаем пачатак двух апавяданьняў. Вось як пачынаецца «Цётка Магда»: «Яна сядзела каля стала, накрытага чыстым абрусам, зусім ужо сівая, хоць ёй і было яшчэ ўсяго пад сорак. Стол стаяў пасярод пакою, а крыху наводдаль ад яго, каля сьцяны, зялезны нікеляваны ложак, засланы жоўтай, з зялёнымі разводамі, коўдрай». А вось «Дзікі вецер»: «Гойдаюцца сосны над хутарам, шумяць, гамоняць. Вецер сьвішча, гоне з поля хвалі сьнегу, кідае яго на сосны, круце ля галамнёў. І страшна на хутары: ходзяць галодныя людзі, забіваюць, рабуюць». У першым -- плаўны, нетаропкі рытм разгорнутых сказаў абяцае нягучна расказаную, можа, драматычную, а можа, і зьлёгку сэнтыментальную гісторыю, у той час як кароткія неразгорнутыя сказы другога апавяданьня адразу настройваюць на небясьпеку, магчымую трагэдыю.

Цэлеш ніколі не дае падрабязнага партрэта сваіх пэрсанажаў. Вельмі скупа апісвае мейсца дзеяньня. Рэдка і ў асобных выпадках робіць пэйзажныя замалёўкі. Так, у «Хмарах над Бацькаўшчынай» -- амаль ідылічны пэйзаж палескага вечара і партрэт маладой жанчыны «зь цёмна-васільковымі, крыху нібы засмучонымі вачмі й вельмі прывабнымі рысамі тавару» дазваляюць аўтару падкрэсьліць рэзка кантрасную з гэтай спакойнай прыгажосьцю трывожную размову аб становішчы ў краіне. Тут, як і ў іншых творах Цэлеша, усё падпарадкавана думцы й дзеяньню, усё адпавядае суровай мэтазгоднасьці сюжэту. Ніякага «прыгоства», ніякіх дадатковых фарбаў, якія маглі-б павесьці чытача ўбок ад галоўнага. Перад намі летапісец-сьведка.

Мікола Цэлеш -- Вітаўту Тумашу (10.12.75)

Рыхтую Вам перасылку зборніка апавяданьняў -- выбраных, папоўненых новымі, дапрацаваных. З маімі слабымі сіламі -- гэта нялёгкая праца. У канцы гэтага

XXIV

месяца думаю Вам пераслаць. У далейшым, калі-б із мной
што-кольвек здарылася дрэннае, трэба зьвяртацца да дачкі
Карал... Ад перасылкі «Ашчадкаў» пакуль што
паўстрымліваюся: а можа, і праўда, дасьць Бог сілу
паправіцца, і тады зноў вазьмуся за працу...

Мікола Цэлеш, верагодна, ніколі ня лічыў свае творы канчаткова завершанымі. Высокая патрабавальнасьць да сябе вымушала ўдасканальваць напісанае. Нават у надрукаваныя раней творы пісьменьнік уносіў зьмены, імкнучыся да ўсё большай дакладнасьці, ёмістасьці, мастацкасьці.

Адзін прыклад. «Хмары над Бацькаўшчынай». У кнізе «Дзесяць апавяданьняў», дзе гэты твор меў назву «Палескія мрыйнікі», чытаем:

«Саламяныя стрэхі вёскі Клетні **зьявіліся перад вачыма** зусім нечакана. Цяпер **фурманка кацілася** па вузкай палёвай дарожцы. З абодвух бакоў ад яе беглі ўдалеч шнуры палосак, там-сям ужо ўзаратыя.

-- Папар наш, -- растлумачыў Ігнат.

На адным з шнуроў ляжалі кучкі неразьбітага гною, **па краёх якіх прарастала расьліна**. **Каняка** Ігната раптам павярнула з дарогі на гэты шнур.

-- Пазнаў!? -- **выкрыкнуў** Ігнат і сьцебануў **Шарака** пугай, паварочваючы яго зноў на дарогу. -- **То мая палоска, -- вытлумачыў.**

-- **Чаму-ж ты не разьбіў гной? -- спытаўся мой кампаньён.**

-- **Пасьпеецца! Паляжыць, умацнее**...»

У рукапісе, падрыхтаваным аўтарам для гэтай кнігі, урывак гучыць інакш:

«Саламяныя стрэхі вёскі Клетні **выскачылі з-за алешніку** нечакана. Цяпер **мы ехалі** па вузкай палявой дарожцы. З абодвых бакоў яе беглі ўдалеч шнуры палосак, там-сям ужо ўзаратыя.

-- Папар наш! -- растлумачыў Ігнат.

На адным з шнуроў ляжалі кучкі неразьбітага гною. **Ад яго моцна пахла хлевам. Конік** Ігнатаў раптам павярнуў на гэты шнур.

-- Пазнаў!? -- **выклікнуў** Ігнат і сьцебануў **каня** пугай, паварочваючы яго зноў на дарогу.

-- **За што-ж ты яго! Належыць узнагародзіць аўсом, а ты пугай яго!?**

-- **Пасьпеецца з аўсом!»**

Унесеныя зьмены ня толькі надалі замалёўцы большы дынамізм і выразнасьць, але і дазволілі пазьбегнуць некаторай двухсэнсоўнасьці ў характарыстыцы Ігната -- руплівага гаспадара. І так заўсёды: Цэлеш

дабіваецца яснасьці, пластычнасьці і рэльефнасьці адлюстраванага. Параўнаньне твораў у «Дзесяці апавяданьнях» з гэтым зборнікам -- выдатны матэрыял для роздуму пра работу пісьменьніка над вобразам, пра адвечныя пошукі пісьменьнікам шляхоў у духоўны сьвет чытача.

Лявон Юрэвіч

Memory

The view from my little corner of the room where I sit playing with my toys is of a foot and a leg. The leg is crossed over the other and is twitching restlessly. I can hear a soft hissing sound. It is coming from between his teeth. It is my father. My mother and I must be very quiet because my father is working. His work is "thinking. In his mind there is a story unfolding. My father needs total concentration to put that story together. He needs quiet to jot down his thoughts on paper before they escape him. My father is a writer. He is a creator. He creates stories from events that happened to him. Somewhere deep within him those events trigger feelings and his need to express them. I am about five years old, I do not understand this yet. All I know is that I must be quiet and not disturb him until he is ready for me. My father devoted his whole being to writing. He loved his country. He committed himself to do all that he could to help in the struggle to help Belarus independent. As a parent his guidance was of the most general kind. He loved to read, to go on long walks, to listen to music. My father read aloud to me, sometimes his own, sometimes the poems of Janka Kupala and other writers. He would tell me fairy tales, ancient myths, legends and heroes of

our country. He told me of the old kings and knights and of their courage, patriotism and individual defiance of fate in the history of Belarus. I grew up with love of reading. Someone once said "as music is for the ear, so is literature music for the brain". Literature shows the universality of truth. Its been said that love of reading cannot be "taught", but it may be "caught".

I am a storyteller. I do not write or create stories as my father did. I don't have that talent. I work in a public library with children. I share literature with children. I entice children into the wonderful world of literature. I show them the way to so much pleasure, intellectual simulation, knowledge, and just plain fun!

Slava Celesz Brown

Аб Міколу Цэлешу... колькі словаў

Зь Міколам Цэлешам я пазнаёміўся напачатку 60-х гадоў у Нью-Ёркскай Публічнай Бібліятэцы на 5-ым эвеню ў Нью-Ёрку, дзе я тады працаваў. Мікола Цэлеш прыйшоў да мяне пазнаёміцца, але фактычна, ён прыйшоў з адной справай -- адразу пасьля першых словаў знаёмства (ён, дарэчы, ведаў маіх бацькоў яшчэ зь Менску) ён папрасіў, каб я яму нешта расказаў пра яго сына, зь якім я нейкі час сядзеў за аднэй партай у школе. Пару дэталяў з тых школьных часоў ды аб ягоным сыне я прыпомніў. Гэтыя дэталі ён як-бы ўбіраў у сябе: перапытваў, аналізаваў, даваў дадатковыя пытаньні. У выніку, я за адну гадзіну расказаў яму пра нашыя школьныя часы. Было відаць, што ён перажываў, хацеў ведаць больш пра сына ды быць зь ім хоць-бы ў думках.

Але на гэтым знаёмства не закончылася -- яно пачалося. Бібліятэка ў тыя часы была адчынена два разы ў тыдзень да дзесятае гадзіны, я-ж працаваў у вячэрнюю зьмену, і Мікола Цэлеш стаў рэгулярна наведваць бібліятэку вечарамі. Прыходзіў ён перад 6-ай гадзінай увечары, частавата мы яшчэ пасьпявалі разам перакусіць, а пазьней у часы перапынкаў, як звычай, мы праводзілі ў бібліятэчнай кафэтэрыі. Ён тады рыхтаваў да друку «Дзесяць апавяданьняў», даў пару апавяданьняў у часапіс «Беларуская Моладзь» (дзе я быў сябрам рэдкалегіі). Ён часта чытаў свае апавяданьні, пытаўся, як знайсьці тую ці іншую даведку. Хоць Мікола Цэлеш і ня надта гаваркі, але расказаў

XXVII

мне ён нямала пра сваё ранейшае жыццё і працу ў Менску. Ад яго я даведаўся, што ён працаваў у часапісе «Паляўнічы Беларусі», рыхтаваў да друку зборнік апавяданьняў. Але прыходзілася апавяданьні часта перарабляць, іначыць, дапасоўваць да партыйных вымогаў. Часта даводзілася ня толькі мяняць, але і нішчыць напісанае, бо было небясьпечна. Бясспрэчна, Мікола Цэлеш перажываў, што ў сталым узросьце давялося выйсьці на эміграцыю, але ён быў цьвёрда пераконаны, што гэта быў адзіны шлях, каб застацца жывым! У гутарках мы амаль заўсёды пераходзілі на штодзённыя справы жыцьця беларускае амэрыканскае калёніі, жыцьця беларускае эміграцыі. Жыцьцё эміграцыі ён ведаў -- час-часам бываў ён у Беларускай Царкве на Атлянтык Эвеню ў Брукліне, раз ці два быў у селішчы Бэлэр-Менск. Актывістам беларускага жыцьця на эміграцыі яго ніяк нельга назваць, але ён, бясспрэчна, жадаў усяму беларускаму ўдачаў. З шырэйшым грамадствам у яго сувязяў ня было, але ён трымаў лучнасьць праз ліставаньне зь Юркам Віцьбічам, д-рам Тумашам, Міколам Паньковым. Грамадства-ж у Нью- Ёрку да Міколы Цэлеша ставілася таксама насьцярожана -- прычынай гэтаму быў найперш, на мой погляд, замкнуты характар Цэлеша, але было таксама не сакрэтам -- чуткі ой як паўзьлі! -- што ён меў кантакты з Максімам Танкам, нешта пасылаў да друку ў БССР. У тыя часы беларускае грамадства -- трэба мець заўсёды на ўвазе, што гэтае грамадства было найперш і найактыўнай палітычнай эміграцыяй, -- ні аб якіх кантактах з БССР і думаць не хацела й не жадала.

Наша знаёмства цягнулася нейкі час, але паступова Мікола Цэлеш аддаліўся, і я страціў зь ім кантакт. Праўда, выдаўшы «Дзесяць апавяданьняў», у працэсе распаўсюджаньня кнігі ён яшчэ кантактаваўся са мной, але хутка адышоў.

Аналізуючы Міколу Цэлеша, я сказаў-бы, што ён жыў думкамі ў сваім сьвеце -- бясспрэчна, блізка зьвязаны зь Беларусьсю, -- але адначасна перажываючы, што ён знаходзіцца па-за межамі свае Бацькаўшчыны і што па волі тагачаснага рэжыму ён ня можа й ня зможа стварыць для Бацькаўшчыны таго, што ён хацеў-бы.

Яшчэ адзін згублены для Бацькаўшчыны працаўнік, добразычлівец, патрыёт і пісьменьнік.

Вітаўт Кіпель

Аўтабіяграфія

XXVIII

Нарадзіўся 25-га ліпеня 1900 году ў в. Зазер’е Есьмінскай воласьці, Барысаўскага павету, Менскай губерні. Бацька -- Яўхім Цэлеш, маці Барбара, абодвы -- сяляне.

У 1911 годзе скончыў вясковую школу. Настаўніца (пазьней жонка Янкі Купалы) дамаглася, каб мяне аддалі ў «Выше-начальное училиэе» за сямнаццаць вёрст, у мястэчку. Гэта ўваходзіла ў пляны й бацькі, бо зямлі на нашу сям’ю прыпадала толькі тры дзесяціны, а, апроч мяне, было яшчэ двох сыноў.

Вучні «Выше-начального училиэа» мелі жалю вартае існаваньне. Жылі ў бруднай і халоднай «бурсе», харчаваліся, галоўным чынам, сухім хлебам і адзінай на дзень цыкорыяй; крупнік варыўся таксама толькі раз на дзень і толькі ў дні школьных заняткаў. Гэта прымушала мяне, нягледзячы на такую далёкую дарогу і супроць волі бацькі, уцякаць дахаты. Можаце сабе ўявіць, як я дабіраўся праз пушчы й пустыя палі, часта ўжо ўпоцемку, да майго Зазер’я. Цяпер часта ўспамінаю, як мяне не загрызьлі ваўкі, якіх у нашай мясцовасьці было шмат.

Навука мая ў «Выше-начальном училиэе» скончылася ў 1914 годзе, калі бацьку забралі на вайну. У шаснаццатым я выехаў у Варонеж, дзе дастаў працу на пошце. Гэта была няўдалая спроба палепшыць становішча сям’і, бо ў Расейскай імпэрыі быў ужо пачаўся хаос і голад. Сябры з Бацькаўшчыны, якіх было шмат у Варонежы, як уцекачоў ад вайны, параілі мне кінуць працу на пошце і ехаць на поўдзень. Другога выйсьця ня было, і я апынуўся, якраз у дні лютаўскай рэвалюцыі, у невялікім гарадку Кадзіеўка, на Кацярынаслаўшчыне. Тут таксама было шмат уцекачоў ад вайны з Бацькаўшчыны -- галоўным чынам інтэлігенцыі. Пры іхнай дапамозе пры мясцовай гімназыі для маладых людзей, страціўшых магчымасьць вучыцца на Бацькаўшчыне, былі арганізаваныя агульнаадукацыйныя курсы. Я знайшоў такую-сякую працу й пачаў наведваць гэтыя курсы. У 1919 годзе скончыў іх.

Пачалася грамадзянская вайна. «Недзялімцы» наступалі з Дону, саветчыкі арганізоўвалі абарону на мясцох, і ў чырвені дзевятнаццатага мяне паклікалі ў войска. Цяжка перадаць усё тое, што мне прыйшлося перажыць; даволі сказаць, што, калі я вярнуўся дахаты па дэмабілізацыі, ні бацька, ні маці не пазналі мяне -- так зьнясілены быў я двума тыфусамі запар.

У 1922 годзе я асеў на сталае жыцьцё ў Менску. Аслаблены тыфусамі, я ня мог дазволіць сабе вялікай нагрузкі, што патрабавалася ўмовамі жыцьця. Не пайшоў я й ні ў якую партыю; паспрабаваў

XXIX

слухаць лекцыі на факультэце грамадскіх навук, але мне яны не падабаліся -- усю іхную мудрасьць я прайшоў у жыцьці на практыцы...

У 1928 паспрабаваў свае сілы ў літаратуры. Выявілася, што яны ў мяне ёсьць, і я ўзяў працу ў рэдакцыях. У 1929 годзе была выдадзена мая першая кніжка, рэдактар -- **сьвятлай памяці Міхась Чарот**. Мела яна добрыя водгукі, і я наважыў заняцца літаратурай.

Новая вайна прынесла нам жудасныя няшчасьці. Я згубіў палавіну сям'і, а пазьней і ўсю.

Літаратурная праца мяне крыху натхняла, але са старасьцю і гэтаму прыйшоў канец. Дажываю жыцьцё самотным, у адзіноце: што лёс пашле?..

Мікола Цэлеш

1

Хмары

над

Бацькаўшчынай

Да чытача

2

Апавяданьні гэтыя радзіліся не адразу: я пісаў іх некалькі год. Зразумела, гэта не азначае, што я сядзеў над імі гадамі, пісаў і пісаў. Я кажу, пісаў некалькі год -- гэта значыць, думаў над імі, не забываў пра іх ні пры якіх абставінах. Бывала, кладу шынгэльсы і прыбіваю іх цьвікамі; раптам зьяўляецца цікавая думка, вобраз, пасаж... Але не пра маю працу над шынгельсамі, а пра апавяданьні. Кладу на момант малаток і хуценька запісваю гэтую думку, вобраз, пасаж... Потым засоўваю гэтую картку ў кішэню, каб не забыць. А што рабіць, калі бракуе часу? У Амэрыцы «time -- money, money -- time».

Едучы дахаты, усё яшчэ думаю пра запісы. Урэшце ў вольную хвіліну распраўляюся зь імі... Памятаю, так зьявіўся вобраз цёткі Магды. І памучыўся-ж я над ім! Фабула дазваляла пісаць аповесьць, але я ведаў, часу для аповесьці бракуе -- чакае малаток, а не пяро...

Але ў другім выпадку, у «Меры гвалту» (у другім выданьні «На межах»), памятаю, зьявіўся Матузок у маіх думках маланкава й з гатовым характарам. «Ганна, сякеру!» Нікога ён не засек, праўда, толькі сам сябе намучыў... Я лічу гэтае апавяданьне, кароценькае да мінімуму, найбольш удалым з маіх усіх, і я хачу сказаць, што характар можна ствараць ня толькі на вялікім матар'яле.

Але вось «Партыйны таварыш» памучыў мяне. Не ўдаваўся. І не адзін шынгэльс быў выкінуты ў сьмецьце, пакуль я дайшоў зь ім да ладу...

Такім чынам, праца для хлеба штодзённага і творчасьць? Мне здаецца, яны спалучаюцца ў найбольш удалы й цікавы спосаб ствараць сапраўды мастацкія, зразумела, кароткія літаратурныя рэчы -- цікавы твор можа быць толькі тады, калі ў ім адбіта жывое жыцьцё...

Цікава паслухаць і нашых пісьменьнікаў і крытыкаў у гэтай справе. Як-жа доўга я працаваў над «Дзесяцьцю апавяданьнямі»![1] Годы, сябры!

Аўтар

---

[1] Мікола Цэлеш. Дзесяць апавяданьняў. Выданьне аўтара. Нью-Ёрк, 1965, 95 б.

3

Хмары над Бацькаўшчынай

-- На гэты раз паедзем на Палесьсе да Ігната, -- сказаў мой кампаньён. -- Ты ўбачыш, якая там раскоша для паляўнічага і які спэц у гэтай справе сам Ігнат!

-- А ці ты папярэдзіў яго, што прыедзем?

-- А як-жа? І атрымаў адказ: «Чакаем! Сена мяккае, мурожнае, спаць на ім, як на пярыне. А качкі -- над галавой кракаюць...»

Цяжка сапучы, паравік загамаваў рух і спыніўся на паўстанку. Ігната мы ўбачылі на пустым прывакзальным пляцы. Ён стаяў з пугай у рукох каля сваёй хурманкі, пазіраючы на вагоны. Убачыўшы нас, кінуўся насустрач, каб дапамагчы цягнуць перагружаныя набоямі й харчамі торбы.

-- Ці ёмка было ехаць? -- пытаўся.

-- А нічога! Толькі дужа цесна было!

-- Ну, дык-жа ў добры час! -- зірнуў на Лорда. -- Якраз -- выжла? А дуплякоў і цецярукоў -- няма веры колькі!.. -- асьцярожна паклаў далонь на лысую галаву сабакі. -- Лорд! А што гэта -- Лорд?

-- На ангельскай мове -- то вялікі пан.

-- Гмм... Сабакам гэта не пасуе, але от-жа выдумаюць...

4

-- Ну, а як там наш Кандрат маецца? -- спытаў кампаньён пра другога мрыйніка, як іх клікалі ў вёсцы.

-- А што яму там?! Пакуль што роўна, як і ўсе мы...

-- Ён меркаваў за скуркі набыць новую стрэльбу, дык ці набыў?

-- Меўся-б набыць, бо скурак гэтых настраляў, колькі й я, але Пекла (так Кандрат клікаў сваю жонку Пёклу) не дазволіла. Трэба, кажа, раней у гаспадарцы спраўнасьць навесьці, а потым ужо пра стрэльбы думаць. Сама аднесла скуркі ў крамку.

-- Відаць, добра вам паводзілася ў гэтую зіму?

-- А нічога сабе: пяць лісаў, зайцоў з паўсотні, тры ваўкі, рысь, дзьве норкі ды некалькі шашкоў.

Кампаньён усьміхаўся.

-- Мог-бы й ты набыць новую фузэю...

-- Дык-жа набыў-бы, каб хацеў! Але не патрабую, бо з гэтае не даю маху, хоць і старэнькая...

Хурманка кацілася па каляістай і няроўнай дарозе.

-- Но, конік! Но, пайшоў! -- падганяў Ігнат. Конік быў невялікі, трыбухаценькі, але цегавіты. І ўсякі раз, калі ён борзда пускаўся наперад, Ігнат паварочваўся тварам да нас і казаў:

-- Нашы літоўскія конікі хоць і маленькія на выгляд, але працавітыя... Нішто сабе конікі!

Прабубнелі па нейкім драўляным мосьціку цераз невялікую рэчку, і дарога пайшла па мяккай вясёлай лугавінцы, што цягнулася ўздоўж зарослай чаратамі і аірам гэтай рэчкі.

-- Праедзем тутака крыху нацянькі, -- растлумачыў Ігнат, пакручваючы пугай над крупам каня.

Там-сям рэчка срэбрам пабліскавала з-за густой зелянізны расьлін. Ад подыху ветру чароты ківаліся то ўлева, то ўправа. На заваротах утвараліся затокі, і на аднэй зь іх мы заўважылі чародку цыранкоў. Лорд пацягнуў носам паветра і, скочыўшы з хурманкі, шпарка панёсься да іх. Не дабегшы мэтраў зь дзесяць, раптам спыніўся як укапаны. Качкі паднялі галоўкі й глядзелі на яго. І як толькі ён пасунуўся чутачку да іх, стромка ўзьняліся ўгару й закружылі над алешнікам, выглядаючы небясьпеку.

-- Эх, -- уздыхнуў Ігнат, -- выйгада ім тутака! Потым, крыху падумаўшы: -- А Кандрат тамака ўжо мрые, чакаючы! Панарыхтаваў набояў! Наплёў лапцяў!

5

-- Рыбак рыбку пячэ, а паляўнічы лапці пляце, -- прамовіў кампаньён.

-- Яно, можа, і так, але-ж мы з Кандратам і рыбакі й паляўнічыя адначасна.

* * *

Саламяныя стрэхі вёскі Клетні выскачылі з-за алешніку нечакана. Цяпер мы ехалі па вузкай палявой дарожцы. З абодвух бакоў яе беглі ўдалеч шнуры палосак, там-сям ужо ўзаратыя.

-- Папар наш! -- растлумачыў Ігнат.

На адным з шнуроў ляжалі кучкі неразьбітага гною. Ад яго моцна пахла хлевам. Конік Ігнатаў раптам павярнуў на гэты шнур.

-- Пазнаў!? -- выклікнуў Ігнат і сьцебануў каня пугай, паварочваючы яго зноў на дарогу.

-- За што-ж ты яго! Належыць узнагародзіць аўсом, а ты пугай яго!?

-- Пасьпеецца з аўсом!

Уехалі ў вёску. Вуліца бегла па скацістым узгорку, паўз рэчкі. Па адным ейным баку, тым, што да рэчкі, будоў ніякіх ня было -- толькі там-сям азяроды, частакол агародзікаў ды яблынькі й дулі... Птыч дугой абгінала вёску й зялёнымі пожнямі глыбака ўразалася ў палі. Берагі ейныя хаваліся ў гушчарох лазьняку й альшэўніку. Насупраць вёскі, паміж іх, сноўдалася бялявая постаць чалавека зь сеткай-таптухай на доўгім кіі.

-- Кандрат ужо абмацвае сваёй снасьцю віры, -- зазначыў Ігнат, паказваючы пугаўём у той бок, -- на вячэру, значыць, будзе юшка...

Ігнатава хата стаяла на высокім мейсцы, каля самай вады, двума вокнамі на паўдня, а двума -- на ўсход. Каля яе ляжаў перакулены човен, а ў падстрэшшу тырчэла два вяслы. На плоце сушыліся: трыгубіца, лыкавыя лапці з анучамі й шэрыя нагавіцы, запэцканыя водарасьцямі; відаць было, што гаспадар яшчэ нядаўна карыстаўся ўсім гэтым... Гаспадарчыя будынкі былі зьбітыя так-сяк з дробнага яловага лесу; толькі хата была збудаваная з добрага сасновага бярвеньня. На двары, каля сьвірна, сохлі ў скіртах пашчапаныя дровы й ляжалі яшчэ не папілаваныя бярозавыя й кляновыя катлякі...

6

Нас спаткала Ігнатава жонка, крыху, можа, маладзейшая за Ігната. Была чарнявая, зь цёмна-васільковымі, нібы крыху засмучонымі, вачмі й вельмі прывабнымі рысамі твару.

-- Ну, Марынка, прымай гасьцей! -- зьвярнуўся да яе ласкава Ігнат, вешаючы на крук шапку.

-- У добры-ж час! Якраз качак гэтых, як гразі! Але заходзьце-ж, заходзьце далей! -- прамовіла, крыху як-бы нарасьпеў, гаспадыня, папраўляючы валасы.

Падлога ў сьвятліцы была вымыта аж да бляску і пацярушана аірам, ад якога ішоў моцны пах валяр'яны. Павесілі торбы на крукі, а стрэльбы паставілі ў кут.

-- Горача сёньня траха, -- прамовіла Марына, пазіраючы на нас зь вясёлай усьмешкай. -- Пайду квасу вам хлебнага й студзёнага папіць прынясу...

Узяла з паліцы вялікі гарлач і выйшла. Хутка вярнулася з квасам. У гэты час за вакном мільганула высокая постаць Кандрата, які ня йшоў, а амаль бег. Рыпнулі дзьверы, і ён паўстаў перад намі. Быў мокры аж да паловы. У руцэ трымаў на лазіне два шчупакі, хунтаў на пяць кожны.

-- А-а, каб на яго ліха, -- адзін выкруціўся усё-ткі з таптухі -- пераскочыў цераз край! Ды якраз і большы...

-- Дык ты вазьмі сабе аднаго! -- скамандаваў Ігнат.

-- У мяне тамака ё... Ну, і тым часам бывайце, у мяне там пільная справа...

-- Пачакай Кандрат! -- паклікаў яго кампаньён.

Зьняў з крука торбу, дастаў зь яе бутэльку з зуброўкай і паляўнічую складаную чарку. Паставіў чарку на найбольшую мерку -- прыблізна з паўкватэркі -- і наліў у яе агністай вадкасьці.

-- На, сагрэйся, Кандрат!

Не маргнуўшы вокам, Кандрат перакуліў яе. Выцер рукавом вусы.

-- Уга, па жылах пацякла! Ну, цяперака дык сапраўды сагрэюся!..

І скочыў за дзьверы.

-- Пэўна, жэрліцы там паставіў нанач, -- зазначыў Ігнат.

Пасьля вячэры выйшлі з хаты й паселі на непапілаваных катлякох, у тым ліку й Марына. Кандрат далучыўся крыху пазьней. Прысутнасьць сярод нас гэтай простай, але прыемнай жанчыны

7

неяк узбуджала й натхняла на шчырую гамонку. Прычынялася да гэтага, пэўна, і палеская ноч, ціхая, парная, таямнічая, -- ноч, калі не хацелася класьціся ў пасьцель, калі ўся істота імкнецца да таварыства, да гутаркі, да мараў...

На Птычы час ад часу плёскаў шчупак, нейдзе ў чаротах гудзеў бугай, выбухалі трывожным крыкам на выгарах спалоханыя лісам ці ваўком крыжны...

Парушыў маўчаньне Ігнат.

-- Скажыце, ці праўда гэта, што наш беларускі ўрад у Менску ўвесь чыста заарыштаваны за тое, што пераводзіў вёскі на пяцідворкі й хутары й што прадаваў сялянам панскую зямлю? І ці праўда таксама, што хутка пачнецца вялікі згон да кагалу? Кажуць, што аб гэтым з Масквы прыйшла пастанова. Вы людзі мястовыя, адукаваныя, дык-жа мусіце ведаць усё...

Вельмі не хацелася псаваць прыемны адпачынак гутаркамі на палітычныя тэмы, і тым ня менш вымушаны былі неяк задаволіць нашых так ветлівых гаспадароў.

-- Пра арышты ёсьць нейкая гаворка, але не ўсяго беларускага ўраду, а толькі некаторых ягоных сяброў, прынамсі наркома земляробства...

-- Завошта-ж яго арыштоўваць, калі ён рабіў дабро для народу! І рэвалюцыя-ж была ўзьнятая для дабра народу!

-- Народу ён дагадзіў добра, але, мабыць, не дагадзіў некаторым вышэйшым за яго...

-- Гэта, значыць, у Маскве?! Дык-жа вось у гэтым і ўвесь цьвік: што Маскве да нас?

-- Рацыя! Але Масква ня толькі на карку нашым, але й на карку іншых, а зрабіць нічога ня можам...

-- Ну, а наконт таго згону ў кагал? -- уставіў Кандрат.

-- Тут яшчэ нічога выразнага няма... Пастанова гаворыць толькі: гаспадаркі вашэцяў зьяднаць у адну гаспадарку... А як яно там укладзецца, яшчэ рана гутарыць...

-- Зьяднаць?! Гэта значыць: ня кіем, дык палкай! -- выклікнулі разам Ігнат з Кандратам. -- Але для чаго гэта мае быць рабіцца?

-- Людзі жывуць няроўна: адзін бедны, другі багаты -- хочуць зрабіць усіх роўнымі...

Ігнат зарагатаў.

8

-- Кажуць, некалі жыў дуркаваты цар, а мо’ кароль, дык ён дужа хацеў, каб у ягоным царсьцьве -- ці ў каралеўстве -- людзі выглядалі, як па шнуру, роўныя. Дык ён зрабіў ложак па свайму росту і загадаў пераймаць усіх на дарозе й класьці на гэты ложак. Хто быў карацейшы, дык таму выцягвалі ногі, а хто даўжэйшы, дык таму адсякалі... Дык вось і нас цяперака кладуць на гэны ложак...

-- Старажытнае паданьне аб Пракруставым ложку! -- зазначыў мой кампаньён.

-- Старажытнае, але добра паказвае, што цяперака хочуць рабіць із намі...

-- Яшчэ рана казаць, як яно будзе выглядаць.

Кампаньён зірнуў на Ігната.

-- Хачу, каб вы мяне не залічалі ў стопрацэнтнага абаронцу гэтай новай выдумкі, -- прамовіў. -- Я гэтакі-ж прыхільнік яе, як і вы самі, і калі што-небудзь сьцьвярджаю, дык толькі з чужых слоў: «усё гэта робіцца ў імя будучыні...»

-- Гэтага дык мы зусім ня можам уцяміць! -- заўважыў Ігнат. -- Як гэта ў імя будучыні? Усё павінна рабіцца і робіцца для людзей, а не для нейкай няведамай будучыні, бо мы ня можам ведаць, якая будзе тая будучыня й чаго людзі, якія будуць тады жыць, захочуць!.. Хай самі яны думаюць пра сваё жыцьцё!

Тут умяшалася Марына.

-- На мой бабскі розум, няма сэнсу ламаць галаву над будучыняй будучых людзей: от, царскія гэнералы думалі зрабіць прыгожую будучыню для сваіх нашчадкаў, пачаўшы астатнюю вайну, а бачыце, што з гэтага выйшла?!

-- Клутні й няшчасьці, кажуць, -- уставіў Кандрат, -- дык вось яны тады й зачнуцца, як згоняць усіх у кагал; а шчасьце й няшчасьце, дык яно ў кожнага на свой лад...

-- Але чаму яны цягнуць нас гвалтам да гэтага шчасьця?! Забыліся, хіба, пра мудрую прыказку нашых дзядоў ды прадзедаў, што шчасьлівым насільна ня станеш! Хай бы сабе йшлі да гэтага кагалу тыя, хто хоча!..

* * *

На сене мы яшчэ доўга гутарылі на гэту тэму.

-- Калі й сюды дайшлі чуткі пра Прышчэпава, дык яго, пэўне, ня толькі скінулі з пасады наркома, але й пасадзілі ў «кутузку...»

9

-- А мы сядзім от там і нічога ня ведаем...

Памаўчалі. Потым зноў:

-- Выцерабяць нас нанава, як у 1863! Прышчэпава ніяк нельга залічыць у ворагі народу -- ён патрыёта й не абы-які! -- адукаваны, паезьдзіўшы па Эўропе, нагледзіўшыся на сельскую гаспадарку ў Данііі, шмат чаго перадумаўшы... Ягоная зямельная палітыка ў стасунку да нашых умоў вельмі ўдалая -- зірнем на тых, хто прыняў яе. Пачалося зусім іншае жыцьцё!

-- Дык, кажаш, выцерабяць?

-- А ты што, ня бачыш і ня чуеш? «... Адсячы галаву нацдэмаўскай гадзіне...» Заклік: выбіць нашу інтэлігенцыю, пакінуць народ без кіраўнікоў...

-- Спалохаліся росту?

-- Можа быць! А ведаеш, колькі яе было выцераблена ў шэсьцьдзесят трэцім? Толькі пакараных сьмерцю, узятых «пад ногаць», як яны кажуць, гэта значыць, усьцягнутых на шыбеніцы й расстраляных, па афіцыйных зьвестках, цераз суды было каля паўтары сотні. А колькі іх расстраляна й павешана на мейсцы, бяз жадных судоў? Ды загінула ў сасланьні? Сібір была перапоўнена нашымі паўстанцамі, гэтага не адмаўлялі навет гэтакія русафілы, хоць і не расейцы, як Хведар Дастаеўскі... Усіх пакараных было каля пяцідзесяці тысяч, і ўсе яны маладыя людзі: студэнты, гімназыстыя, ахвіцэры... Сунуцца хмары на нашу Бацькаўшчыну!

-- Але гэта ім некалі адрыгнецца, калі яны паспрабуюць гэтак зрабіць, як адрыгнуўся ім шэсьцьдзесят трэці ў дзевяцьсот пятым ды шостым і ў дзевяцьсот сямнаццатым ды васямнаццатым...

Кампаньён цяжка ўздыхнуў.

-- Страшна жыць! Так, страшна!

* * *

Нітку салодкага ранішняга сну перарвала пастухова труба.

-- Ту-ту-ту-ту! Выганяй!

Успомнілася зь дзіцячых год: «Пастух трубіў -- штаны згубіў, дзеўкі йшлі -- штаны знайшлі!»

І ў гэты-ж мамэнт рыпнулі вароты ў стадоле. Ігнат крыкнуў:

-- Пара ўставаць! Качкі ўжо кружаць над галавой.

Мурожнае мяккае сена сьпесьціла за ноч цела, і ўставаць ніяк не хацелася. Прыслухаліся: качкі, праўда, шыбуюць над дахам!

10

Падхапіліся й пачалі спаўзаць зь сена. Марына ўжо падаіла карову й разьвешвала на плоце толькі што выкарыстаную даёнку й цадзілку. Была босая. Аголеныя да калень ногі ружавелі ў промнях ранішняга сонца.

-- Добрай раніцы! -- прывіталіся.

-- А раніца, праўда, добрая, ядраная! -- адказала. -- Зірніце на дыямэнты расы, што рассыпаліся па кусту бэзу!

Кампаньён зірнуў на мяне, быццам-бы пытаючы: «Ну, ці чакаў ты такіх пэрлаў ад простай вясковай бабіны?»

Выцерла хвартухом рукі й з той-жа бадзёрай ветлівасьцю прапанавала:

-- Зайдзіце ў хату выпіць па кубку сырадою.

Праз паўгадзіны выйшлі на сьцежку цераз агарод. Моцна пахлі каноплі. Ішлі ў кірунку да рэчкі, зьбіваючы нагамі расу зь лістоў буракоў і бручкі. У канцы агароду, каля зьдзічэлай дулі, таптаўся Кандрат.

-- Позьненька вы сьпіцё! -- прамовіў, калі падышлі да яго. -- Я думаў, што вы ўжо й да паўдня будзеце спаць.

-- Управімся! -- коратка зазначыў Ігнат. -- Нашы застануцца нашымі, не паляцяць!

Над чаратамі віселі воблакі туману. Там-сям чарнелі сілуэты стагоў. Сена ляжала і ў копах, ад яго пахла размаітымі пархумамі траў. Лорд, які пругка мільгаў перад намі, раптам насьцярожана прыпыніўся. Мы рассыпаліся, ланцужком абхопліваючы выгарыну. Лорд зірнуў на нас разумнымі вачыма і рушыў дробнымі крокамі наперад. Падвёўшы нас да выгарыны, зноў стаў, уніклівa пазіраючы на чарот. Ляскаў зубамі й ціхутка папіскваў, час ад часу пазіраючы на нас, ці дазваляем мы яму рушыцца далей. Тонкі хвост ягоны алавіком выпрастаўся й дрыжэў. Я папхнуў каленам сабаку наперад. І ў той-жа мамэнт з-пад самага ягонага носу выпырхнула качка, напаўняючы паветра трывожным крыкам. Нашы стрэльбы па інэрцыі апынуліся на лініі стрэлу, але Ігнат пасьпеў папярэдзіць:

-- Старка! Малых пахавала, а сама для адводу вачэй узьнялася...

Скіраваліся да наступнай выгарыны. Лорд прарабіў той самы манэўр, што й раней: раз і два напружыста мільгануў перад намі й спыніўся, уцягнуў носам паветра, асьцярожнымі крокамі падвёў нас да выгарыны й застыў на мейсцы. Чарот перад намі закалыхаўся, як

11

быццам пад ім забушавала вада, і з-пад яго пачаў вырывацца мацёры качур.

-- Пільнуй! -- крыкнуў на гэты раз Ігнат.

Мой стрэл быў першы -- качур ані варухнуўся, ляцеў далей. Не затрымаў яго й стрэл кампаньёна. Тады Кандрат спакойна ўзьняў сваю паядынку, добра прыклаўся й стрэліў. Качур перавярнуўся пузам угару й шлёпнуўся на ваду. Але Лорд усё яшчэ стаяў на мейсцы ў мёртвай стойцы, скіраваўшы вочы ў чараты выгарыны.

-- Пэўна, не адзін ён тут, -- заўважыў Кандрат, пасьпешна заганяючы новы набой у сваю паядынку.

-- Пільнуй! -- зноў пачуўся Ігнатаў крык.

З густымі пырскамі вады й з амаль заглушаючым усё наўкола крыкам і лапатаньнем крылаў вырвалася з чаратоў цэлая чарада крыжнаў, прыгожа паблісквaючы ў промнях сонца зырка зялёнымі й белымі пёрамі. Першым стрэліў зноў я й таксама хібіў, бо дужа хваляваўся. Ігнат дубальтам звaліў дзьве, але Кандрат на гэты раз хібіў.

-- Трэба было цэліць крыху ніжэй, а ты пусьціў набой у неба, -- зганіў яго Ігнат.

-- Ну, пабачым, куды ты будзеш пускаць свой набой!

-- Ды куды? У качку, а ня ў неба...

Падышлі да новае вялікае выгарыны, суцэльна зарослай аірам, пухоўнікам, чаротам, а там, дзе крыху віднелася дно, асакой.

-- Тутака іхнае царства-гаспадарства! -- зазначыў Ігнат. -- Але і ўтапіцца можна...

І праўда, мох пад нагамі гушкаўся, і перад вачмі выраставалі гузы -- гэта вада, націснутая нашымі нагамі, пампавалася пад мохам у другое мейсца наперадзе нас, уздымаючы ўгару гэтыя гузы. Качкі (і ўсё буйнейшых гатункаў) выляталі з чаратоў амаль памінутна, некаторыя зь іх комам зноў падалі на ваду пасьля нашых стрэлаў, іншыя перапалохана зьнікалі ўдалечыні.

Торбы нашы моцна абцяжарвалі плечы -- пара было-б ужо й спыніць страляніну, але новае «пільнуй!» заахвочвала нас яшчэ пастраляць крыху. Урэшце па вялізным качуру схібіў і Ігнат.

-- Трэба было-б браць крыху вышэй, а ты пусьціў набой у чараты, -- зганіў яго, у сваю чаргу, Кандрат.

Ігнат незадаволена зірнуў на яго, але прамовіў лагодна:

-- Стаміўся, пэўна! Пара ўжо спыніць гэта!

12

Падыходзячы да вёскі, Кандрат смачна лыкнуў языком.

-- Вось цяпер з ахвотай пап’ём і студзёненькага кваску...

-- Дык-жа ідзі, вынесі гарлач на двор!

Кандрат пайшоў у хату, а мы паселі на груду бярвеньня, што ляжала каля сьцяны сьвірна. Кандратава гаспадарка мала чым розьнілася ад Ігнатавай: такі самы човен, перавернуты ўгару дном; на плоце сетка-таптуха; такія-сякія гаспадарчыя будынкі, крыху, праўда, больш занядбаныя, чым Ігнатавы; хата з падгніўшым вянцом... Але хлебны квас ягоны быў найвыдатнейшы: Пекла ягоная, відаць, была спраўнай гаспадыняй...

* * *

Гады цераз два нам зноў захацелася пабываць на Птычы. Напісалі Ігнату, каб прыехаў па нас да чыгункі. Аднак адказу ад яго ня было. Гэта нас моцна зьдзівіла: Ігнат заўсёды вылучаўся рупнасьцю й акуратнасьцю. Доўга разважалі: ехаць ці ня ехаць? Калі паедзем поездам, а Ігнат нас на станцыі з канём не спаткае, дабрацца да яго будзе вельмі цяжка. Усё-ж паехалі. Ігнат ня прыехаў. Гэта было адразу-ж відаць, бо ён звычайна станавіўся із сваёй хурманкай на відным мейсцы каля станцыі. На гэты раз тут ня было аніводнае хурманкі...

-- Што цяпер рабіць?

Да Клетні -- трыццаць кілёмэтраў! З такой цяжкой паклажай, якая заўсёды бярэцца паляўнічымі на два дні паляваньня, нечага было й думаць ісьці пехатою. Ды якімі мы будзем пасьля гэтакай цяжкой маршыроўкі?! І вяртацца назад, ня выпусьціўшы аніводнага набою, было таксама дзікім. Селі на лаўку каля станцыйнага будынку, чакаючы на які-небудзь выпадак. За сьпіной было адчыненае вакно тэлеграфнай канторы. Час ад часу званіў тэлефон, стукаў апарат і чулася нейчая гамонка. І раптам у вакно прасунулася галава, ужо палыселая.

-- Мрыйнікі? -- спытала. -- На паляваньне да Клетні дабіраецеся? Я таксама з такіх, але якраз выпала дзяжурства. А заўтра там будзе цэлая кананада!..

-- Ды вось-жа, ня прыехала па нас хурманка, і цяпер ня ведаем, што рабіць.

-- Цяжка, праўда, -- прамовіла галава. -- Знайсьці цяпер хурманку амаль немагчыма з тае прычыны, што кожны стараецца

збыць каня, калі мае яго, бо дужа вялікія й падатак і цягла... -- потым раптам: -- Хаця пачакайце! Можа, яшчэ ўладзіцца: зьвярніцеся вунь у тую хату зь зялёнымі вакяніцамі -- ён балагол і, здаецца, учора прывёў каня. Завуць гэтага балагола Шаем.

Мы падзякавалі галаве.

-- Ну, дык ні пяра ні пуха!

Шая выглядаў на чалавека гадоў пад пяцьдзесят. Меў, відаць, кучу дзяцей, бо ў хаце было ўсё перавернута ўверх дном. Мы запыталіся, ці можа ён даставіць нас да Клетні.

-- Чаму я мушу дастаўляць вас да Клетні, хіба я адзін толькі тут, хто можа даставіць вас да Клетні?

-- Але толькі вы маеце каня?

-- Толькі я маю каня?! Кожны можа мець каня! -- потым, зірнуўшы на нашы стрэльбы й на сабаку. -- Вы стральцы?

-- Вы-ж бачыце?!

Шая задумаўся. Можна было зразумець: падлічвае, колькі можна зарабіць на гэтым падарожжы.

-- Ну, я мог-бы даставіць вас да Клетні, але гэта будзе вам шмат каштаваць...

І заламаў такую цану, за якую Ігнат мог-бы прыехаць па нас два разы.

Доўга таргаваліся, урэшце ён крыху спусьціў, мы набавілі. Цераз хвілін дзесяць конь быў запрэжаны.

-- Ну, то можам ехаць! -- сказаў Шая.

Калі мы ўбачылі ягонага каня, дык у нас адпала ахвота ехаць: адны толькі рэбры ды скура!

-- Шая, як ты можаш пускацца ў дарогу на такой шкапе?

-- На такой шкапе?! Я купіў гэтага каня толькі тыдзень таму часу! І ведаеце, колькі я заплаціў, -- адзін сызорак! Каб я так здароў быў, што гэта праўда! Але чаму вы думаеце, што гэта няважны конь? Вельмі добры конь! Паглядзіце ў зубы: яму толькі пяць год!

-- За сызорак купіў каня, ды такога маладога!

-- Так, за сызорак, каб я так здароў быў! Вы там замкнуліся ў сваіх мурох і нічога ня бачыце й ня ведаеце... Гаспадары цяперака праганяюць з двара сваіх коней. А чаму? Падумайце самі...

Праехалі кілёмэтраў зь пяць, і конь ішоў сапраўды добра, прымаючы пад увагу ягоны выгляд.

-- Нядрэнны конь! -- зазначыў урэшце кампаньён.

14

Шая выклікнуў:

-- Ну, што я вам казаў? І гэта толькі за адзін сызорак! Але сызорак быў таксама добры: сем рублёў заплаціў у Менску пяць год таму назад...

Шая крыху памаўчаў.

-- Каб я так здароў быў, цяпер можна ўзяць добрага каня за капейку.

-- Так дрэнна?

-- Я не кажу -- дрэнна! Можа, яно будзе й добра? Але цяпер: бяры, гаспадар, на тыдзень хлеба ў торбу і едзь на шашу. А прыехаў з шашы, едзь у лес па дровы й вязі іх да чыгункі за сорак кілёмэтраў. А потым ты мусіш даць два разы на месяц хурманку для начальства... Каб я так здароў быў: селянін гоне свайго каня з двара! Той чалавек, што прадаў мне гэтага каня, кажа:

-- Шая, толькі ты можаш узяць гэтага каня, бо ты балагол, а не гаспадар, табе ня трэба ехаць на шашу і ў лес па дровы. Ты не адбываеш цягла. А мне шкода праганяць з двара такога добрага каня.

Да вечара мы ўсё-ткі дабраліся да Ігната. Нас спаткала Марына, але зусім ня так, як бывала: была быццам-бы засаромленая, глядзела ў падлогу.

-- Што здарылася? -- спыталі.

-- Ат, ды нічога!

-- Вычуваецца нешта нядобрае?

-- У нядобры час прыехалі, -- адказала. -- Ну, але што-ж, пайду паклічу Ігната, ён нейдзе на сяле.

Вярнулася хвілін цераз дзесяць, за ёй ішоў Ігнат.

-- А ўсё-ткі прыехалі? -- зьдзівіўся. -- Гэта ўжо ня мрыйнікі, а цэлыя пакутнікі...

-- Кажыце лепей пра свае справы.

Ігнат адмахнуўся.

-- Няма чаго казаць: кладуць нас на той прахвостаў ложак!

-- Пракрустаў, -- паправіў яго кампаньён, які любіў ува ўсім парадак.

-- Хай сабе на Пракрустаў.

-- Значыць, папісаліся ў калгас?

-- Што!? Ніколі! Калі гібець, дык лепей ужо вольным чалавекам...

15

Больш гаварыць ня было аб чым, і мы запыталі, ці можна будзе заначаваць.

-- А чаму не? Мейсца на сене хопіць, накасіў для каравёнкі.

-- А дзе-ж ваш конік?

-- Няма коніка! Няма!.. І паляўнічы білет атабралі: ня йдзеш у кагал -- ня можаш і паляваць! Стрэльбу хацелі забраць таксама, але ў час схаваў.

Прадчувалі: паляваньне будзе няўдалае -- занадта разгуляліся нэрвы. Ляжалі на сене доўга моўчкі. Нейдзе каля варот цвыркаў казельчык. У багнах каля Птычы трубіў бугай...

-- От як яно закруцілася! -- з роспаччу прамовіў кампаньён. -- Ніколі ня думаў, што гэтакімі тэмпамі і з гэтакім гвалтам над народам будзе яно рабіцца!

-- Але азірніцеся, хто гэтым закручвае! Вясковыя люмпэны -- прадукт палітыкі 1861 году, якіх трохполка й цераспалосіца парабіла жабракамі...

--Але-ж партыя!?

-- А партыі гэта на руку, бо зайшлі ў сьляпы завулак, а салодкі пірог улады нікому ня хочацца выпускаць із рук...

* * *

Ня ладзілася з паляваньнем...

Змрочныя думкі дужа абцяжарвалі сьведамасьць. Выйшлі на грудок, дзе заўсёды адпачывалі. Селі на сухі мох пад тым-жа разгалістым дубам. Моўчкі пазіралі ў пахмурнае неба. Урэшце кампаньён, якому, відаць, карцела выліць сваю жоўць, заўважыў:

-- Аднаго не магу зразумець: Троцкага зрабілі ворагам і выкінулі за мяжу, а тэорыю ягоную прынялі? Гэта-ж ягоная прапанова: калектывізаваць сельскую гаспадарку! У мэту ўваходзіла атрымаць поўны кантроль над сельскім гаспадаром і выпампаваць ад яго ўсё, ператварыць яго ў пралетара; па сутнасьці, гэта ёсьць прыхаваная хворма заняволеньня сялянства. Ненавідзеў яго Троцкі, баяўся яго, не давяраў, бо меў зь ім шмат клопатаў у часы хатняй вайны на Ўкраіне, на Беларусі, на Тамбоўшчыне і ў Закаўказьзі!..

-- Цёмная гэта справа з Троцкім! Адзін зь іх, хто разумеў вёску, гэта Бухарын: ён стаяў не на абдзіраньні селяніна, а на ягоным узбагачэньні, на падцягваньні бедняка да ўзроўню заможніка й навет урастаньні кулака ў сацыялізм...

16

-- Бухарын, здаецца, яшчэ не скапітуляваў?

-- Не заносіцца на тое, каб ён выйграў: партыя засьмечана, з аднаго боку, прыхільнікамі Троцкага, а з другога, -- кар'ерыстамі, эгацэнтрыкамі й, вобразна кажучы, проста «плескачамі», якія здольны толькі на адно: пляскаць у далоні кожнаму, хто прамаўляе з трыбуны ЦК, якую-б ён бязглузьдзіцу не гаварыў... Троцкі вельмі добра разумеў, што па дзесяці гадох панаваньня партыі няма каго ўжо больш абдзіраць, -- гэта зусім правідлова! Але і ён не хацеў выпускаць пірог улады із рук...

Пачаўся невялікі, але густы й няпрыемны дождж. Неба стала мутным і студзёным. Нейдзе ў ім ляцелі на паўдня журавы.

-- Пакідаюць ужо бацькаўшчыну нашы ганаровыя птахі! Каб я мог ляцець зь імі!

Потым, падумаўшы:

-- Можна лічыць паляваньне скончаным! І ня толькі на сёньня, але наагул: цераз два-тры гады пасьля калектывізацыі галодныя людзі натоўпам пойдуць да рэчак і вазёраў, на лугі ў лясы і вынішчаць усё жывое, чым можна напхаць страўнік; можна насмараваць нашы стрэльбы й схаваць іх надалей, чакаючы на лепшыя часы...

-- Але ці прыйдуць гэтыя лепшыя часы?

Кампаньён паціснуў плячыма.

Вярнуліся да Ігната падзякаваць за начлег. Ён сядзеў на калодах у двары і ладзіў сваю рыбацкую снасьць.

-- От, як-небудзь будзем перабівацца: рыбкай, грыбком, арэшкамі, ягадкамі -- лес нам заўсёды даваў ратунак у ліхую гадзіну!

-- Не бярыце ўсё гэта так блізка да сэрца! Памятайце нашага прарока Янку Купалу:

Хай-жа вам так не здаецца,
Што бяда ужо й зацісьне.
Знайце, ліха ператрэцца,
І маланкай доля блісьне...

Нью-Ёрк, 1962-1972

17

У імя догмы

Раскажу я вам, мае сябры, адну гісторыю -- лёс аднае сям'і. Гэтая гісторыя кожнаму із вас, можа быць, нагадае не адну такую-ж гісторыю, у якой, так ці інакш, былі закранутыя вашыя блізкія -- сваякі або сябры.

Жыў у нас на засьценку чалавек. Жыў сабе проста, гаспадаркі вялікай ня меў: шэсьць дзесяцінаў зямлі, добры конь, са тры каровы, авечкі, сьвіньні ды іншае. Адно, што можна пра яго сказаць як пра гаспадара -- быў бязьмерна працавіты, ну, і хлеба не пазычаў, а меў такі-сякі лішак, так што адна дачка ягоная навет і ў гімназыі вучылася.

Раптам (гэта было ў пачатку трыццатых гадоў) заходзіць да яго, і якраз у часе сьняданьня, старшыня сельсавету Хвёдарка Скураток, ведаеце, можа, яго? Да гэтага самага Кастрычніка вясельлі ўсё па вёсках граў, бо на скрыпачцы ўмеў траха пілікаць. А зь ім заходзіць і сакратар партыйнай ячэйкі Янук Бізун, асоба таксама выдатная: картыга, выпівоха, хабарнік; у дзевятнаццатым папоў усё «расстрыгаў». Заходзяць, ні слова ні кажучы, садзяцца. Няёмка неяк Богушу -- так звалі таго гаспадара -- запрасіць-бы да стала, дык страва занадта штодзённая, яшчэ пакрыўдуюць: «Іш чым частаваць наважыў, куляшом нейкім, быццам яечні няма з чаго ўпячы!» Пачаць рыхтаваць што-якое іншае, дык, можа, сьпяшаюцца куды?

Урэшце Богуш пытаецца:

-- У справе якой ці, можа, так сабе наведаць прыйшлі?

-- У справе, а як-жа, будзем хадзіць у гэты час «так сабе», -- а самі сьмяюцца.

-- А ў якой такой справе, калі не сакрэт? -- цікавіцца Богуш.

-- Ты ня прыкідвайся дурной авечкай! -- адказвае больш языкасты Янук. -- Табе павінна быць ужо ўсё ведама...

-- Бог з вамі! Каб мне было што ведама, дык хіба я пытаўся-б? От крыж, што мне нічога такога ня ведама. Пра што вы кажаце?

-- Ты падаткі заплаціў?

А трэба сказаць, што Богуш быў у гэтым вельмі рупны. Бывала, з нас хто-небудзь упрэцца, дык і то Богуш будзе казаць: «Як-жа, падаткі плаціць трэба: і на школу, і на дарогі, і на бальніцы, і на паліцыю (ніяк ня мог прызвычаіцца казаць "міліцыю"), бо паліцыя

парадак беражэ...» Якое-ж было яго зьдзіўленьне, калі ён пачуў пра падатак!

-- Ці вы жартуеце, ці проста пазьдзеквацца прыйшлі?

-- Зусім не жартуем: апісаць тваю гаспадарку прыйшлі!

Тут Богуш сапраўды разгубіўся. Гаспадыня яму шэпча: «Квіты! Квіты пакажы ім, вунь там за абразамі тырчаць!» А Богуш, як аслупянелы, стаіць сярод хаты. Урэшце пытаецца:

-- А паперы ад вышэйшых уладаў у вас ёсьць на тое апісаньне? -- думаў, пэўна, спалохаць іх гэтым.

Скураток, праўда, дастаў із свайго брызэнтавага партфэлю паперку й пачаў яе чытаць: «Гаспадарка Богуша Макара, якая ў мінулым выкарыстоўвала наймовую працу і як не плаціўшая падаткаў, пастановай сельсавету апісваецца з мэтай абкладаньня індывідуальным...»

Паклаў паперку ў партфэль й сказаў:

-- Зразумеў? А цяперака пастаў тутака свой подпіс, і калі не аплоціш гэты індывідуальны да наступнага панядзелка, дык усё тваё будзе сканфіскавана, а сам ты паедзеш туды, дзе Макар ніколі цялят ня пасьвіў... -- і гучна зарагатаў.

Якое гора ахапіла ўсю Богушаву сям'ю, калі Скураток ізь Януком пакінулі хату. Каб у Богуша былі грошы, дык ён, магчыма, тым ці іншым шляхам пакіраваў-бы гэтую справу ў іншы бок. А то ў кішэні ў чалавека нічога: адно чырвонец нейдзе валяўся, які некалі прыслала дачка Раінка. Прадаць што-колечы, дык дзе-ж патрапіш у гэтакі кароткі час, дый што прадасі на гэтакія вялікія грошы?

Страшэнная ноч была тая для Богушавых. Сынок Юльяш, такі здатны хлапчук, каб нічога ня чуць і ня бачыць, закруціўся ў коўдру, трасецца ды плача. Раптам -- грукат у шыбу. Тут усе й памлелі. А маці стала на калені, склала рукі на грудзях ды моліцца:

-- Ойча, зь неба Божа, ізжалься над намі!..

І тады толькі падышла да вакна. Бразгат паўтарыўся.

-- Каго там Бог нясе?

-- Свае, адчыніце!

Якая радасьць ахапіла ўсіх, пачуўшы голас Зенькі. Юльяш выскачыў з-пад коўдры, пабег адчыняць. З грукатам адсунуў засаўку.

-- Заходзьце, дзядзька Зенька!

19

Празь сьветлую пляму адчыненых дзьвярэй у хату ўсунулася няскладная постаць Зенькі.

-- Што гэта вы сёньня гэтак рана замкнуліся?

Гаспадыня зараз-жа залемантавала:

-- Зенечка, родненькі, скажы, што на сьвеце чуваць? Усё-ткі ты больш за нас мусіш ведаць! (У Зенькавай хаце за пераборкай была канцылярыя таго сельсавету).

-- Ды нічога добрага! -- пачаў той. -- Адно зьдзекі з народу нашага: былі нацдэмы -- вучняў забіралі ў турмы, а цяперака кулакі -- высылкі ў сібірскую немарач...

Раптам з палацяў пачуўся крык Богуша ды такі страшэнны, вяр'яцкі нейкі, што ўсе ў хаце аж памлелі.

-- Гэта яны... гэта яны... ідуць... ідуць!..

-- Богуш! Богуш, апамятайся! -- паклікала ўстрывожаная гаспадыня.

Богуш прачнуўся, сеў на палацях і, азіраючыся, загаманіў ужо спакайней.

-- О ты, Божа! Сон... ды такі страшны! Ніколі, здаецца, такога страшнага ня сьніў. Здаецца, я адзін у полі. І чорная, чорная хмара завісла пад небам. І здаецца, крукі круцяцца, круцяцца нада мной... Сотні іх! Ага, сотні! А я галодны й зусім зьнясілены, навет кропелькі вады ня было ў роце... І ледзьве дыхаю я. А яны ўсё круцяцца, круцяцца ды ўсё бліжай, бліжай! А ў мяне голыя рукі. І зь кіпцюрамі, усё зь кіпцюрамі да мяне! А вочы іхныя прагныя, крывяжэрныя! Божа ты мой! Я ўсё вочы плюшчу, плюшчу, каб ня дацца ім. Хочу махнуць рукою, рука не паварочваецца, крыкнуць -- язык анямеў, так аслаб, мусіць, я! А яны ўжо і да вачэй дабіраюцца -- выдзяўбці мне вочы хочуць!..

-- Крукі, кажаш? -- пытаецца Богушыха.

-- Ага, крукі! -- адказвае, усё яшчэ пад уплывам сну, гаспадар.

-- Крукі -- то нашы ворагі, -- заключае гаспадыня. -- То яны круцяцца над намі... Хочуць нашае крыві! Сьвятая царыца маці, выратуй нас!

-- Што вырабляюць?! -- раптам заўважае Зенька. -- Надысь дык завязалі дзьверы знадворку ў хаце Міхалкі, каб ня мог даць па галаве -- ведаеце Міхалкаў нораў, -- ды вывелі карову, быццам ён падатак не заплаціў... А ўчора дык у Аўдолі кублы трасьлі, і што

там трэсьці ў яе, каб іх трасца трэсла! Бачыце, бедная ўдава адгукнулася пра калгасы нядобра!?

-- Няўжо пра гэта дзе-небудзь вышэй ня ведаюць?

-- Мо’ й ведаюць -- адна хэўра!

-- Зладзюга Янук усім гэтым верхаводзіць. Выгадавала маці сынка на гора людское! Тады, як яшчэ падлеткам быў ды сала ўкраў у Аўдолі, каб выдалі ўладзе, дык мо’ цяпер людзі дзякуй сказалі-б...

-- Здаецца, і да вас сёньня ўраньні заходзілі? -- цікавіцца Зенька.

Богушыха пацьвердзіла, што заходзілі, -- Янук і Хвёдарка.

Тады Зенька пачаў апавядаць, як, вярнуўшыся ад Богушавых і паклікаўшы з крамы спажывецкага таварыства Гарэліка -- трэцяга члена бюро ячэйкі, яны пра невашта доўга спрачаліся. Пра што была гутарка, праз пераборку ня ўцяміць, але Янук усё крычаў на Хвёдарку: «Што ты зь імі цацкаешся!? Дырэктыва партыі... Правая палітыка... Ліквідаваць як клясу...» Якая тутака правая палітыка, калі яна зусім ня правая! -- скончыў Зенька. -- Па-мойму, дык яна хвальшывая!

-- Тваёй абароне аддаемся, сьвятая Божая Маці, -- шаптала Богушыха ў кутку каля ложка.

-- І гэтак штовечар: гавораць, гавораць... -- працягвае Зенька. -- І як языкі не забаляць?

-- Дык-жа за гэта грошы маюць! -- устаўляе Богушыха.

-- Пра адно буду прасіць цябе, Зенька, -- умяшаўся ўрэшце Богуш. -- Калі што-якое здарыцца із намі, дык паведамі Раінку, -- усё-ткі настаўніца яна, можа, хоць дзяцей выратуе!

-- А я вам скажу: людзі самі ў пекла лезуць, -- разважае Зенька. -- Гэта, як я ўспамінаю, пачалося ад тае першае пачкі, што папісаліся ў гэты самы хаўрус. Было іх няшмат -- усяго дзевяць чалавек на сельсавет, але імі цяпер казыраюць, хоць і есьці ў іх няма чаго. «Народ, маўляў, прэ-эць у калгасы!» Ну, а хіба захочуць запытацца ў кожнага па добрай волі? Іхная-ж тут карысьць: будуць сядзець на карку агулу ды гарэлку смактаць...

Зенька пайшоў, а тое, што ён сказаў, яшчэ доўга мянтэжыла Богушавых.

-- Я так і ведаў, што ўсё гэта Янук капае на нас, -- заўважыў Богуш. -- Ня дай, Божа, сьвіньні рогі! -- зірнуў праз вакно на вуліцу, дзе нехта прайшоў з цыгаркай. -- Проста ўтварылася хэўра злачынцаў і зьдзекваюцца зь людзей...

21

-- Схадзіў-бы ты да Сукеніка, усё-ткі ён начальнік тутака, у павеце.

-- Няма цяперака ніякіх паветаў, -- запярэчыў Богуш. -- Раёны ўсюды.

-- Ну, дык у раён. Мо’ яшчэ не забыўся, як і мы ня цураліся яго.

-- Так ісьці няма чаго: трэба ўсё гэта на паперы выкласьці.

-- Можа Юльяш змог-бы?

-- Не пад сілу яму яшчэ! Раіна -- тая магла-б. Але пакуль да яе дабярэшся...

Наважылі: заўтра ўраньні ісьці да Мікітавага сына, вучня сярэдняй школы, ды прасіць, каб ён склаў заяву, а тады ўжо ў тэй раён, можа, яшчэ пасьпеем добра падцерці нос гэтаму зладзюгу Януку! Разважыўшы гэтак, яны навет крыху павесялелі. Але назаўтрае ўраньні па засьценку разьнесьліся чуткі, што на вуліцы, каля былой карчмы, ляжыць няжывы Хвёдарка Скураток. Да Богушавых першай прыбегла із гэтай навінай тая-ж Аўдоля Бабок.

-- А вы тутака сядзіцё й нічога ня бачыце й ня чуеце: гэта-ж Скураток няжывым пад плотам знойдзены!

Богуш спачатку неяк нібы узрадаваўся, а потым падумаў: ото ліха! Яшчэ да мяне прычэпяцца!

Тым часам пайшлі паглядзець: праўда, ляжыць у гразі, рукі раскінуў, быццам лёг адпачыць пасьля цяжкое працы. Нагой упёрся ў плот, і ў кулаку корак ад бутэлькі з гарэлкай трымае.

На целе Скуратка ня было нічога такога, што паказвала-б на сьмерць ад забойства ці іншага якога-колечы гвалту, тым ня менш, прыехаў унезабаве прадстаўнік ДПУ з карагодам міліцыянэраў і з вышуковым сабакам і распачаў вышук. Зэфір абнюхаў Хвёдаркаву куртку, лізнуў ягоны пасінелы твар, якраз каля самага роту, зь якога яшчэ сьмярдзела гарай, брахнуў разы са два ды, адбегшыся крокаў на колькі, падняў нагу на плот.

-- Расьпісаўся! -- заўважыў нехта з натоўпу праз агульны рогат.

Прыехаў на райкомаўскай машыне й Сукенік, а ўнезабаве й пракурор. Прывезьлі із сабой і спэцкора ад цэнтральнай газэты. Спачатку яны цікавіліся толькі справай Скуратка, але хутка пачалі «выкрываць» злосных неплацельшчыкаў падаткаў, кулакоў і іншых парушальнікаў савецкіх парадкаў. А назаўтрае ў газэце зьявілася цэлая бачына, прысьвечаная «барацзьбіту за лепшую будучыню

чалавецтва, Хвёдарку Скуратку, загінуўшаму ад рук кулакоў і іхнае агентуры на сваім пасту...»

-- Божа мой, колькі нагаворана! -- заўважыў настаўнік нашае школы. -- Калі ён і быў барацьбітом, дык толькі за бутэльку гары...

Нататка канчалася: «Мы ведаем, хто зрабіў гэтую справу! Мы ведаем і натхніцеляў забойства, тых, хто сунуў зброю ў рукі забойцы! Сьмерць кулакам і іхным агентам -- *беларускім нацдэмам*!»

-- Во і зброя ўжо найшлася!

-- А ты думаў як?

-- Акалеў чалавек пад плотам, хапіўшы празь меру...

-- Акалеў ці не акалеў, але цяперака, браце, пільнуйся!

Але Богуш іначай думаў: дзякуй Богу, зоймуцца гэтай бруднай справай, дык мо' й пра нас забудуць. Толькі ўспамінак пра беларускіх нацдэмаў дужа яго непакоіў: шмат знаёмых дачкі Раіны яшчэ раней пазабіралі як нацдэмаў. Ды яна й сама пісала некалі вершыкі. «Патрэбны ёй гэтыя цыдулькі!? Ня той час, каб песьні пяяць! Дзе ейныя гэтыя сшыткі?» Адчыніў сундучок, дзе яшчэ хаваліся студэнцкія працы Раіны. Пажоўклыя бачыны сшытка, перакладзеныя сухімі галінкамі незабудак, бэзу і іншых кветак, якія нагадвалі-б Раіне не адну вясну ейнага жыцьця, дрыжэлі ў нязграбных рукох усхваляванага хлебароба. «Адны толькі прыкрасьці ад гэтых вершыкаў! Вунь колькі людзей пазабіралі!» Асьцярожна згарнуў сшыткі да купы і нейдзе схаваў, падалей ад вачэй людскіх.

Водгук настаўніка аб Скуратку дайшоў і да Богушавых. Богушыха сказала:

-- Пагаманіў-бы ты, стары, з настаўнікам! Усё-ткі ён адукаваны ды з Раінай некалі сябраваў...

Калі сьцямнела, Богуш па агародах дабраўся да школы і ціха пастукаў пальцам па шыбе. Настаўнік адхіліў фіранку й пазнаў Богуша.

-- Заходзьце! -- кіўнуў галавой. Выйшаў у калідор адчыніць дзьверы.

-- Што вас прыгнала так позна да мяне?

Богуш убачыў крэсла й сеў -- дух занімала ў яго.

-- Скажыце, што-ж гэта робіцца? -- і пачаў апавядаць сваю бяду.

-- Можаце не казаць -- усё ведама...

23

-- Але што-ж гэта такое? Дзеля чаго? Зь якой мэтай?

Настаўнік прайшоўся па пакою, стаў перад Богушам, паклаўшы рукі ў кішэні. Задумаўся.

-- Я баюся, што вы мяне не зразумееце, -- заўважыў.

-- Пастараюся. Кажыце!

-- Перш-наперш: што гэта такое? Тэрор! Зьдзек прайдзісьветаў з сумленных людзей. Другое: дзеля чаго? Каб умацаваць сваё хісткае становішча, бо апынуліся ў сьляпым завулку...

-- Для мяне не зразумела, як можна ўмацаваць сваё становішча, рабуючы народ?

-- Справа вось у чым: існуе догма, што сацыялізм, а тым больш камунізм, адкідае ўсялякую хворму прыватнай уласнасьці. Усё павінна быць нічыім, агульным...

-- Не разумею! Як гэта нічыім, агульным!? Нехта-ж мусіць сачыць за парадкам. Раскрадуць! І хто-ж тады стане дбаць пра што-кольвек, калі ўсё нічыё?

-- От-жа гэтыя самыя Хвёдаркі ды Янукі...

-- Дык-жа ня будзе чаго ўжо рабаваць!

-- А цяпер дзеля якой мэты? Бачыце, гэтую догму выпрацаваў Карла Маркс...

-- Каб ён здох той Макс...

-- Ды ён ужо даўно ў магіле, -- усьміхнуўся настаўнік. -- Але паводле гэтае догмы, сацыялізм і камунізм прышчэпяцца толькі ў высака індустрыяльных краінах...

-- Разумею...

-- Дзе амаль усе людзі работнікі, а ня ўласьнікі. Тым часам, Расея ня ёсьць высака індустрыяльная, а якраз адсталая. Вось-жа ў імя гэтае догмы й робіцца ўсё гэта: перш-наперш, атабраць у людзей усякую ўласнасьць, заняволіць іх і панаваць, бо іначай трэба адмовіцца ад улады...

-- Улада, праўда, спакушае, і чым больш улады, тым больш зла... І я цяпер бачу, што усё тое, што гаварылася раней і гаворыцца цяпер ад імя савецкае ўлады, ёсьць проста брахня, ашуканства!

-- Як хочаце назавіце...

-- Але ў мяне тутака іншае пытаньне: людзі ўсьцяж гарнуліся ад горшага да лепшага, а цяпер, выходзіць, наадварот, трэба гарнуцца ад лепшага да горшага... Канец сьвету надыходзіць, ці што?!

24

Настаўнік быў даўно пад падозраньнем, і пасьля справы Скуратка яго арыштавалі. Але Богуша, як ён і меркаваў, ня краталі. Ён ужо й зусім павесялеў. «От, дзякаваць Богу, як той казаў: бяз зла ня бывае дабра...»

І раптам прыбегла ад Зенькі дзяўчына.

-- Тата казаў, каб вы ведалі...

Гаспадар і гаспадыня кінуліся тое-сёе хаваць, але было ўжо запозна: каля дзьвярэй зьявіліся Янук, Юзік і сам Сукенік, галава раёну.

-- Ну, усё скончана! -- толькі і мог вымавіць Богуш. -- Ідуць вязаць! І бязуладна апусьціўся на лаўку. Раптам пацягнуўся рукой да сякеры, якая тырчэла перад вачыма за лаўкай. «Я-ж вас, нягоднікаў!» -- прамовіў, сашчэрыўшы зубы. Богушыха да яго:

-- Ня губі дзяцей! Ня губі дзяцей! -- і засланіла сабой сякеру.

Богуш застагнаў, пазіраючы наўкола.

Калі ў хату ўвайшлі ўсе ўтрох, Богушыха заўважыла:

-- Дзяжу падымаў мой стары, дык засопся...

Сукенік, як стары знаёмы (раней скупляў па вёсках лён, ільняное семя, шчаціньне), цынічна прамовіў:

-- Ну, як маешся, старэча? (Добра ўмеў размаўляць па-нашаму).

-- Якая справа вас прынесла да нас? -- не хаваючы злосьці, з натугай прамовіў Богуш.

-- Усялякія справы бываюць -- і прыемныя й няпрыемныя, -- адказаў лагодна. -- Так ужо павялося на сьвеце... Але трэба-ж неяк жыць!? Цяпер у нас справа няпрыемная...

Адчыніў свой тоўсты партфэль і пачаў павольна застругваць аловак. Потым паклаў на стол аркуш паперы. Убачыў на шасьце вязанкі цыбулі й давай гаманіць пра цыбулю. «Якая яна ў вас добрая! І дзе яна такая расла? Цяпер на рынку нічога ня купіш, хоць зубы кладзі на паліцу. Як ты думаеш, Макар, хто ў гэтым павінен?» Янук і Юзік рагаталі. «Ну, досыць! На басьнях далёка не заедзеш». І пачаў чытаць паперу, водзячы алоўкам па радкох. У ёй і быў лёс Богушавых. Цэлая куча розных злачынстваў, пра якія Богуш, каб не пачуў ад Сукеніка, так і ня ведаў-бы аж да самай сьмерці. Пасьля, спаслаўшыся на рэзалюцыі пленумаў і зьездаў, заключыў:

-- Пазбаўляецца ўсяе маёмасьці... Падлягае высылцы... Дазваляецца ўзяць із сабой толькі тое, што можна панесьці з сваёй сям'ёй...

25

Богуш, зьбялелы, цяжка дыхаючы, сядзеў нярухома. Юльяш і Агатка ўголас заплакалі.

-- А дзеткі, а родныя, а нашто-ж я вас парадзіла! -- залемантавала Богушыха.

І тады раптам Богуш зноў ірвануўся да сякеры, але Янук загарадзіў яму дарогу.

-- Куды, шалапут!

Некаторы час Богуш глядзеў на яго налітымі крывёй вачыма. Але пасьля неяк скурчыўся, зьмізарнеў і асеў...

* * *

Зенька ўсё падрыхтаваў. Як толькі зьявіўся Юльяш, яны селі й паехалі... За засьценкам адразу пачынаўся лес. У ім было так ціха й прыгожа! Мяккі сьнег камамі ляжаў на лапніку хвояў і лашчыў позірк. Але на сэрцы дзіцяці быў смутак: мо' ў гэты час памірае бацька? Мо' яго забівае Янук? Мо' над заплаканай маці стаіць з палкай Юзік? Мо' ўжо і Агатку забіваюць? Хай-бы лепш заставаўся пры іх! Хай-бы ўсіх разам, калі гэтакі наш лёс! Хай бяз лішніх мукаў -- у адну магілу! А Раіна-б паплакала... паплакала... ды нічога... было-б лягчэй, чым бачыць сваімі вачыма... А потым і забылася-б... забылася-б...

-- Та-та! Ма-ма, дзе вы? -- вырвалася раптам у малога скрозь сон.

-- Але-ж трэба паведаміць Раіну, -- сказаў Зенька. -- Ты, можа, хочаш заснуць? Дык загарніся ў кажух ды засьні!

Раіна яшчэ ня спала. Сэрцам чула бяду: хадзіла па пакою, хвалявалася, журбавала. «Як яны там цяперака? У газэтах усё пішуць аб наступе на прыватны сэктар у вёсцы, аб беларускіх нацдэмах, аб апартуністых, левых і правых, аб трацкістых, прышчэпаўцах... Дзе падзеліся тыя героі, што рабілі рэвалюцыю? Толькі адзін ён -- ён нягрэшны, сьвяты, чысты, як дыямэнт; ён усё ведае, усё прадбачвае, а ўсе іншыя, увесь народ -- гэта нішто, авечкі, быдла... Як-жа тады жыць? Як жыць, калі няма пра што думаць, калі ён за ўсіх думае, а ты ня маеш правоў думаць, і для цябе гэта рызыкоўна; табе толькі застаецца ўсё насіць ў сваім сэрцы, пакутваць, хвалявацца, мучыцца за ўсё і за ўсіх, блізкіх і далёкіх, за ўсіх, за ўсіх!.. Божачкі, як гэта ўсё цяжка, здаецца, лепш памерці-б, адысьці, куды ўсе ўрэшце адыходзяць... От толькі іх, іх бясконца

шкада... бясконца... Яны клапаціліся, яны думалі даць мне добрую будучыню, рупіліся, дбалі, а цяпер? А цяпер яны для мяне -- стрэмка ў сэрцы! Калі зь імі, ня дай Божа, што-небудзь... лепш заплюшчыць... заплюшчыць вочы назаўсёды... Ён -- упыр! Крывяжэрная пачвара...» Зірнула на ягоны партрэт. «Божачкі, Божачкі, што я кажу? Гэта-ж, гэта-ж, Божа мой!» Падышла да вакна, прыслухалася, хоць добра ведала, што не прамовіла ніводнага гуку, а толькі размаўляла із сваім сэрцам. «Але-ж ці яны кулакі? Божачкі, Божачкі, як страшна стала жыць!..»

За вакном быццам-бы зарыпеў пад нейчымі нагамі сьнег. Устрапянулася ўсім целам, прынатужыла слых, замерла. Але-ж ніхто і нічога пачуць ня мог, бо нічога ня было прамоўлена. А калі возьмуць... Скажаш і тое, чаго ніколі ня было... ня было сказана й ня было зроблена. Адчула холад па ўсёй сьпіне. Намерылася пайсьці ўзяць хустку і прыкрыцца ёю. І ў гэты час пачула нейкі шорах за вакном. Мабыць, вецер. Гэтак часта бывае: шорах ветру за вакном у стрэхах прымеш за рух жывой істоты, калі напружаны нэрвы. Але цяпер ужо выразна пачуліся крокі. Страх зноў скаваў усю істоту, і адначасна нібы радасьць мільганула ў душы, што нехта жывы ёсьць паблізу, што яна не адна і калі што, дык усё-ж такі... усё-ж такі нехта жывы!.. Прыклалася да сьцяны вухам і ў той-жа час пачула голас Юльяша:

-- Раіна, адчыні!

«Юльяш, чаму? -- падумала. -- І чаму так позна? Пэўна, здалося ад напружаньня нэрваў». Але зноў пачулася:

-- Раіна, Раіна, адчыні!

Трызьніцца! Трызьніцца, да чаго дайшла! Хапілася за галаву й пачала церці скроні. Але зноў, ужо гучней:

-- Ты ня сьпіш, Раіна. Праз шчыліны ў вакяніцы відаць сьвятло з твайго пакою. Адчыні, гэта я, Юльяш...

І ён уголас заплакаў. І тады Раіна з усёй сілы кінулася да дзьвярэй, штурханула далоньню засаўку і адчыніла зусім напята дзьверы. Выскачыла на ганак, абхапіла Юльяша за шыю, прыліпла да яго і пачала абсыпаць сястрычнымі пацалункамі.

-- Што здарылася? Што здарылася? -- сьпяшалася хутчэй дазнацца.

-- А нічога, -- няўпэўнена, сьціраючы з вачэй сьлёзы і кідаючы позіркам на Зеньку, казаў Юльяш.

27

Гэта яе на нейкі мамэнт як-бы супакоіла. Пачала сьцягваць зь Юльяша сьвітку. Меркавала: пэўна, выпадкова, куды-небудзь едучы... Можа, па доктара ці за лекамі якімі, бо там-жа ў іх нічога ня знойдзеш. Павесіла вопратку, потым зноў:

-- Не, вы хлусіце! Скажыце, вы хлусіце? Нешта здарылася? Па доктара едзеце? Ага, маўчыцё! -- і гістэрычна, скрозь сьлёзы, засьмяялася.

Юльяш закрыў далонямі твар і зачмыхаў носам, ня маючы сілы паўстрымацца. Тады загаласіла і Раіна.

-- Я ведаю, нешта здарылася. Цяжкое, надзвычайнае. Мабыць, у сувязі з забойствам Скуратка? (Яна ўжо ведала пра гэта з газэтаў). Божа, што ў вас там робіцца?

Разгублена замітусілася па пакою.

-- Зь якім забойствам? -- адказаў Зенька. -- Хто яго тамака забіваў? Проста акалеў п'янюга пад плотам, перабраўшы меру.

Ён сьпяшаўся расказаць:

-- Увесь вечар утрох: Скураток, Юзік і Янук пілі ў мяне за перагародкай. Пасьля выйшлі ўсе, абняўшыся. Ну, і паваліўся і акалеў на марозе...

-- Божа, Божа, і чаму ў вас гэтакае здарылася? Цяпер вас не пашкадуюць... Прычэпяцца...

-- Ды яно так, абы прычапка...

-- Забралі каго... у вязьніцу?

-- Забралі -- не забралі, проста зганяюць зь мейсца, а куды -- невядома.

-- Ага, высылаюць, значыць!

Зенька маўчаў. Юльяш зноў загаласіў. Раіна прытулілася да яго, пытаючыся:

-- Юльяш, браток, скажы праўду: тату й маму высылаюць?

Юльяш хацеў нешта сказаць, але ня мог, кіўнуў толькі галавой. Раіна зьбялела і абамлелая павалілася на падлогу. Зенька падскочыў да яе, пачаў пляскаць па шчоках. Загадаў Юльяшу зачэрпнуць вады. Пачаў пырскаць ёй на твар. Потым пасадзіў яе на крэсла, падтрымліваючы, каб не павалілася зноў.

-- Глыні крыху вады!

Паднёс да роту крынку і гвалтам уліў ёй глыток вільгаці. Цяжка дыхаючы, Раіна адплюшчыла вочы.

-- Каб колькі кропляў валяр'янкі!

Паказала рукой на столік.

Пасьля кропель адчула сябе лепей.

-- Трымайся, дзяўчына! -- сказаў Зенька. -- Цяпер такі час, што ў кожнага што-небудзь няладна! А ты мусіш выратаваць дзяцей -- безь цябе загінуць! Не маленькая, разумееш! Вазьмі сваё сэрца ў кулак і скажы яму, каб яно маўчала. Людзей цяпер не шкадуюць. Іх валяць, як той лес! Хочаш -- ня хочаш, кладзіся пад сякеру! Газэта табе гэтага ня скажа, але ўсе добра ведаюць гэта. Ці ты чытала што-кольвек пра Матошку? Зь дзевятнаццаці двароў застаўся цэлым толькі адзін: васямнаццаць *вылюднены*, павысланы, зьнішчаны. І старых і малых -- усіх разам! Трымайся, ты мусіш выратаваць Юльяша і Агатку. Толькі ты адна можаш гэта зрабіць. Той, ад каго гэта залежа, і ў вус не падзьме, як яны будуць замярзаць...

-- Мамачка, татачка, што-ж із вамі будзе?

-- Трымайся, дзяўчо! Апраніся цяплей, мы едзем, бо час не чакае. Не паедзеш-жа так, як стаіш?

-- Маё сэрца чула... Маё сэрца чула... -- стагнала, апранаючыся.

-- Ды, калі праўду казаць, і нам тутака, хто застанецца, ня соладка будзе. У калгас загоняць. Зямлю і ўсё дабро адбяруць. І будуць сядзець на шыі розныя Скураткі, Юзікі ды Сукенікі, як тыя вошы!.. Ім што? Такі ўжо цяпер сьвет пайшоў... Я просты чалавек, газэтаў ня чытаю, але бачу, пакоцяцца гэныя парадкі па ўсяму сьвету...

У дарозе Раіна ўвесь час паўтарала:

-- А ці мама хоць цёпла надзелася? А ці ім дадуць што-небудзь узяць ізь ежы? Ці ім сказалі, куды іх павязуць?

-- Куды? Ясна -- куды, у Сыбэрыю тую -- угноена яна чалавечымі касьцямі за сотню з гакам год!

-- А родненькія мае! А даражэнькія! А ці ўбачу я вас яшчэ калі? А мамачка! А татачка!

* * *

Як толькі Юльяш пакінуў хату, пабегшы да Зенькі, пачаўся ўзаконены вышэйшымі савецкімі ўладамі працэс *рабаваньня*, які афіцыйна называўся *раскулачваньнем*. Перш-наперш на сярэдзіну хаты выцягнулі куфар гаспадыні. Усё, што было ў ім, апынулася на падлозе. Трубкі палатна кужэльнага, белага, як сьнег, -- праца рук Богушыхі, -- вышываныя ручнікі, бялізна, верхняя вопратка...

Новыя, яшчэ не апранатыя кажухі і суконныя каштоўныя рэчы былі адкладзены асобна, мабыць, для сябе. Грошы, якія гаспадыня ўзяла за ягады, што назьбірала ўлетку Агатка, аднекуль высыпаліся на падлогу. Янук і Сукенік не паўстрымаліся, каб не пазьбіраць іх у свае кішэні. Пасьля ўзяліся за гаспадароў сундучок. Калі ўзьнялі вечка, на дне, сярод усякае дробязі, убачылі невялікі плецены кошык. Адчынілі: ляжалі шматкі рознай матэрыі, напарсткі, нажнічкі, эпалеты з двума «лычкамі» (рэліквія з часоў Богушавае службы ў войску), а на самым нізе, беражна загорнуты ў эластычную паперу, партрэт гаспадара й гаспадыні, як яны стаялі пад вянцом. Сукенік усьміхнуўся, а Янук брыдка вылаяўся і кінуў картку пад ногі. Але два срэбныя пярсьцёнкі і два такіх самых крыжыкі, за якія тое-сёе можна было набыць у «Таргсіне», падзялілі паміж сабой...

Пакуль Янук і Сукенік «гаспадарылі» ў хаце, трымаючы здранцьвелага Богуша і амаль ужо няпрытомную Богушыху за пераборкай, каб яны ня бачылі, што робіцца зь іхнай працай, Юзік гаспадарыў у каморцы, дзе стаяла ў кубельцы сала, віселі пад стольлю шынкі й каўбасы, і ў слоіках ды макітрах ляжала масла ды сыры. Твар ягоны быў ужо ў тлушчах, а пальцы й рукавы сьвіткі ў сьмятане. Калі Сукенік і Янук заглянулі ў каморку, ён зайздрасна прасіпеў:

-- Ежце! Ежце, ліханька! Поўны кубелец сала -- ды якое!? Панюхайце толькі!

Зарагатаў, абціраючы аб валасы рукі.

-- Ото была-б масьленіца для Хвёдаркі, каб быў жыў...

* * *

Усіх выгнанцаў гуртам пагналі да чыгункі для пагрузкі на цягнік. Але вагонаў яшчэ ня было. Начальнік канвою, камандзір войскаў ДПУ, у новенькай, зь іголачкі, хворме, загадаў фурманкам стаць шнурам каля прысадаў станцыі. Некалькі чырвонаармейцаў, таксама з войскаў ДПУ, у цёплых шапках і новенькіх валёнках і кажухох, з аўтаматамі за плячыма, шпацыравалі ўзад і ўперад па шнуру. Для разьвітаньня з выгнанцамі іхным сваяком і знаёмым начальнік канвою «вялікадушна» дазволіў гадзіну.

Вазок Богушавых стаяў першым ад краю. Раіна і Юльяш убачылі яго адразу. Накрытая кажухом Богушыха ляжала, а ля яе,

маленькім камочкам, Агатка. Дзіця было прастуджана, у грудзях у яе хрыпела, яна кашляла, час ад часу падымала галоўку і хныкала. Быў чуваць плач і іншых дзяцей. Здавалася дзіўным і незразумелым навет для нашага народу, бачыўшага ня раз гора, як гэта можна выгнаць гуртам усіх з хат бяз жадных повадаў і прычын і гнаць іх, наўсуперак іхным жаданьням, некуды на край сьвету, на голад, холад і павольную сьмерць!?

Богуш ні то сядзеў, ні то ляжаў у перадку вазка, час ад часу мацаючы вусы й бараду і скідаючы зь іх смочкі намёрзшага лёду. Быў спакойны. Убачыўшы Раіну і Юльяша, узварухнуўся, але ня было відаць, каб занепакоіўся. Ня стаў ні пра што распытваць, толькі заўважыў, што забыўся спусьціць із ланцуга Бобіка -- бедны, пэўна, сядзіць ды вые!..

-- Ты, Раіна, аддай яго якому-небудзь добраму гаспадару -- Бобік верны сябра!

У ціхай роспачы Раіна нахілілася да ягонага твару, падстаўляючы свой лоб для бацькаўскага пацалунку.

-- Ну, што-ж, усё скончана, і няма пра што гаманіць...

-- Ня трэба, тата, пасядзім моўчкі.

-- Вось што я хочу сказаць толькі: *ня ворагі мы, а хлебаробы!* З таго, што зараз надумана там, навярху, нічога добрага ня выйдзе! Праца й толькі карысная й разумная праца робіць чалавека шчасьлівым і здаровым! Але праца ня з прымусу, а па сваёй добрай волі, тая, што ідзе ад свайго ўласнага нутра. Кожны чалавек -- сам па сабе: і па працы, і па вопрацы, і па гамонцы, і па розуму, і навет па тым, як ён ідзе, што есьць, як сьпіць... Самая маленькая дробязь і тая будзе рабіцца адным гэтак, а другім іначай. На фабрыцы, у войску й то кожны работнік і кожны вой розныя... А тут хочуць зрабіць вялікую гаспадарку, дзе раней працавала па адзіночцы сотня або тысяча людзей, і каб усім было пароўну, і каб ніхто ня быў пакрыўджаны, і каб быў добры посьпех у працы?! Перамелюць народ, дый годзе! Доўга думаў я над гэтым! Той наш нацдэм Прышчэпа разумна разважаў: «Што-ж, кожная сям'я гаспадара ёсьць калгас. Неразумна ламаць сем'і, заганяючы іх у адзін вялікі калгас». А гэтыя камісары -- проста хэўра галадранцаў, злачынцаў ды людзей, якія не разумеюць нас, хлебаробаў, або проста хочуць пажывіцца з нашае працы, атрымаўшы пасады ў калгасах.

-- Дзеткі мае! -- адгукнулася аслаблым голасам Богушыха. -- Як-жа вы цяперацькі будзеце безь мяне?

-- Мама, ня трэба! І так разрываецца сэрца! Можа, як-небудзь скончыцца гэтае ліха, і зноў будзем разам...

-- Будзем, будзем! Усе апынімся некалі там, -- заўважыў Богуш. -- Але там ужо ня трэ' будзе думаць ні пра што...

Вагонаў усё не падавалі. Адціснутыя ахоўнікамі ад фурманак сваякі і знаёмыя, што прыйшлі ў астатні раз сказаць сваё шчырае «бывайце!», стаялі групкамі наводдаль. Маўчалі. Усіх гнебіла адна й тая-ж думка, адна й тая-ж цяжкая роспач, скруха.

-- Сэрца разрываецца! -- стагналі некаторыя. -- Сэрца разрываецца! Хай-бы лепш усім нам праваліцца ў якое прадоньне!

Зенька не выпускаў із зубоў піпкі, ціснуў яе зубамі, грыз, пыхкаў ёю, хоць у ёй ужо нічога й ня было.

Раіса глытала гарачыя сьлёзы. Юльяш і Агатка ўчапіліся ў крысо ейнага кажушка, быццам баючыся, што яна ад іх уцячэць; дрыжэлі, сморгалі прастуджанымі насамі; усхліпвалі, калі да ікнае сьведамасьці даходзіў трагізм з бацькамі...

Было ўжо блізка раніцы, калі, стукаючы буфарамі, паравік падсунуў да станцыі чараду пустых таваровых вагонаў. Ахоўнікі ўзялі стрэльбы напагатоў, і пачулася сухая каманда:

-- Уставаць! Пакідаць вазы! Станавіцца па тры -- мужчыны асобна, жанчыны асобна! Малых браць жанчынам! Фурманам апекавацца коньмі! Гатова?

-- Гатова!

Маўклівай, прыгнебенай, зьнясіленай масай людзі заварушыліся і пасунуліся ў напрамку да вагонаў, ахопленыя з усіх бакоў вартай. Сьнег рыпеў і енчыў пад іхнымі нагамі... І ў гэты мамэнт аднекуль зь цемры пачуўся страшэнны й надрыўны крык, б'ючы, як электрыкай, у мозг тым, хто яго чуў:

-- Ка-ты! Ка-ты! Вырадкі! Няма на вас кары божай! Згіньце вы із сваёй камунай! Ж ы в е Б е л а р у с ь!

... Усё сьціхла, замерла ў жудаснай цемры.

1941-1971

32

На межах

Сьвет памуціўся ў ягоных вачох: лес, поле, хаты й самі людзі -- усё здавалася нейкім іншым, не такім, як раней, шэрым, панурым і няпрыветлівым. Сьцяўшы зубы й сьціснуўшы кулакі -- моцна, аж да болю, аж пазногці ўпіліся ў далоні, шурпатыя, патрэсканыя ад працы, з шэрымі вужлакамі мазалёў, -- ён стаяў за варотамі свайго двара й сачыў, куды яны паедуць?

Мінуў Дзяніс Галуза на пары коняў, з плугам на возе, самы завадаты «іхны»... «Зладзюжка! Снапкі з чужога поля падбіраў! Цяперака ў брыгадзірах -- ловіць рыбку ў мутнай вадзе!..» За ім праехаў Антон Балабон -- «хітрунок, падлізьнік, боты чысьціў і штаны падцягваў пры патрэбе, бывала, пану -- іхны сучасны важны агіцірнік!.. Усюды ўпхнецца із сваім язычком, вільне ўправа, вільне ўлева! Цюцічка! Стань на лапкі, дам салодкі кавалачак!» За Антосем тыркацелі: Сымон, Паўлюк, Гіляр, Рыгор -- усе дванаццаць

33

-- «дванаццаць юдаў»... «І Рыгор там?! Ня можа быць? -- прыглядаецца: -- так, Рыгор!»

Матузок прыгадвае бурлівы сход напярэдадні, тую паперку, што напісалі ад імя сходу; прыгадвае твар «упаўнаважанага па калектывізацыі» -- руды, прытуплены... Рыгор тады не падпісаў тэй паперкі! «Што будзе тады, як замест збажыны на нівах парасьце сьвірэпка?!» «Але таму, рудому, яму -- што?! Абы ўцягнуць на сьпіс пабольш людзей -- за гэта яму будзе ўзнагарода! А што будзем есьці ў наступным годзе, ён пра гэта ня дбае, ён будзе сваё мець з разьмеркавальніка!..»

Брыгада мінула вёску. Калёсы барабаняць па выгану, гужом паўзуць на ўзгорак. Сухавей воблакамі ўздымае пыл, гоніць яго па дарозе, круціць, сьлепіць ім людзей...

Матузок узлазіць на плот, каб далей было відаць, глядзіць, дзе яны прыпыняцца. Якраз на ягоным бульбянішчы! Здымаюць плугі, закладаюць у іх коняў!

-- Ганна, сякеру!

Выбягае за вароты, імчыцца па вуліцы. Босыя ногі грукацяць аб сухі грунт. Не па мерцы купленыя ў Прамгасе штаны зь вялізарнейшай ластавіцай торбамі матляюцца вакол ягоных ног. Кашуля расхрыстана! Вочы гараць!

-- Стой! Стой, табе кажу! Куды пхнешся, твая гэта зямля?!

Першым ішоў у баразьне Дзяніс Галуза. За ім -- іншыя.

Падбег, замахнуўся сякерай па пастронках.

-- Ты што? Звар'яцеў?!

-- Маё! Ня руш!

Забег наперад, махае сякерай перад коньмі. Крычыць:

-- Праз труп хіба пярэйдзеце!

-- Чаго вар'юеш? Ня хочаш у калгас, зямлю табе вымераюць у Дубнікох!

-- Разумнікі! Ідзіце вы ў Дубнікі! Маё -- тут, угноенае, упрацаванае!.. Ня руш!

Замахваецца зноў секчы пастронкі. Моцны скурат гойдаецца, не падаецца. Матузок замахваецца на плуг. Зялеза зьвініць, коні хмыляцца. Дзяніс вырывае ў Матузка сякеру, адкідае яе ўбок. Матузок бяжыць наперад і кладзецца ў баразну перад коньмі. Нагавіцы спаўзьлі з паясьніцы, відаць схудалы, жаўтаскуры крыж...

-- Рабаўнікі! Зладзюгі! Хочаце зжыць мяне ізь сьвету?!

-- Што зь ім рабіць? -- пытае Дзяніс у сяброў.

-- Ды што ізь ім цацкацца? За ногі ды вон з баразны...

-- Гвалт падыме!

Дзяніс бярэцца за пугу і гоніць коняў на Матузка. Коні хмыляцца, прыпыняюцца, а потым скачуць цераз Матузка. Плуг скабляну ў яго па галаве.

-- Кінь, Дзяніс! Кінь, яшчэ пакалечыш чалавека -- няпрыемнасьць будзе вялікая!

-- Ды ён ужо пакалечаны -- лемехам у галаву... -- кажа Рыгор.

Усе падыходзяць да распасьцёртага на зямлі Матузка. Кладуць яго на калёсы. Кроў цячэць на твар, кропля па кроплі спадае на кашулю. Матузок стогне, у грудзях ягоных хрыпіць...

-- Забіць-бы яго, гада! -- злуе Дзяніс. -- Забіць і канец!

-- Забіць чалавека? Божа мой, забіць?! Ці тут вайна?! Да чаго-ж мы дайшлі? -- Рыгор хапаецца за грудзі, быццам у яго там, пад кашуляй, агонь. -- Вырываем із- пад ног зямлю, ды яшчэ забіць!? Гады! Усе становімся гадамі! Гатовы адзін аднаго праглынуць!.. Божа мой, як-жа жыць? -- ідзець да плуга й садзіцца на дышла. -- Згіньце-ж із вашай камунай!

Падымаецца з дышла, бярэць свайго каня, ставіць яго ў аглоблі й лезе на воз да Матузка. Адрывае шмат ад свае кашулі й накладае на рану Матузковай галавы. Потым скіроўвае каня на дарогу ў кірунку вёскі.

* * *

Дзьме моцны вецер. Падымае пыл з дарогі, круціць яго й нясе некуды ўдалеч... Матузок стогне на возе, мырмоча: «Браткі, я... Хіба я? Я нічога -- я ня ступіў нагой на ваша!.. Ані! Кажаце -- баразна? На маём!.. Дуб стаіць на Нупрэевым, а рабіна на маём!.. Як крывавіцца яна ў марозную восень! І я любуюся!.. Любуюся сваёй азімінай!..» Раптам ён усхліпвае й падымаецца, каб зьлезьці з хурманкі. Рыгор пераймае яго й кладзе назад. «Ну, вось і масток! Ганна! Ганна! Дай рыдлёўку, трэба спусьціць гэтую чорную ваду на глебу... Тады -- атава... атава... Што? Сякеры няма! Падай мне рыдлёўку! Зямля пухкая, скібамі. Я хачу выкапаць ямку ў садку. Ага! Пад тэй дуляй... У зацішку... На чужую зямлю ня ступлю, не-не! Вон, рабаўнікі! Ты ня плач, Ганна!.. Ня плач!.. У сьпякоту, у

мароз і мяцеліцу, хіба я калі адпачыў? Дай руку! Вось тут, ох! Як горача...»

Яны ўязджаюць у вёску. Тады Матузок адплюшчвае вочы й мутным позіркам глядзіць у неба. Воблакі плывуць, плывуць!.. Рыгор сочыць за рухамі Матузка, і яму становіцца не па сабе. «Пачнецца такая разьня! -- думае. -- І адкуль гэта ўсё, дзеля чаго? Жылі людзі, кожны меў свой інтэрас... Адзін разумнейшы, рупнейшы, спрытнейшы... Другі дурнейшы, раскіднейшы, бяспутнейшы... І ня было на каго крыўдаваць! А цяпер вось прымушаюць браць суседа за горла...» Яму прыгадваюцца дзіцячыя гады. З Матузком блукалі яны па палёх, па лясох, па балотах. Зьбіралі ягады й гарэхі, дралі лыкі. Лясы глыбокія, страшныя! Баяліся зьвяроў. Здавалася ім -- вось зараз выскача з-за выварацi мядзьведзь. І лясьніка баяліся. Аднаго разу згубілі дарогу й доўга блукалі па лесе. Матузок усё паўтараў: «Маці Божая, прасьвятая Багародзіца... Маліся й ты! -- казаў. -- І тады яна выведзе нас на дарогу...» І раптам лес, праўда, перад імі расчыніўся, і яны выйшлі на поле. Тут ужо страху ня было. Матузок выняў з-за пазухі акрайчык хлеба. Разгарнуўшы шмат, у які быў загорнуты хлеб, асьцярожна, каб адмераць па-роўнаму й не пакрышыць, разрэзаў яго на дзьве часткі.

-- Ну, бяры любую! -- зьвярнуўся да Рыгора.

-- Адкуль гэта ўсё?! -- стаяла невырашальнае пытаньне перад Рыгорам. Зірнуў у неба. -- Пэўна-ж не адтуль?!..

* * *

Дзень, два ціха. Мацей Матузок ня вылазе з хаты. «Сэрца! Вырваць сэрца і кінуць ім, кінуць у вочы: бярыце, ежце!» Трэці дзень: на ўсіх сходах, у раённым друку: «Вылазка ворага... З'агітаваны кулакамі, Мацей Матузок із Загібелек, чалавек зь бядняцкага асяродзьдзя, кінуўся ў бойку з калгасьнікамі, не дапускаючы іх да былое свае нівы! Не шкадаваць ворага! Павесьці змаганьне па ўсяму фронту... Ліквідаваць кулакоў і іх агентаў, хто-б яны ні былі ў мінулым...»

Сяляне шуганулі ў калгасы...

Увечары да Мацея прыйшоў Рыгор. Ён занепакоены. Рухі ягоныя рашучыя, словы моцныя. Сячэ із пляча! «Задушаць! Згноіцца душа, толькі гледзячы на гэта... Усё папрадам, пакіну і

ўцякаць буду! У места, а калі не, дык хоць у тую Сыбэрыю!.. Чорту ў зубы! Не магу глядзець на ўсё гэта -- на ўсю гэтуюману...» Выпроставае свае рукі -- даўгія, жылістыя: «Во, вырвацца з гэтага пекла!.. Мазалямі ўсюды можна пракарміцца...»

Маўчыць Матузок. «Добра яму казаць! -- думае. -- Ён ды жонка -- усяго таго клопату! Абодвы працаваць могуць. А тутака за сталом поўна хлебаедаў...» Матузок схіляе галаву, глядзіць у вакно, за якім, як-бы ў сьне, разьлягліся шырака балоты, лысеюць пясчаныя градкі. Адтуль чуецца балбатаньне цецярукоў, курлыканьне журавоў. Вочы Матузка міргаюць, і зь іх выкатваецца сьляза. «Не, не магу я пакінуць гэтага! -- шэпча. -- От тэй бусел, што стаіць на адной назе на балоце, кожную восень адлятае, а ўвесну зноў прылятае. А я-ж ня бусел! Як-жа я магу пакінуць назаўсёды тое мейсца, дзе нарадзіўся?!»

Пад восень Рыгор выехаў.

Прыехаў каморнік. Для тых, хто не пісаўся ў калгас, зямлю адмераў у Дубнікох на закінутых аблогах. Старшыня сельсавету выклікае Матузка да сябе.

-- Ты мусіш выбрацца адсюль! І як мага хутчэй. Усё пад калгас адышло. Праз тыдзень на тым мейсцы, дзе ты сядзіш, будуць пастаўлены будовы для калгаснай жывёлы...

Матузок яму не пярэчыў, але й перабірацца ня стаў. Тут сядзелі ягоныя дзяды й прадзеды, будзе сядзець і ён аж да самае сьмерці. Закону такога няма, каб адбіраць у хлебароба зямлю. Сядзіць у хаце, пазірае ў вакно... Рана зажывала, але ў галаве нешта круціла, калола, быццам цьвіком. І думкі -- неадчэпныя, пагрозьлівыя. Рвуцца мазгі, туманіцца зрок... Выйдзе за гумно, пастаіць, паглядзіць у балацяную далеч, паслухае курлыканьне журавоў, граньне на тоненькіх дудачках кулікоў. Тады стане быццам крыху лепей, але як толькі вернецца ў хату, зноў пачынае круціць у мазгох... «Калі скончацца гэтыя пакуты, дый ці скончацца!? Закрыліся-б лепей ужо вочы!»

Раніцой да дома падышла гурба калгасьнікаў.

-- Ну, Мацей, уцякай, браце, пакуль на галаву дошкі не паляцелі! Будзем разьбіраць тваю дзядоўскую спадчыну!

Сэрца Мацея плача, але сам ён маўчыць.

І Дзяніс лезе на дах. Ляцяць дошкі. Рыпяць кроквы. Мацей глядзіць некуды ўдалеч, каб ня бачыць і ня чуць, што робіцца

наўкола. А людзі снуюць узад і ўперад -- чуецца крык, рогат, грукат... Грузяцца хурманкі...

Старшыня сельсавету зноў падыходзіць да Матузка.

-- Ты ня злуй! Што-ж тут злаваць -- новыя часы, новыя парадкі!.. Ня хочаш у калгас, мусіш вызваліць мейсца! Дапаможам табе перабрацца, і за гэта скажы дзякуй! Партыя загадала...

-- Дзякуй табе й тваёй партыі ў шапку!..

-- Ну, от, пачынаеш лаяцца! Што-ж тут лаяцца!? Калгасы -- справа не абыякая! Пасядзіш пад тымі Дубнікамі з годзік, дый шапку тую яшчэ зьдзенеш: прыміце, калі ласка, раба божага Мацея Матузка да кумпаніі... Ашукаўся быў!

Мацей падымаецца і зноў ідзе ў гумно, каб нічога ня бачыць і ня чуць. Садзіцца там на старую падгніўшую калоду й глядзіць удалеч, дзе сінее сьцяна пушчаў за балотам. А словы старшыні стаяць у галаве, і сэрца, здаецца яму, зараз вырвецца з грудзей. «Ашукаўся быў!? Шапку зьдзенеш! Бярозавай кары й па-за калгасам можна знайсьці!» -- шэпча.

Ганна знайшла яго тут.

-- Хадзі, там нешта пра цябе добрае напісана, кажуць людзі!

Дзяцюк чытае раённы лісток «Шлях камуны». Зноў тое самае. «Бядняк, але зарваўся, упёрся!.. Калгасьнікі пастанавілі дапамагчы яму -- перавозяць усю ягоную гаспадарку на новае мейсца за свой кошт...»

Дах хаты разбураны. Бяруцца за зруб. Ганна выносіць з хаты астатнія рэчы. Дзяжу беражна ставіць на зялёную мураўку. Накрывае кажухом, каб не сапсулася цеста, і садзіцца. Мацею ўспамінаецца тое лета, прыемнае, ціхае... Коні скачуць па вуліцы, вязуць Ганну -- на той самай дзяжы -- да двара Матузка. Грае музыка. Дружкі сьпяваюць шлюбныя песьні. Маці Мацея выходзіць на ганак спаткаць нявестку. Ад варотаў да ганку раскручана трубка палатна. Мацей бярэць Ганну подручкі й вядзець яе па палатну ў хату -- у новую, яшчэ пахнучую жывіцай... «Ці тая клямка была тады ўжо на дзьвярох, ці я прыладзіў яе пазьней? -- думае Мацей. -- Ганак то так, праз два гады пасьля вясельля дабудаваў... І палец тады быў дужа пакалечыў...»

Выпрастаў палец, мацае пазногаць.

38

Грукат... Тлум... Ляціць з грукатам бярвеньне. Рыпяць колы. Матузок сядзіць ціха, нібы ня чуе й ня бача нічога. Раптам падыходзяць і кажуць:

-- Жыта тваё коні стравілі...

-- Маё жыта? Хіба ёсьць у мяне жыта? А-а-а! Праўда, кавалачак яшчэ заставаўся, ня зжала Ганна...

-- Што-ж ты сядзіш, схадзіў-бы паглядзеў! Можа, яшчэ што-небудзь уцалела?

Матузок падымаецца, выходзіць за сядзібы. Сонца пячэць страшэнна, і ў паветры стаіць гарачыня, нібы ў напаленай печы. Мацею няма чым дыхаць -- сьціснула ў грудзёх. Легчы-б, паляжаць, бяз руху, бяз думак...

Па жыце ўздоўж і поперак сьцежкі. Конскія логавы. Гурт коняў начаваў у жыце. «Наўмысна!.. Зразумела, наўмысна... -- думаў Мацей. -- Пацяшаюцца! Паднесьлі падаруначак...» Здрантаванае жыта мітусіцца ў ягоных вачох. «Добра!.. Добра!.. Мы, Матузкі, цегавітыя! Яшчэ пабачым?.. Яшчэ пабачым!..» Ходзіць па жыту, зрывае каласкі, бярэць іх у жменю. Успамінаецца Рыгор. «Задушаць! Не ўстаяць табе супроць іхнае хэўры...»

Пячэць сонца. Абрыдла гэтая сьпякота! Хоць-бы на хвілінку пацягнула халадком. Згортвае сарваныя каласкі ў пучок і ўтыкае яго ў сваю шапку, каля казырка. «Задушаць! От, паваліцца-б тут і заснуць... назаўсёды... Што? Ня дам, маё! Ня руш майго!»

Бяжыць у вёску. Не па мерцы купленыя ў Прамгасе штаны зь вялікай ластавіцай торбамі боўтаюцца вакол ног. Вочы блукаюць па прасторы. Прыбягае. Хата ўжо раскінута, ляжаць толькі груды бярвеньня. Ганна сядзіць на дзяжы, пакрытай кажухом. Мацей глядзіць на яе й усьміхаецца -- хваравіта, ненатуральна. «Зноў хіба вясельле?!» -- кажа. Ганна бача: хворы чалавек, і маўчыць. Матузок украдаецца ў натоўп. Вочы блукаюць, твар перакрыўлены ўсьмешкай...

-- Хата раскінута, гаспадарка панішчана, жыта здрантавана -- вазьміце вось і гэта! -- працягвае ім каласкі. -- Вашым дзеткам на забаву!.. Ня хочаце? Але -- вазьміце! Што-ж тут? Падбіраў снапкі на чужых нівах -- вазьміце й гэта! Ага, праз газэцінку?! Падкулачнік я! Падкулачнік! Хай ужо будзе й гэтак...

Раптам хапаецца за галаву, хістаецца. Здымае шапку й кідае яе вобземлю.

39

Вясельле! Будзем скакаць! Грайце, музыкі! А ты тут сядзіш на дзяжы, Ганна? Наша з табой вясельле! Юрачку! Мяцеліцу! Мікіту! Не, Мацея! Мацея!..

Менск, 1942
Нью-Ёрк, 1972

Дзікі вецер

Гойдаюцца сосны над хутарам, шумяць, гамоняць. Вецер сьвішча, гоне з поля хвалі сьнегу, кідае яго на сосны, круце ля галамнёў. І страшна на хутары: ходзяць галодныя людзі, забіваюць, рэжуць, рабуюць... «Надоечы ў Апчаку выразалі ўсю сям'ю... На хутары ў Сідаравых пакралі авечак...»

Хто гэтыя людзі? Адкуль яны наплываюць? Якая сіла кідае іх хмарамі ў балацяныя прасторы Палесься?

-- Людцы, ратуйце! З галадухі мрэм! Усё паатабралі, пазабіралі! Мрэм, як мухі!..

... Мільёны памершых ад галадухі на Ўкраіне!

* * *

На хутары ў Гарася пабліскваe сьветлячок: «Ня сьпім, пільнуем, бо йдуць хмарамі галодныя ўкраінцы. І разам з тым, ідуць нядобрыя чуткі: раскулачваюць, высылаюць, зганяюць зь зямлі роднай...

Гарась прыслухоўваецца. Вецер ходзіць за хатай, мацае сьцены мяккім вобмацкам, сьвішча пад кроквамі. Вароты на добрым запоры, на ланцугу, цераз увесь двор -- злосны Баян, але хто ведае, што можа здарыцца за ноч. Падкапаюцца й пад сьцяну, атруцяць і сабаку -- тут трымай вуха востра! І Гарась схіляе галаву, падрэмле й зноў усхопіцца. Думкі тузаюць яго -- неадчэпныя, цяжкія! «Д'яблы

іх ведаюць зь іхнымі парадкамі! Нешта гавораць і пра яго? Нейкія чуткі ходзяць... Праўда, працай нажытае... Зямлі тры гэктары толькі! Але хіба ёсьць у іх што-небудзь пэўнае, станоўкае? Пяць пятніц на тыдні...» Гарась пакручваецца, стогне. «І гэты Зьмітрачок! Тады, як Марынка яму адмовіла, уваччу была злосьць. Заўсёды ў яго злосьць! Як клянуць яго людзі! Зразумела, Марынка, а ня я -- я тут зусім збоку прыпёку... Не ляжыць у дзяўчыны сэрца да хлапца, дык прычым тут бацька?! Учора, казаў Міхалка, Зьмітрачок езьдзіў з новымі «прапазыцыямі» ў раён, -- успамінае Гарась. -- Якія там у сабакі прапазыцыі!?»

Устае, падыходзе да абразоў, доўга стаіць перад імі моўчкі, потым шэпча пацеры. Раптам зьявілася думка: не заплаціў ён, здаецца, страхоўку? Падаходны заплаціў, самаабкладаньне таксама -- яшчэ пад дождж тады патрапіў, -- а от страхоўку... Становіцца каленкамі на тапчан і мацае рукою за абразамі -- тут у яго квіткі, уся «канцылярыя». І паперы шамацяць у нязграбных запрацаваных рукох. Перастаўляе сьветлячок на край стала, раскладае паперы: самаабкладаньне, падаходны, цягла (гужавая павіннасьць), культурны збор... «Падаткаў шмат, дык перайначылі на культурны збор!» Ухмыльнуўся. «А вось і страхоўка -- чырвоны квіток, каб ім усё стала чырвоным уваччу! Але, хвала Богу, ня будзе да чаго ім прычапіцца! Усё ў парадку!» Гарась загортвае квіткі ў газэціну й кладзе іх зноў «за пазуху сьвятым».

Але спакой да яго ўсё-ж не вяртаецца: насядаюць іншыя думкі. «Каб ціха, дык-ба й ня думалася! А то такое ліхалецьце! Сапхнулі нас на край жыцьця!» Ён ідзе па хаце. Падыходзе да ўслончыка, на якім стаіць вядро з вадой, і смачна, нібы то каляды, а не піліпаўка, п’е ваду. Потым з грукатам апускае зноў на ўслончык вядро.

Агата прачнулася й пытаецца:

-- А каню ты, пэўна, зноў забыўся падкінуць нанач? Як лёг, толькі сьцямнела, дык і дрыхнеш!

-- Дзе-ж дрыхнеш, калі ўвесь час варочаюся з боку на бок... Выйшла-б ды дала...

-- На мяне не спадзявайся: страшна мне! -- адказала кабета. -- Не магу за дзьверы паказацца... Ляжу й усё слухаю, што там робіцца на панадворку... А сасонкі ўсё шумяць, шумяць -- ці то мо’ так у мяне ў галаве?

-- Марынка, можа ты выйшла-б падкінуць каню?

Марынка не адказала, сьпіць.

Нацягнуўшы на плечы кажух, Гарась падышоў да пячуркі, узяў ключ і выйшаў. Баян зазваніў ланцугом і разы два без ахвоты брахнуў...

Цераз хвілін пяць або менш Гарась вяртаецца ў хату й кажа:

-- Ліха іх ведае! Такі конь, як лялька, а можа, і ён хутка будзе не патрэбен?

Ён цяжка апусьціўся на канец тапчана. У гэты мамэнт Баян ірвануўся з будкі й ярасна кінуўся па ланцугу да варотаў. Зараз-жа пачуўся грукат у вакно.

-- Каго там Бог нясе?! -- пытае Гарась, прыхіліўшыся тварам да шыбы.

-- Свае! -- пачуўся адказ.

-- Міхалка нечага йдзе, -- прамовіў Гарась і пайшоў адчыняць. Цераз хвілінку ўвайшлі ўдвох.

-- Вось надвор'е! -- кажа Міхалка. -- Дзікі вецер з усходу. Ды яшчэ й сьнег. Так і круціць, круціць, сьвету ня відаць! У такое надвор'е толькі злодзеям добра ды перамытнікам: да раніцы й знаку не застанецца ад сьлядоў...

Селі абодвы на тапчан і хвіліну маўчалі. Потым Міхалка зноў:

-- Ты чуў? Ён цябе таксама ў перамытнікі ўпісаў! Раней -- падкулачнік, зрыўшчык, сабатоўнік... Бача, гэта не бярэць, дык у перамытнікі... Ён сказаў, што ты да брата за мяжу хадзіў...

-- Брат у мяне, праўда, за мяжой ё, ты-ж сам ведаеш! Але-ж ад самага таго часу, калі нас падзяліла мяжа, я нічога ня чуў пра яго...

-- Адным словам, кляпае на цябе! Я цябе папярэджваю як добрага чалавека й суседа...

Гарась сарваўся з тапчана й зноў пабег да вядра з вадой. Напіўся й вярнуўся. Сеў зноў каля Міхалкі. Доўга глядзеў у падлогу. Верыў Міхалку: Зьмітрачок кляпае на яго! Вычуў гэта й сам ня раз. І ратунку няма ніадкуль: ніхто не захоча ўтранчацца ў гэтую справу. Не такі цяпер час: кожны высьцерагаецца Зьмітрачка...

-- Ты толькі падкажы мне, калі гэта будзе. Я ведаю, яны хочуць мае крыві! Я зраблю ім, бо іншага ратунку няма! А ты, Міхалка, павінен ведаць: рызыкоўны я чалавек... -- голас ягоны задрыжаў і перарваўся.

Міхалка ўзьняўся з тапчана, але зараз-жа зноў сеў. Гарась узяў яго за руку, моцна паціснуў у сваёй.

-- Ты -- сусед! Ты ўсё мусіў бачыць, кожны мой крок! Ці я калі адлучыўся з дому хоць на адну добу? Схадзіць да брата, прынамсі, патрэбна хоць дні тры, бо чалавек -- ня воўк! Дый воўк патрабуе адпачынку... Усё гэта вось на іх!.. -- памацаў мазалі на далонях. -- На іх, на маіх мазалёх, усё гэта трымаецца! Памятаеш, колькі было гора мне, каб паставіць гэны хутарок!? А Зьмітрачок? Ты-ж бачыш, які ён? А што сватаўство не ўдалося, дык ня я тут віной, а Марынка -- сэрца дзяўчыны не ляжыць да яго! -- голас ягоны зноў на момант перарваўся. -- Ох, Божа! Якое жыцьцё для нас настала!? Дзеўка не пайшла за хлопца, дык ён плявузгае на ейных бацькоў! І вераць яму! Вераць!

-- Гэта-ж адна хэўра! -- чуецца голас Агаты.

-- Агата, ты чуеш? Марына! Вы чуеце? Ён нас у перамытнікі ўпісаў; за мяжу, кажа, хадзілі, разам з таварам весткі пераносілі!? Ведае, сабака, дзе балючай укусіць!

-- Тата, я спаткаю яго й скажу, каб ён ад нас адчапіўся...

-- Ня руш яго! Ня руш! Бо горай будзе... Падумае: спалохаліся!..

Агата плакала.

-- Не хвалюйцеся за парой! -- пачаў раптам супакойваць Міхалка. -- Можа, як-небудзь, як той Янка кажа, «ліха пратрэцца, і маланкай доля блісьне...» Можа, разьбяруцца тамака вышэй!? Старшыня, дык той ня вельмі бярэцца за гэтую справу: усё ўгаворвае Зьмітрачка пачакаць... Пэўна, дачуўся пра нешта? Толькі той, упаўнаважаны па палітычнай частцы, вельмі ўхапіўся за яе...

-- Ухапіўся, кажаш? -- пытаюцца ўсе ў вадзін голас.

-- Божанька, выратуй! Гэта-ж ад яго найбольш і залежыць...

Назаўтра Міхалка прыйшоў зноў.

-- Пільнуйцеся! Заўтра або пасьлязаўтра ўночы...

* * *

Зьмітрачок вярнуўся з раёну радасна ўсхваляваны. «Так, пачынаецца! Ну, вось і дачакаўся». Цяпер ён ні аб чым іншым ня думаў, як толькі аб тым, як ён прыйдзе да Гарасёвых, як абвесьціць ім пра пастанову раёну аб высылцы і як яны будуць гэтым прыгнебены... «Во, упэўніліся, што азначае маленькі Зьмітрачок!» (Так называў яго, бывала, Гарась). Зласьлівая радасьць абхоплівае сэрца Зьмітрачка. «Зязюля ваўку не таварыш! Марыне трэба

чалавек, а не валацуга! Ага! Вось цяпер дык рады былі-б такому сватаўству...»

Кідае на брудны ложак сваю будзёнаўку (ні ў якога Будзёнага ён ня служыў, наагул у чырвонай арміі ня быў, але ўдае сябе за будзёнаўца), запальвае сьвятло ў пакоі й садзіцца за стол. Яшчэ толькі сёмая гадзіна, а павінна пачацца гэта а дванаццатай. Яшчэ шмат часу. А яму хочацца як найхутчэй. Сэрца ягонае перапоўнена злосьцю. Ён хоча ўбачыць сьлёзы бацькі й маці Марыны. Як соладка будзе глядзець яму ў гэты час на іх. «Сьмерць! Усім ім сьмерць; усім такім, хто супроць яго, Зьмітрачка! Не, не раптоўная сьмерць, а цяжкія павольныя мукі -- там, у зьледзянелай поўначы, дзе ня сьвеціць сонца, а потым ужо сьмерць... пад цяжкім паленам дзе-небудзь... Вось вам усім: буду ў вас на языках аж да вашага скананьня...»

Дастае зь кішэні пакамечаны кавалак паперы. Разгортвае й глядзіць у яго. Чытае: «...калі яго не ліквідаваць, як клясу, дык калектывізацыя ў раёне зь мейсца ня зрушыцца. На яго глядзяць усе, бо ён аўтарытэт у іх... яму вераць! Не запішацца ён, ніхто пісацца ня стане. Вось чым ён падсечаны! Паспрабуй давесьці, што гэта ня так!? Не запісаўся-ж да гэтага часу...» Глядзіць угару, на партрэт правадыра. Вусаты твар сурова ўхмыляецца. «Так-так! Грамі ворага!» Зьмітрачок задаволена хіхікае. Падсоўвае лямпу, чытае далей: «А калі калектывізацыя ня зрушыцца зь мейсца, дык што-ж скажуць нам, раённым камуністым...» Глядзіць на гадзіньнік. Яшчэ рана! Комкае паперу й засоўвае яе зноў у кішэню. Кладзецца на ложак, выцягвае ногі й глядзіць угару: там бездапаможна дзынкае ў павуціньні муха. Непамерна падкручаная лямпа хліпае, агеньчык падымаецца, робіцца мутным і гасьне...

Зьмітрачок навет не пачуў, як у хату ўвайшлі старшыня райвыканкому й раённы ўпаўнаважаны (прадстаўнік ДПУ). Пабуджаны, клыпае вачыма й глядзіць то на аднаго, то на другога.

-- Струсіў, таварыш? -- пытаецца прадстаўнік, шынэль якога зьвісае аж да долу. -- А можа выпіў? Не? А не пашкодзіць для адвагі! Як-ніяк, а сваяк!? -- усьміхаецца. -- У патэнцыі...

Зьмітрачок некаторы час глядзіць на малінавыя пятліцы прадстаўніка. Ускоквае, круціцца па пакою, шукаючы будзёнаўку.

-- Пасьпеем! Часу яшчэ -- уга, колькі! -- прадстаўнік дастае з кішэні гадзіньнік. -- За сем мінут дванаццатая. Для нашых спраў

найлепш другая або трэцяя, верце мне! Чалавек усьпіцца, часам дзікія сны, бо чуткі-ж -- чуткамі зямля поўніцца! -- і пабуджаны зьнянацку, як ачумелы. Крыкнеш -- ногі падгінаюцца і ў нагавіцы не пападаюць... І золатца! Золатца, калі ёсьць, не пасьпее прыхаваць... Ха-ха!

Вымае зь кішэні шыняля бутэльку вішняку, другую -- каньячок тры зорачкі. -- З закрытага нашага! -- ухмыляецца. -- Толькі ўчора даставілі...

-- Учора й нам тое-сёе...

-- Вам? Ты быў у нашым закрытым? Не? Зойдзеш калі-небудзь паглядзець. Балыкі, асятры, сёмга амурская, шынкі -- усё гэта вэндзанае, толькі ў рот кладзі! А цяпер -- тры шклянкі! Хуценька! Што? Толькі адна? Давай адну! Эх, ты, недарэчны Гарасёў зяцёк! Хацеў на хутарок?.. Красуню Марыну... Бюст -- во! -- зрабіў паўкруг рукамі. -- Абарвалася! -- зарагатаў. -- А ты ведаеш, што гэта амаль здрада -- сваяцтва з кулакамі... Ха-ха! Не палохайся! Сам ведаеш: ня кулак ён! Але хай будзе кулак, каб застрашыць праваслаўных... (Так ён заўсёды называў сялян).

Зьмітрачок паставіў на стол шклянку, выцершы яе брудным ручніком.

-- Хлеб цягні сюды!

Зьмітрачок паклаў на стол акраец хлеба.

Праз колькі часу, калі пустыя бутэлькі былі перастаўлены пад стол, прадстаўнік запытаў:

-- Зброя ёсьць? Няма? Эх ты!

-- Калі што-якое, я рукамі іх, рукамі... -- залемантаваў Зьмітрачок. -- А то вось: найлепшая зброя, без аніякага гуку! -- узяў з-пад лавы шворан. -- Дзёбнуць -- і гатова!..

Яны выйшлі. Дзікі вецер кідаецца ім у твар, блытаецца паміж ног, торгае даўгі шынэль прадстаўніка. Ідуць зусім паціху, моўчкі, толькі неўтаптаны, намецены завеяй сьнег рыпіць пад ботамі. Але вось у мутаўзе мяцеліцы вымалёўваюцца будынкі Гарасёвага хутара. Паварот налева. Сьветлячок замаячыў цераз шыбы вакна: ня сьпім, вартуем! І на сэрцы Зьмітрачка становіцца неяк брыдка-брыдка, быццам-бы плюнуў бацьку ў твар. Але -- позна! Рука прадстаўніка ў шырокім рукаве паднялася й апусьцілася на шыбу. Пякельная душонка Зьмітрачка торгаецца, хвалюецца...

-- Ня сьпяць яшчэ! Ня сьпяць! -- кажа прадстаўнік.

Зьмітрачок хіхікае -- прытварна, ненатуральна...

* * *

Жывучы амаль на мяжы, Гарась у той-жа дзень, калі даведаўся ад Міхалкі пра небясьпеку, пачаў рыхтавацца да ўцёкаў. Уначы ён здолеў адвезьці жонку й Марынку на тэй бок і вярнуцца назад, каб наступным рэйсам забраць найбольш каштоўнае з гаспадаркі.

У сенцах стаялі спакаваныя мяшкі, за лаўкай у хаце тырчэла вострая сякера. «Трэба ўзяць і яе, -- падумаў, -- мала што можа здарыцца ў дарозе». Гарась паставіў сякеру каля дзьвярэй, каб не забыцца, і ўвайшоў у хату. Якое гора ляжала ў яго на сэрцы, што трэба пакідаць абжытае мейсца! І з-за каго? З-за зладзюшкі Зьмітрачка! Ён стаіць і глядзіць у задуме ў вакно. Раптам яму здаецца, што пачынаецца вайна. Чырвоная армія ўцякае ў паніцы. Калгасы разбураюцца. Зноў аднаўляецца парадак. І што-ж тады Гарась зробе? Ён зловіць уцякаючага прыхвастня Зьмітрачка. «Ну, што -- накіраваў? Насмактаўся чалавечай крыві? Ты дурань! Думаў, зьнішчыўшы гаспадароў, жыцьцё людское палепшыцца?! Сьвет трымаецца на працы, а не на рабунку. Так, на працы! Бясконца рабаваць нельга!» І ён цягне Зьмітрачка на расправу грамады. «Во ён! Во той, хто разбурыў наша жыцьцё!» А народ крычыць: «Сюды яго цягні! Сюды!..»

-- А вайна павінна быць! -- шэпча сам сабе Гарась. -- Без вайны цяпер ніяк усяго гэтага не разблытаеш... Або здарыцца які-небудзь заварот кішок!? Усё роўна, павінна-ж нешта адбыцца!?

Гарась варушыцца, шастае рукамі па гарачай галаве. Якраз у гэты час пастукалі. Баян злосна ірвануўся да варот. І ў Гарася -- здалося яму -- усё абвалілася ў сярэдзіне. Але ён бярэць сябе ў рукі й падыходзіць да вакна. Адсоўвае фіранку й глядзіць у цемру ночы. «Яны!.. Утрох!.. Яшчэ-б з гадзінку, і ўсё было-б скончана!..» Млосьць разьліваецца па целу. «Кінуць усё!.. Паваліцца й узяць сябе за горла!..» Гарась з хвіліну стаіць у роздуме. Раптам здрыгануўся ўсім целам, нібы яго аблілі студзёнай вадой, і рашучасьць вярнулася да яго...

Выйшаў у сенцы.

-- Вон, Баян! Вон! -- крыкнуў цераз дзьверы як мага спакайней.

Знадворку чуваць быў пагрозьлівы голас Зьмітрачка.

-- А ну, адчыняй там, кулацкая лахудра!

-- Божа сьвяты й міласьцівы, выратуй!..

Узяўся за засоў, расчыніў дзьверы.

-- Людцы добрыя, чаго-ж так злаваць? Папярэдзілі-б, што прыйдзеце: яечню, паўкварты на стол!.. Ці-ж няма чым спаткаць госьцейкаў?! Ёсьць, хвала Богу, і скварка й чарка... дзякуючы нашай, рабоча-сялянскай уладзе... Жывем, хвала Богу!

Увайшлі ў цёмныя сенцы гуськом. Правай рукой Гарась намацаў сякеру. Стаіць! Зьмітрачок ішоў першым, за ім -- старшыня райвыканкому, апошнім прадстаўнік. У рукох у яго наган. Месяц то выплывае з-за хмары, то зноў схаваецца. Гарась глядзіць на наган. «Вось якія госьцейкі! Праваронь, Гарась, і тут табе хаўтуры!..»

-- Усе дома?

-- Усе, усе! А дзе-ж ім быць? Праходзьце, праходзьце ў сьвятліцу!..

А сам застаецца, нібы дзеля таго, каб не пакінуць незачыненымі сенцы. Усе ўтрох пасталі ланцужком перад дзьвярыма, Зьмітрачок шукае закрутку.

-- Божа сьвяты й міласьцівы, памажы й даруй!

Рука Гарася апускаецца на сякеру. Сьвятло месяца абвілася паяском на шыі прадстаўніка. Узмах сякеры -- і ён цяжкім мяшком аб'ехаў на падлогу! Старшыня райвыканкому кінуўся схапіць наган, які вываліўся з бразгатам з рук прадстаўніка, але быў павалены другім узмахам сякеры. Зьмітрачок крутнуўся, нешта закрычаўшы, дый ірвануўся да дзьвярэй на двор.

-- Не, ты ўжо цяпер застанешся тутака! -- спакойна прамовіў Гарась. -- Хацеў крыві, от табе кроў!..

І зьнёс яму галаву сякерай...

* * *

Гойдаюцца сосны, шумяць, гамоняць!.. Вецер сьвішча ў іхным гальлі! Гоніць з поля хвалі сьнегу. Кідае яго на сосны, круціць каля галамнёў. І страшна наўкола: ходзяць галодныя людзі, забіваюць, рэжуць, рабуюць...

1943-1977

47

Партыйны таварыш

Мы стаялі каля сьцяны нейкае няжылое будовы: я, Барута, Саладуха й Капейка. Барута трымаў на павадку сваю Флейту, а Капейка -- Султана. Мой Залівай зараз-жа абнюхаўся з Султанам, і яны, у адзнаку згоды й сяброўства, павілялі хвастамі. Але Барутава Флейта, як паненка, трымалася ўбаку. Машына ўсё ня прыходзіла, і чакаць яе на такой сьцюжы было надакучліва. У нас ужо зьявілася падозраньне, што яна й зусім ня прыйдзе, што часам, здавалася, і паляваньне не адбудзецца. А яно абяцала быць удалым, бо ўночы, як на заказ, выпала добрая пароша -- радасьць паляўнічых. Сьнег ляжаў мяккі й пульхны, як вата, і сьлед на ім трымаецца, як аддрукаваны: сабакі йдуць па такім сьледу за зьверам упэўнена, аж пакуль зьвер не натрапе на паляўнічага...

На ўсходе ўжо пачало разьвідневацца, калі з-за рогу будыніны раптам выбліснула мяккае сьвятло фараў машыны. Мы адразу-ж заварушыліся, а ганчакі пачалі папіскваць на павадкох, прадчуваючы блізкае паляваньне. Але радасьць наша была

прадчаснай: высадзіўшы, не даязджаючы да нас, двух пэрсон, машына зрабіла круг і пайшла назад. Адзін з тых, што высадзіліся з машыны, быў высокі і тонкі. Ішоў ён да нас шырокімі крокамі, быццам нартамі соўгаў; на правым плячы дубальтоўку трымаў. Другі, кароценькі й гладкі, як катляк, з галавой, уросшай у плечы, тупаў за ім дробненькімі крокамі.

-- Не хвалюйцеся! -- зьвярнуўся высокі да нас. -- Машына зараз прыйдзе. У «эмцы» (марка машыны) мы ўсё роўна не зьмясьціліся-б усе. Я даў загад з гаража ўзяць крытую двохтонку, у ёй будзе куды выгадней і вам і вашым сабачонкам...

Гаварыў ён спакойным і ўпэўненым голасам, мяккім і прыемным, і гэта выклікала ў нас да яго сымпатыю. Барута, які ўкладаў плян паляваньня і ўмоўліваўся аб сродках даезду з гэтым-жа высокім, раптам замітусіўся:

-- Ды што-ж гэта я?! Знаёмцеся! Гэта, гмм... таварыш Балевіч, кожны з вас, пэўна, ведае яго з нашых газэтаў! А гэта... -- паказаў на кароткага, -- гэта...

-- Адзін з партыйных таварышаў, -- падказаў высокі. -- А па прозьвішчу Галякоў.

-- Так, будзем знаёмыя, партыйны таварыш Галякоў! -- і Барута падаў яму руку.

Перазнаёміўшыся, мы зноў прытуліліся да сьцяны, дзе было крыху зацішней. Курылі й размаўлялі. Партыйны таварыш -- будзем яго так і называць -- доўга ўзіраўся ў нас. Потым вусны ягоныя натапырыліся, неяк па-брыдкому зморшчыліся, і ён прамовіў:

-- Так сказаць, пралетарскія ахвотнікі? Што-ж, добра! У гэтым няма нічога дрэннага... Уладзімер Ільліч таксама грашыў гэтым. Гаспадары цяпер -- хто? Мы -- пралетары! Праўда, таварыш Капейка? -- і стукнуў Капейку далоньню па куцай скуранцы, у якой той курчыўся ад сьцюжы.

Ува ўсім і заўсёды згодны, Капейка кіўнуў галавой. У гэты час пад'ехала машына. Балевіч сеў разам з намі, пад брызэнтавы навес, тлумачачы гэта тым, што любе паслухаць паляўнічыя байкі.

-- Тады я пайду ў кабінку да шафёра, -- адгукнуўся Галякоў.

-- Не, -- запярэчыў Балевіч. -- Вы там сапрэеце ў сваім цёплым убраньні. У кабінку пойдзе таварыш у скураной куртцы: ён мёрзьне...

Гэта выклікала ў нас да яго яшчэ большую сымпатыю. Калі ўсе апынуліся ў машыне, стала зусім відавочным, што «эмка» сапраўды не зьмясьціла-б нас усіх; аднаго разу мы ехалі гэтакай кампаніяй на «фордзіку», які быў крыху прастарнейшы за «эмку», аднак сабак мусілі трымаць на каленях.

Як толькі зрушыліся зь мейсца, адразу-ж пачулі палёгку: як-ніяк, а едзем! І едзем -- куды? Якраз у самы асяродак зьвярынага сьвету ў Любошчынскую пушчу, пра якую так шмат нагаворана паляўнічымі.

Маючы справу штодзень з трамваямі, якія ў Менску заўсёды бітком набіты людзьмі, я сядзеў і думаў: якая выгода мець хаця-б старэнькую якую машыну. Сядзіш сабе на мяккай фатэлі ды пакурваеш ды ў вакенца пазіраеш; падабалася тут -- спыніўся, не падабалася -- коціш далей! Пэўна, пра гэта самае думаў і Барута, бо ў гэты-ж мамэнт прамовіў да Балевіча:

-- Гаспадар, -- дазвольце клікаць вас гэтак -- добра было-б, каб вы пачасьцей нас вазілі, а мы-б за гэта зайцоў вам стралялі...

-- Хацеў-бы, -- адгукнуўся той з ухмылкай. -- Але часам не выпадае: то машына занятая, то я заняты...

Машына спраўна бегла па зацярушанай сьнегам шашы. Насустрач імчаліся тэлеграфныя слупы, рэдкія дрэўцы й дарожныя знакі. Там-сям міналі вёскі; з каміноў хат падымаліся сінія слупікі дыму. Гледзячы на яго, роіліся ўспаміны з гадоў мінулых, і тады, быццам-бы наяве, пахла смажанай скваркай, вясковай каўбаскай з часначком, перчыкам і нямолатай муштардай. Траплялі на вока й разбураныя «вялікім згонам» сядзібы хутаранаў з адзічэлымі ўжо каля іх яблынямі й дулямі, і тырчэлі ўгару голыя каміны печаў...

-- А от скажыце, гаспадар, -- зьвярнуўся Барута да Балевіча, -- як гэта зразумець: у дваццатых гадох савецкая ўлада рабіла тут землеўпарадкаваньне й садзіла людзей ня толькі на пяцідворкі, але й на хутары. А у трыццатых гадох гэтая-ж улада загадала зносіць гэтыя хутары й пяцідворкі й некаторых уласьнікаў іхных навет саслала да Сыбэрыі... Зразумела, я так ня думаю, але можна было-б падумаць, што ў трыццатых гадох ня было ўжо савецкае ўлады...

-- Прышчэпаў нарабіў хутароў і засьценкаў! -- з жарам умяшаўся Галякоў. -- Гэта ягоная дывэрсія супроць савецкае ўлады... Ён і пакараны за гэта!

Барута не здаваўся:

-- Але-ж Прышчэпа, ці Прышчэпаў, як вы кажаце, дзейнічаў на падставе пастановы цэнтральнага камітэту партыі й дэкрэтаў з Масквы. Па-другое, чаму дывэрсія? Жыцьцё пацьвердзіла, што найлепшай хвормай сельскай гаспадаркі на Беларусі зьяўляюцца дробныя селішчы й хутары, бо тутака ў нас няма тлустых стэпаў, як на Ўкраіне ці ў Заходняй Сыбэрыі, дзе не патрэбна ўгнаеньняў і можна разгарнуцца з камбайнам і іншымі вялікімі машынамі... Тутака ё: кавалачак нівы, праз гоні -- рэчка альбо горка, лес і балота, а то й багна, градка сярод іх зь пяском, дзе нішто не расьце... І вось я кажу, колькі было працы пераносіцца на новыя мейсцы, а цяпер, бачыце, тырчаць голыя каміны, і шмат хто з тых працавітых і добрых гаспадароў ужо загінуў у той Сыбэрыі...

Барута абвёў усіх позіркам.

-- Ну, гэта можа ўжо і занадта!? -- заўважыў мякка Балевіч. -- Хаця, трэба прызнаць, зямельная палітыка была ў нас часам непрадуманая й нявыразная, што пацягнула за сабой вялікія ахвяры...

-- Кіньма пра гэта! -- скамандаваў Галякоў. -- Давайце, я вам лепш раскажу праўдзівую гісторыю з часоў змаганьня за ўладу на паўдні, якая вам пакажа, якім павінен быць сапраўдны бальшавік.

І ён расказаў, як у дзевятнаццатым годзе, будучы ваенкомам палка, уласнаручна застрэліў свайго найлепшага таварыша, падазраючы яго ў здрадзе.

-- Бяз усякай лішняй валакіты! Вось гэтак: наставіў наган паміж вачэй і выпаліў! Хай ведае: рэвалюцыя з такімі не жартуе!..

Барута сумным позіркам абвёў нас усіх і пакруціў галавой.

-- Але-ж, вашэць, вы не яго пакаралі, а самога сябе!

-- Як так? Я яго застрэліў!

-- Я, як праўнік, мушу вам сказаць, вы зрабілі вялікае злачынства, і ён цяпер вас усюды сьцігае, што відаць з вашага апавяданьня.

-- Ён мерыўся перабегчы на другі бок з дачкой белагвардзейскага ахвіцэра, гэта я дакладна ўдаводніў!.. Ну, і атрымаў па заслугах!

-- Гэта вы цяпер так кажаце, а прычына была іншая, што вы яго забілі: можа, вам перашкаджаў у чым, можа, зайздрасьць, не падзялілі гэтай дачкі ахвіцэра...

-- Менавіта, я яго папярэджваў: не зьвязвайся з гэтай дзяўчынай!

-- Ну, вось спрунжына й выкрылася! -- урачыста выклікнуў Барута. -- Толькі ўсебаковы разгляд справы ў судзе можа ўстанаўляць віну чалавека...

-- Які можа быць суд над ворагам?! Пад ногаць -- і ўсё! Рэвалюцыя ня церпіць валакіты! Калі-б лёс кожнага высланага кулака вырашаўся судом, хапіла-б працы на дзясяткі год, а партыя, кіруючыся рэвалюцыйным пачуццём, зьліквідавала іх за тры гады...

-- Гісторыя будзе судзіць нас! -- выкрыкнуў Барута. -- Але лічу лішнім гаварыць з вамі на гэтую тэму...

-- Праўда, досыць аб гэтым! -- сказаў зноў мякка Балевіч, які, апусьціўшы долу вочы, слухаў спрэчку.

Мы пад'язджалі да вызначанага па пляну мейсца. Тут дарога зьбягала ўніз. Направа ляжала катлавіна балацяных імшараў. За ёй сінела смуга лесу. Улетку на гэтых імшарах, сярод досыць густых, але дробных зарасьляў, было даволі шмат цецярукоў і пардвы. Цяпер з-пад сьнегу тырчэлі адно голыя дубцы, ды сярод іх чарнелі аброслыя бурым мохам купіны. Цецярукі й пардва мусілі шукаць сабе другое мейсца, дзе можна схавацца ад сьцюжаў і знайсьці корм. Але зайцы маглі быць сярод купін. Пастанавілі распачаць паляваньне адсюль. Балевіч загадаў шафёру ехаць назад у Менск, бо машына магла спатрэбіцца там па якой-кольвек прычыне, але на шостую гадзіну вечара загадаў прыехаць па нас.

-- Перакусіць-бы перад маршам! -- прапанаваў Саладуха, абмацваючы сваю торбу, зь якой тырчэла чырвонагаловая бутэлька.

-- Чаго-ж, не забаронена! -- адказаў нехта.

-- Ды аднаму неяк няёмка, -- падміргнуў Барута. -- Быццам-бы хаваюся?

-- Ведаем, ведаем! Шукаеш хаўрус прапусьціць па аднэй?!

-- Тады давайце пойдзем на край таго лесу, -- прапанаваў Балевіч. -- Там будзе й зацішней і прыямней...

Селі на сухі й мяккі мох пад разгалістымі ёлкамі. Саладуха адкаркаваў бутэльку й наліў чарку «прадукту сацыялістычных пяцігодук», як называлі гэрэлку ў той час у народзе, ня ў прыклад іншым прадуктам, якіх у продажы ня было ніколі ўдосталь.

-- Ну, дык будзем здаровы! -- сказаў і перакуліў чарку. Потым перадаў бутэльку Баруце. -- Кіруйце там далей! -- загадаў.

Бутэлька павандравала з рук у рукі аж да самага адказнага. Выпіўшы другую чарку, Саладуха зазначыў:

-- Цьфу! Сядзеў у машыне, як пад жандарам... Цяпер адразу палегчала... -- і павёў рукой па грудзях.

Усе зразумелі, што гэта намёк на партыйнага таварыша.

-- Ніякіх жандараў не павінна быць! -- зазначыў Балевіч і засьпяваў: «Отречёмся от старого мира...» -- Гэта ў нас у гімназыі гэтак сьпявалі, бывала.

-- А ў нас крыху іначай! -- уставіў Барута:

«Отречёмся от серого мыла и покинем в баню ходить».

Усе зарагаталі, а больш за ўсіх рагатаў сам «адказны». Потым дадаў:

-- Ну, што-ж -- і пакінулі! Выраб мыла, ні шэрага, ні белага, нашымі бюракратамі па пляну не прадугледжаны.

-- А дазвольце пацікавіцца, гаспадар, у якой гімназыі вы вучыліся?

-- У клясычнай, што на былой Губэрнатарскай, -- адказаў Балевіч. -- Але скончыць не давялося.

Выцягнуў зь кішэні партфэльчык і дастаў зь яго пажоўклую фотакартку, на якой, прыпёршыся да сьцяны вялікага драўлянага дому, стаяў хударлявы даўганогі хлапчына ў картузе з галінкай над ліха заламаным казырком.

-- Гмм... Гімназыя гэтая давала досыць ладныя веды! -- заўважыў Барута. І потым, вяртаючы картку: -- Бацька ваш, пэўна, меў маёнтак, мяркуючы па пабудове?

-- Ніякага! Усё жыцьцё прабыў лясьнічым у князёў Аляўковічаў, і будыніна гэтая іхная...

-- Вы зь беларускага паходжаньня, зразумела?

-- Для мяне, як для члена партыі, падобнай праблемы не павінна было-б існаваць. Аднак, ці я мушу крывіць душой? Корань маіх продкаў ідзе глыбака ў вякі гэтае зямлі! І я сам нарадзіўся тут, атрымаў ад маіх бацькоў гарт жыцьця, вырас тут, усмактаў у сябе пах гэтых цудоўных волатаў-сосен! -- зірнуў на лес. -- Гэта мая Бацькаўшчына! Люблю я яе ўсімі фарбамі мае душы! А іншыя землі, народы -- гэта толькі суседскі двор для мяне: мушу быць у кантакце зь ягонымі жыхарамі для агульнай карысьці...

-- Дробна-мяшчанскі перажытак... -- ціха прамовіў партыйны таварыш.

Балевіч чуў гэта, але не палічыў патрэбным пярэчыць.

-- Вы кажаце: хвалюе вас усё наша, -- прамовіў Барута. -- Гэта добра. Гэтак і павінна быць...

* * *

Сабакі, як толькі пусьцілі іх з павадкоў, узялі сьлед, і жвавае яхканьне заліло ваколіцу. Але касы ўсё яшчэ нейдзе ляжаў, прыціснуўшы да галавы вушы: авось, не заўважаць! І толькі тады узьляцеў мячом угару, калі Флейта, аж зь віскам, напаролася на яго. Робячы дугу (нездарма -- касы!), ён пакаціўся пад гару. Страляць нікому ня трапілася з прычыны стромкасьці й нечаканасьці, зь якой ён ускочыў і потым зьнік за гарбом гары. Флейта й Запявала, як спрэжаныя, кінуліся за ім, нягледзячы на тое, што трэці іхны сябра, Капейкаў Султан, неаднокраць зьбіваў іх з тропу; урэшце ён натрапіў на стары сьлед і пайшоў ім «упяту», гэта значыць, у адваротным напрамку, куды пабег зьвер. Магло атрымацца ўражаньне, што заяц павярнуў назад. І гэта зьбіла некаторых з панталыку: Галякоў, із стрэльбай напагатове, насіўся па касагору; Балевіч схаваўся за ёлачку: авось, набяжыць зьвярынка!

Галасы Флейты й Запявалы чуліся ўжо здалёк. Гэта паказвала на тое, што касы вырваўся на чысты прастор і цяпер імчыцца некуды да бліжэйшых хмызьнякоў, дзе мог-бы пераблытаць свой сьлед петлямі й нечаканымі кідкамі ўбок. «Дзе-ж ёсьць гэтыя хмызьнякі?» Я падняўся на грэбень касагору, каб агледзецца і потым ужо браць адпаведны кірунак. Кілёмэтры за паўтара, праўда, сінела смуга маладога сасоньніку, сярод якога вылучаліся й старыя магутныя кражы. «Напэўна, заяц ужо там? -- падумаў. -- І пакуль яго вытураць сабакі, пройдзе нямала часу». Маляўнічай нізінай, па якой віўся невялікі ручай, там-сям пакрыты ўжо маладым празрыстым лядком, я скіраваўся да таго ляску. На ўскраіне яго рос зусім дробны й непразазны для чалавека хвойнік. Вузкай віляючай сьцежкай я падаўся ў глыбіню лесу. Праз колькі часу выйшаў на старую засеку, над якой якраз і стаялі, як вартаўнікі, тыя магутныя, шматгадовыя волаты-сосны. Тут было так ціха й прыгожа, што я, папраўдзе, ня мог зрушыцца зь мейсца: паміж соснамі там-сям крывавілася каліна й полымем шугала рабіна. Глядзеў угару на кроны соснаў. «Жыцьцё! От так от: адны паміраюць, другія падымаюцца на іхнае мейсца! Родная маці Беларусь, ніхто й ніколі, ніякі бандыта, якой-

бы ўладай ён ні валодаў, ня зможа спыніць гэтага працэсу на тваіх грудзёх!»

Знайшоў чысты ад сьнегу пень і сеў. З захапленьнем і разам з тым з роспаччу пазіраў на бронзавыя каломны волатаў-дрэваў, з роспаччу таму, што мала ўжо іх уцалела. Ведаў, за часоў гістарычнае Літвы -- Беларусі лес гэты ўваходзіў у Ачолкаўскую пушчу, якая цягнулася далёка на паўдзённы захад і зьлівалася з пушчамі Тураўскай і Лунінецкай. Пладзіліся тут тады зубры й туры, куніцы й рысі, ласі й дзікі, а ў шматлікіх рачулках -- бабры. «Яшчэ адна-дзьве пяцігодкі, і шмат спатрэбіцца часу аднавіць усё гэта...» І цяжкі смутак лёг на сэрца. «Лес для беларуса -- кармілец, сховішча й абаронца перад лютым ворагам у часы грозныя, радасьць і натхненьне -- у часы спакойныя... Як-жа дапусьцілі мы, што вынішчаюць яго чужакі для свайго ўзбагачэньня й славы бяз нашага ведама й дазволу?! Хапала-ж у нас і кемнасьці, і адвагі, і трывалкасьці, каб бараніцца на працягу вякоў ад лютых ворагаў з захаду і усходу». Комкаў сьнег і лыкаў яго, каб заглушыць пякучы боль унутры...

Сядзеў доўга. Галасы ганчакоў былі ўжо зусім заглохлі, але потым зноў сталі чутнымі. Значыць, заяц нейдзе блытае па зарасьнякох. Раптам недалёка хруснуў сьнег. Я ўсхапіўся. Узяў напагатоў дубальтоўку. Але з-за густых ялінак, якія абступілі мяне з таго боку, адкуль пачуўся хруст сьнегу, нічога ня мог убачыць. «Пэўна, з дрэва зваліўся ком сьнегу?» -- падумаў. І ў гэты мамэнт улавіў нейкае нявыразнае мырматаньне: як-бы нехта ўпаўголас маліўся альбо штось дэклямаваў. «Можа, з чалавекам якое-колечы няшчасьце? І можа тое, што я прымаю за маленьне ці за дэклямацыю, ёсьць слабы лямант аб дапамозе?» Я пасунуўся на некалькі крокаў у напрамку, адкуль чуліся гукі. І тое, што я ўбачыў, крыху мяне й зьдзівіла й занепакоіла: бяз шапкі (яна вісела разам із стрэльбай на суку ёлкі) стаяў Балевіч і, скіраваўшы зрок у цудоўна-празрысты прастор неба, пад якім маячылі кроны соснаў-волатаў, дэклямаваў верш; пры гэтым правая рука ягоная то апускалася, то падымалася ў такт рытму верша. Напружыўшы слых, мне ўдалося ўлавіць адну із строф:

Ляпей жабрачы лёс,
У рукі кій, за плечы торба;
Ляпей страха нябёс,

Бясконцы шлях і леры корба...

Верш Уладзімера Жылкі! -- успомніў я. -- Але-ж паэта сасланы, і творы ягоныя забаронены, а можа й папалены? Хутка зразумеў: Балевіч, пэўна, меркаваў, што яго тут ніхто не пачуе, і пад уплывам красы пушчы захапіўся красой жылкаўскай лірыкі. Каб не паставіць яго ў няёмкае становішча, я прыцішыўся на мейсцы, разьлічваючы, што ён пастаіць-пастаіць дый пойдзе ў іншы бок ад мяне. Але гэтак ня здарылася: праз колькі часу ён скіраваўся якраз у напрамку да мяне. Я адчуваў сябе не на мейсцы: час неспакойны, арышты, ссылкі, у тым ліку й паважаных асоб з самой партыі, асабліва зь ліку беларусаў! Чалавек можа падумаць: шпіёніў, падслухваў... Мне нічога іншага не заставалася, як ісьці яму насустрач.

Балевіч ня выявіў ніякае трывогі. Спыніўся, убачыўшы мяне, і спакойна заўважыў:

-- Як добра тут, га?! Зірніце на гэтыя шапкі соснаў! Ані варухнуцца! Стаяць і быццам-бы дрэмлюць у ціхай задуме! Бог ты мой, які цудоўны наш беларускі лес! Здаецца, нідзе больш такога няма! Сапраўды, я адчуваю сябе памаладзеўшым на дзясяткі год...

-- А колькі-ж вам у сапраўднасьці?

-- Не паверыце! Усяго толькі на чацьверты дзясятак падбіраецца...

-- А галава ўжо сівее!

-- Ня дзіва...

Ён глядзеў на мяне сваімі сінімі спакойнымі вачыма, такімі сінімі, як сёньняшняе неба.

-- Хіба так цяжка? -- адважыўся я спытаць.

-- Ці цяжка, пытаецеся? Звар'яцець можна! Дый вар'ююць! -- задумаўся. -- Ото, стаў пад сасну й гляджу... Музыка гэтых вашых сабачонак... От, нейдзе выкручваецца, думаю, з-пад іх маленькая істота, на мове нашай -- заяц! Хітрыць, блытае сьлед... Адным словам, робіць тое самае, што й мы з вамі ў падобнай сытуацыі, -- засьмяяўся, -- калі насядуць са-ба-чон-кі!.. Здаецца яму часам, урэшце адарваўся, перахітрыў, уцёк; можна прысесьці й адпачыць, а тут зноў сабачонкі... Якія ў яго могуць быць у гэты час адчуваньні?! І ўспомніўся мне верш Уладзімера Жылкі, той, дзе паэта гаворыць:

Ляпей жабрачы лёс,
У рукі кій, за плечы торба...

Люблю беларускую лірыку! -- выклікнуў. -- І шкадую, што яе цяпер так незаслужана рэжуць!

Падзьмула цёплым вецярком. Сосны маркотна зашумелі. Зачапіўшыся за зялёныя кроны кражаў, сонца пачало сплываць на дол. У гэтую пару дні кароткія, і мы скіраваліся да шашы. Спачатку йшлі краем засекі. Усюды ляжаў павалены лес: і ў шуртах, і проста калодамі на зямлі. Там-сям ужо пакрыўся грыбком, спарахнеў, гніў...

-- Правая рука ня ведае, што робіць левая, -- капануўшы нагой гнілое палена, прамовіў Балевіч. -- Плян нарыхтовак лесу нашы бюракраты склалі, у Маскве зацьвердзілі й перадалі ЛесБелу для выкананьня, а пра тое, што няма каму й няма на чым вывезьці лес, забыліся... І ляжыць цяпер, грыбком аброс, гніе... а ў горадзе няма чым кватэру абагрэць...

-- Ну, вось, і я якраз думаў пра гэта, седзячы там, на пні. Вы -- партыйны, а я -- беспартыйны, але мы абодвы беларусы, і думкі нашыя ў адносінах да дабра нашае бацькаўшчыны цякуць у адным напрамку. Скажыце-ж, калі ласка, як гэта здарылася, што мы згубілі ўладу над сваім дабром?!

Пытаньне, відаць, дужа заскочыла Балевіча. Ён неяк зусім па-інакшаму зірнуў на мяне й маўчаў. Пасьля ўжо сказаў:

-- Думаецца мне, што тут адбыло галоўную ролю бытуючае ў нашым народзе пераканаьне, што мы -- нізшыя й мусім выконваць нейчую волю. Гэта зусім не азначае, што мы былі заўсягды такімі! Якраз наадварот! Вам, напэўна, ведама, што крывічы й дрыгавічы былі найлепшымі калёнізатарамі, гаспадарамі, будаўнікамі, умелі ладзіць з суседзямі й пашырылі сваю ўладу далёка за межы сучаснай Беларускай рэспублікі ўва ўсіх напрамках... А літоўскім плямёнам накінулі навет сваю мову й культуру! Комплекс нізшасьці гэтай пачаў расьці ў нашай псыхіцы ад часоў, калі нас выраклася наша кіруючая эліта. Гэта -- вынік Люблінскай вуніі!

-- Здрада, значыць?!

-- Так, можна назваць гэта здрадай: народ пакінуты быў на волю лёсу й на ганьбу хцівых суседзяў... «Сьмерд! Быдла!» Гэтак, бясспрэчна, было з боку нашага экстэнсыўнага заходняга суседа... А ўсходні?! Ён ведае толькі адно: браць тое, што дрэнна ляжыць...

-- Здрада! Так, здрада, гэта, бадай, бясспрэчна! -- прамовіў я ў разгубленасьці. -- І мусіла-б яна быць урокам для нас. Тым часам

здраднікі -- о Божа! -- і цяпер, калі ўжо фізычна выразана наша другая эліта, вырасшая на новых пачатках, пляскаюць у далоні й крычаць: «Хвала! Патапіць нацдэмаў!» Быццам-бы не разумеюць, што, па сутнасьці, ніякіх нацдэмаў, як ворагаў, ня было, быў страх у акупанта перад растучай нашай сілай...

Абодвы былі так узрушаны, што словы здаваліся ўжо лішнімі.

Лес абрываўся раптоўна, простай, як страла, лініяй. За ім ляжала шэрае куп'істае балотца з параскіданымі па ім рэдкімі карлікавымі сасонкамі й бярозкамі. Сьцежка вяла нас па ўскраю гэтага балотца, абгінаючы няёмкія для праходу мясьціны. З правага боку, на пясчаным смыку, чарнеў перасохлы лубін. Ужо наводдаль было відаць, што сьнег паміж ім моцна сьпісаны сьлядамі зайцоў.

-- Можа зьвернем, палазім тут па купнякох? -- прапанаваў я.

-- Думаю, ня варта! -- адказаў Балевіч. -- Калі што-небудзь і было паблізу, дык захавалася ў непралазныя хмызьнякі.

І якраз у гэты час з-за купіны стромка выскачыў заяц, быццам-бы толькі й чакаў, каб мы яго паднялі. Балевіч трымаў дубальтоўку ў рукох, я -- на плячы. Пакуль ён цэліўся, я на ўсякі выпадак таксама падрыхтаваўся да стрэлу, хаця й быў упэўнены, што заяц ад Балевіча ня пойдзе. Але стрэлу не пасьледавала. Урэшце Балевіч і зусім апусьціў стрэльбу ўніз.

-- Вось і пайшоў! -- сказаў ні то з прыкрасьцю, ні то з задавальненьнем. Мне страляць было запозна ўжо, і я спытаў:

-- Чаму вы яго пусьцілі? Мелі добры выпадак зрэзаць яго!

-- Куркі забыўся паставіць.

Я бачыў: куркі былі пастаўлены. Паказаў яму на памылку.

-- Загледзеўся зьвярком! -- прызнаўся ўрэшце. -- Бачыце, бачыце, як пакаціў на ўзгорак? Ма-ла-йчы-на!

Але зьвярку ўсё-ж ня было суджана больш жыць: насустрач яму выскачылі з-за балотца сабакі, якія, пэўна, ішлі ўвесь час па ягоных сьлядох. Заяц пад прамым крутам ірвануўся ўбок і мячом пакаціўся па грэбню ўзгорку. Але ў гэты час яго пераняў стрэл. Зьвярок з разгону перакуліўся колькі разоў праз галаву.

* * *

Страляў па зайцу Барута. Калі мы падышлі да яго, за ягонай сьпіной іх вісела тры.

-- А вы што? Пустымі абодвы?

-- Паляўнічае шчасьце здрадзіла нам! -- ізь сьмехам адказаў Балевіч.

-- Расстраляць па загаду багіні Дыяны! -- адвязаў ад сваёй торбы аднаго зайца й прывязаў яго да торбы Балевіча. -- А вам будзе той, што ляжыць на зямлі, сьвяжэйшы... Для мяне чатыры зашмат!

Хаця можна было-б яшчэ пахадзіць, але мы скіраваліся да мосту, куды мелася прыйсьці машына. Пэйзаж адгэтуль адчыняўся досыць прывабны: па нізіне вілася рэчка; яе апавілі ланцужком альховыя зарасьлі; над нізінай шырака разьлёгся парк былога маёнтку, цяпер саўгасу; двохпавярховы палац ягоны панаваў бялізной і раскошай над мясцовасьцю; убаку ад парку з-за аголеных бярозак выглядала сваім вострым купалам драўляная каплічка з пагнутым і паржавелым крыжом над ёй... Вёска, цяпер калгас імя Тэльмана, шэрымі саламянымі дахамі выцягнулася па дну нізіны, прыціснутая рэчкай да крутога гліністага абрыву.

Мы ўзышлі на мост. Над паркам кружылі зграяй вароны й галкі. З маёнтку цягнула кісьлінай сілосу. Чуліся галасы людзей, але ў вёсцы ня было відаць ніякага руху -- здавалася вымершай; хацелася пабываць на ейнай вуліцы й распытаць, як цяпер жывецца людзям.

Падышла машына. Мы залезьлі пад ейны брызэнт. Шафёр даў некалькі сыгналаў для тых, каго яшчэ ня было. Аднак на сыгналы ніхто не адгукнуўся.

Расчынілі свае торбы й пачалі перакусваць. Які смачны быў хлеб і «кулацкае» сала, якім частаваў нас Балевіч!

-- Партыйны таварыш прывёз зь вёскі, -- растлумачыў. -- Езьдзілі некага выправаджаць...

Выпіўкі ў нас ня было ніякай, але ў тэрмасах была яшчэ не астыўшая кава. Запівалі хлеб ёю. Вялі гутарку аб тым, як шмат было дзічыны на Беларусі яшчэ нядаўна. У гэты час пачуўся нейкі енк. Выглянулі з-за брызэнта: бег і енчыў Капейка. Убачыўшы нас, залемантаваў:

-- У імя Айца й Сына, хутчэй на хутар, там партыйны таварыш людзей пастраляў.

Балевіч скочыў зь мейсца.

-- Дзе? Хутчэй! -- крыкнуў.

Мы пасьпяшылі за Капейкам. Калі прыбеглі на хутар, партыйны таварыш ляжаў ужо зьвязаны.

Высьветлілася наступнае: Саладуха, Капейка й Галякоў спаткаліся ў лесе. Селі перакусваць. Спачатку ўсё йшло зусім добра: Галякоў агітаваў за савецкую ўладу й разважаў аб задачах расейскага пралетар'яту ва ўсім сьвеце. Капейка, каб усё было ціха, ківаў яму галавой у знак згоды. Саладуха-ж налягаў на гарэлку. Такім чынам было выпіта два паўлітры «лубінавай» -- Капейкаў і Саладухаў. На трох гэтага было аж занадта дастаткова. Але Галякоў адчуваў сябе на паўдарозе. Паставіўшы на пень і «расстраляўшы» парожнія бутэлькі, ён выняў з рукзака сваю, поўную і якраз «адборную». Паклалі ў агонь палак і зноў пачалі піць. Кіраваў усім гэтым Саладуха. Раптам галава ягоная паехала ўніз. А потым ён і зусім паваліўся на гальлё, на якім сядзеў.

-- Гэта ўжо дрэнна, трэба рушыцца, а ты спаць, -- прамовіў Капейка, тармосячы яго за плячо.

-- Вы ідзіце, ідзіце. Я даганю вас...

-- Не, я цябе тутака не пакіну, каб крукі вочы павыдзяўблі...

Галякоў тым часам завалодаў бутэлькай.

-- Ці не пара паставіць кропку, таварыш партыйны? -- спрабаваў спыніць яго Капейка.

-- Каціся, калі ня хочаш быць маім таварышам!

-- Усякаму рад дапамагчы, ды няма сілаў. Выпілі добра, і на гэтым хвала Богу!

-- Што ты ўсё Бог ды Бог!?

-- Няма нікога вышэй за яго, дык ён на першым мейсцы.

-- Ну, дык каціся зь ім!..

Урэшце была расстраляная і апошняя бутэлька. Галякоў узьняўся й пайшоў, валочачы за сабой ногі. Капейка некаторы час чуў, як ён спрабаваў зацягнуць: «По долинам, по загорьям...» У гэты час прачнуўся Саладуха.

-- Што, пайшоў? -- спытаў.

-- Аняго?! Ня будзе-ж ён тут спаць, як ты!

-- Падтрымай мяне -- пойдзем і мы!

Тым часам Галякоў выйшаў на паляну. На ўскраю яе стаяў хутарок. Спыніўшыся ля яго, Галякоў закрычаў:

-- Снести хутора!

На гэты крык выскачыў і пачаў брахаць беленькі сабачка. Галякоў нацэліўся ў яго із сваёй дубальтоўкі. Сабачка сеў на сьнег, падрапаў лапкай за вухам.

-- Ага, не боишься?

Націснуў на курок, і сабачка закруціўся на мейсцы, афарбоўваючы крывёй сьнег. Далей пачалося яшчэ больш дурное: Галякоў пачаў страляць па галубох, якія кружылі над дахамі хутару. Дзьверы ў доме адчыніліся, і на ганак выйшла дзяўчына. Ёй было пад дваццаць. На нагах мела старыя атопкі ад бацькавых ботаў. Трымаючы дзьверы прыадчыненымі, каб пасьпець у выпадку патрэбы шпарка заскочыць за іх, пачала саромець Галякова.

-- Мястовы, а такія бясчынствы робіце! Нашто вы застрэлілі Зорачку нашага? Ці ён да вас кідаўся? І птушачкі бедныя гэтыя... Хіба яны накакалі вам на галаву? Чаго вы зьявіліся тутака? Вунь ваша дарога! От зараз прыйдзе тата -- ён вам пакажа дарогу!

Галякоў глядзеў на голыя каленкі дзяўчыны. Потым засьпяваў:

-- «А ну-ка, девушки, а ну, красавицы...» -- і кінуўся да дзяўчыны. Яна мышкай шмыгнула за дзьверы і ўзяла іх на засоў. Галякоў, стукаючы кулакамі ў дзьверы, спачатку крычаў:

-- Адчыні, зараз-жа адчыні, а то вышыбу дзьверы!

Потым адышоўшы крокаў на колькі, з разгону ўдарыў у іх плячом. Засоў ня вытрымаў, і дзьверы з грукатам паехалі ўва ўнутар сенцаў, а разам зь імі й Галякоў. Падлога была вільготная й склізкая. Галякоў бразнуўся аб яе. Стрэльба, якую трымаў на плячы, ударылася куркамі аб падлогу й выпаліла разам з абедзьвюх руляў. Якраз у гэты час Капейка вёў міма хутара Саладуху. «Зноў некага застрэліў!» -- прамовіў, успамінаючы ранішнюю спрэчку ў машыне. Абапёр Саладуху на плот каля хутара й кінуўся бегчы на шашу.

* * *

-- Такіх людзей трэба выкідаць з кола паляўнічых, -- гаварыў Барута, дапамагаючы Балевічу давесьці Галякова да машыны. -- Дый вашэць мусіць быць падалей ад іх.

Капейка цягнуў за імі Саладуху.

-- Ну, ідзі, ідзі! А то дам у пысу!

Пакуль выбраліся на шашу, зусім сьцямнела. І неба ляжала над намі чорнае й бяззорнае...

61

1950-1970

Пёрка й іншыя

«Хаця-б не спазьніцца, -- падумала Маўра, -- бо запішуць на чорную дошку. І дзіка было-б. Учора выдалі прэмію, а сёньня -- на чорную дошку!» Прыбавіла кроку. Уночы выпаў дождж, і там-сям стаялі лужыны. Маўра ўжо не абыходзіла іх, а скакала цераз іх. Раптам, не разьмерыўшы крок, скокнула ў самую сярэдзіну лужыны. На нагах былі досыць ужо паношаныя пантофлі, і яна адразу-ж пачула студзёную вільгаць пад панчохай. Праз хвіліну-дзьве пачала чыхаць, і засадніла ў горле. Успомніла, як яна ў мінулым годзе хварэла на грып: на працу хадзіць не магла, а доктар не даваў бюлетэню, бо тэмпэратура ня была дастаткова высокай. Маўра магла-б папасьці пад суд за прагул, і яе гэта вельмі

хвалявала: такі паварот справы быў-бы для яе проста трагічным, бо хто клапаціўся-б пра Ўладзіка. Гэта-ж яму і дзевяці няма! На шчасьце, у канцы другога дня хваробы тэмпэратура паднялася, і доктар выпісаў ёй адпачынак.

Усё-ж той месяц быў для яе жудасным: па-першае, вылічылі із заробку за восем прапушчаных дзён, а страхкаса заплаціла толькі шэсьцьдзесят працэнтаў; па-другое, трэба было купляць лекі, палепшыць харчаваньне, купіць новы абутак, бо ў гэтым заставацца было рызыкоўна -- разваляцца, і тады клопат! Яна ніяк не магла зьвесьці канцы з канцамі. Узяла пазычку з касы ўзаемадапамогі, а потым цяжка было выплачваць. Уладзік хадзіў у школу бяз уласных алоўкаў і сшыткаў, а вярнуўшыся, капрызіў ад крыўды. І яшчэ адно: якраз у гэты час у адным зь ягоных чаравікаў адарваўся падносак, другога абутку ён ня меў, а лекцыі прапускаць не хацелася, бо й бяз гэтага вучыўся дрэнна. Маўра сама прыбівала гэты падносак як магла. Хвалявалася й плакала. І ўсё-ж дзіця празябла й зьлягло ў пасьцель. А пасьля грыпу -- ускладненьне на бронхі, і хлапчук ніяк ня мог канчаткова акрыяць: у грудзёх хрып, уночы кашаль, пот...

Калі Маўра ўспомніла пра гэта, ейная прысутнасьць на ўчарайшых урачыстасьцях здалася ёй найменш не на мейсцы. І ўдвая стала шкода Ўладзю. «Адаслаць-бы яго на курорт! Але дзе ўзяць пуцёўку? Гэта -- раз! Па-другое, грошы! Хіба яна можа выкраіць із свайго бюджэту на курортную пуцёўку? Ат, і думаць пра гэта ня варта!..»

Перайшла на другі бок вуліцы. «А Ўладзя ўсё-ж хворы... Хворы... Нешта трэба ўсё-ткі зрабіць...» Пачала ў памяці падлічваць, колькі патрэбна грошай, каб адаслаць Уладзю хаця-б у дзіцячы дом адпачынку, у тыя хоць-бы Крынкі. Бадай, гэта магло-б збыцца, каб падрабіць крыху зьверхчасова. І вельмі гэтаму ўзрадавалася. «А хлапчуку зусім неабходна пажыць лета ў вёсцы, падыхаць сьвежым паветрам, пабегаць па полю й па лесе... От, каб ня быў вывезены ейны дзядзька, скіравала-б Уладзю да яго на хутар на ўсё лета. Хай бы займаўся там сваімі жукамі ды мятлікамі...» Успомніла сваё дзяцінства: усё-ткі неяк было прыямней! «Так, сасновы лес-бор... Густы пах смалы. Сьветлымі кроплямі коціцца яна па кары, быццам сьляза, -- плача параненае дрэва. Бывала, ідзеш сабе па мяккім, але пругкім моху сярод дрэваў, нібы па тоўстым дыване. І пчолкі, пчолкі гудуць у паветры...» Успомніла пах мёду, які ела ня раз

удоваль на хутары ў дзядзькі, калі езьдзіла ў час канікулаў, як была студэнткай тэхнікуму. «Калі мы яго бачым цяпер, гэты мёд? А, кажуць, гэта найлепшыя лекі ад прастуды. Навет «Пёрка» раіла неяк: "Любенькая, купіце мядку зь кілаграмік ды сьлівачнага масьліка, ды яечак зь дзесяць, памаранчыкаў ды зварыце ўсё гэта разам, ды папаіце ім хлапчука -- усю хворасьць як рукой здыме..." Лёгка сказаць: купіце! А дзе купіць? А завошта?» Адчула крыўду, нібы яе абакралі, абманулі. І вочы ейныя затуманіліся. «Пэўна, каб быў жыў Паўлік, усё было-б іначай. Паўлік, Паўлік! На каго ты нас пакінуў!? Хіба мы цябе ня любілі?! Адышоў назаўсёды! І як-жа гэта? Ад кулі? Або ад бомбы? А можа проста замёрз, застыў у той студзёнай Фінляндыі? Скажы, ад чаго спынілася тваё сэрца?»

Выняла зь кішэні хустку, выцерла вочы. У «пахавальнай» было сказана толькі: «... Ваш муж, Павел Исидорович Боровик, пал смертью храбрых в бою с врагом. Родина будет помнить его имя...» Яшчэ раз выцерла вочы. «Помніць! От і помняць! За каго й за што ты аддаў сваё жыцьцё? Што благога зрабіла тая Фінляндыя нам -- менавіта мне, нашаму ўласнаму краю, нашай Беларусі?..»

І ў гэты час пачула ззаду чыесь пасьпешныя крокі. Чамусьці здрыганулася. Хацела аглянуцца, але не хапіла волі.

-- Сьпяшаецеся? Баіцёся, каб ня прышылі месяцаў пяць за спазьненьне?

Зірнула назад -- Базыль! Спынілася, і пайшлі разам. Глядзела яму ў твар, але на ягоныя пытаньні нічога не адказвала -- баялася, што голас выдасьць ейнае хваляваньне.

-- Ага, разумею! Гэта вы пасьля ўчарайшага балю із такім «энтузіязмам» імкнецеся на работу.

-- А чаму вы ня прыйшлі? -- запытала Маўра не без некаторай хітрасьці, бо ведала, што ўчора былі запрошаны толькі «перадавікі-ўдарнікі», а Базыль у іх ня лічыўся.

Нічога не адказаў, толькі весела зарагатаў, імкнучыся заглянуць у вочы Маўры.

-- Ну, а як: крытыкі й самакрытыкі было дастаткова? Гэны даўгавязы ў сініх акулярах, за якімі ён хавае свае вочы (Базыль меў на ўвазе фабрычнага прапагандыстага. Сапраўднае прозьвішча ягонае -- Пакоўнік, але працаўнікі, у зьвязку з прапагандай, далі яму мянушку -- Падкоўнік), гэты ў сініх акулярах, мабыць, перамываў костачкі шмат каму, падводзячы «базу ворага», у тым ліку й мне?

-- Не, учора якраз гэтага ня было. Ды што гэта вы, зь левай нагі сёньня ўсталі, ці што?

-- Жартую проста! Плакаць ці што з усякае няпрыемнасьці? Сьлёз ня хопіць! А пакармілі чым-небудзь смачным на балю, значыць? Прэміяў, мяркую, шмат раздалі. Мабыць, прыйшоўся й вам талён на пашыўку паліто або гарнітура ў атэлье?..

-- Не, мне далі вялізны кавалак мыла -- аж кілёграм цэлы!

Базыль зноў зарагатаў.

-- Мыла? Ды яшчэ вялізны кавалак? І гэта нядрэнна «на данным этапе»! Мыла не заўсёды купіш! У гаспадарцы спатрэбіцца, як сказала адна бабуля, становячыся ў чаргу, дзе, ёй сказалі, выдаюць цыпэліны.

-- Запасьлівая бабка! -- заўважыла Маўра. -- Гэта, мабыць, наша Пёрка.

-- Якая такая Пёрка?

-- Суседка наша.

-- Ну, і задаволены вы падарункам?

-- А што-ж? Месяцы на два мылам забясьпечана.

Ішлі некаторы час моўчкі.

-- Ух, я ўжо стамілася -- ногі забалелі. І калі гэта сюды трамвай правядуць?

-- Трамвай? Якая цяпер у нас будзе гадавіна кастрычнікавай рэвалюцыі? Дваццаць другая, ці што? Ну, дык ён ужо праведзены роўна дваццаць два разы, бо ў кожную гадавіну даецца цьвёрдае абяцаньне пракласьці яго да наступнай гадавіны...

Маўра краем вока зірнула на спадарожніка. Насьміхаецца! Але-ж, праўда, кожны раз у дзень кастрычнікавых урачыстасьцяў абяцаюць і трамвай правесьці, і вуліцы выбрукаваць, і шмат-шмат іншага, але ўсё гэта застаецца толькі абяцаньнем. Апрача таго, калі гаспадары ўсяго цяпер мы самі, працоўныя, дык чаму кожны із нас ня можа шчыра выказацца пра недахопы й навет пасьмяяцца?! Ад гэтага магла-б быць толькі карысьць. Зноў зірнула на Базыля. «А ўсё-ткі добры ён. Шчыры. Гатоў дапамагчы, як тады, з дрывамі. Прывёз, і пасек, і склаў. А я гатова была ўжо "падводзіць базу ворага" і пад яго...»

-- Так, цяжкасьці, зразумела, яны ў нас ёсьць, -- сказала. -- Усё наша жыцьцё -- адны толькі цяжкасьці! Будуем дом -- цяжкасьці з цэглай, зь цьвікамі, з дошкамі. Хочам падбіць падноскі на боты --

цяжкасьці із скурай. «Так, падноскі, -- успомніла. -- Начыньня няма, цьвік або ломіцца, або гнецца, ня йдзе. А аддаць у майстроўню, трэба чакаць тыдзень, а то й болей, пакуль падаб'юць. А Ўладзю няма ў чым у школу йсьці». Стала зноў цяжка ёй, і яна папрасіла:

-- Базыль, досыць пра гэта! Галава разрываецца...

У гэты мамэнт яны перасеклі сквэрчык, цераз які дарога да фабрыкі значна скарачаецца. Пад нагамі было мокра й склізка. Базыль узяў Маўру подруку.

-- Дзе вы праводзіце вольны час? -- запытаў.

-- А ў мяне яго няма.

-- Ну, усё-ж, хаця-б у нядзелю.

-- У нядзелю ў мяне працы яшчэ больш, чым у звычайны дзень.

-- Ведаеце, чаму я пытаюся? Хацеў-бы прапанаваць вам паехаць, як кажуць паэты, «на лона прыроды», хаця-б на адзін дзень. Га, паедзем, калі ласка, у нядзелю! Вясна, сонца, паветра... Вы-ж у гэтым годзе -- дый у мінулым, пэўна, -- травінкі жывой у сапраўднасьці ня бачылі? А я ведаю такія цудоўныя мясьціны: лес, рэчка, як люстэрка, лонка з краскамі... І ехаць недалёка.

Маўра доўга маўчала -- думала над нечым. Потым спытала:

-- Базыль, чаму вы ня жэніцеся? Гэта-ж вам, напэўна, пад трыццаць ужо?

-- Пад трыццаць? Поўных ужо трыццаць два! -- адказаў. -- Але, бачыце, такая рэч: як жаніцца? Пры якіх умовах? Нельга-ж жаніцца, напрыклад, на вуліцы, за вар'ята палічуць... А я якраз і знаходжуся амаль на вуліцы -- сябра проста зь літасьці прыняў мяне часова ў свой пакойчык. Жыву на правох кундаля: захоча -- пакіне, не захоча, скажа -- «пайшоў вон!»...

Маўра прамовіла паўжартліва:

-- Значыць, вы завесьці сваё гняздо ня хочаце?

-- Як не хацець? Проста я хочу знайсьці добрую жанчынку, якую палюбіў-бы, -- зірнуў на Маўру, -- і якая палюбіла-б мяне. Але першая ўмова: нехта з нас двох мусіць мець кватэру. Паколькі я яе ня маю й атрымаць на працягу, прынамсі, трох-чатырох пяцігодук не спадзяюся, дык вынікае: павінна мець кватэру яна!..

Намёк быў ясны, і на твары Маўры зьявіліся чырвоныя выпекі.

-- Значыць, шлюб па рахунку?!

-- Я-ж зазначыў: павінны кахаць узаемна...

-- Прывесак?!

-- Ніякага! Калі-б мне не падабалася жанчына, навет маючая кватэру, я не зьвязаў-бы сябе зь ёю. Так сама зрабіў-бы, калі-б заўважыў, што я ёй не да густу...

-- Арыгінальна! Адзіны мужчына ў Савецкім Саюзе, які шукае ідэяльнага каханьня!

Яна падштурхнула яго локцем і засьмяялася. Ён прытуліўся да яе плячом.

-- Ну, дык як -- едзем?

-- Ня ведаю...

-- І ведаць няма чаго: сядзем у вагон дый паедзем.

-- А вы майстра ўгаворваць!

-- А вы думаеце, толькі адзін Падкоўнік умее гэта?

Базыль крыху зайздросьціў яго да Маўры.

-- Пакінь гэтага гліста ў спакою! -- з незадавальненьнем прамовіла Маўра.

Базыль зірнуў ёй у твар.

-- Ну, дык як -- едзем?

-- Ну, добра, едзем! Толькі от -- як быць з Уладзікам?

-- А Ўладзіка каму-небудзь пакінуць на гэты дзень -- той самай Пёрцы, напрыклад?

-- Бедны Ўладзь, ён амаль ніколі ня бывае із мной! Не, не магу я пазбавіць яго гэтай прыемнасьці. Якая радасьць была-б для яго пабегаць па полю, па лонках, па лесе...

Падышлі да хвабрыкі. Пры ўваходзе над аркай быў партрэт Сталіна ў поўны рост. З правага боку -- Молатаў, зь левага -- Кагановіч, але ўжо ў паўрост. А потым «правадыры» паменш рангам роўненькім радком, пад нагамі гэтых трох, і толькі маленькія бюсты штрыхам. Пад аркай стаяла будка для міліцыянэра, які ўва ўсіх уваходзячых пільна правяраў прапусткі. Падыходзячы да будкі, Базыль прадэклямаваў:

У лукоморья дуб зелёный,
Златая цепь на дубе том.
И днём и ночью кот учёный
Всё ходит по цепи кругом...

* * *

У сыботу праца на хвабрыцы канчалася на дзьве гадзіны раней. Вярнуўшыся дамоў, Маўра ўзялася, перш за ўсё, за праньне бялізны, якой за тыдзень накапілася нямала. Паслала Ўладзю прынесьці з прыбудовы каля дома дроў, каб затапіць печку й нагрэць дзеля праньня вады, але выявілася: дроў піленых і пасечаных няма.

-- Не шанцуе, -- цяжка ўздыхнула.

Узброілася ручной пілой і цяжкой сякеркай і пайшла ў прыбудову. Паклала палена на перавернутую ножкамі ўгару табурэтку й пачала вадзіць па ім пілой. Палена было сырое й круглае, на расхістанай старой табурэтцы ляжала дрэнна. Піла, тупая й пагнутая, як заўсёды ва ўдоваў, пілавала дрэнна. Паклікала Ўладзю на дапамогу -- трымаць палена. Доўга мучылася, пакуль адпілавала колькі катлячкоў. Пашчапала іх, аднесла ў хату й доўгі час корпалася каля печкі, разводзячы агонь. Пакуль вада грэлася, Маўра, каб ня губляць час, узялася прыбіраць пакой і мыць судзьдзё на кухні. Вымыла сьмецьце з усіх куткоў, выцерла мокрай анучай вокны, зьняла брудныя фіранкі й павесіла чыстыя, выцерла й пераставіла на мейсца судзьдзё, а вада на праньне ўсё яшчэ ня была гатова. Паставіла варыць суп. Раптам перадумала: зьняла рундальчык із пліты й паставіла на прымус, мяркуючы, што тут суп хутчэй згатуецца, бо Ўладзь прасіў есьці. Але прымус хутка згас -- ня было газы -- ужо два тыдні як чамусьці не давалі. Зноў паставіла суп каля чыгунка з вадой.

Урэшце вада закіпела, і Маўра ўзялася за праньне, час ад часу пазіраючы на рундаль із супам. Калі бялізна ўжо вісела на вышках і вымытая падлога паблісквала вільгацьцю, прыйшла суседка Аўгіньня -- тая самая, што ў двары празвалі «Пёркай» за ейную звычку ўсё, што траплялася пад руку, цягнуць (перці) да сябе ў хату. Цягнула абсалютна ўсё: кавалак дрэва, гаршок, выкінуты кім-небудзь на вуліцу, кош, анучу; узімку, калі не хапала дроў на апал (іх заўсёды не хапала, бо выдавалі ўсяго па мэтру на печ на ўсю зіму), крушыла бліжэйшыя тыны, здымала дошкі з драўляных ходнікаў і навет крыжы на бліжэйшым магільніку...

Усё гэта Пёрка рабіла ў імя ратаваньня ад голаду й холаду сваіх трох унучат: двое ад старэйшае дачкі, муж якой памёр ад сухотаў, і аднаго ад малодшай, муж якой быў сасланы да Сыбэрыі. Хаця абедзьве дочкі цяпер і працавалі, але таго, што яны зараблялі, ледзьве-ледзьве хапала на «голы суп», як казала Пёрка. Апрача

падбіраньня розных рэчаў з вуліцы й двароў, Пёрка хадзіла па суседзях, выпрошваючы, пад выглядам пазычкі, то кавалак хлябца, то крыху крупіцы, мучыцы, цыбулінку, перчыку...

Цяперака яна зайшла да Маўры папрасіць драбінку солі супчык пасаліць. Маўра адсыпала ёй жменьку солі.

-- А можа ў вас знойдзецца й пару бульбінак -- вельмі-ж голы суп у мяне для ўнучатаў!

Маўра дала колькі бульбін.

-- Ото-ж, дзякуй вам! Заўтра пашлю Волечку (старэйшую ўнучку) закупіць -- тады ўсё вярну!..

Але гэта былі толькі словы, і ўсе пра гэта ведалі.

Цяпер Пёрка пачынае гутарку пра сваю самую малодшую ўнучку Марыську -- прыгожую такую, белагаловую дзяўчынку.

-- Капрызе! Хацела пакласьці спаць, ня йдзе. «Есьці хочу!» -- крычыць. Зварыла-б ёй хоць зацірку, дык мукі ані пылінкі!

Маўра дастае з шуфляды кулёк з мукой. Мукі толькі на дне, але яна й гэта аддала. Пёрка бярэць кулёк, прабуючы намацаць пальцамі колькасьць мукі. Потым кажа:

-- Ну, што-ж вас крыўдзіць? У самой, бачу, нічога не застаецца...

-- Бярыце, бярыце! Я абыдуся!

Пёрка яшчэ доўгі час трымае кулёк у рукох. Потым асьцярожна скручвае яго, каб не рассыпаць мукі, і далучае да бульбін і іншага. Працы яшчэ шмат, і Маўры карціць, каб суседка хутчэй пайшла. Але бабка садзіцца на крэсла і пачынае гамонку нейкім, нібы штучным, голасам.

-- Ах, родная вы мая! Каб ня вы, і ня ведаю, што я рабіла-б?

І пачынае апавядаць пра сваё гора, можа, ужо ў соты раз. Але вельмі хутка спаўзае на тэму пра суседзяў: перабірае і перамывае ім костачкі.

-- Кажуць: «Жыць стала лепей, жыць стала весялей!» А каму гэта? Таму вунь дырэктару вялікага магазыну, што ў першай кватэры, -- ого, яму й курачак на сыботу на дом даставяць і індычак. А нам -- што?! За гнілой або мерзлай бульбай у чаргу станавіся на дзьве гадзіны?..

Маўры становіцца цяжка ад гэтай гамонкі, але сказаць суседцы, каб яна пайшла, ня можа, толькі паўтарае колькі разоў:

-- Ах, колькі ў мяне яшчэ працы на сёньня! Колькі працы!

Але Аўгінька ня ўходзіць.

-- Гаротніца ты мая! -- выклікае. -- І табе цяжэнька, хоць ты й пэнсію па мужыку дастаеш!..

-- Я нічога не дастаю, -- адказвае спакойна Маўра. -- Даюць толькі на Ўладзю, пакуль стане паўналетнім...

-- Ну, вось, бедная ты мая! Цяжэнька! Цяжэнька й табе без кармільца...

Яна глядзіць у твар Маўры, імкнучыся зразумець, як падзейнічалі на яе гэтыя словы.

-- Забілі ірады! Загубілі!..

Потым, панізіўшы голас амаль да шэпту:

-- Гамоняць, горамі там ляжалі, у тэй Хвільляндыі, пад сьнегам, і прыбіраць некаму было, столькі народу паклалі...

Пераҗагналася прыткім рухам рукі й кончыкам хвартуха выцерла сухія вочы. Паглядзела на Маўру, якая сядзела із сумным тварам перад сталом.

Урэшце пайшла! Маўра так была змучана ейнай гамонкай, што яшчэ доўга не магла зрушыцца зь мейсца. «Ох, ты, Божа мой, якое жыцьцё! -- прастагнала. -- Куды ні пойдзеш, зь кім ні пагамоніш, чуеш толькі адно: няма дроў, не хапае пайкі, дзеці галодныя, не дастаць абутку, няма кватэры, усюды чарга...» Задумалася. Старалася сама разабрацца ў гэтым, колькі тут ёсьць праўды. «Курачкі! Індычкі! Зразумела, крадуць! Крадуць усе і ўсё: Пёрка -- крыжы на могільніку, бо трэба абагрэць «унучатаў»; дырэктар -- курачак і індычак з магазіну; загадчык дрывянога складу -- дровы; дырэктар абутковай хвабрыкі -- абутак; крадуць пад усякім выглядам: пад выглядам камандыровачных, пад'ёмных, сутачных, на лячэньне, на рамантаваньне кватэры, на пабудову дач... І чым вышэй пасада, тым больш злодзей! І, зразумела, нам, людзям простым, не застаецца нічога! Але -- пытаньне: ці гэта толькі ў нас так, ці па ўсім сьвеце -- эпоха такая, зладзейская!?. Мабыць, часткова ўсюды так...»

Узяла са стала фотакартку мужа ў жалобнай рамцы. Доўга глядзела, часам праводзячы пальцамі па твары адбітку, па чорных мяккіх вусіках. «Паўлік, за каго й за што ты склаў сваю галаву?» І сьлёзы раптам пасыпаліся з вачэй.

Увайшоў Уладзік.

-- Ты зноў плачаш, мама? Што гэта такое? Тата-ж памёр, як герой, абараняючы Бацькаўшчыну. «Бацькаўшчыну!? Усё гэта ад

казённай прапаганды ў школе й піянерскіх атрадах», -- падумала Маўра, гледзячы ў вочы сыну.

-- А хіба табе ня шкода таты?

-- Зразумела, шкода! Але-ж ён выконваў свой сьвяты абавязак перад Бацькаўшчынай!

«Пакалечаныя», -- прамовіла пра сябе Маўра й хацела нешта сказаць сыну яшчэ, але нехта пастукаў у дзьверы.

-- Можна, -- сказала, ставячы картку мужа на стол.

* * *

Увайшоў Падкоўнік. Знала, будзе доўга выпытваць, як жывецца, і выхваляць партыю, урад, парадкі, адданасьць работнікаў савецкай уладзе, пераконваць працаваць яшчэ больш аддана... Зірнула яму ў твар і ледзьве не прамовіла: якая брыда! Але яму хоць-бы што! Ён добра мае: атрымлівае з закрытага разьмеркавальніка й ня жыве, зразумела, толькі на пэнсію; для такіх існуюць сакрэтныя фонды. Яму ня трэба стаяць дзесяць гадзінаў крукам ля станка або над сталом!

-- Можна да вас? -- спытаў, водзячы зрокам па пакою.

-- Ну, што-ж, заходзьце!

Ведала, гэта неадхільна; на іхнай мове гэта называецца «індывідуальная апрацоўка» -- хадзіць па хатах працаўнікоў. Зірнула на Ўладзіка, які стаяў у дзьвярах да куханькі.

-- Ідзі, Уладзь, спаць!

-- Што ты, мама? Яшчэ-ж зусім рана?!

-- Ідзі, Уладзь, спаць, -- я сказала!

Падкоўнік крыху затрымаўся пры ўваходзе, пазіраючы на той кут, дзе павінны вісець абразы. Маўра гэта заўважыла й нядобра падумала аб ягонай эстэтыцы: яму-б вывесіць «Павлика Морозова». Прайшоў далей, дзе стаяла шырокая канапа, на якой Маўра й спала.

-- Прыпала, разумееце, вольная хвілінка, вырашыў адведаць некаторых сваіх працаўнікоў, як яны жывуць...

-- Ну, што-ж, можаце глядзець, колькі вам захочацца, як я жыву, пераканаецеся, прынамсі, што жыву па-савецку, гэта значыць, -- ну, добра...

Зрабіла грымасу, якую можна было прыняць і за ўсьмешку.

Падкоўнік спыніўся пасярод пакою, уважліва пазіраючы па бакох. На сьвежых шпалерах сьцен там-сям былі прымацаваныя

кнопкамі паштоўкі з малюнкамі ды некалькі сямейных фотакартак. Перш за ўсё, прапагандыст зьвярнуў увагу на малюнак царквы сьвятой Сафіі Полацкай. Зьняў са сьцяны картку. На адвароце было выведзена каліграфічным почыркам: «Маленькой крошечке Маврикии от папы в день рождения. Да хранит тебя Господь. Аминь. Андрей Перегуд-Домейко».

-- О-о! Гэта цікава! Бацька ваш, значыць, сьвятаром быў у гэтым храме?

-- Не, ён быў інжынэр-каморнік і ўсё жыцьцё выкладаў у Полацкім каморніцкім вучылішчы.

-- Мяркуючы па прозьвішчу, -- зь беларускай шляхты? Перагуд ды яшчэ Дамэйка!

-- Ня ведаю. Можа быць...

Глядзела на паштоўку й успамінала бацьку, як ён, бывала, стаяў ізь ёй у гэтым храме й слухаў цудоўны хор, падцягваючы й сам добрым баском у некаторых мясьцінах.

-- Паштоўкі гэтай я выкінуць не магу: памяць! -- прамовіла.

Падкоўнік заглянуў у ейны твар і ўсьміхнуўся.

-- Я ў ваша прыватнае жыцьцё ня ўмешваюся...

Урэшце апусьціўся на канапу, выпрастаўшы доўгія ногі ў брудных чаравіках аж на палову пакою. «Сухая жардзіна, -- падумала Маўра, -- ды яшчэ выцягненая з бруднай лужыны...»

-- Што-ж вы стаіцё? -- узяў яе за руку й прыцягнуў да канапы. -- Ведаеце, мы жывем у цудоўную эпоху...

-- Ведаю, -- адказала Маўра.

-- У эпоху, калі перабудоўваецца сьвет...

-- На лепшае ці на горшае? -- усьміхнулася.

-- Зразумела! Зразумела -- на лепшае. Колькі зьменаў ува ўсіх галінах! З краіны, вылучна аграрнай, СССР ператвараецца ў краіну самай перадавой тэхнікі...

Базыль некалі назваў гэныя ягоныя выказваньні жвачкай. «Цяперака зацягне гэную-ж сваю жвачку на цэлы вечар», -- падумала з прыкрасьцю Маўра.

-- Зразумела, і людзі -- савецкія людзі -- павінны перарабіцца адпаведна патрабаваньням новага часу.

-- Перарабіцца, кажаце?

-- Так, перарабіцца, зразумела, ня ў простым сэнсе: у іх павінны адміраць звычкі й традыцыі, прышчэпленыя ім капіталістычным

грамадствам... Рэлігія там і іншае... Ад усяго гэтага наш чалавек павінен вызваліцца й чым хутчэй, тым лепш -- жыцьцё ягонае тады стане паўней і радасьней... Зразумела, і ў пытаньнях пола й каханьня ён павінен стаць таксама вольным... Вы падумайце, колькі розных трагэдыяў адбылося на глебе каханьня, зайздрасьці й сэксуальнай незадаволенасьці... Маленькі прыклад, калі дазволіце: я чуў, што вы часта скардзіцеся на галаўныя болі...

-- Я прасіла-б вас не кранацца майго прыватнага жыцьця й майго здароўя, -- зь незадаваленьнем зазначыла Маўра.

-- Але гэта ня ёсьць так дужа прыватнае! -- узвысіў голас прапагандыст. -- Гэта спалучына з грамадствам, з вашай функцыяй у ім: копіі з плянаў, якія вы робіце, ня ёсьць дакладныя. Ня будзеце-ж вы цяпер адмаўляць, што тут ёсьць простая сувязь із вашай сямейнай сітуацыяй...

-- Ці ня думаеце вы мяне лячыць? -- прамовіла Маўра й адсунулася ў другі канец канапы.

-- Я хочу толькі вас пераканаць: у нас вырастае свая, сацыялістычная мараль, вырастае новы чалавек, вольны ад усякіх умоўнасьцяў, як грэх, сумленнасьць і іншае... Сутнасьць гэтага новага чалавека -- гэта, перш за ўсё, адданасьць нашай партыі і ейным правадыром, любоў да сацыялістычнай працы, сяброўскія адносіны да жанчыны й бязьмежная нянавісьць да ўсякіх вылазак ворагаў, пад якой-бы маскай яны ні хаваліся. Пытаньне: як ведаць, хто вораг? На гэта ёсьць спэцыяльныя ворганы, і кожны член сацыялістычнага грамадства павінен дапамагаць ім...

У Маўры закружылася ў галаве, і яе ледзьве не званітавала.

-- Перапрашаю, пайду пастаўлю гарбату! -- і выйшла на кухню.

Выпіла шклянку вады. «Божа мой, але як-жа жыць!? Няма сумленьня, няма друга, прадай кожнага й чакай, што ён прадасьць цябе -- вось ён новы чалавек!..» Адвярнулася да вакна, застрэміўшы ногці пальцаў у далоні рук і адчуваючы, што вось-вось брызнуць з вачэй сьлёзы. Каб перамагчы сябе, пачала даставаць з шуфляды судзьдзё. Потым наліла ў пасудзіну вады й паставіла яе на вагонь. Адцягваючы паварот у пакой, стаяла перад вакном і глядзела ў чорную, непраглядную цемру. Чула, як Падкоўнік, закурваючы, паліў запалку. Потым падышоў да этажэркі і ўзяў сямейны альбом. «Але-ж там фотакарткі стрыечных братоў у хворме польскіх

ахвіцэраў», -- успомніла з жахам. Схапіла банку з канфітурамі, шклянкі й сподкі й кінулася ў пакой.

-- Перапрашаю! -- сказала, імкнучыся ня даць магчымасьці вырвацца наяў свайму гневу. -- Зараз ня час разглядаць альбомы: будзем піць гарбату!

Узяла альбом у яго з рук і аднесла ў кухню. І адразу-ж адчула палёгку. Пачала наліваць у шклянкі гарбату. Падкоўнік сачыў за плаўнымі рухамі ейнай добра складзенай постаці. Лісьліва заўважыў:

-- Я кажу, кожны з нас гатоў-бы памерці так, як памёр ваш муж. Чэсьць і слава героям!

-- Чаму-ж вы не запісаліся на фінляндскі фронт добраахвотнікам?

-- Ну, гэта ўжо іншае пытаньне: намі распараджаецца партыя!

«Пад гэтай шырмай добра вам хаваць свой эгаізм», -- падумала. Падсунула шклянку з гарбатай да Падкоўніка.

-- Частуйцеся, калі ласка.

-- А вы, што-ж?

-- І я таксама.

Падкоўнік макаў у гарбату коржыкі і адхлёбваў вадкасьць.

-- Цікава! Хачу вас праверыць, ці не забылі вы Пушкіна. -- І, адсунуўшы шклянку, прадэклямаваў:

У лукоморья дуб зелёный,
Златая цепь на дубе том.
И днём и ночью кот учёный
Всё ходит по цепи кругом...

Уважліва глядзеў у твар Маўры. Яна маўчала. «Вось яно што, -- думала, -- вось дзе сабака закапаны? Значыць, міліцыянэр не прапусьціў міма вушэй... Базыль пад падазрэньнем, значыць?..»

Падкоўнік заўважыў ейную заклапочанасьць.

-- Цікавая вы жанчына, -- сказаў, -- ва ўсіх адносінах... І ў самым, што называецца, саку!.. Можаце захапіць! Можаце... -- ён зірнуў на гадзіньнік. -- Аднак, мне пара ўцякаць...

Вылез з-за стала, узяў у рукі кепку, пабарабаніў пальцамі па ейным казырку. Потым сагнуўся перад Маўрай і пацісnуў ёй руку. Выйшаў...

* * *

-- Падлюка! -- амаль крыкнула Маўра, калі крокі заглухлі.

Дзьверы з катушка Ўладзіка прыадчыніліся.

-- Ты крычыш на яго, мама?

-- А ты яшчэ ня сьпіш? Ідзі й сьпі! Заўтра я цябе пабуджу рана: мы некуды паедзем...

-- О, як добра! Але я раней цябе ўстану...

-- Ну, добра, ідзі сьпі!

Дзьверы зачыніліся. Маўра села да стала, абхапіўшы рукамі галаву. «Цяпер пачне падводзіць базу...» Хацелася найхутчэй убачыць Базыля, папярэдзіць яго. «Але, усё-ткі, што тут такога небясьпечнага? Пушкін -- клясык!» Але тут-жа ўспомніла адну з лекцыяў Падкоўніка. «...У клясыцы таксама ёсьць шмат двохсэнсовага й для нас непажаданага, а навет і варожага... Да клясыкі трэба падыходзіць крытычна...» Задумалася. «Сапраўды, дуб, залаты ланцуг на дубе тым... І дзень і ноч кот вучоны ходзе па ланцугу кругом... Ёсьць нешта няяснае, як быццам... Але ўсюды можна знайсьці што-кольвек няяснае. Як-жа тады быць? Нічым ня цікавіцца, нічога ня чытаць, ня ведаць і не гаварыць? Маўчаць як рыба?! Але й гэта можа паказацца падазроным такім, як Падкоўнік. Гэта праўда, Базыль неасьцярожны, і трэба яго папярэдзіць...»

Прабіла дзьве гадзіны ночы. Успомніла: шмат няскончанай працы. Паднялася, хістаючыся, запаліла ліхтар і, уперад за ўсё, дастала з вышак бялізну, каб папрасаваць. Выйшла на двор узяць вугольля для праса. Пачула першыя, як-бы пробныя, трэлі салаўя. Зірнула ўгару. Па сінім аксаміце неба рассыпаны дыямэнты зораў. «Божа, якая прыгажосьць! А жыцьцё чалавечае такая мярзота! Калі-ж людзі навучацца прыгожа жыць? Ці назаўсёды застануцца такімі брыдкімі й подлымі?» Разьвяла агонь у прасе й прысела на хвілінку на крэсла, пакуль нагрэецца прас. «Бр-рр, якая брыда, кішка сьмярдзючая! А от нос задзірае: новы чалавек! Калі такі новы чалавек, дык хай лепш яго ня будзе. Але Базыль?! Базыль... Ён-жа такі шчыры, добры...»

Прас нагрэўся. Маўра разаслала на стале байкавую коўдру й пачала прасаваць, адчыніўшы крыху вакно (баялася чаду ад праса). Ува ўсходняй частцы неба зьявіліся проблескі раніцы -- вясёлыя, прыемныя. Жаўрукі дружна ўзьляталі ўверх, услаўляючы сьпевамі новы дзень. І Маўры раптам стала неяк асабліва радасна: забыліся ўсе няпрыемнасьці. «Заўтра, -- падумала. -- Не, гэта-ж ужо сёньня,

зараз ужо чацьвертая гадзіна? Базыль... можа быць...» Зазірнула ў вакно. «А дзень, здаецца, будзе прыемны...» Уявіла сябе на ціхай дарожцы паміж цэлага мора жыта з васількамі ў рукох. Потым гэтай дарожкай сышла ўніз, на лонку, да рэчкі. Базыль з Уладзікам ішлі збоку. Потым яны апынуліся ў нейкім захаваным куточку. Лісьцьва над імі была густой -- падобная на шацёр. Уладзь бегаў па лонцы за матылямі, а Базыль апавядаў розныя вясёлыя й сьмешныя гісторыі. «Ах, ня трэба стамляць сябе перадчаснымі марамі... Хутка ўжо!»

Скончыла прасаваньне толькі а пятай гадзіне. Наважыла прылегчы хоць на часіну. Але сон ніяк ня прыходзіў. Круцілася з боку на бок. Потым устала, адчыніла вакно: можа быць, пры сьвежым паветры хутчэй удасца заснуць! Спынілася на хвілінку перад люстэркам шафы. Распахнула халат і павяла далонямі зьверху ўніз па пругкіх ружовых грудзях, потым па бёдрах. «У самым саку!» -- прашаптала, усьміхаючыся. Шмыгнула мышкай пад коўдру...

Салавей пеў цяпер нейдзе зусім блізка. І пеў так горача, з запалам, адчаканьваючы кожную трэль, кожны гук, што яна заслухалася. Уяўляла, як ён растапырвае крыльцы пры гэтым і трапеча імі, як вібруе ягоны маленькі язычок у пашыраным горлачку й зь якім вялікім жаданьнем імкнецца забавіць сваю каханку, якая сядзіць нейдзе ў гнязьдзечку на яйках. І чуліся ёй то бульканьне ручайка нейдзе ў лясной гушчы, то пераліваньне плаўкага срэбра ў залатое судзьдзё. Потым песьня салаўя пачала ўсё болей і болей аддаляцца, і сам салавей раптам ператварыўся ў нейкае вялізнае страшыдла -- ці то птах, ці то зьвярына!? «Ды гэта-ж той Падкоўнік, прапагандыста! Вунь і ягоныя брудныя чаравікі на даўгіх нагах, выцягнутых на цэлы пакой...» Маўра із страхам усхапілася. Спачатку ніяк не магла ўспомніць, дзе яна й што зь ёй. Потым апамяталася. Наўкола было ціха. Успомніла: а сёмай павінен быў прыйсьці Базыль. Пачула крокі на кухне.

-- Уладзь, гэта ты?

-- Я, мама!

-- Ніхто да нас ня прыходзіў?

-- Не, мама!

Зірнула на гадзіньнік: было каля дзявятай гадзіны. «Значыць -- не! І вось гэтак... Чакай кожную хвіліну якой-колечы няпрыемнасьці...» Сэрца стукала моцна, моцна! «Забыцца-б, забыцца ад усяго гэтага!» Апусьціла галаву на падушку...

76

1959-1970

Дзе шукаць праўду

Яны сядзелі пад разгалістай вечназялёнай хвояй. Дзед Габрусь плёў з пруцікаў кошык, а Сымонка глядзеў у задуме на сінюю зыб возера, што кіпела й пенілася, стукаючы ў берагі. Каля іх дыміў невялікі касьцёр, над якім парылася ў кацялку бульба. Калі агонь у касьцёрчыку малеў, дзед Габрусь папраўляў галавешкі й падкладаў новае паленца.

-- Ты так дужа не бяры да галавы, Сымонка! Як-небудзь будзем жыць! От хутка бульбачкі паямо, вадзічкі пап'імо, і ўсё пойдзе на лад...

Сымонка навет пальцам не варухнуў і нічога не адказаў: у памяці ягонай стаяў абраз паховінаў бацькі: «бацюшка» чытаў над магілай «са сьвятымі ўпакой»; маці кідалася вобземлю й рвала на сабе валасы; аб камяні скрыгатала рыдлёўка, і аб вечка труны дуднелі, падаючы ў яму, камы зямлі...

Дзед Габрусь цераз хвіліну загаварыў зноў:

-- Ну, а як зь нядоімкай, зноў прыходзілі?

-- Прыходзілі, -- коратка, нібы зь незадавальненьнем, адказаў Сымонка.

-- Ну, і што вы ім адказалі?

-- Нічога!..

-- А хай бы маці пажалілася вышэй!

-- А куды яна можа пажаліцца?

-- І гэта праўда! Хто яго ведае, куды йсьці й дзе шукаць цяпер праўду!?

Зноў некаторы час маўчалі.

-- Ото круцялі! Яны-ж ведаюць, якая салодкая цяперака ваша доля, а ўсё роўна лезуць: дай ім рубля! Гэта Шашок усім гэтым верхаводзіць -- так уелася яму ў косьці выцягваньне гэтых рублёў з народу!.. Усе справы ў ягоных рукох!..

На астатнюю заўвагу Сымонка таксама нічога не адказаў. У гэты час Габрусь скончыў свой кошык. Адставіў яго ўбок і прамовіў:

-- Ну, нічога! Як-небудзь будзе!.. Вось адзін ужо гатовы -- давай купца хоць зараз! Усё-ж нешта дадуць?! А заўтра пойдзем рыбкі паловім...

-- А Шашок!? -- раптам гукнуў Сымонка.

-- А што Шашок?! Ягонае гэта хіба возера!? Ён узяў яго пад рэнту? Насадзіў у ім рыбы? Бог дзеля ўсіх у аднолькавай меры пасылае і рыбку, і бульбіну, і грыбок...

-- Але-ж човен Шашкоў! І ня любе ён, як хто ловіць рыбу! І злуе, калі невад ягоны вяртаецца пустым!.. На мінулым тыдні, кажуць, выкуліў з чаўна Нічыпара, злавіўшы на возеры...

-- Ото хапуга душагубны! Але човен ня ён рабіў -- цесьляры агулам выдзяўблі, каб зручней было часам перабрацца на тэй бок... Прыўлашчыў, значыць, народную працу... Паўсьвета загроб-бы, каб мог... новасьпечаны пан... Бачыце, дырэктар саўгасу!.. Шышка вялікая! От і дай такім уладу!

-- А скажыце, дзядусь, чаму ў вас нічагуткі няма -- навет хаты?

-- Было... Было тое-сёе і ў мяне: і зямля, і коні, і кароўкі... Але лёс ужо мне такі выпаў, што ўсяго лішыўся!.. А здарылася вось як: як пайшлі чуткі, што гаспадаркі будуць адбіраць ды ўсіх зганяць да кагалу, людзі, хто мог, кінуліся ўцякаць у Сыбэрыю тую... Ну, думаю, трэба й мне пяткі падмазваць!.. Паехаў! А Сыбэрыя тая і ёсьць Сыбэрыя: нездарма туды людзей зганялі за ўсякія ўчынкі... Пагібель!.. На сто вёрстаў чалавека не спаткаеш! А калі й спаткаеш, дык сьцеражыся яго, як зьвера таго... бо зарэжа або заб'е... Сядзіш у сваім салашы й душы ня чуеш: ні пагутарыць зь кім, ні чаркі выпіць... А тут машкара проста загрызае. Твар распух у мяне... Кінуў усё ды павярнуў аглоблі назад... -- паскроб бараду й дадаў: -- Не, выгаднейшага жыцьця, як тутака ў нас, мусіць, нідзе няма: тут

табе й крынічка, і з рыбкай вадзічка, і лясок ды грыбок, яблычак ды агурок, выйдзеш на сьвет Божы, птушкі заводзяць такі харавод, што аж сэрца заходзіцца...

Дзед зморшчыўся й заміргаў вачыма, пэўна, прачуліўся дужа. Зьняў бульбу з кастра, адцадзіў яе. Перахрысьціўся, выцер бараду.

-- Ну, дык хадзем, будзем есьці, што маем!.. -- гукнуў Сымонку.

Бульба была смачная, сопкая, адно толькі -- гарачая. Абодвы, пякучы пальцы, дзьмухалі на яе. Хвоя над галавой баюкала іх сваёй маркотнай песьняй; возера гудзела й бухала каля берагоў...

Сымонку гэта неяк па-асабліваму хвалявала -- то журботна, то ўзьлётна, і ён усё пазіраў на возера...

-- Людзі кажуць, -- прамовіў урэшце, -- што на гэным мейсцы, дзе цяперака возера, некалі стаяў горад, а ў ім царква... Потым горад пайшоў пад зямлю, і стала возера... Ці праўда гэта?

Дзед некаторы час маўчаў, пазіраючы некуды ўдалеч. Потым паскроб сваімі жорсткімі пальцамі бараду і адказаў:

-- Гэта голас зь мінулых вякоў, дзядоў ды прадзедаў нашых!.. Некалі мы жылі сваім царствам-гаспадарствам... І было яно слаўным, вольным і справядлівым, так што другія цары-каралі зайздросьцілі яму... Ну, зразумела, і ненавідзелі за гэта... І ўзялі сабе за мэту: зьнішчыць яго! Адны дзеялі подступам, другія -- сілай... Папалілі нашы гарады й сёлы, панішчылі людзей, парабавалі... От, і склалася ў народзе, што гарады пад зямлю правaліліся!.. -- задумаўся й зноў паскроб бараду: -- Павер'е гэтае паказвае, што народы -- усе народы! -- мараць пра сваё ўласнае гаспадарства, каб ніхто чужы не стаяў над імі!..

-- А от зірніце, дзядуля, і птушкі і іншыя жывёлы -- усе зьбіваюцца ў свае чароды! -- уставіў Сымонка.

-- Так ужо адтуль, -- зірнуў у неба дзед, -- прызначана, бо іначай усе адзін другога пазагрызалі-б... А так усё-ткі могуць абараняцца, хоць і слабейшыя! От ты бачыў калі-небудзь, як верабейкі грамадой, калі на іх нападае варона, праганяюць яе...

-- А кажуць, што ўначы перад Вялікаднем пасярод возера выплываюць царскія вароты той затануўшай царквы і анёлы так прыгожа сьпяваюць «Алілуя», што ўсё наўкола замірае, як зачараванае...

-- От гэта й сьцьвярджае, што народ наш марыць пра сваё гаспадарства, хоць, можа, і нясьведама; некаторыя й вераць, што яно ўваскрэсьне...

У Сымонкі было яшчэ шмат пытаньняў, на якія ён хацеў-бы атрымаць адказы: а якое гэта было царства-гаспадарства? а якія ў ім былі каралі ці князі? а чаму яно не баранілася? а ці добра ў ім было бедным людзям?.. А дзеду Габрусю трэба было сплесьці сёньня яшчэ пару кашоў на заказ, і ён па картоплі ўзяўся за працу...

* * *

Выйшлі да возера, яшчэ толькі пачало вылузвацца з ранішніх туманаў сонца. Знайшлі човен, заехалі ў сітнікі й там прастаялі цэлы дзень. Улоў быў ладны, і Шашок іх не злавіў. Рыбу разам з кашамі дзед панёс у мястэчка прадаваць. Прынёс адтуль мукі, солі, запалак, газы і іншае, што патрэбна ў хаце...

Калі дзед Габрусь панёс рыбу й кашы ў мястэчка ў другі раз, Сымонка сам адважыўся пайсьці на возера. Знайшоў човен і, як звычайна, забраўся ў сітнікі, дзе рыба найбольш тыркала. Плоткі браліся адна па другой, і Сымонка так захапіўся ловам, што й не заўважыў, як ідзе час...

Па паўдні надвор'е крыху сапсулася: над возерам затрымалася, на першы пагляд, невялікая хмара, і пырскаў дождж. Але потым хмара нейк расплылася, выцягнулася ўва ўсе бакі. Аднекуль наляцеў вецер, і над возерам узьняліся валуны хваляў. Човен закруціла, загушкала... Сымонка наважыў выплыць на бераг і перачакаць там, пакуль хмара міне. Але на возера былі пушчаны рагаткі з жыўцамі, і ён баяўся, што хвалі занясуць іх куды-небудзь вельмі далёка; паплыў спачатку пазьбіраць рагаткі. Але гэта было ня так і лёгка: валуны хваль кідалі човен ува ўсе бакі. Раптам грукнуў гром, і рэха ад яго пакацілася па лясох і палёх. Хлапцу стала так страшна, што ён адмовіўся ад свайго намеру і энэргічна скіраваў човен да берагу, які быў ужо няблізка. Гарнуў ваду вяслом і чытаў пацеры. От яшчэ крыху, і ён будзе на цьвёрдай зямлі! Ужо бачыў тое мейсца, дзе лягчэй за ўсё прычаліць! Ужо човен ткнуўся ў бераг! І раптам з-за кустоў -- Шашок.

-- Стой! Стой, кажу табе! А то пойдзеш на дно...

На нейкі мамэнт Сымонка як-бы аслупяneў, але гэта цягнулася нядоўга. Ведаў: Шашок не пашкадуе! Сьцяў зубы і, як найглыбей, загарнуў ваду вяслом. Човен шпарка крутнуўся ад берагу.

-- Стой! Стой, не ўцякай!

Сымонка нібы й ня чуў: гнаў човен усё далей і далей...

Быў мамэнт, калі ў сэрцы Шашка загаварыла сумленьне і сьціганьне беднага хлапца зусім ні за што здалося яму дзікім і жорсткім. Але хутка хцівасьць заглушыла гэтае пачуцьцё. Шашок скочыў у ваду, прабуючы дагнаць Сымонку. Праплыў крокаў з сотню й вярнуўся на бераг, пабачыўшы, што човен не дагоне. Вытрасаючы ваду з вопраткі, пагражаў кулаком Сымонку й бубнеў:

-- Няшчасная галота!.. З-за іх рыбкі не зьясі!.. Ну, пачакай-жа, злаўлю, дам добрую лазьню...

Схаваўся за кусты і адтуль пачаў сачыць, куды паплыве хлопец...

Хмара закрыла ўсё неба. Паліў такі густы й буйны дождж, што неба злучылася з возерам і за пяць крокаў нічога ня было відаць. А Сымонка націскае й націскае на вясло, шэпчучы пацеры, -- сьпяшаўся прыбіцца да таго берагу, дзе Шашка няма й куды ён не пасьпее дабегчы. Ад дажджу на дне чаўна сабралася шмат вады. Сымонка высыпаў рыбу з чыгунка ў човен і пачаў ім выліваць за борт ваду. Човен, згубіўшы імпэт, закружыў на мейсцы. Зноў хапіўся за вясло, але адчуў: сілы ягоныя слабеюць. Раптам па гарбох валуноў пракаціўся такі віхор, што вырваў з рук Сымонкі вясло й шчэпкай пакаціў яго па вадзе. Цяпер Сымонка быў зусім бязрадны: човен закружыўся на мейсцы, робячы крэн то на правы, то на левы борт. Азірнуўся: усюды бушавала вадзяная стыхія; па зыбкай паверхні яе сьвісьцеў дзікі вецер... Час ад часу паветра і, здавалася, зямлю патрасаў пярун, і тады ў галаве хлапца варушыліся змрочна-безнадзейныя думкі... Заплюшчыў вочы, каб нічога ня бачыць; заткнуў пальцамі вушы, каб і ня чуць; лёг ніцма на дно чаўна й бязупынку паўтараў: «... Прасьвятая Багародзіца... выратуй і пазбаў ад сьмерці...» Па целу разьлілася нейкая млявасьць, стома... І ён пачаў драмаць. І зьявіўся Шашок: кружыўся перад ім, крыўляўся, пагражаў, замахваўся, але наблізіцца высьцерагаўся. «Нічога, Шашок, ты мне ня зробіш! Калі ты мяне тут утопіш, будуць на цябе ўсе паказваць пальцам, як на забойцу... А мяне выцягнуць тваім-жа невадам... А потым? Потым будзе тое, што бывае з усімі...»

Гарэлі кругом сьвечы -- шмат сьвечаў! Суворыя твары сьвятых глядзелі на Сымонку з усіх бакоў. Дзяк чытаў псалмы. І тут-жа стаяў дзед Габрусь, зь сьвечкай таксама. Твар ягоны быў падобны на твары сьвятых. Раптам адчыніліся царскія вароты. Цераз іх хоча прашмыгнуць да «сьвятая-сьвятых» Шашок. «Вось ён! Вось!» -- крычыць Сымонка. Габрусь із сьвечкай заступае яму дарогу... Усьлед за тым загудзелі басы й тэнары й царква напоўнілася цудоўным сьпевам. Плаўна паплыло ў паветры: «Сьмерцью сьмерць папраў...»

Човен стукнуўся носам у бераг. Сымонка ўздрыгнуў і адплюшчыў вочы: перад ім стаяў Шашок...

Дажджу ўжо ня было. Зыркія промні сонца блішчэлі на вадзе. Усюды сьпявалі птушкі. «Як-жа гэта так?! Хіба дзед Габрусь усё-ткі ўпусьціў Шашка?» -- падумаў Сымонка ўсё яшчэ пад уплывам сну. І ў гэты час пачуў голас жывога Шашка.

-- Ну, што? Уцёк?! А ну, вылазь, шчанё!

Сымонка сабраў рыбу ў чыгунок, узяў свае вуды й пакорліва падняўся з чаўна; ішоў і азіраўся, выбіраючы мамэнт, каб як-небудзь прашмыгнуць паміж Шашковых рук. Але той схапіў яго за каршэнь і з такой сілай тузануў, што хлопец кулём падкаціўся яму пад ногі. Рыба пасыпалася з чыгунка ўва ўсе бакі.

-- Рыбкі хоча галота?! Я пакажу табе рыбку!..

Прыціснуў хлапца нагой і пачаў выламваць з куста прут. Сымонка глядзеў на яго скоса, гатовы ў любую мінуту да рашучай абароны. Шашок ужо замахнуўся на яго прутом, але ў гэты час прагучэў спакойны, але ўладны голас дзеда Габруся:

-- Стой! Гэта табе ня пройдзе!..

Шашок азірнуўся.

-- І ты тут?

-- І я тут! Прымі нагу з хлапца!

Шашок падпарадкаваўся.

-- Ці не адкусіў ён кавалак твайго чаўна з галадухі? -- гіранічна прамовіў дзед. Выставіў наперад грудзі й паскроб бараду. -- Сьвет жыве хрыстовай праўдай, якой-жа праўдай жывеш ты?! -- і потым да Сымона: -- Устань, хлопча! Хай толькі паспрабуе крануць цябе калі-небудзь хоць пальцам...

* * *

Возера ляжала ціхім і гладкім. Толькі час ад часу чуўся слабы вецярок -- водгук мінулай навальніцы. І тады вадзяная гладзь пакрывалася то срэбнай, то залатой луской... І маркотна шумелі над возерам векавыя хвоі...

Менск 1930
Нью-Ёрк 1965

Ападкі

Хто ведае, можа, гэта ўжо і ўсё, казаў той, кропка! Перакінемся яшчэ раз у нашы родныя мясьціны, дзе кружылі мы ў жыцьці сьцежкамі-дарожкамі, ня раз спатыкаючы й злыдзень, і галечу, і незаслужаную крыўду-зьдзек, але ніколі не пазбываліся чараў нашай Маці-Бацькаўшчыны...

Народ наш з пагардай адварочваецца ад тых, хто выракаецца гэтых чараў -- сваёй мовы, культуры, традыцыяў і звычаяў, ахрысьціўшы гэтых вобаратняў мянушкай *ападкі*. І яшчэ тады, калі ўсё наша апрычонае, не падобнае ні на расейскае, ні на польскае, каралася законам і вынішчалася, зьявіліся волаты нашага новага паўстаньня зь мёртвых -- Праньціш Багушэвіч, Кастусь Каліноўскі, Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Лёсік, Смоліч, Ластоўскі, Ігнатоўскі й сотні іншых. Беларускі народ нясе іхныя імёны на сваіх шчытох і па-сёньня, не зважаючы на тэрор і паняверку...

Ападкі! Як трапна гэта сказана народам! Як ападкі, з чырваточынай у сярэдзіне, апаўшыя зь яблыні, згніваюць бясьсьледна пад ёй, гэтак і яны зьнікаюць бясьсьледна з памяці свайго народу, стаўшы служкамі чужынцаў у сваёй уласнай хаце й згодныя на ўсялякае плюгаўства, усхваляючы ўсё чужое! Адвернемся-ж з пагардай і мы ад іх!

* * *

У абсягу Меншчыны ёсьць нямала малых і вялікіх катлавінаў. Адна зь іх прасьціраецца імшарамі й багнамі на дзясяткі кілёмэтраў на захад ад Менску. Пачынаецца яна ад Ждановічаў і цягнецца

некуды аж пад Радашковічы -- у кірунку заходнім, і ад Ратамкі да Астрашыцкага Гарадка -- у кірунку паўночна-ўсходнім. На гэтай катлавіне і ўтворана цяпер «Беларускае мора». Але ў тыя часы тут можна было добра адпачыць з вудай або стрэльбай, хто ведаў куткі й закуткі сярод гэтых непралазных багнаў. На адным досыць прасторным грудку, можа, так гэктараў пад пяцьдзесят, сярод гэтых багнаў і лясоў стаяла некалькі хатак засьценку Дразды. Некалі гэта была адна сям'я. Але сучасныя ягоныя жыхары мелі ўжо навет і розныя прозьвішчы. Адна з хатак належала Ўладыславу Ягеле, якога ў сувязі са зьбегам імя гэтага беларуса з польскім каралём Ягелам, дражнілі: кароль Ягела. Быў ён высокі, хударлявы, жылісты, з вострым арліным зрокам і рабіў уражаньне моцнага чалавека. І жыў ён тут, сапраўды, як той кароль: лясы, воды і ўсё тое, што ў іх ёсьць, як рыба, дзічына, ягады, грыбы й арэхі, належала яму. Чаго яшчэ трэба чалавеку? У семдзесят год, калі я яго знаў, ён бегаў, як юнак, ня ведаў ніякіх хваробаў, спаў як забіты, ніколі ня бачыў я яго ўзнэрваваным, за выключэньнем аднаго выпадку, аб якім і будзе гутарка ўперадзе. Хата ягоная, па старому беларускаму звычаю, ніколі не запіралася на замок, і ў яе можна было ўвайсьці, калі яго ня было дома. Гэта было вельмі выгодна для мяне як рыбалова й паляўнічага, і я часьцяком наведваў гэтыя мясьціны.

На гэты раз Уладыслава я застаў на двары. Ён стаяў за рогам свайго гумна й пільна ўглядаўся некуды ўдалеч, бязупынку сморгаючы рукой па сваёй даматканай нагавіцы, што паказвала на надзвычайную ўзьюшанасьць. Паставіўшы свае вуды пад страхой, я падышоў зь ім прывітацца. Не адрываючы зроку ад таго, на што ён глядзеў, Уладыслаў паклікаў мяне рукой бліжэй да сябе.

-- Бачыш? -- сказаў, паказваючы вачыма некуды за гумно. -- Прыехаў! Ага, вунь, бачыш? Новы пан!

На пясчаным ускрайку бору пры маляўнічай ручавіне, выбягаючай аднекуль зь лесу, я ўбачыў домік на колах, памаляваны ў вясёлыя колеры вясны. Каля яго завіхаўся чалавек, і відаць было па апрананьню -- вайсковец, ахвіцэр. Ён то згінаўся над нечым, то выпрастоўваўся, паблісквaючы ў промнях сонца начыста выгаленай і круглай, як качан, галавой.

-- Бачыш, уладкаваўся! -- працягваў Уладыслаў. -- Брацец мой родны. Х-ы!

Я чуў ад Уладыслава ня раз, што ёсьць у яго нейдзе брат малодшы, але сказаць, кім ён ёсьць і дзе прабывае, ад гэтага ён заўсёды ўхіляўся. Я зразумеў: ахвіцэр прыехаў зь перасоўным домікам на дачу ў родныя мясьціны...

-- Чаму-ж ён не пад'ехаў сюды бліжэй? -- спытаў я Ўладыслава. -- Каля вашай сядзібы, бадай, найлепшае мейсца ўва ўсёй гэтай ваколіцы, каб праводзіць прыемна час.

-- Х-ы! Цураецца! Бачыш, цурацца цяпер стаў нашага мужыцкага побыту, як начапіў энеральскія лычкі на мундур... Родная костка чужым мясам абрасла...

-- Адзін ён там, у сваім домiку?

-- Чаго-ж адзін? Жонка, дачушка.

-- Занудзіцца тамака й пад'едзе бліжэй.

-- Нуды ў яго мала! Стрэльбу мае, выжлу добрага... А качак і цецярукоў тут хапае...

Уладыслаў крыху памаўчаў, ня спыняючы пазіраць з-за гумна на домік вясёлых колераў.

-- У яго тамака ўсё ёсьць, у тым доміку: лектрыка, вадзіца студзёная, як лёд, і другая, цёплая, з-пад кранціка цурчыць, у пячурцы пірагі салодкія пякуцца й качкі смажацца... Куды-ж яму цяперака да нас?! Павыбілі паноў, каб самім стаць панамі. Жонка вымашчаная пархумамі, дачушка прыбраная, як цукерка... Запэцкацца аб нас могуць! Ну, і выракся! -- выклікнуў зь нейкім непагамаваным узрушаньнем. -- І сумленьня ў іх, падобных яму, ніякага, хоць ты кол на галаве цяшы! Хы, пад дзюравай сьвіткай у дзяцінстве абодвы спалі: ён да сябе -- у мяне задніца голая, я да сябе -- у яго... А цяпер ён як-бы пан, а я ўсё той-жа мужык, а ці пад панам добра, ці ён свой, ці чужы? Ды яшчэ што?! Цярпець ня можа, як ён кажа, нашай мужыцкай мовы, га?! От тут у мяне гэта сядзіць! -- паказаў на грудзі. -- Кажа: адсталасьць гэта, бо вы адсталыя мужыкі...

-- Я думаю, усё гэта ад ягонай жонкі, -- умяшаўся я.

-- Не, не скажу! Жонка якраз наша, нейдзе з-пад Барысава, гамоніць па-нашаму і ўсё сваё любіць і на яго крычыць: чаму ты, кажа, адбіўся ад сваіх? Любе прыйсьці тут, пагаманіць, парадзіцца, а ён -- не! У першы год, як прыязджаў з гэтым домікам, дык, праўда, пару разоў заходзіў. Месяц тутака стаяць, а ня зойдзе! Ходзе па грыбы ды па ягады або із стрэльбай ці з вудай, а пацікавіцца нашым

жыцьцём -- не! Як-жа так! Мы кармілі яго сваім хлебам, як ён вучыўся, і чакалі ад яго, што ён дапаможа нашаму народу наладзіць справядлівае жыцьцё, а ён вось што!? А пад аднэй сьвіткай, бывала, спалі! Я кажу: ападкі гэта! Чарвяк іх точа знутры!..

Гутарка гэта магла-б цягнуцца яшчэ даўжэй, але мне трэба было ісьці да рэчкі, бо вечарына стаяла цудоўная -- ціхая, цёплая; у такія вечарыны добра бярэць язь на гарох з падкормкай на ямах пры перакатах, дзе вада закручваецца й вымывае розны корм з дна рэчкі. Я аблюбаваў ужо некалькі год таму назад такія віры і ведаў, дзе трэба сесьці, куды й на якой тоні закідаць.

За вечарыну мне й праўда пашанцавала падчапіць пару ладных язёў, і я пакінуў затоку толькі тады, калі стала ўжо шарэць і паплаўка нельга было разгледзець. Дый камары сталі дапякаць страшэнна. Уладыслаў загадаў спаць ісьці на сенавал, дзе камароў няма й ня так душна. Раніца выдалася цудоўная -- ціхая й цёплая, як і ўчарашняя вечарына. З самага пачатку мне пашанцавала падчапіць яшчэ пару добрых рыбін. Астатні язь так доўга і ўпарта не даваўся, што я пратузаўся зь ім з паўгадзіны. Толькі наважыў перайсьці на другую, аблюбаваную мною, яміну, дзе ўчора добра сыпануў прынады, як убачыў паміж кустоў постаць у зялёным вайсковым убраньні. Гэта быў брацец Уладыслава. Намацваючы больш бясьпечную мясьціну, каб не заваліцца па пахі ў багну, ён сунуўся ў маім напрамку. У рукох трымаў вуды, сачок і невялікі сундучок із снасьцямі. Нёс таксама складаны зэдлік, каб ямчэй было сядзець каля рэчкі.

Я ветліва прывітаўся зь ім, але «энерал» не зьвярнуў увагі на маё прывітаньне, быццам нічога й ня чуў.

-- Хто вам дазволіў лавіць тут рыбу? -- раптам зьвярнуўся да мяне.

Закон я добра ведаў: ува ўсіх рэчках і вазёрах на Беларусі, за вылучэньнем спэцыяльных рыбнасаўгасаўскіх, было вольна лавіць рыбу вудачкай, і гэта пытаньне, ды яшчэ такім тонам, не магло мяне не абурыць. Тым ня менш, я ветліва, але праўда не бяз гіроніі, спытаў, у сваю чаргу:

-- Хіба трэба пытаць у каго гэтага дазволу? Гэнерал, здаецца, мыліцца, калі ўважае, што гэта так!?

Гэнерал аж выпусьціў з рук вудачкі -- пэўна-ж, прызвычаіўся «повелевать», а тут гэтакае... Мундур ягоны ў гэты час як-бы

няўзнак расхінуўся, і я ўбачыў пад ім футурал ад браўнінга. Зразумела, мне напляваць на ягоны браўнінг -- страляць мяне ён тут ня будзе, -- але я, усё-ж наважыў не задзірацца зь ім. Гэнерал, пэўна, падумаў, што я спалохаўся і яшчэ больш строга прамовіў:

-- Перш-наперш, уважайце, зь кім маеце гутарку. Па-другое, зьвяртайцеся да мяне на агульназразумелай мове, а не на нейкім вузкаадсталым дыялекце, перапоўненым аджылымі архаізмамі, за якія ў наш час могуць скіраваць туды, дзе Макар цялят ня пас...

Тут ужо я ня мог паўстрымацца.

-- Менавіта вы якраз і ёсьць гэты аджылы архаізм, дарма што носіце савецкую хворму. Вы ведаеца, як вас тут клічуць, -- ападак! Гэта, па-першае! Па-другое, вы мыліцеся, што да мовы. Не дыялект і не архаізмы, з вашага вялікадзяржаўніцкага пункту гледжаньня, а беларуская мова, на якой гавораць мільёны людзей, і больш старэйшая, чым ваша «обЭепонятная»... І, па меншай меры, ня шчыра цьвердзіць, што вы не разумееце яе, -- вы-ж беларус усё-ткі й гэтую мову ўсмакталі ў сябе з матчыным малаком!.

-- Ну, добра, добра, сьціхніце! Я ўчора тут падсыпаў гароху, а вы мне паспасавалі ўвесь лоў!

-- Вы толькі ўчора, а я тут бываю ўжо на працягу дзесяці год.

-- Я тут вырас! Я ведаю тут кожную ямінку! -- крыкнуў гэнерал.

-- Ага, прызналіся ўсё-ткі -- беларус!?

-- Я не дазваляю вам зь мяне кпіць!

-- Вы самі зь сябе кпіце.

Тлустая шыя гэнерала налілася крывёй.

-- Я вас арыштоўваю: вы знаходзіцеся ў пагранічнай зоне бяз візы...

Гэта было крыху нечакана для мяне. Каб не дражніць больш гэнерала, які, сапраўды, мог зрабіць для мяне вялікую прыкрасьць, я зьвязаў свае вуды. Выбраліся з багнаў і накіраваліся ня куды-небудзь, а да хаты Ўладыслава.

-- Адчыні сваю стопку, трэба замкнуць гэтага чалавека, пакуль прыедзе пагранічная ахова...

Уладыслаў аж затросься ад сьмеху.

-- Гэта твая ваенная перамога? Ото-ж ужо ад вялікага розуму з глузду зьехаў! Ты во які карак маеш, а ў гэтага чалавека таксама дзеці. І чакаюць яны: татка рыбы прынясе. На карткі ня дужа

разгонішся! -- І потым да мяне: -- Ідзі, чалавеча, у хату, адпачні, брацец з глузду, пэўна, зьехаў...

Ці вывеліся на Бацькаўшчыне падобныя людзі, ці яны, гэтыя ападкі, і надалей аплёўваюць усё сваё...

Нью-Ёрк, 1956

«Янка сеяў -- людзі жалі»

Ніколі й нідзе ня траціласа столькі чалавечай энэргіі на доказ вольнасьці, роўнасьці, сацыяльнага дабрабыту і іншых атрыбутаў наземнага раю, як у «сацыялістычнай бацькаўшчыне». І ніколі й нідзе ня было столькі супярэчнасьцяў між словамі й справамі, як менавіта там. Вось урачыстасьці кастрычніцкай рэвалюцыі, якія, як ведама, прыпадаюць на сёмага лістапада. Да гэтага дня рыхтуюцца тысячы розных брашураў, артыкулаў, выступленьняў, успамінаў, апісаньняў... Усе друкарні ўва ўсіх рэспубліках мабілізаваныя надрукаваць іх ва ўдарным парадку ў мільённых тыражох і разаслаць праз адпаведныя ворганы і арганізацыі, гэта значыць -- праз абкомы, райкомы й селькомы ў самыя далёкія куточкі. Апрача таго, пачынаючы з шостага лістапада і навет раней, пэрыядычныя выданьні запоўнены прыгатаваньнямі да надыходзячых урачыстасьцяў. Чыноўнікі партыйнага апарату: райкомаў, абкомаў, ЦК КП(б) саюзных рэспублік і самога ЎКП(б) разьмеркаваныя й разьязджаюцца па хвабрыках, заводах, шахтах, сёлах, вёсках і аўвулах. І дзень і ноч грымяць радыёрупары літаральна з усіх раздарожжаў аб адным і тым-жа. Партрэты, сьцягі,

лёзунгі, транспаранты, ілюмінацыі -- усё ў чырвоным колеры -- і ўсё гэта мусіць сьведчыць аб дасягненьнях, аб волі, аб шчасьці пад савецкай зоркай...

I

Кузьма Вальтэр атрымаў пяць год Калымы за дурноты. У палітыцы ён мала кеміў і наагул быў чалавекам пасыўным, але сярод студэнтаў вылучаўся здольнасьцямі. Гэтым апошнім крыху злоўжываў, што ўласьціва амаль усім або шмат каму зь юнакоў. І калі на сцэну ў дзень кастрычніцкіх урачыстасьцяў зьяўляўся той ці іншы прамоўца із сваім неадменным «падвядзеньнем вынікаў», ён знаходзіў для яго вельмі трапную характарыстыку. Гэта сьмяшыла сяброў, што сядзелі побач, і на іх нехта нябачны зьвярнуў увагу. Затым, ужо на банкеце, якім заўсёды канчаюцца падобныя ўрачыстасьці, была зроблена й другая неасьцярожнасьць. А тут якраз і трэба найбольш высьцерагацца, бо НКУС, бясспрэчна, ведае прыказку: «Што ў цьвярозага ў галаве, тое ў п'янага на языку»...

Сядзелі хэўрай за сталом, налівалі ў шклянкі «нарзан» (ад слова «нарэзаўся», значыць, напіўся), расказвалі адзін аднаму розныя гісторыі, жартавалі, сьмяяліся... Кузьма быў у цэнтры ўвагі. Часам да іх падыходзіў хто-колечы зь кіруючых, напрыклад, парторг, заўвуч або й зусім хто-небудзь зь незнаёмых, але важных асобаў, і таксама падымаў напоўненую шклянку.

-- Ну, сябры, вып'ем! Чаго-ж, на тое й сьвята, каб усім было весела!

Стукаліся шклянкамі, праліваючы вадкасьць на па-сьвяточнаму прыбраны стол, і выпівалі. Кузьма раптам заўважыў:

-- Ну, вып'ем! Хроніка зазначае: расеец выпіць ня дурань! От на што-небудзь іншае дык глузду часам не хапае...

-- Ну, Кузьма, гэта ты ўжо беспадстаўна... Былі-б у мяне такія здольнасьці!

-- А хто сказаў, што я расеец?

-- Ну, калі не расеец, дык «малодшы брат».

-- Зусім -- не! Чуеш, як гучыць маё прозьвішча? Можа быць, крыху немец, крыху ангелец, прасьцей кажучы, -- цэлы інтэрнацыянал ува мне адным...

-- Што-ж, гэта нядрэнна, ува ўсякім разе «на даным этапе»...

Кузьма працягваў:

-- Апрача таго, калі-б і расеец, дык гэта зусім не пярэчыць таму, што я сказаў, бо вось ужо год, як пішу дысэртацыю па дыямату й ніяк не магу скончыць!

Усе весела засьмяяліся.

-- Так, маючы такую нагрузку, як ты? Ты-ж прыходзіш на лекцыі толькі паспаць!

-- А якога чорта там рабіць? Выйдзе вось гэтакі кагуцік і пачынае кукарэкаць аб «адпаведнасьці вытворчых адносін вытворчым сілам...» Трэба разумець: «дыялектыка што дышла, куды павернеш, туды й выйшла...»

Зноў усе гучна засьмяяліся. Але знайшоўся й такі, што папераджальна сказаў:

-- Цішэй, хлопцы! Няпрыстойна-ж усё-ткі гэтак...

Гэта быў аднакурсьнік Кузьмы і ягоны першы сябра Нупрэй Орлік.

-- Што няпрыстойна? Сьмяяцца? Ты, як будучы лекар, мусіш хутка рэцэпты выдаваць на сьмех, бо, зразумей, памірае...

-- А гэта востра ўсё-ж: дыялектыка што дышла... -- заўважыў студэнт Алесь, калі зноў аднавілася цішыня.

-- Ты, Ляксей, чалавек божы, відавочна, п'яны? Дыялектыка -- гэта аснова марксысцкага пазнаньня існуючага! -- раптоўна атакаваў яго Орлік. -- І што тут ёсьць недакладнага?!

-- Нічога! Сёньня пабалаголіць можна! -- умяшаўся Кузьма.

-- І ты таксама, Кузьма, сёньня нешта збэсьціўся...

-- Дыялектыка -- гэта ёсьць спосаб давесьці... -- сур'ёзна загаварыў Алесь.

-- Давесьці, што ты грыб, а не студэнт! -- пасыпалася на яго з усіх бакоў.

-- Хай сабе грыб, але першы, Баравік (такім было ягонае прозьвішча).

-- Ну й баравік! Проста атрутны мухамор, смаршчок!

-- Я навет скажу, што й не смаршчок, а звычайны грыб, неазначанага роду, сьмярдзючы шаплык, як кажуць у нас...

Зноў усе весела засьмяяліся, і гэтым інцыдэнт быў-бы скончаны, каб не ўмяшаўся нехта пабочны.

-- Пра што спрэчкі? -- спытаў.

-- Ды ні пра што! -- быў адказ. -- І наагул, ніякіх спрэчак няма.

-- Дыялектыка што дышла... -- усё-ж захіхікаў Алесь Баравік. -- Не, як сабе хочаце, а гэта прамоўлена...

Адразу-ж усе прыціхлі.

-- А вы ведаеце, грыбы-ж самі сеюцца, -- заўважыў Орлік, шматзначна пераглядаючыся зь сябрамі. -- Таксама, як і дурні...

-- Намёк быў вельмі выразны, і гутарка адразу-ж спынілася. Але моўчкі сядзець было няёмка, і нехта запрапанаваў:

-- Давайце засьпяваем!

-- Не! Гэта наробе шмат шуму, якога ў залі й так, хоць адбаўляй!

Сапраўды, за сталамі амаль нікога ўжо ня было. Хадзілі, курылі, гучна размаўлялі; нейдзе стукалі більярднымі кіямі; нейкая падвыпіўшая дзяўчына гістэрычна рагатала... І ўсё гэта пакрывалася шалёным звонам фартап'яну, на якім нехта прабаваў зайграць: «У Кацюшы выраслі ігрушы, бо ночку ў садзе правяла...», але з-пад п'яных пальцаў высклізала клявіятура. Урэшце яму ўдалося схапіць матыў, і яго адразу-ж падхапілі п'яныя галасы.

-- Вось бачыце? Папросім лепей Кузьму прачытаць што-небудзь, -- запрапанаваў Орлік.

-- Які-небудзь верш!

-- Які там верш! Ён можа нам цэлага Джамбула напамяць выкласьці.

-- Маналёг Раскольнікава -- ён прыхільнік Дастаеўскага.

-- Ён -- прыхільнік Дастаеўскага? -- пачуўся голас таго-ж незнаёмага, які пытаўся толькі што аб спрэчцы, але некуды быў адышоўшы і цяпер зноў стаяў за сьпіной Кузьмы.

-- Шпіцаль! -- адразу-ж прыйшла ў галаву шмат каму адна й тая-ж думка.

-- Мы -- студэнты! Мы мусім ведаць ня толькі тое, што выклікае спачуваньне, але й тое, што ўпакараньне...

Кузьма больш адчуў, чым зразумеў, што акалічнасьці склаліся неяк нядобра. Але яго нешта штурхала, як гэта нярэдка бывае зь ня зусім цьвярозымі людзьмі, зьдзівіць чым-небудзь прысутных. Ён падняўся, каб голас ягоны больш даходзіў да слухачоў, і прадэклямаваў верш Янкі Купалы -- верш, які быў быццам-бы

забаронены, але тым ня менш ня сходзіў з вуснаў людзей. У вершы гэтым шмат разоў паўтараліся радкі:

Янка сеяў -- людзі жалі,
А зязюлька кукавала:
Ку-ку! Ку-ку!

Чытаў Кузьма сапраўды добра й заслугоўваў на пахвалу, але, калі скончыў, наўкола стаяла амаль мёртвая цішыня.

II

Здавалася-б, усё гэта -- дзяцінныя гульні, на якія ня сьлед зьвяртаць увагі. Толькі пару гадзін таму на ўрачыстай частцы вечара столькі было слоў пра волю, а ўсё-ж і гэтым нехта зацікавіўся. Першым пра гэта даведаўся Орлік. Кузьма яшчэ ляжаў у ложку з кніжкай у рукох (студэнты жылі ў інтэрнаце), калі Орлік падышоў да яго. Быў усхваляваны або, праўдзівей, прыгнебены. Аблакаціўся на ложак супроць Кузьмы, і вочы іхныя спаткаліся. Кузьма адразу-ж зразумеў: нешта здарылася. Запытаў сьцішаным голасам:

-- Хворы ці што -- з перапою?

-- Так, хворы! І вельмі дужа хворы... -- скрывіўся. -- Але як мне сказаць табе пра гэта?

-- Што за выбрыкі?! Язык у цябе прысох?

-- Здаецца, на цябе зрабілі данос. Але ведай: я пра гэта з табой ніякай гутаркі ня меў, -- памаўчаў. -- У мяне й без таго клопатаў хапае...

-- А што здарылася?

-- З бацькамі нядобра.

-- А што зь імі ёсьць: раскулачаныя, сасланыя?

-- Пакуль -- не! Але вось прычапіліся, што некалі мелі малатарню, пазычалі суседзям, значыць, -- эксплуататары, жылі з чужой працы...

-- Тутака няма лёгікі. Кожны што-небудзь пазычае ў суседа.

-- Ты шукаеш лёгікі? А якая лёгіка ў тым, што цяпер вынішчаюць пад корань усю нашу інтэлігенцыю? Рэвалюцыя-ж была за вызваленьне ўсіх народаў з-пад ярма расейскага шавінізму й за вольнае станаўленьне гэтых народаў у сваіх межах. Макіявэлеўшчына! -- Орлік прыкра ўхмыльнуўся. -- Але я ня з гэтай прычыны пачаў з табой гаворку: хочу папярэдзіць -- сьцеражыся!

-- Пра які данос ты пляцеш?

-- Я-ж сказаў: на цябе ёсьць данос!..

-- На мяне?

-- Так, на цябе! За ўчарашняе, я так думаю.

-- А што ўчора здарылася? -- задумаўся. -- Ах, гэта? Які можа быць данос, калі я зусім сумленны! Ды пры тым яшчэ -- нашчадак пралятараў!

-- Ну, як хочаш!

-- Але адкуль у цябе гэтакія весткі?

-- Бачыў, як Баравік празьмерна пасьпешна выскачыў із спэцаддзелу.

-- На падставе гэтага ты мяркуеш, што на мяне данос? Але-ж ён ходзе туды штодня, бо яму даручана рэгістрацыя вайскоўцаў. Якая дурнота! І пра што на мяне могуць даносіць, калі я чысты, як крышталь?!

-- Ну, не скажы, і на крышталю могуць знайсьці лішаі, калі гэта патрэбна.

-- Але-ж у цябе няма ніякіх ня толькі доказаў, але й пасьлядоўнасьці?

-- Бачыш, Баравік тут раззваніў пра ўчарашняе па ўсяму ўнівэрсітэту, і стварылася ўражаньне...

-- Учора я ня быў п’яны й дасканала памятаю ня толькі кожнае маё слова, але й гэст, зь якім яно было выказана. Тое, што пакпіў з прафэсара па дыямату? Але-ж ён -- мішэнь для кпінаў ва ўнівэрсітэце!

Гэтая гутарка адбылася, як было ўжо зазначана, раніцой наступнага дня пасьля ўрачыстасьцяў; а гадзіне чацьвертай нечакана зьявіўся загадчык спэцаддзелу таварыш Падкаблук. Прайшоў разы два па галі, кінуў позіркам на ложак Кузьмы. Хаця той, здавалася, і ня прыняў блізка да сэрца паведамленьне сябра Орліка, усё-ж гэта яго крыху занепакоіла. На працягу цэлага дня нікуды ня выходзіў, за вылучэньнем у сталоўку праглынуць сьняданьне. Як толькі вярнуўся, зноў разабраўся і лёг на ложак. Узяў у рукі кніжку, але чытаньне ў галаву ня йшло. «Дзіўна -- данос!? Які можа быць данос на мяне? Хіба ня ведама, хто я? І што мог раззваніць гэты ішак, Алесь Баравік? Дыялектыка што... Але-ж гэта жарт! Хіба ён гэтак страшны? Верш Янкі Купалы! Добры верш, прачулы, лірычны. Людзі пяюць яго. Пабольш-бы гэтакіх вершаў!

Дурнота нейкая з гэтым даносам... Не, Орлік проста здэнэрваваны сваімі асабістымі справамі -- няпрыемнай сытуацыяй з бацькамі -- і свой настрой хоча перадаць іншым...» Адклаў убок кніжку й задумаўся. Хай сабе даносяць! Ягонае сумленьне чыстае, і ён спакойны. Зноў пачаў чытаць, але радкі, быццам жывыя, рухаліся й рассыпаліся перад вачыма. «Гэта пройдзе, трэба толькі прагуляцца, дыхнуць сьвежым паветрам». Апрануўся й выйшаў на калідор. Насустрач яму ішоў таварыш Падкаблук, быццам спэцыяльна нейдзе тут яго чакаў.

-- Вось і добра! -- падумаў, адчуваючы ўсё-ж трывогу ў сэрцы. -- Можна будзе зь ім адразу-ж гэную справу й высьветліць...

Але Падкаблук, не дайшоўшы да дзьвярэй інтэрната, сам паклікаў да сябе студэнта пальцам.

-- Зайдзіце, калі ласка, да мяне на хвілінку, -- прашаптаў, як-бы баючыся, каб хто не пачуў. -- Ведаеце куды? У спэцаддзел, пакой нумар дзевяць...

Кузьма заглянўў яму ў вочы і ўбачыў у іх нешта хітрае, лісьлівае і, разам з тым, пагрозьліва-падступнае. «Якія брыдкія вочы, -- падумаў, -- жоўтыя, як у д'ябла!» Але запытаў:

-- Калі -- цяперака?

Падкаблук ледзьве не падскочыў.

-- Чаго-ж вы крычыцё? Чаго крычыцё? -- і потым зь незадавальненьнем: -- Зразумела, цяпер! А то калі-ж? -- азірнуўся і зноў зашаптаў, ужо ветліва: -- Перад тым, як увайсьці, пастукайце ў вакенца, вось гэтак во! -- і пальцам пастукаў у сьцяну, паказваючы, як трэба. -- Пашпарт маеце із сабой? Добра! Не забудзьце пашпарт!

Павярнуўся й пайшоў у той бок, адкуль зьявіўся.

Кузьма адчуваў, як пачынае разьбіраць яго хваляваньне. «Дзіўна!» -- парушыў плячамі. Вярнуўся ў залю, выняў з сундучка пашпарт, паклаў яго ў кішэню і ўзьняўся нагару. Але пакою нумар дзевяць нідзе ня было -- усё ішлі соткі. Ён успомніў: нумары для большай зручнасьці ідуць ад сотак. Падышоў да нумару 209. Праўда, у дзьверы было ўробленае невялічкае вакенца, такое невялічкае, каб толькі можна было празь яго зазірнуць на калідор з пакою. Пастукаў, як вучыў Падкаблук. Вакенца адчынілася, нібы аўтаматычна, і паказаўся твар заўспэцаддзелу. Быў як-бы заклапочаны, павекі падміргвалі.

-- Ага! Вы? Заходзьце!

Хранцузскі замок на дзьвярах мякка пстрыкнуў, і дзьверы бяз шуму адчыніліся. Як толькі Кузьма пераступіў парог, зараз-жа зачыніліся.

-- Ну, вось і новы кліент. Сядайце!

Кузьма азірнуўся. Ён і ў думках ня меў, што пры ўнівэрсытэце можа быць установа, нагэтулькі засакрэчаная. Дзьверы, сьцены, столь, навет рамы вакон, усюды, дзе мог пранікаць гук, былі абкладзеныя нечым мяккім -- коркам або ватай, або тым і другім. Зьверху абабітыя цыратай. Падлога засланая мяккім і грубым дыванам. Але мэблі было параўнаўча мала: тры-чатыры крэслы, апрача двух фатэляў, канапа і ў кутку пакою агнятрывалая шафа. На сьценах віселі колькі партрэтаў: Ленін, Сталін, Дзяржынскі і Яжоў...

Падкаблук узяўся за адзін з трох, стаячых на стале, тэлефонаў. Потым перадумаў, паклаў слухаўку на мейсца й зьвярнуўся да Кузьмы:

-- Ну, што, пакукуем?

Студэнт зачырванеўся.

-- Пашпарт пры вас?

Кузьма перадаў пашпарт.

-- Уперад мушу вас папярэдзіць: сам факт, што вас сюды паклікалі, а таксама тое, аб чым з вамі тут размаўлялі, мусіць застацца таямніцай. Зразумела?

-- Зразумела.

-- Калі-ж бы выявілася, што вы свайго слова ня стрымалі, будзеце адказваць, як за разгалошваньне дзяржаўнай таямніцы...

Потым Падкаблук пачаў дапытваць Кузьму пра ягонае асабістае жыцьцё: дзе праводзіць час, зь кім спатыкаецца, якія вядзе гутаркі. Кузьма адказваў, што, апрача навукі, ён мае васьмігадзінную нагрузку ў школе, для гульні часу ня мае, і таму знаёмствы ягоныя абмяжоўваюцца студэнтцкім і настаўніцкім асяроддзем.

-- А вы не знаёмы з палкоўнікам Міхалам Дуброўскім?

Кузьма зразумеў, што прозьвішча выдуманае, і спакойна адказаў:

-- Ведаю аднаго Дуброўскага, сакратара райкому, а ці палкоўнік ён, ці не, ня ведаю...

Падкаблук на момант як-бы зьмяшаўся.

-- Ага, так?! А вось вытлумачце, як вы ўчора правялі вечар кастрычніцкіх сьвятаў: ці ня здарылася з вамі чаго-небудзь асаблівага, ці не спаткаліся вы зь кім-небудзь такім... ну?

Кузьма перадаў усё пра вечар, як і было, бо дагадаўся, што Падкаблук дастаткова паінфармаваны.

-- Гэтак нядобра! Вось-жа вы там кідаеце розныя туманныя тырады... І гэты верш, як ён там: «зязюлька кукавала» ці што?

-- Янка Купала -- народны паэта, узнагароджаны ордэнам...

-- Так, усё гэта правідлова. Але бывае ўсялякае й зь вельмі вялікімі людзьмі, што-ж казаць пра народных паэтаў?

-- У вершы гэтым няма нічога, што магло здавацца супярэчлівым...

-- Вы так перакананы? Гэта даволі дзіўна, прымаючы пад увагу ваш век. Я, напрыклад, знаходжу ў ім і вельмі шмат, як вы кажаце, супярэчлівага... -- Ён узяў нейкі лісьцік паперы й пачаў: -- Па-першае, высьмейваньне калгаснага будаўніцтва -- адчыненае, нахабнае... Вось нейкі Янка сеяў, а прыйшлі людзі й зжалі! Хіба гэта не намёк на беднату й не абарона кулака? Па-другое, у той час, як Янка сеяў, зязюлька кукавала. Якая яна, гэтая птушка?! А птушка яна такая, што не клапоціцца аб сваім дабрабыце -- ня робіць сабе гнязда, а забіраецца ў чужыя... Хіба тут, у гэтай бяздомнай птушцы, не відавочны намёк на пралятарскую клясу, вясковую беднату й ліквідацыю прыватнай уласнасьці на аднэй шостай зямной кулі? Не працуюць, ня дбаюць, а як Янка пасее, сажнуць! Так, Янка Купала народны паэта, адзначаны ордэнам, пакінем яго ўбаку, хай жыве сабе на здароўе, пакуль што... Але чытаць такія вершы публічна!? Адно толькі аблягчаючае віну ёсьць ува ўсім гэтым -- гэта тое, што вы нічога не схавалі, паведамілі пра ўсё, як яно было... Калі вы захочаце пакапацца ў сваёй памяці і ўспомніць тое, што зь вечарам ня зьвязана, але мае для нас вялікае значэньне, дык вам гэта дапаможа знайсьці правідловы шлях у будучыні...

Як гэта ня дзіўна, Кузьма зарагатаў -- зарагатаў ад усіх гэтых бязглуздых інтэнцыяў і выдумак. Падкаблук зірнуў на яго ўніклівым позіркам. Але тут быў усё-ж унівэрсітэт, і ён нічога лепшага не знайшоў, як толькі змаўчаць. Узяў слухаўку тэлефону, прыклаў да вуха. Ціха й доўга размаўляў зь некім. Потым, таксама ціха, зьвярнуўся да Кузьмы:

-- Вельмі шкадую, але абавязаны параіць вам безадкладна зьявіцца ў вадну паважаную ўстанову на Савецкай. Вы, зразумела, дагадваецеся, у якую? Не палохайцеся, яна страшная толькі для контррэвалюцыянэраў, шпіёнаў і дывэрсантаў. Людзей-жа сумленных яна бярэць пад сваю апеку і ахову...

І ён пачаў тлумачыць, як патрапіць у гэтую ўстанову, куды для гэтага патэлефанаваць і да каго зьявіцца.

III

Кузьма, не заходзячы ў інтэрнат, выйшаў з будынку ўнівэрсітэту. Ідучы, ён ня стаў разьбірацца ў тых супярэчнасьцях, якія хаваліся ў вапошняй заўвазе Падкаблука адносна «паважанай установы». Ён спадзяваўся: там разьбяруцца. Страшная для контррэвалюцыянэраў, дывэрсантаў і шпіёнаў. Ён-жа не дывэрсант, ня шпіён і не контррэвалюцыянэр! Яму ня можа пагражаць нічога благога. Тое, што тутака нагаварыў гэны крэтын, проста плюгаўства, на якое ня сьлед зварачаць увагі.

Увайшоў у пад'езд паважанай установы, знайшоў тэлефонную будку, набраў паданы Падкаблуком нумар. Яму нехта адказаў: -- Трэба чакаць, паклічуць. -- Добра! Калі не сьпяшаюцца, значыць, няма ніякай і небясьпекі! Проста разьдзьмуханы пажар! Не сьпяшаюцца!? Ён прайшоў па прыймовай залі. Агледзеў сьцены з партрэтамі й лёзунгамі. Прачытаў на адным: «ЧК -- ДПУ -- НКУС -- вартаўнік рэвалюцыйнай законнасьці». Што тут страшнога? Наадварот, вельмі добра! Якое жыцьцё без законнасьці? Выглянуў праз акно, застаўленае кратамі. На дварэ ціха, як у магіле,-- нідзе ніякіх жахаў. І чыста, культурна. Як відаць, і праўда, больш выдумак пра гэту ўстанову. Злыя языкі, таму што сьцірае з твару зямлі дывэрсантаў, шпіёнаў, контррэвалюцыянэраў. Для іх можа быць страшная! Засьвістаў нейкі матыў, як свой чалавек у гэтай ўстанове, і сеў на адну з лавак, што стаялі каля сьцяны й на якіх ужо сядзелі, галоўным чынам, чамусьці жанчыны. Якраз у гэты час вакенца адчынілася, і яго паклікалі па імю й прозьвішчу.

Як толькі ён зайшоў за дзьверы, зь ім цацкацца ня сталі: скамандавалі падняць рукі ўгару й абшукалі кішэні. Потым прымусілі распрануцца, як маці радзіла. Заглянулі ў рот, у вушы, ва ўсе дзюркі й шчэлкі. Круцілі налева, направа, нешта сьпісвалі; глядзелі ў твар і ў вочы; зьмералі й зважылі; ашчупвалі кожны

рубец і кожны гузік у вопратцы. Урэшце загадалі апрануцца. Ну, цяпер, мабыць, адпусьцяць!? Але яго павялі ў нейкі калідор і загадалі чакаць, пакуль зноў не паклічуць. Стаяла адна-адзіная лаўка, і ён сеў. Гумар ягоны адразу-ж зьнік. Абразьліва было ўспамінаць, як яго абшуквалі. Што-ж, выходзіць -- арыштант? Хацелася то плакаць, то крычаць, то ірваць на сабе валасы, то стукацца галавой аб сьценку. Чакаў выкліку, і тады будзе пратэставаць. Але ніхто ня прыходзіў і ня клікаў: на калідоры было ціха, пуста, толькі час ад часу, нейдзе далёка, мабыць, у «амэрыканцы», аб існаваньні якой ён чуў, нейдзе там ляскалі нейкія зялезныя запоры. Цяпер інтарэсы навукі, працы, адпачынку, сну й усяго іншага, чым жыве нармальны чалавек, адсунуліся на задні плян. Ламаў пальцы. Раптам яму стала зімна. Здавалася, на дварэ студзёны дождж із сьнегам, у той час як стаяла цудоўнае надвор'е.

Ён сядзеў ужо гадзіну, потым другую, трэцюю... Забалела сьпіна, і думкі лезьлі ў галаву самыя змрочныя. Ён навет падумаў, ці не ўцячы яму адгэтуль? І хай тады вырашае сам лёс, што зь ім будзе. Ён паспрабаваў адчыніць дзьверы, якія, на ягоную думку, маглі выходзіць на вуліцу або куды-небудзь на задворак. Але за дзьвярыма быў нейкі катух, у якім стаялі насілкі, а на іх ляжалі вымачаныя крывёй анучы, два раменныя бізуны, цьвікі, малаток, а збоку стаяла вядро з вадой... Не пасьпеў ён зачыніць з агідай дзьвярэй, як з пакою насупраць нехта выйшаў і спыніўся ў яго за сьпіной. Кузьма так спалохаўся, што баяўся варухнуцца і азірнуцца. Але той, хто стаяў за сьпіной, сказаў:

-- Прыбіральня ня тут.

-- Я ня маю патрэбы, -- мэханічна адказаў Кузьма.

-- Ну, то пойдзем!

Пакой, у які яго ўвялі, быў невялікі, але ён злучаўся з двума іншымі -- налева й направа. Дзьверы ў іх былі адчыненыя. Каля адных зь іх, паставіўшы крэсла проста на праходзе, сядзеў зь вінтоўкай баец. Кузьма зразумеў, што цяпер яму адсюль ужо ня выйсьці, і ён мэханічна спыніўся на парозе. У другім пакоі, за вялікім сталом, заваленым паперамі, стаяў чалавек у вайсковай хворме з малінавымі пятліцамі на мундуры. Твару ягонага ня было відаць, бо ён глядзеў у паперы.

Сонца ўжо вісела на кончыку дугі, па якой ходзіць ад усходу да заходу. Крывавыя промні, ахварбаваўшы неба, нацэліліся ў вокны. І

ўсё ў гэтым пакоі: і людзі, і рэчы -- здаваліся чырвонымі, быццам залітымі крывёй. Кузьма стаяў і чамусьці доўга глядзеў на кончык багнету, добра адточаны й таксама заліты сонцам. І яму здавалася, што й з багнету таксама сочыцца кроў...

Раптам той, у вайсковай хворме, узьняў галаву, кароткім позіркам зірнуў на Кузьму і як-бы ўсьміхнуўся.

-- Філёзаф! -- прамовіў.

І зноў панік у чытаньне папераў.

Прайшло хвілін пяць або дзесяць. Кузьма чакаў. Ногі ягоныя зьдзервянелі. У вушах зьвінела. Ён адчуваў, што тоне, і яму хацелася крычаць аб дапамозе, як некалі ў дзяцінстве, калі ён сапраўды тануў.

-- Ку-ку! -- зноў адгукнуўся вайсковец.

І зноў апусьціў вочы ў паперу. Потым ужо сувора да байца:

-- Ну, што-ж ён будзе стаяць!? Адвядзі яго ў адзіночку «амэрыканкі», хай там пакукуе...

IV

Кукаваў Кузьма ў «амэрыканцы» досыць доўга, каля дзевяці месяцаў. Потым яго асудзілі завочна на пяць год Калымы. Калі адпрацаваў чатыры з паловай гады, справу ягоную раптам патрабавалі на перагляд. Што было прычынай гэтага і ці на карысьць яму гэта ці на шкоду, Кузьма ня ведаў; ён толькі дагадваўся, што перагляд справы зьвязан з беларускай нацдэмаўшчынай, якая штораз прымала ўсё вастрэйшыя й вастрэйшыя хвормы. Але, калі яго пасадзілі ў вагон і павезьлі на захад, яму стала лягчэй. Не таму, што ён спадзяваўся на нешта: ён ужо пагадзіўся зь лёсам; было дастаткова часу, каб зразумець, што маладое жыцьцё ягонае пакалечанае, зламанае, і цяперака, каб навет выпусьцілі, яму ўжо ня ўзьняцца, не папасьці зноў ва ўнівэрсітэт, не заняць адпаведнага ягонаму таленту мейсца ў жыцьці; заўсёды і ўсюды над ім будзе цяжэць гэтае «рэпрэсаваны». Але, так ці йначай, ён едзе ў родныя мясьціны, дзе прайшло дзяцінства, дзе цьвітуць яблыні й цудоўна сьпяваюць птушкі, дзе жыцьцё выкавала яму душу. З вакна вагону ён спадзяваўся ўбачыць родныя хаткі, крытыя саломай, але такія мілыя, прыхільныя; палі, па якіх бегаў босым

наўздагон мятлікам; рэчкі й ручаі, у якіх ныраў у пошуках рыбы; лясы, у якіх лазіў па дрэвах і зьбіраў ягады і арэхі; спадзяваўся пачуць родную гаворку; пабачыць мілыя твары беларускіх дзяўчат... Пасьля дзікай і няпрыхільнай Калымы гэта было так шмат!

Выгляд Кузьмы быў страшэнны: высах, пачарнеў, згорбіўся, нягледзячы на свае дваццаць шэсьць год! У вачох залягло цяжкое ўпакараньне, і калі-б яго цяперака ўбачыла маці, не пазнала-б! Навет чэрап і той быццам-бы набыў іншую хворму: занадта выпукаў ззаду, над шыяй, і хаваўся пад валасы сьпераду. Галіцца ў вязьніцы, а потым у лягеры ня было ніякай магчымасьці з-за адсутнасьці брытваў, і ён некалькі разоў на год бараду падпальваў, каб стала карацей. Ад гэтага яна хоць і губляла колер, але расла гусьцейшай і лепей абараняла ад сьцюжы...

Падарожжа цягнулася больш месяца; было зьнясільваючым, галодным і халодным, нягледзячы на вясну. Калі-ж яго прывезьлі ў турму -- у родную, як ён яе называў, -- ён крыху павесялеў. Страшэнных допытаў яму тут не прадбачылася, ён усё гэта пражыў! На цяжкія працы не ганялі, ежа і абыходжаньне былі лепшыя, чымся ў лягерах... І калі-б у камары было хоць крыху вальней, ён палічыў-бы гэта за лепшае да канца сваёй адседкі...

Была ціхая раніца. За вакном чылікалі вераб'і. Падагнуўшы каленкі пад жывот, бо выпрастаць іх ня было куды, Кузьма ляжаў у найдальшым куце. Яшчэ ўсе спалі, бо было зусім рана, сьвятло толькі стала прабівацца ў камару. Стаяў такі смурод, што дыхаць ня было чым. Час ад часу нехта блюзьніў цераз сон: капашыўся, стараючыся выпрастаць ногі, паскрэбваўся пад лахманамі, стагнаў, а часам і лаяўся на суседа. І Кузьме, як жарт, успаміналася:

Жіть стало лучше'
Жіть стало веселей...

Або:

Я другой такой страны не знаю'
Где так вольно дышіт человек...

Падумаў з усьмешкай: «Пэўна, гэтаксама аб гэтай "стране" думалі й Малюта Скурат, і Аракчэеў, і Мураўёў-вешацель...»

-- Д'яблы зь імі, з усімі, -- раптам прашаптаў.

І тады, як і заўсёды і ўсюды, калі заставаўся сам-насам, пачынаў успамінаць родны край і родны кут: бэз пад акном, вазёрную гладзь,

шумы бароў, ключ дзікіх гусей над галавой, калі яны вяртаюцца ўвесну на Бацькаўшчыну... Так даўно гэта было, а здаецца, толькі ўчора! І нейкі радасны смутак абхопліваў усю ягоную істоту, што Бацькаўшчына такая каханая, такая любая й прывабная, што яе нельга забыць... Пачаў успамінаць далей, як, бывала, маці прыходзіла ўвечары ў ягоны пакойчык запытацца, ці мякка яму спаць? Старэнькая! Як яна цяпер там? Мабыць, і цяпер яшчэ кладзе падушку з надзеяй, а вось прыйдзе ўночы... Раптам -- за вакном стрэл! Куля, ударыўшыся аб мур, прасьвісьцела ў паветры. Вераб'і ўсёй сваёй сям'ёй адляцелі. І ўслед за тым пачуўся енк у жаночым блоку. З чаго-б гэта? Хіба жанчына можа зрушыць голымі рукамі гэтакія цяжкія краты? Здаецца, гэтага ніколі ня было. Але тут-жа ўспомніў: заўсёды гэтак было, калі хто падымаўся да вакна...

Прайшлі хвіліны. Вераб'і, адзін па адным, занялі сваё мейсца. Шчасьлівыя яны! Ім вось можна адлятаць і зноў прылятаць. Сярод іх няма «ворагаў народу» і шпіцаляў. Усе роўныя і ўсе вольныя! У гэты час за сьцяной пракацілася аўта. Кінуўшы думаць пра вераб'ёў, Кузьма стаў прыслухоўвацца: спыніцца яно тут ці ня спыніцца? Калі спыніцца, значыць, прывезьлі, як штодня ў гэтую пару, новых нешчасьліўцаў... Але шум аўта быў заглушаны грукатам далёкага цягніка. Цік-так-так! Цік-так-так! Гу-гу! Давай дарогу! Кузьма забыўся пра аўта й пачаў думаць пра цягнікі: вось, можа быць, ідзе цэлы транспарт туды, у тайгу, у немарач, на пагібель... А можа едуць людзі, хто куды хоча. Але ўсё роўна:

Усе чатыры стораны
Для цябе адкрыты...
Прыляцелі вораны,
І кол у магілу ўбіты...

... ягоныя вершы, складзеныя ў ссылцы... Так, калоў над магіламі панаўбівана ня сотні і ня тысячы; калі высекчы пару дзясяткаў гэктараў тайгі на гэтыя калы, дык і таго не хапіла-б адзначыць сьляды сьмерці на аднэй толькі Калыме. Калы й калы! І найбольш -- «малодшых братоў»: беларусаў, украінцаў, калмыкаў, татар зь цёплага Крыму...

Вераб'і чылікалі...

Вясна! Вясна! І добра ўсё-ж, што тут, а ня там, на Калыме, калі навет і кол! Успомніў яблыні каля хаты ў маёвай красе, жоўтыя плямкі дзьмухаўцоў на лонцы, зялёныя талерачкі вадзяных ліліяў з

жоўтымі й бела-ружовымі гарлачыкамі на возеры... І ў ягоную змарнелую душу прыйшло зноў тое бадзёрае й надзейнае асьвятленьне, якое яго ня раз наведвала ў хвіліны найглыбшага духовага ўзрушэньня... «Будзе! Будзе!» -- пачуў голас аднекуль з вышынь. І яму захацелася плакаць ад радасьці...

Шум цягніка зьмяніўся гудзеньнем самалёту, які ляцеў нейдзе дужа высака. Кажуць: «Высака лётаюць шчасьліўчыкі...» Яму хоць-бы глянуць адтуль, з вышыняў, а так памрэш за гэтымі тоўстымі сьценамі, нічога ня бачыўшы... І раптам страшэнны выбух! Такі страшэнны, што заскрыгаталі замкі ў дзьвярох муру. Каб гэта адбывалася ня тут, можна было-б падумаць: выбухла вялікая міна! Усьлед за выбухам першым пачулі яшчэ і яшчэ... Вераб'і над вакном заціхлі, вязьні заварушыліся...

-- Што здарылася?

-- А трасца яго ведае -- выбух нейкі...

-- Які тамака выбух -- з гарматаў смаляць...

Праўда, цяпер ужо зусім выразна смалілі з гарматаў...

Трывожным выцьцём глушылі ўсё наўкола сірэны...

-- Практыкаваньні!.. На ворагаў усё шыкуюцца!..

Прайшло з паўгадзіны. Увесь гэты час гарматы стралялі бязупынку, і было чуваць кружэньне самалётаў над местам. Заціснутыя сярод сьценаў, вязьні не маглі нічога зразумець: стаялі, слухалі, адзначаючы кожны гук сваім камэнтарам:

-- Практыкуюцца ў забіваньні людзей...

-- Ня нам судзіць! Мне-б вось цэтлік атрымаць на выйсьце адсюль -- зусім заніштo ўскочыў у прысак...

Нехта ў адказ зацягнуў расейскую песьню.

Понапрасну, Ванька, ходишь,
Понапрасну ножки бьёшь,
Ничего ты не заслужишь,
Дураком домой придёшь...

-- Хай-бы сабе й «дураком», абы прыйсьці...

-- Аняго-ж, так табе й адчыняць барджэй дзьверы: калі ласка, гаспадар, мейце ахвоту выйсьці...

-- Я й кажу: згінеш тутака ў гэтых сьценах!

-- Ня мудрона! Вязьніца -- ня курорт! Сала тутака не загадуеш.

-- А вось-жа вытрымліваюць і па некалькі год; бачыш, тамака сядзіць адзін, -- паказалі на Кузьму, -- на Калыме пяцігодку адбарабаніў...

-- Але якім выглядае!

У гэты час -- тупат ног на калідоры, бразганьне зялезных запораў, крык:

-- Выходи! С веэамі выході!

-- Рэвалюцыя? -- прамовіў нехта асьцярожна.

-- Пастраляюць нас каты!

Ляснуў замок...

-- Выходи! С веэамі выході! Не задерживаться!..

Усе пасьпешна сыпануліся ўніз. Каля сходаў стаяў вартавы й кожнага ўзнагароджваў ударам стрэльбай па тыльных частках. Кузьма быў ужо добра дасьведчаны ў гэтых справах і праскочыў у яго за сьпіной. Пры выйсьці на падворак яго нехта схапіў у абдымкі.

-- Кузьма, браток, якое шчасьце бачыць цябе!

Кузьма азірнуўся -- перад ім стаяў Орлік.

-- Жыў? Божанька!?

-- Жыў! Ня верыцца! А як тамака ў месьце?

-- Дрэнь... Тое самае...

-- Даўно цябе сюды? І завошта?

-- Завошта -- ня кажуць. Дагадваюся, з пытаньняў сьледчага, усё па тваёй справе...

Кузьма зморшчыўся: няпрыемна слухаць -- «па тваёй справе...» Але, разам з тым, высьвятлілася, чаму справу патрабавалі на перагляд.

-- Пачакай, тут нейдзе Алесь.

-- Алесь Баравік?

-- Яму сьледчы рэбры паламаў...

-- Значыць, Баравік -- наш?

-- То была мая памылка -- мушу прызнаць! -- І Орлік пачаў клікаць: -- Алесь! Алеська!

З натоўпу выйшаў Баравік. Зьбялелы й змучаны, ён быў не падобны да сябе. Глядзеў на Кузьму й таксама не пазнаваў. Кузьма сьціснуў яго ў сваіх абдымках, адчуваючы, як нейкая цяжкасьць спадала ў яго з сэрца: ён усё журбаваў, што прададзены сябрам... Цяпер Кузьма адчуваў сябе як-бы вінаватым перад Алесем.

Людзей усё яшчэ праганялі цераз «прыклады».

-- Куды нас, куды? -- енчыў спалохана Алесь.

-- Трымайцеся мяне, -- адказваў Кузьма. -- Я ў гэтых справах ужо спэц!

Ад варот пачуўся крык:

-- Станавіцеся па чатыры! Чаго стаіцё як бараны?

-- Аняго, хто-ж? -- працадзіў амаль дзяціным галаском высокі чалавек у вялікіх валёнках, якія ў гэтую сьпякоту выклікалі й сьмех і гора.

Пачалі станавіцца. Усе ўтрох сталі разам. Чацьвертым быў нейкі малады хлапец. Хутка зьявіўся начальнік канвою -- адзін з камандантаў НКУС. Зьяўленьне яго выклікала страх ува ўсіх палітычных. Гэта быў «Нэрон» -- прыземісты, моцны, бескампрамісова-напорысты... Як ні адгароджваецца НКУС усемажлівымі перасьцярогамі, і ў мейсцы і ў вязьніцы ведалі пра Нэрона шмат...

Як толькі ён зьявіўся на падворку вязьніцы, гудзеньне галасоў замянілася шэптам:

-- Нэрон... Нэрон...

Глядзелі на ягоны крыху васпаваты твар з даўгім носам, прыгнутым уніз, як у савы, і зь вялікімі чорнымі, на выкаце, вачмі. Страх у некаторых быў настолькі вялікі, што яны сталі зьбялелымі.

-- Што гэта будзе? Што гэта будзе?

Халодным, бясчулым зрокам Нэрон абводзіў натоўп.

-- Адысьці ад сьцяны! -- крыкнуў. -- Стаць па чатыры! Контра -- асобна, шпана -- асобна!

Да яго падскочыў баец і пачаў нешта гаварыць. Нэрон адхіліў яго рукой. Кузьма добра ведаў, што ў няволі крыміналу лепей, ніж палітычным.

-- Куды я, туды й вы, -- шапнуў сябрам, становячыся да крыміналу.

Калі мужчыны былі ўжо пастаўленыя, і пачалі выводзіць жанчын, Нэрон меў кароткую прамову:

-- Вы, контра, такую вашу й растакую... Я з вамі цацкацца ня буду! Адзін крок убок -- і куля ў патыліцу! Пастраляю, як сабак! Зразумелі? Слухайце далей: хто ліча сябе нявінным (гэта тычыць тых, хто пад сьледствам), -- пяць крокаў наперад! Хто хоча на волю, таксама пяць крокаў наперад!

Орлік і Баравік глядзелі ў вочы Кузьмы. Той пакруціў галавой. Але некалькі людзей аказаліся наіўнымі й выступілі наперад. Гэта былі, галоўным чынам, навічкі із Заходняй Беларусі.

-- Адвядзіце іх у тыл двара! -- загадаў Нэрон байцам.

Павялі. І потым пачуліся некалькі стрэлаў.

Натоўп замёр. Кузьма ціха прамовіў:

-- Вызвалілі...

Калі былі выведзеныя й жанчыны, іх таксама пачалі ставіць па тым-жа прынцыпу: контра -- асобна, шпана -- асобна. Розьніца была толькі ў тым, што ставілі асобна й цяжарных жанчын. Іх было ўсяго некалькі, з новых, узятых згодна загаду «Об із,ятіі подозрітельных ліц» з прычыны вайны.

-- Яшчэ гэтых у тыл двара! -- загадаў Нэрон і дадаў з усьмешкай: -- Усё-ж роўна прыйдзецца ў дарозе «ліквідіровать[[[»

Напасьледак вароты адчыніліся.

V

Вялікае места гарэла страшэнна, цэлым морам агню, як могуць гарэць у сухую пагоду напалавіну драўляныя гарады. Будынкі, тэлеграфныя слупы, электрычныя праводкі, асфальт, гума, хварба на машынах, дрэвы ў парках -- усё шугала полымем, плавілася й ператваралася ў вугаль і залу. Агонь перакідаўся з будынку на будынак, з вуліцы на вуліцу, мацаючы жоўтымі языкамі тое, што яшчэ не гарэла. Ляцелі ўніз галавешкі. Валіліся цэлыя сьцены. Неба счарнела і, здавалася, абвісла, спаўзло ўніз, закрываючы сонца. Вось па гэтых палаючых, напоўненых жарам і дымам вуліцах, іх пагналі на ўсход -- шпарка, без затрымкі.

Урэшце выйшлі з пажарышча. Бег зьмянілі на крок. Але сілы шмат у каго забракла. Адзін вязень паваліўся. Да яго падскочыў Нэрон.

-- Зь якой калёны?

-- Палітычны! Прыстрэльце мяне...

І зьняволены, сьцяўшы зубы, уткнуўся ў пясок тварам. Нэрон павольна выняў наган, нацэліўся ў галаву й стрэліў. Спакойна паклаў наган на мейсца й паскакаў наперад калёны. Праходзячы міма забітага, зьняволеныя здымалі шапкі.

Алесь усё стагнаў:

-- Куды-ж нас? Куды?..

-- Маўчы! Бачыш?..

Апынуліся за горадам. Крымінальных сьцераглі ня так пільна, як палітычных, і калёна іхная значна парадзела. Гэта яшчэ горш злосьціла канвой супроць палітычных. Нэрон скакаў з канца ў канец калёны, расьцягнутай на кілёмэтр, а мо' і болей, і час ад часу чулася траскатня аўтаматаў...

Па паўдні сонца прыпякло. Даймала й прага, а да студняў, якія сустракаліся па дарозе, не дапускалі. З учарашняга дня нічога таксама ня елі. Аслабелых зьявілася больш, і аўтаматы страчылі часьцей. Алесь так мучыўся, што жыцьцё для яго згубіла каштоўнасьць. Ён прасіў сяброў:

-- Пакіньце мяне тут, на дарозе! Дайце мне памерці!

Становішча ўскладнялася яшчэ тым, што Кузьма йшоў босы. Абутак ягоны, старыя чаравікі вайсковага тыпу, атрыманыя яшчэ на Калыме, канчаткова развалiліся, і ён іх выкінуў. Гарачы жвір паліў яму ногі й раніў да крыві. Кузьма намагаўся ступаць ня ўсёй ступнёй, а толькі пятой, дзе скура больш грубейшая, а таму менш чульлівая. Гэта пазбаўляла яго цьвёрдай апоры, а трэба было яшчэ цягнуць і Алеся. Яны досыць ладна ўжо адсталі ад «сваіх». На шчасьце, Нэрон увесь час трымаўся каля палітычных; тутака, каля іх, цягнуліся толькі некалькі байцоў, падганяючы або расстрэльваючы тых, хто адставаў. Раптам Алесь канчаткова згубіў сілу ісьці. Якраз у гэты мамэнт скакаў да іх на сваім белым кані Нэрон. Спалохана пачалі падымаць Алеся. Але й самі былі моцна зьнясіленыя.

-- Вперёд! -- крыкнуў Нэрон.

Кузьма з благаньнем зірнуў на начальніка й прамовіў:

-- Дазвольце глыток вады -- з чалавекам нядобра...

-- З чалавекам?! Контрык?!

-- Урка! -- зь нейкім нутраным узрушаньнем ухапіўся за гэта Кузьма. -- У дошку свой! Памылкова залез не ў сваю кішэню...

Веданьне Кузьмой блатнога жаргону, як відаць, пераканала Нэрона, і ён паскакаў далей.

-- Паехаў? -- спытаў Алесь. -- Але нашто вы мяне мучаеце? Вы жадаеце, каб я йшоў у імя дружбы?

-- Калі ты ня можаш ісьці, мы цябе панясем.

-- Добра! Я буду ісьці!

Ён падняўся, але хутка пачаў зноў ападаць. Сябры трымалі яго -- адзін з правага, другі зь левага боку.

-- Трымайся, Алеська! Ужо нядоўга. Абхапі мяне за шыю левай рукой, а Орліка правай!

Калі Нэрон пад'ехаў да іх зноў, яны ўжо амаль дагналі астатніх. Зьняўшы шапку, Кузьма ў нейкім непераможным экстазе ўзьняў свой худы твар да неба. Уздыхнуў. І ў гэты мамэнт адчуў, што наўкола іх адбываецца нешта надзвычайнае. Падбадзёрыў Алеся, ведаючы добра, што гэта найлепей захоўвае сілы.

-- Вось ужо хутка! Ужо хутка!.. Ты чуеш, Алесь, як нейдзе грукочуць панцыры? Гэта йдзе наша вызваленьне...

-- Наша вызваленьне? Чаму?

-- Гэта-ж рухаецца фронт... Адступаюць!.. Адступаюць!.. Алесь, можа, праз паўгадзіны мы будзем вольныя... І вось калі-небудзь зьбярэмся й будзем сьмяяцца з усяго гэтага...

Насустрач ляцела аўта, падымаючы хмары пылу, з-за якога нічога ня было відаць. Калі напасьледак небасхіл адкрыўся, паказаўся ўсхваляваны Нэрон. Ён размахваў наганам і крычаў:

-- Назад!.. Вярні з шасэ!.. Пастраляю!.. Тррр!..

Кулі ляцелі над іх галавамі. Ляглі! Калёна аддалялася ўсё больш і больш. Крык Нэрона адчуваўся слабей. Але рухацца ня было сілы. Урэшце папаўзьлі ўсё далей і далей ад дарогі, час ад часу адпачываючы ў жыце. Да іх даносіўся трэск кулямётаў, бухалі гарматы. Над імі кружыў самалёт. І выбухла бомба. Зямля, здаецца, заварушылася пад нагамі. Потым самалёт павярнуў да шашы, відавочна, заўважыўшы войска. Калі ён пралятаў над галавой, былі відаць чорныя кругі на ягоных крылах, а ў іх адзнакі чужой дзяржавы. Адпаўзьлі далей ад дарогі. Урэшце перад імі адчынілася лонка -- жыта скончылася. Вады на ёй не знайшлі, але мох быў вільготны. Яны камамі заціскалі яго ў далонях і смакталі. Алесю адразу-ж стала лягчэй. Ляглі ў траву і аддаліся прыемнаму адпачынку...

Кузьме ўсё яшчэ ня верылася, што гэта вызваленьне. Хутка пяць год, як яго заарыштавалі. Успомніў Падкаблука, вобраз якога да гэтага часу быў заслонены больш агіднымі тварамі.

Орлік заўважыў:

-- Як-бы хацелася цяпер спаткацца із сваім сьледчым!

Глядзелі ў неба. Пасьля вязьніцы яно здавалася ім цудоўна-празрыстым...

-- Якое шчасьце быць вольным! -- прамовіў Кузьма. І потым да Орліка: -- Ты кажаш, хацеў-бы спаткацца із сваім сьледчым?! Не, дружа, яны для мяне ня існуюць! Я ведаю, такія тыпы заўсёды былі й будуць! На гэтых пачварах трымаецца ўсякая ўлада...

-- Ці будзе чалавецва калі-небудзь вольным?

-- Я магу сказаць толькі адно: чым вышэй цывілізацыя, тым мацней няволя... Ты кажаш -- парадокс? Але з гэтага няма выйсьця! Цывілізацыя забівае чалавека!..

-- Наўжо ў людзей ня хопіць розуму, каб жыць па-братэрску? -- запярэчыў Орлік.

-- Ты бачыш, што здарылася на аднэй шостай зямной кулі ад гэтай спробы?!

-- Ну, гэта іншая справа: тут проста дыктат аднае асобы...

-- Гэтых асоб высоўвае час. Расея ня хоча быць больш адсталай: мы, маўляў, ня горшыя за вас!

-- Значыць, праліцьцё крыві застанецца й надалей?

-- Усё роўна: праліцьцём крыві ці брудам, дымам, занячышчэньнем паветра, атручэньнем водных рэсурсаў, жорсткай эксплуатацыяй натуральных багацьцяў -- цывілізацыя зробіць сваю справу! А што датычыць мяне, я цяпер нічога не жадаю. І ня хочу ні аб чым думаць. Досыць мне гэтага! Хачу толькі аднаго: вольна дыхаць...

Ён заплюшчыў вочы й доўга ляжаў так моўчкі.

Бойка цягнулася нядоўга, усяго хвілін дзесяць, пятнаццаць. Ужо даўно заціх і рух калёны. Цяпер можна было паглядзець, што робіцца наўкола. Падняліся з травы: нідзе ніякага жыльля ня было. А есьці й піць хацелася страшэнна. Кожны трымаў у рукох пучок моху й высмактваў зь яго вільгаць. Калі-б жыта было сьпелым, можна было-б падмацавацца калосьсем. Але яно толькі пачало наліваць. Ірвалі і елі шчаўе. Ізноў ляжалі ў траве, бо ногі млелі й слабелі. Алесь увесь час спаў. Твар ягоны быў нядобрага колеру, пад вачыма лягла пухліна. Дыхаў цяжка й няроўна. Ён цяпер быў для Кузьмы й Орліка праблемай: як яго даставіць у такое мейсца, дзе знойдзецца такі-сякі мэдыцынскі пэрсаналь? Дзе ёсьць тут паблізу такое мейсца? Некалі разам зь іншымі студэнтамі Орлік быў мабілізаваны на час летніх вакацыяў на торфараспрацоўкі.

Успомніў, ехалі па гэтым-жа шляху. Калі-б торпазавод знайшоўся блізка, было-б добра. Там ёсьць мэдыцынскі пункт і жыве знаёмы лекар. Але памяць не магла падказаць, як дабрацца да торпазаводу.

Кузьма спачуваў Алесю, але нічым ня мог дапамагчы, ён ніяк ня мог нацешыцца воляй. Ляжаў і глядзеў на ўсё наўкола, як на нейкі цуд. Трава, лес, воблакі і ўсё астатняе здаваліся яму цяпер бясконца мілымі. Да арышту ён ніколі не адчуваў гэтага.

Ляжаў і думаў. Раптам прамовіў да Орліка:

-- Воля можа быць здабыта толькі няволяй... Вось чаму людзі з-за мяжы ніяк ня могуць зразумець нас. Пяць год, як я травінкі ня бачыў!

Раптам з таго боку, дзе праходзіла шаша, з жыта выйшаў чалавек. Было відаць -- вайсковец. Кубікі на пятліцах кашулі адсьвечваліся чырвоным бляскам. На рамяні вісеў футарал ад нагана. Кузьма і Орлік пасьпешна схаваліся ў траву, але чалавек усё-ж заўважыў іх. Скіраваўся туды, трымаючы руку на футарале.

-- У выпадку чаго трэба яго абяззброіць, -- заўважыў Орлік.

-- Голымі рукамі?

-- Навет і голымі. Лепш памерці ў змаганьні, чым трапіць у іхныя рукі зноў!

Але чалавек, падышоўшы бліжэй, гучна й па-сяброўску засьмяяўся.

-- Арыштанты? -- запытаў, водзячы па іх зрокам.

Сябры маўчалі.

-- Не палохайцеся! Такімі тут перапоўнена жыта... і жывымі й мёртвымі...

Чалавек перасунуў футарал з наганам за сьпіну і апусьціўся каля іх на траву. Яму было год каля трыццаці. Бялявы, лейтэнант, з ордэнам на грудзях. Сінія вочы глядзелі спакойна й ласкава. Шырака расставіў ногі. Упёрся лакцямі ў каленкі і апусьціў на далоні галаву. Прамовіў:

-- Разьбегліся ўсе: арыштанты й не арыштанты, гэнералы й байцы, сябры партыі й беспартыйныя... А ЦК КП(б)Б на чале з сакратаром Панамарэнкам ганебна ўцёк першым. Дваццаць тры гады балбаталі пра абарону, умацоўваліся, ачышчаліся, зьнішчалі ворагаў, замыкалі граніцу на замок, будавалі аэрадромы, танкі, самалёты, а разьляцелася ўсё гэта ў пух і прах за няцэлыя дваццаць тры гадзіны! Ад першага-ж удару! Арміі няма, пайшла ў палон.

Прабіваюцца ў тыл толькі паасобныя часткі. Гарматы й танкі ляжаць пагарэлыя на дарогах, самалёты -- на аэрадромах!

Павольным позіркам зірнуў на ўпрыгожаныя ордэнам грудзі. Раптам пальцы рук ягоных скурчыліся, як кіпцюры ў драпежнай птушкі, і ён шпарка, можа, навет нечакана для самаго сябе, учапіўся за ордэн.

-- Да д'ябла гэтыя цацкі! -- выкрыкныў.

Адарваў ордэн, сагнуў яго, зламаў і швырнуў надалей ад сябе.

-- Колькі пакутаў прынесла мне гэта цацка!

Змоўк. Цяпер яго ўжо не баяліся. Орлік пацікавіўся:

-- За Фінляндыю, мабыць, узнагародзілі?

Лейтэнант узьняў вочы й доўга глядзеў на яго, быццам не разумеючы, аб чым пытаюць.

-- Так, за Фінляндыю, -- адказаў напасьледак.

Задзёр на жываце кашулю. Паказаўся вялізны сіняваты шрам.

-- Шрапнэль! -- прамовіў.

Закасаў рукаво на правай руцэ.

-- Куля!

Зьняў абодвы боты, паказваючы пакрамсаныя ікры галеняў.

-- Таксама шрапнэль! Досыць зь мяне! Наваяваўся! -- на мамэнт змоўк. -- Прабіваюся да сям'і, дамоў...

-- А вы адкуль? -- запытаў Орлік.

-- З-пад Менску, -- зноў памаўчаў. -- Ня ведаю, дзе цяпер сям'я. Жыла тут недалёка, на лётнішчы... Хто мог прадбачыць, што так хутка будзе вайна?! -- зірнуў на Алеся. -- А гэта што -- хворы?

-- На допытах паламалі рэбры...

-- Так, ламалі й ламаюць! Колькі нашага няшчаснага беларускага народу пагінула ў вязьніцах, на Калыме, за Уралам... Раней, за царамі, самі мусілі ехаць туды ў пошуках вольнай зямлі й кавалка хлеба, ехалі й паміралі, як мухі, у дарозе... А цяпер як кулакоў, нацдэмаў, непажаданы элемэнт з пагранічча эшалёнамі звозілі... Палітычныя? -- запытаў праз некаторы час. -- Пэўна, із студэнтаў? Сярод гэтай катэгорыі ўсё раскрывалі ўсялякія змовы...

-- Студэнты, -- адказаў Орлік. -- Ён вось, -- паказаў на Кузьму, -- адпакутваў на гэтай самай Калыме пяць год, увесну патрабавалі справу на перагляд, і нас прышылі да яе -- мяне й гэтага хворага...

-- Ага, разумею! Доказаў ня было, успомнілі старое...

Прачнуўся Алесь.

-- Нядобры выгляд у яго, -- заўважыў лейтэнант і, адшпіліўшы ад пояса торбу, зазірнуў у яе.

-- Што-ж вы зь ім мяркуеце рабіць?

-- Як-небудзь дабірацца да сваіх.

-- Далёка?

-- Мае бацькі кілёмэтраў за сто адсюль, -- сказаў Орлік. -- Яго, -- паказаў на Кузьму, -- трохі бліжэй. Сам-жа хворы зь Віцебску.

-- У Віцебск не дабярэцеся -- гэта пэўна. Да каго-колечы з вашых сваякоў? Але ці давядзеце? Яму-ж перш-наперш патрэбна апэрацыя, калі рэбры сапраўды паламаныя.

-- Тут нейдзе недалёка ёсьць торпазавод, -- адказаў Орлік. -- Там у мяне знаёмы лекар.

-- Так, торпазавод імя Варашылава, кілёмэтраў дваццаць адсюль. Але як вы да яго дабярэцеся?

-- Небясьпечна?

-- Небясьпека, бадай, мінула, хіба толькі немцы могуць патрывожыць, напрыклад, да закапваньня трупаў, якімі ўсеяны дарогі.

Орлік пачаў апавядаць, як цяжка ім было ў дарозе і як хацелі Алеся прыстрэліць канваіры...

-- Так, бьюць нас, бьюць, -- уздыхнуў. -- Гэтая вайна адчыніла мне вочы. Гараць нашы гарады й сёлы ад Бугу да Дзьвіны, Прыпяці й Дняпра! Каму патрэбна вайна? Нам? Ваююць Масква й Бэрлін, але на нашай зямлі, за наш кошт, ня пытаючыся нас... Два акупанты! Які зь іх лепшы для нас? Цяжка сказаць! Прынамсі, Бэрлін хоць ня прыкідваецца нашым прыяцелем. І так будзе датуль, пакуль ня возьмем свой лёс у свае рукі, ня створым сваёй вайсковай сілы, не паставім слупы на сваіх межах... Аддаю рацыю нашым нацдэмам, якіх, прызнаюся, раней не разумеў, -- парваць сяброўства з ваўком у авечай скуры!

Дастаў з торбы хлеб, пакроены на тонкія скібы, каўбасу, якраз беларускую, вясковую. Пах ейны раздражняў апэтыт усіх.

-- Пакуль што, падмацуемся, -- сказаў.

Дастаў з торбы таксама й масла, намазаў ім чатыры кавалкі хлеба. Адрэзаў столькі-ж кавалачкаў каўбасы й таксама паклаў на хлеб.

-- Ну, пачнем, сябры па няшчасьцю!

-- Не, дзякуем, -- адказалі Кузьма і Орлік. -- Вось толькі, калі маеце чым, падмацуйце нашага хворага сябра -- яму гэта вельмі неабходна, асабліва кава.

-- Падумана й пра яго -- усё прадугледжана!

Адкруціўшы ад флягі, што вісела на поясе, вечка, наліў у яго нечага, але толькі ня кавы, і разам з хлебам падаў хвораму.

-- Віно, -- сказаў. -- Гэта падтрымае сілы лепей, ніж кава, якой якраз і няма...

Наліў і Кузьме, у якога выгляд быў таксама вельмі дрэнны. Потым -- Орліку й сабе...

Сонца вісела над самым лесам. Ад травы на лонцы падымалася пара. Нейдзе ў жыце запілікала перапёлка. Жаўрукі, як гэта заўсёды бывае перад заходам сонца ў ціхі й цёплы дзень, узьняліся зь сьпевамі ў неба.

-- Вось бачыце, навет птушкі дзякуюць прыродзе, што яна дала ім магчымасьць пражыць дзень! А мы, людзі, усё забылі сёньня... -- схамянуўся: -- А цяпер -- час у дарогу!

І, дастаўшы зь кішэні нож, лейтэнант скіраваўся да альховых кустоў, што расьлі па краёх лонкі. Выразаў дзьве даволі даўгія й моцныя палкі. Потым некалькі іншых, крыху карацейшых. Зьвязаў іх пасамі так, каб атрымаліся насілкі. Потым нарэзаў гальля і ўслаў імі тое, што атрымалася.

-- Вось так мы яго й панясём! Я з аднаго канца, як больш моцны, а вы двое -- з другога. І так дабярэмся да бацькоў маёй жонкі, а адтуль на фурманцы да вашага лекара на торпазаводзе -- я добра ведаю гэтую мясцовасьць.

На захадзе яшчэ гарэла вячэрняя зара, але тут, паміж жыта, ужо клаўся змрок. Лонка пакрылася павуціньнем туману. У траве, здавалася, пад самымі нагамі, надрываўся драч. Тры чалавекі ўзьнялі насілкі й рушыліся ў дарогу. І ў гэты час, як-бы па ўмове, закукавала зязюля -- працяжна й пранікліва:

Ку-ку! Ку-ку!

Зь містычным пачуцьцём Кузьма здрыгануўся. І ціхім, прачуленым голасам прадэклямаваў:

Янка сеяў -- людзі жалі,
А зязюлька кукавала:
Ку-ку! Ку-ку!

-- Вось і адкукаваў я, -- уздыхнуў.

-- Будзе жыць! -- у гэты час прамовіў Орлік. -- Я лічыў: сорак і адзін раз!..

-- Гэта ты пра Алеся?

-- Пра яго.

-- Зязюлька -- роспачлівая птушка, гэта пэўна! -- заўважыў лейтэнант.

-- Вось з-за гэтае роспачлівае птушкі я і адпарыўся пяць год на Калыме, -- адгукнуўся Кузьма.

І пачаў апавядаць лейтэнанту ўсю сваю гісторыю ад пачатку. Калі скончыў, зрабіў выснаў:

-- У вершы народнага паэты Янкі Купалы сьпяваецца аб іншым, аб селяніну Янку, які сеяў, а людзі жалі... Зязюля тут толькі наш родны калярыт! Але, бачыце, птушка гэтая ня робіць сабе гнязда, лічыцца «бяздомнай», на думку НКУС, і прадэклямаваны мною верш на вечары кастрычніцкай рэвалюцыі палічылі за зьдзек з калгаснага будаўніцтва й прышылі мне нацдэмаўшчыну, каб было больш пераканаўча... Па Вальфсону, адным словам, гэта называецца дружба народаў!

Нью-Ёрк, 1951 -- 1972

На мёрзлай зямлі гарыць касьцёр. Сыраватыя дровы пыхкаюць і шыпяць, быццам жывыя істоты. Каля кастра корпаюцца ўдвох: адзін малады, нявысокага росту, чарнявы й з чорнымі вясёлымі вачыма, больш падобны на гішпанца ці італьянца, а не на беларуса, а другі сярэдняга веку, хударлявы, з рыжаватай чупрынай, упарта выпаўзаючай з-пад шапкі-вушаткі й закрываючай вочы. Твар у яго сур'ёзны, удумлівы.

Той, малады, габлюе на самадзельным варштаце дошку, а старэйшы стаіць з рулеткай над ужо выгаблеванымі й вымярае іх, каб зрабіць труну.

Вароты на вуліцу адчынены, і людзі, галоўным чынам кабеты, у адзіночку й гуртам снуюць праз двор у хату і з хаты. Некаторыя зь іх яшчэ ў даўнейшых дублёных кажухох, досыць ужо паношаных; другія ў ватных фуфайках фінскага тыпу. Праз вокны з хаты чуецца нуднае чытаньне псальмаў нейкім дзяцюком, які яшчэ не забыўся царкоўнае мовы, і ўсхліпваньне жанчын, але ня плач гэта ўсё-ткі -- больш дзеля формы, не такі, як плачуць над роднай істотай, якая пакідае гэты «пекны» сьвет...

Раптам той малодшы, зь вясёлымі чорнымі вачыма, кладзе гэбаль на дошку, падыходзіць да кастра і з хвіліну грэе над ім рукі. Тады дастае зь кішэні кісэт, вышыты шаўковымі ніцямі, і круціць цыгарку. Закурыўшы, зьвяртаецца да таго, што з рыжай чупрынай.

-- Хадзі, Залатавуст, абкурым гэтую справу!

Залатавуст папраўляе рыжаватую чупрыну й незадаволена махае рукой, маўляў: пацярпі, не перашкаджай! Але калі пахкі дымок махоркі даходзіць і да ягонага носу, разгінаецца, некаторы час глядзіць на дошкі, на якіх відаць пametкі, дзе трэба адпілоўваць, і далучаецца да маладзейшага.

-- Ты, Чарняўчык, любіш лёгка жыць! -- гаворыць.

-- А што такое?

-- Во! Працаваць трэба!

-- Праца -- ня воўк, у лес не пабяжыць.

Залатавуст з усьмешкай пазірае на яго.

-- Праца -- здароўе для чалавека, калі яна ня цераз сілу...

Дастае свой зашмальцаваны кісэт і таксама круціць цыгарку. Паперка ў памерзлых рукох ня слухаецца, і махорка сыплецца на дол. Чарняўчык глядзіць на яго і ўсьміхаецца:

-- З халадком працуеш, а кажаш, што не працаўнік я...

Падклалі стружак і дроў у касьцёр.

-- Проста дзіўна! -- раптам заўважае Чарняўчык. -- Больш трыццаці год немаведама дзе ён быў? А паміраць, з ардэнкамі й мэдалямі, прыйшоў у бацькаву хату! Быццам тамака не прыняла-б яго зямля...

-- Вось гэта-ж! -- коратка заўважае Залатавуст.

-- Кажуць, сам вусаты быў пад ягонай аховай...

-- Ну, так! -- зноў уставіў Залатавуст.

-- Але, зразумела, ён-жа зусім ужо выбыў з памяці нашага народу; ён стаў чужым для кожнага з нас, а можа, навет і для Міхаіла? Дык ён прыйшоў паміраць да чужых? Кінуўшы сваіх сяброў, якія маглі-б зрабіць яму багатыя паховіны? Вось у чым загадка!

-- Ну, чужая душа -- пацёмкі...

-- Але-ж! Але-ж!.. Можа, зрабіў што-небудзь такое, што не падабалася тамака іншым іхным тузам -- цяпер такі час, пасьля вусатага... -- хвіліну падумаў. -- Хоць і гэнерал -- поўныя грудзі ардэноў і мэдаляў, а парадак ёсьць і для іх...

-- Гэта ўсё пустое, калі душа згубіла спакой! -- запярэчыў Залатавуст. -- Няма тады іншай рады, як зламаць усё, што давяло да гэтага... І кропка!..

Зацягнуўся махоркай і выпусьціў воблака сізага дыму: -- Хутчэй за ўсё чалавек усьвядоміў, што быў на хвальшывым шляху...

-- Што ты хочаш сказаць?

-- Сумленьне прабудзілася, як гэта бывае пры канцы жыцьця з людзьмі моцнымі... Ты кажаш: гэнерал, поўныя грудзі ардэноў і мэдаляў, але-ж гэнерал ён не ад арміі, а ад ЧаКі, а тутака вялікая розьніца: гэнерал ад арміі бароніць сваю Бацькаўшчыну, свой народ ад ворагаў, а ЧаКа? Што такое ЧаКа? Колькі нявінных тамака, у той ЧаКа, палягло!? Я-ж кажу, цяперацькі, пасьля таго вусатага, усё гэта выкрываецца навонкі...

-- Рацыя! -- заўважыў Чарняўчык. -- Бадай што няма ніводнае сям'і ў нашым беларускім народзе, зь якой ня быў-бы хто ўзяты ў тую ЧаКу!

-- А ты ведаеш, цябе яшчэ на сьвеце ня было, як ён пачаў узвышацца. У вайну Масквы з Варшавай наш народ у бальшыні стаяў убаку. Так? Ні туды, ні сюды -- абое рабое. Кажуць так: на мэце была свая воля й

незалежнасьць. А як абвясьцілі мабілізацыю, моладзь схавалася ў лесе. Із сотні двароў нашае вёскі толькі ён адзін з козырам зьявіўся на пункт. А потым, у адзін дзень, прыляцеў атрад ЧаКа. Пагналі хлопцаў, гнаілі па турмах, судзілі... Адных паставілі ў войска, а другім кулю ў патыліцу... Людзі ведаюць: гэта ягоная работа...

-- Гэта значыць, сваіх сяброў, зь якімі пацаном бегаў па вуліцы!?

-- Навет, кажуць, стрыечнага брата не пашкадаваў: ардэны й мэдалі задарма не даюць...

-- Пачвара! -- выклікнуў Чарняўчык.

-- І гэта ня ўсё! У тыя часы настаўнікі па вёсках ствараліе беларускія гурткі, каб даць няпісьменным сялянам -- а яны ўсе былі няпісьменнымі -- веду пра свой край. І вось-жа ў гэты час ён ужо быў высака падняўшымся тамака, у самой Маскве. І яго прыслалі адтуль вынішчыць гэтую «пагрозу»... Кіраваў ён усім і ўсімі. Не магу табе сказаць, колькі гэтых настаўнікаў саслана ў Сыбэрыю, а колькі загінула па турмах і ад куль... Потым, як усё было зроблена, яго забралі ў Маскву і зноў узвысілі...

-- Страшна слухаць, браце мой! -- прамовіў Чарняўчык.

Залатавуст працягваў:

-- А ў часе гэтае няшчаснае вайны зь немцамі: дзе ён быў, што рабіў? І гэтыя шыбеніцы... шыбеніцы... у кожным гарадку, у кожным мястэчку і навет у вёсках. Колькі на іх загінула нашых людзей!? За што? Што баранілі сваіх дзяцей, што любілі Бацькаўшчыну? Ці можа яны былі вінны ў тым, што Гітлер абхітрыў Сталіна! Мікіта пакрысе ачышчаецца цяпер ад гэтага, бо далей ужо некуды...

Чарняўчык і Залатавуст усё яшчэ стаялі й курылі, ціха размаўляючы, калі з хаты выйшаў сам гаспадар, Міхайла Жыжка, малодшы брат нябожчыка. Быў ён каржакаваты, шыракаплечы, крыху як-бы на раскірэчаных нагах, што сьведчыла аб ягонай станоўкасьці і спрыце ў працы. На ім быў шэры кулёк із сукна хатняга вырабу, якія ў нас насілі тады, як мелі права браць воўну ад сваіх авечак для хатніх патрэб. На макаўцы лысаватай галавы -- ён быў бяз шапкі -- віднеўся як-бы гузак: казалі, гэта шышка таленту. Міхайла таксама падышоў да кастра.

-- Ну, як у вас тутака? -- спытаў мяккім і прыемным барытонам, пазіраючы то на Чарняўчыка, то на Залатавуста. -- Клеіцца што-небудзь?

Чарняўчык адказаў:

-- Гэбаль нікуды ня варты, хоць коўзайся па ім пэўным мейсцам. Дый цьвікоў нідзе не знайсьці!

-- А вы ня думайце пра цьвікі: па іх, можа, прыйшлося-б аж у Маскву ехаць! Ды ў народзе кажуць, труну й ня зьбіваюць цьвікамі: яна павінна быць на сашчэпах па канцох, як, прыкладам, робяцца сундукі. Ня ведаю, ці гэта забабон, ці вымогі тэхнікі?

-- Ясна, -- заўважыў Залатавуст, -- зялезны цьвік хутка дасьць акісьленьне, і дошка пачне гніць, а нашы прашчуры верылі, што, паміраючы, ён пачынае жыць у іншым сьвеце, і труна -- жыльлё ягонае -- мусіць быць моцным; гэтак і стварылася традыцыя: ня зьбіваць труну зялезнымі цьвікамі...

-- Не клапаціцеся дужа! -- адказаў Міхайла. -- Калі ня знойдзем адпаведнага начыньня выдзеўбці дзюркі для сашчэпаў, дык возьмем канцы дошак у драўляныя цьвікі, добра заклінаваўшы іх звонку. Моцна будзе, уга як!

Міхайла павярнуў ужо ў хату, як яго перапыніў
Чарняўчык.

-- Міхайла, а скажы, калі ласка, як гэта ўсё здарылася?

-- Што?

-- Ну, ды зь нябожчыкам Захарам, вашым братцам. Гэта-ж проста нельга ўзяць да галавы: ня было амаль паўвеку, а потым раптам, -- як сьнег на галаву... Дзе быў, што рабіў, нічога ня ведама...

-- Усё ведама, Чарняўчык!

-- Ну, як-жа?

-- У партыі быў. Шмат разоў узнагароджаны за адданасьць...

-- Каму?

-- Партыі, зразумела, а не народу! Супроць народу якраз! Ну, а што яшчэ?

-- Ці ён табе пісаў, што прыедзе паміраць у бацькаву хату?

-- Нязручна яму было пісаць гэта...

-- Дык ён прытупаў пехатою ад станцыі?

-- Мабыць! Дужа позна зацягнулася паседжаньне праўленьня калгасу. Выйшаў я дахаты, можа, гэтак а другіх ужо пеўнях. Іду, цемра хоць вока выкалі. А спаць -- млее ўсё цела! І халіпа якраз, сьлізка. Думаю, от, каб крыху падмарозіла яшчэ ўночы, дык назаўтра добра было-б гной вывезьці. І раптам бачу: каля хаты

нехта сноўдаецца -- то туды, то сюды... Думаю: у помраку ад «гары» нехта ня можа знайсьці тропу. А потым гэтакая думка: можа, з раёну хто-кольвек, ды няшчасьце якое здарылася, ды пакалечаны ці што? Якраз меўся прыехаць гэты наш Хведарчук па справе насенных фондаў... І так, прыбавіўшы кроку, апынуўся я каля сваіх варотаў. Не, бачу, і не Хведарчук і ня хто-небудзь з падвыпіўшых: хоць і цемра, а
гузікі блішчаць на шынялі, і нешта мырмоча сабе пад нос...

-- Хведарчук у гэты час гарэлку піў у Мітраханавых, -- ізь сьмехам заўважыў Чарняўчык.

-- Ага, я так неяк усумніўся: ці сплю я? Ведама, прыляжаш штораз на дзьве-тры гадзінкі, дык той сон падпільноўвае цябе на кожным кроку. Не, ня сьплю, чуваць плёханьне пад нагамі чалавека. Падыходжу крыху бліжэй і тады ўжо зусім выразна бачу: чалавек хоча дастацца ў двор, ды ці ня ўмее адчыніць хворткі, ці сілы не хапае... -- Вы каго, таварыш, шукаеце? -- пытаюся.

-- Міхаіла Жыжку, -- адказвае.

Я бачу, чалавек як-бы аслаб -- хапіўся за шульлё... Я падтрымаў яго й кажу:

-- Я і ёсьць Міхайла Жыжка. А што вам трэба?

-- Во калі спаткаліся! -- адказвае. -- Не пазнаеш Захара?

І ўжо зусім гатовы паваліцца да долу. Карцела мне тут сказаць: брацец, цураўся ты нас якіх сорак год і ня толькі цураўся, але й рабіў усякае плюгаўства супроць народу нашага, дык паварочвай, брацец, аглоблі назад. Але падумаў: гэта я так магу сказаць яму як брат, а як паставіліся-б да яго бацькі нашыя? Паўстрымаўся я й дапамог яму ўвайсьці ў хату. Жонка кінулася запальваць сьвятло, а ён загадаў ні аб чым не турбавацца, быццам ведаў мой настрой. І зараз-жа палез на печку...

-- Цікава! -- ня ўстрымаўся Чарняўчык.

-- Ага, слухайце: заціх там, на печцы. А за гэты час, як у тым кіне, праз маю голаву прайшло ўсё наша сумеснае жыцьцё, навет тое, як біліся аднаго разу за невашта: ён дае мне бухлянкі, а я злаўчыўся ды ўкусіў яго з-пад нізу. І вось ён прыйшоў сюды аддаць, бачу, астатні ўздых. Гэта значыць, нешта робіцца ў ягоным сэрцы?! Нешта такое іншае, ня тое, што было ў ім гэныя сорак год?! І шкада мне стала яго, да таго шкада, што хоць вазьмі ды зараві на ўсю ваколіцу. А зь печы ўсё ніякага гуку. Думаю, заснуў! Ну, і

хвала Богу! Назаўтрае аб усім пагутарым. А жонка ўсё турбуецца: каб ён хаця-б не памёр там? Ну, што Бог дасьць, -- адказваю. І ў гэты час чую голас Захараў, але такі няпэўны, слабы, што мяне аж за сэрца хапіла.

-- Міхайла! Га, Міхайла!

-- А што, браток?

-- Для цябе я зрабіў вялікі клопат, прыйшоўшы сюды памірaць! Даруй мне гэта!

-- А Божачкі, усе-ж будзем памірaць, дзе каму Бог давядзе. Што-ж тут дараваць? Жыць яшчэ мусіш!

-- Ну, гэта ўжо напрасьліна! -- адказвае. -- Я сваё ўжо аджыў... А цяпер, Міхайла, падыдзі сюды?

-- Так і клікаў, Міхайла, па-свойму, а не Міхаіл?

-- Вось-жа тое і дзіўна, што ўсё чыста казаў па-нашаму, быццам толькі ўчора пакінуў нашу Загібельку. Я падняўся да яго. Захар падняў галаву й сеў:

-- Я ўпадобіўся быў, кажа, той славутай сьвіньні, што падкопвала карэньне дуба, зь якога ела жалуды. Забыўся быў на ўсё, выракся й Бацькаўшчыну сваю прамяняў на гэтыя цацкі...

Паказаў на груд ардэноў і мэдалёў, выкладзеных з тэчкі.

-- І ня толькі забыўся й выракся, але й рабіў усё, каб зганіць, утаптаць у бруд і вас і Бацькаўшчыну...

І тут ён заплакаў, брыдка, усхліпваючы й пырскаючы сьлінай. Потым згарнуў свае мэдалі і ардэны зноў у тэчку.

-- А цяпер, кажа, вазьмі гэтыя цацкі й выкінь іх на сьметнік!..

-- І ўсё гэта ён рабіў пры поўнай памяці? -- спытаў Чарняўчык.

-- Пры поўнай!

-- І ты іх выкінуў?

-- Не. Мы іх закапаем разам зь ім...

-- Чалавечае -- чалавеку, а Божае -- Богу, аман! -- заключыў Залатавуст.

Нью-Ёрк, 1965

Галчыны дзеці

Славік стаяў на бальконе й глядзеў на маляўнічы вобраз места, што шырака раскінулася па ўзвышшах і нізінах абапал досыць ладнай і прыгожай рэчкі. Віднеліся сады й паркі зь цяністымі алеямі зь ліп і кляноў, з разгалістымі магутнымі дубамі й стромка бягучымі ўгару элегантнымі кіпарысамі; прыгожыя палацы з зубчатымі вежамі; купалы цэркваў і касьцёлаў; зялёныя й чырвоныя дахі новых дзяржаўных будынкаў; снуючыя па вуліцах трамваі, аўтобусы, тралейбусы й легкавыя аўтамашыны, якія адсюль выглядалі яшчэ меншымі. На поўнач ад горада віднелася вялікая Лысая гара, пра якую хадзіла шмат легендаў, што яна зьяўляецца

былым «Скопішчам» нашых прашчураў-крывічоў і дрыгавічоў-люцічаў, на якім у дахрысьціянскай эры на нашай Бацькаўшчыне спраўляліся трызны. Усё гэта вельмі цікавіла Славіка, і ён успомніў словы свайго дзеда: «Слаўны горад! Стары горад! Палілі й разбуралі яго ня раз ворагі, войны бушавалі над ім, а ён зноў падымаўся ізь зямлі...» І падумалася Славіку: «Чаму на сьвеце так ёсьць, што ўсе ваююць супроць усіх?! Хіба ня можна жыць у міры й ладзе? Нейкі праклён цяжэе над усім жывым, што існуе на зямлі!»

Раптам аднекуль з-за ягонае сьпіны вылецела галка. Славік аж спалохаўся ад нечаканасьці. Пачаў прыглядацца і ўбачыў пад страхой гняздо. Яго вельмі зацікавіла, як выглядаюць галчыны яечкі, а калі яечак ужо няма, дык ейныя дзеці...

На бальконе стаяла крэсла, на якім увечары адпачываў бацька. Славік паставіў яго так, каб дабрацца да гнязда. Крэсла было занізкім; апрача таго, яму перашкаджаў Бобік, дваравы пёсік, які ўвесь час аціраўся каля дзяцей: ён, павізгваючы, лез за Славікам. Выманіў Бобіка на двор і прынёс на балькон малыя драбкі, пры дапамозе якіх тады-сяды сьціралі пыл на сьценах будынку. Драбкі таксама былі крыху закароткія, тым ня менш Славік палез па іх да гнязда. Вось ужо й страха! Славік ухапіўся аднэй рукой за край яе, а другой пачаў намацваць гняздо. У ім было трое птушаняткаў. Яны высоўвалі ізь гнязда галоўкі й разьзявалі роцікі, просячы есьці, бо яны шпарка расьлі й патрабавалі шмат калёрыяў, так шмат, што бацька-галка й маці-галка не пасьпявалі здабываць для іх гэтую ежу. Славік падумаў: ён можа ім дапамагчы і ўзяў адно птушаня ў рукі, каб аднесьці ў хату й накарміць яго. І якраз у гэты мамэнт над ягонай галавой зьявіліся дзьве галкі. З моцным крыкам яны кружылі над ім і білі яго крыламі й дзюбамі. «Храбра абараняюць сваю хату й сваіх дзетак! -- падумаў Славік. -- І ўсе жывыя істоты гэтак робяць. Таму, можа, і вайна ўсіх супроць усіх?» Ён ужо саступіў пару ступенек уніз, як адна галка ўчапілася яму ў валасы й пачала драпаць кіпцюрамі па твары. Бобік нюхам пачуў забаву і, падскокваючы, круціўся на мейсцы, пазіраючы ўгару на Славіка. Другая галка атакавала Славіка з другога боку. Славік захваляваўся й выраніў з рук галчанё -- яно паляцела ўніз і бразнулася аб брук...

Ён гэтага зусім не чакаў і зь непакоем глядзеў уніз. Каля галчаня ўжо мітусіўся Бобік. Пёсік ня быў галодны, сырога мяса ніколі не каштаваў; ён думаў, што гэта нейкая новая забава і стараўся

дагадзіць Славіку. Прыціснуўшы галчанё лапай, радасна павізгваючы, глядзеў на Славіка...

За галчанём кінулася ўніз адна із старых галак. «Пэўна, мама ягоная! -- падумаў Славік. -- Мамы заўсёды кідаюцца ў абарону сваіх дзетак, хоць ім і пагражае небясьпека». Каб выратаваць галчанё й галку ад Бобіка, Славік, рызыкуючы зваліцца з вышыні й разьбіцца, шпарка зьлез з драбак і кінуўся на двор. Але было ўжо запозна: Бобік лапай ціскаў паўжывое галчанё, а каля яго ляжала й мама-галка зь перакушаным горлам. Так часам бывае: хочуць зрабіць дабро, а выходзіць зло...

Славік, схапіўшы прут, сьцебануў разы два Бобіка. Пёсік заенчыў і кінуўся ўцякаць, дабег да скрыні, у якой гаспадыні пакідалі сьмецьце, схаваўся за ёй і адтуль пазіраў сваімі хітрымі вачыма на свайго сябра па забавах, ня могучы зразумець, за што яго набілі...

Славік зноў падняўся на балькон. Тут яго чакала новая няпрыемнасьць: на даху суседняга дому сядзела другая галка -- бацька, а мо' матка галчанятаў, із сумам пазіраючы на сваю загінуўшую таварышку. Славіку дужа хацелася, каб уцалелая галка не пакідала гнязда й сваіх дзетак. Але ўвесь гэты й наступныя два дні галка не паказвалася. Галчыны дзеткі пішчэлі ад голаду. Цяпер нічога другога не заставалася, як толькі забраць іх з гнязда, -- іначай яны загінуць. Але перш-наперш трэба падрыхтаваць для іх мейсца. На вуліцы ён знайшоў скрыначку з дыхты. Акуратна вычысьціў яе й паставіў у прыхожай. Уверсе над скрынкай вывеў друкаванымі літарамі: «Прытулак для галчанятаў-сіротак». Зноў паставіў драбкі й палез уверх. Галчаняты выцягвалі да яго галоўкі з разьзяўленымі ртамі й жаласна папісквалі. Асьцярожна выняў іх з гнязда і аднёс у хату.

Карміў іх тварагом і хлебным мякішам. Але яны елі дрэнна, і адно з галчанят загінула. Славік быў гэтым вельмі ўзрушаны. Узяў рыдлёўку й пайшоў закапваць галчанё. І дзіўная рэч, у той час, як ямка была ўжо гатова, зьявілася старая галка. Яна сядзела на дрэве й жаласна каркала. Славіку стала неяк вельмі нядобра, быццам ён зрабіў вялікае злачынства. «Зразумела, плакала-б усякая мама па сваім дзіцяці!» -- падумаў. І на ягоных вачох зьявіліся сьлёзы.

Калі вярнуўся назад, дзьверы ў прыхожую былі напята, а каля парогу ляжаў Бобік, павільваючы сваім кароткім хвосьцікам. Лёгка

было зразумець: пёсік расправіўся з астатнім галчанём. Гэтага было ўжо шмат для чульлівага хлапца: апусьціўшыся на крэсла, ён пачаў ужо плакаць уголас. Бобік падпоўз да яго і, заглядаючы яму ў твар, пачаў лізаць яму рукі. Вочы ягоныя прамаўлялі: «Ну, чаго ты плачаш? Я-ж добра гуляў з табой і зрабіў усё, што толькі мог, нягледзячы на тое, што ты мяне набіў. Ня плач, хлопчык! Ня плач!..»

Менск, 1930

Шчупак

І летась ён хадзіў лавіць рыбу, але з гэтага нічога добрага не атрымлівалася. Аднаго разу дык навет здарылася прыкрасьць: пры закіданьні вуды Ромка так няёмка размахнуўся, што зачапіў сябе на гачак за мяккія часткі заду. Ня раз адрываліся ў яго й гачкі. А больш за ўсё рыба тыркала добра, толькі на гачак не чаплялася. Дома жартавалі: «Ат, забаўляецца хлопец! Ну, і хай сабе!» Але няпраўда, што ён забаўляўся. Рэчка яго вабіла таму, што там дужа прыгожа й цікава. Птушкі весела сьпяваюць і чырыкаюць на розныя галасы, рыбка гуляе ў празрыстай вадзе, ніхто яму нічым не надакучае. Кіне ў ваду чарвяка з гачкам, ляжа на траву і глядзіць, што будзе далей. Як толькі чарвяк апусьціцца на дно, зараз-жа наляціць аднекуль рыбная драбязга. Штурхаюць чарвячка, круцяцца, мітусяцца, цягнуць яго за кончык ува ўсе бакі, носяцца за ім... Тады аднекуль

выплывае большы натапырысты акунь. Ён пасоўваецца наперад павольна, паважнымі штуршкамі, раз-поразу раскрывае рот, нібы пазяхае. «Іш, які пан, -- думае Ромка. -- Ня выспаўся, пэўна...»

Драбязга -- хто куды! Акунь бярэ чарвяка, прабуе яго, ці смачны, ці можна яго зьесьці. Падабаўся, відаць, чарвячок! Бярэ яго мацней, каб ня выкруціўся. І пад бераг! Усё гэта з вялізарнейшым захапленьнем назірае Ромка. І здаецца яму, што ў гэтым ёсьць нейкі вялікі інтэрас для ўсіх, а ня толькі для яго аднаго. І ведаў прыроду Ромка так добра, што зьдзіўляў усіх. «Шчупак!? Шчупак -- драпежнік, -- казаў ён, -- жывіцца толькі маленькімі рыбкамі, ну, і іншымі істотамі, пэўна, таксама і, зразумела, мусіць хавацца, затойвацца дзе-небудзь пад карчом, пад каменем, пад берагам, у траве і адтуль нападаць на свае ахвяры. Акунь -- таксама, але ён, як пан, ходзіць сабе паважна па сваёй акрузе і, калі што не ўпарадку, дык дасьць наганяй! Што? Язь! О, гэта далікатная рыба! Ён нікога ня крыўдзе, кармоў не адбірае. Выйдзе сабе на глыбокі струмень празрыстай вады й давай гуляць! То нырне глыбока й перакуліцца жоўтым пузам угару, то мільгне маланкай перад вачыма, то моцна плёхне вадой, як-бы некаму наругаецца. Мянтуз? О, гэта рыба санлівая. Удзень сьпіць дзе-небудзь у нары, а ўночы выпаўзае пажывіцца...» Так звычайна апавядае пра свае прыгоды сябрам Ромка.

Калі пастарэў на год ці на два, яму надакучыла хадзіць на рыбу каля горада. От, каб туды дабрацца, дзе ловіць дзед Акула! І аднаго разу яму пашанцавала. Дзед сядзеў на ганку і апавядаў свайму суседу:

-- Дзіўны гэта дзень быў: цёплы, прыемны! Вада ў рэчцы ані варухнецца, толькі ледзь прыкметна цурчыць на вірох! Ды там-сям шчупак альбо сом плюхне! У такі дзень рыбцы не сядзіцца па хатах! Гуляе, жыруе! І, ведаеце, акунёў дык па чатыры браў на аднаго чарвяка! Аж рука забалела, цягаючы іх!..

Тут Ромка, які слухаў гэтую гамонку, ня вытрымаў:

-- Аж па чатыры на аднаго чарвяка! Ой-ёй-ёй, гэта цудоўна! -- і потым лісьлівым тонам: -- Дзядусь, вазьміце мяне із сабой у наступны раз!

-- Ты мне ўсю рыбу папудзіш! -- адгукнуўся Акула.

-- Не, ой, не! -- узмаліўся хлопец. -- Далі Бог! Буду вас ува ўсім слухацца!

-- Ну, вазьму, хай цябе качкі!..

* * *

Вясна была ў самай сіле. Кукавала зязюля, і Ромка ў памяці падлічваў, колькі год адкукуе. Над самай галавой рыбаловаў то цохкаў, то падсьвісtваў, як-бы некага зманьваючы, салавей... Ромку так прыемна было гэта слухаць, што ён забываўся, дзе й знаходзіцца.

Раптам, нібы скрозь сон, дзедаў голас:

-- Ах, пярун-бы цябе забіў! Вось шчупак, дык шчупак!

-- Выцяглі? -- крыкнуў Ромка.

-- Выцяг... свой перарваны шнур... Падумаць толькі, новы шнур і перарваў?! -- Акула стаяў і торгаў у рукох шнур, прабуючы яго на моц.

Пакуль дзед лаяў шчупака й зьвязваў шнур, Ромка перакінуў сваю вуду з жыўчыкам на аблюбаванае дзедам мейсца, але ўсё-ткі на такой адлегласьці ад дзеда, каб ён не пакрыўдзіўся й не накрычаў. Не прайшло й дзесяць хвілін, як плаўнічок раптам як-бы скокнуў угару, потым дробненька задрыжэў, а потым паехаў па вадзе й пачаў ныраць. Ромка ведаў: калі плаўнічок скокнуў угару, значыць, шчупак схапіў жыўчыка, а калі пачаў дробненька дрыжэць, шчупак ціскае ў зубах рыбку, а калі паехаў па вадзе, значыць, шчупак пайшоў з жыўчыкам куды-небудзь пад корч. Нарэшце, калі плаўнічка ўжо зусім ня было відаць, Ромка падсек і пачаў цягнуць да сябе. Шнур напружыўся, як струна, але Ромка няўхільна і ўпарта цягнуў усё бліжэй і бліжэй да сябе. Шчупак тузаўся на вудзе, кідаючыся ў бакі. Раптам сагнуўся ў дугу й высака скочыў угару. Вудзільна трэснула папалам! Ромка, як учадзелы, стаяў над рэчкай і глядзеў у ваду.

-- Вялікі шчупак, дзядусь! Зламаў мне вуду!

-- Казаў табе: не цягні нахрапам!

-- Я аж спалохаўся -- такі вялізны шчупак! Скочыў дугой угару...

Прайшло пяць або дзесяць хвілін, пакуль Ромка прыспасобіў пад жыўцоўку другую вуду. «Можа, не паплыў далёка? Можа, зноў возьмецца?» -- думаў. Чытаў некалі, што шчупакі галодныя, навет злоўленыя ў сеці, кідаюцца на другую рыбу.

Пачапіў на гачак другога жыўчыка й закінуў вуду на тое самае мейсца. Сеў на траву й пачаў пільна прыглядацца да плаўнічка, час ад часу кідаючы позірк на дзеда, які ўсё калупаўся із сваімі

шнурамі. Хвілінаў празь дзесяць плаўнічок зноў, як і тады, раптам як-бы скокнуў угару, потым драбнюсенька задрыжэў, потым асьцярожна, нібы прабуючы, павёў па вадзе і ўрэшце пачаў ныраць усё глыбей і глыбей. Сэрца ў Ромкі задрыгала! Сьціснуў у рукох вуду й чакаў мамэнту, калі можна будзе падсякаць. Неўзабаве шнур напружыўся зноў, як нацягнутая струна. Але на гэты раз Ромка ня даў маху: перш-наперш, ён гукнуў дзеда Акулу на дапамогу. Той спрактыкавана падцягнуў шчупака да берагу. Потым падвёў пад яго свой сачок і спакойна выняў рыбіну з вады.

-- Ага, папаўся, браце! -- прамовіў із задавальненьнем і пачаў выймаць з роту рыбіны гачак. І раптам выкрыкнуў: -- Э-э-э! Бачыш? У яго ў роце мой шнур з гачкам!

-- І мой, дзядусь! І мой! -- пасьпяшыў адказаць Ромка. -- Вось гэты, з драцяным павадком...

-- Хэ-хэ! Бач ты, зладзюга! Павадзіўся гачкі ў рыбакоў адкусваць і вудзільню ламаць! Больш ня будзе табе гэтага! І паклаў шчупака ў сваю торбу.

Менск, 1932

Цётка Магда

Яна сядзела каля стала, накрытага чыстым абрусам, зусім ужо сівая, хоць ёй і было яшчэ ўсяго пад сорак. Стол стаяў пасярод пакою, а крыху наводдаль ад яго, каля сьцяны, зялезны нікеляваны ложак, засланы жоўтай, з зялёнымі разводамі, коўдрай. На ложку ляжалі: белая шлюбная сукенка з прышпіленымі да яе трыма белымі ружамі, вянок з каронай, на якой пабліскваліі бусінкі танных шкляных пэрлаў, з зьверху ўсяго гэтага невялікі кавалак паперы, зусім ужо зжоўклы пад уплывам часу. На ім віднеўся залаты шлюбны абручык. У баку на падушцы ляжалі яшчэ дзьве-тры рэчы дзяцінага туалету: сукеначка зь сіняга тонкага сукна й такая-ж сіняя спаднічка.

Было ўжо подвечар, і пасярод стала, пад глыбокім зялёным абажурам гарэла старасьвецкая газавая лямпа, разьліваючы наўкола

мяккае і прыемнае паўсьвятло; яно крыху скрэсьлівала ператомленасьць на твары жанчыны й рабіла яго маладзейшым. З мэбляў у пакою, апроч стала й ложка, стаялі чатыры венскіх крэслы й досыць уёмісты сундук зялёнага колеру, які звычайна ў нас даецца ў пасаг нявестам. Ён быў уціснуты ў кут паміж ложкам і сьцяной. У другім куце, бліжэй да ляжанкі, стаяла нешта падобнае да тумбачкі, і на ёй пабліскавалі чысьцінёй талеркі, нажы, лыжкі й відэльцы. Чырвонай вялікай лічбай каляндар на сьцяне паказваў: «Студзень. 1. 1960». Было відавочным: жанчына рыхтавалася да спатканьня новага году й некага чакала.

Час цягнуўся павольна, і Магда -- так звалі гэтую жанчыну -- паклала перад сабой некалькі вучнёўскіх сшыткаў -- яна выкладала родную мову й літаратуру ў сярэдняй школе -- і пачала выпраўляць памылкі, час ад часу заглядаючы цераз акно на вуліцу. І тады, паміма сваёй волі, захаплялася прыгожасьцю начы, і ёй хацелася выскачыць, як бывала, на вуліцу й пабегаць па марозна-скрыпучым сьнезе.

Раптам улавіла вухам далёкі шум аўтобуса -- чыгункі ў гэтым невялікім месьце ня было, -- і цераз якіх-колечы дзесяць-пятнаццаць хвілін пачуліся доўгачаканыя знаёмыя галасы. Магда хуценька ўскочыла зь мейсца, схавала сшыткі зноў у шуфляду, крыху паправіла перад люстэркам свае сівыя валасы і, накінуўшы на плечы цёплую вязаную хустку, выбегла на ганак спатыкаць гасьцей.

-- О птушаняткі! -- прамовіла нарасьпеў мэлёдычнай беларускай мовай. -- Заходзьце-ж хутчэй, заходзьце! Пазамерзьлі мо’ у гэтай зялезнай скрыні аўтобуса?

«Птушаняткі» гэтыя былі два досыць высокія хлопцы й гаварылі, як на падбор, абодвы густым басам.

-- Нічога, мамка! Усё ў парадку із тваімі птушаняткамі. Перажывем, не прападзем!

-- Дык разьбірайцеся-ж, бо ў хаце сёньня натоплена добра з прычыны сьвята.

Было ўжо каля адзінаццатай, і яна зараз-жа ўзялася за падрыхтоўку стала.

-- А я чакала, чакала, -- працягвала гаворку. -- Божанькі, ці прыедуць хаця?!

Паставіла на стол пахкі студзень із сьвіных ножак і расклала па талерках пласьцікі шынкі й каўбас.

-- Ну, як-жа вам там паводзіцца ў тым Менску?

-- А от жывем, дый усё! -- адказаў старэйшы, Зьміцер, гісторык і беларусазнаўца.

Магда ўсьміхнулася.

-- Вось гэтак і ён адказваў: «Яміла, дый усё!»

-- Хто гэта?

-- Ды адзін хлапчук, зь якім вы мо' сёньня спаткаецеся...

І яна зноў усьміхнулася. А потым сур'ёзна:

-- Жаніцца вам трэба, тады ня будзе «жывем, дый усё!» -- будзе нейкі інтэрас!

«Птушаняты» напоўнілі пакой бадзёрым рогатам.

-- Ну, а чаго-ж тут сьмяяцца?

-- Як-жа, мамка, жаніцца, калі навет ложак няма дзе паставіць? -- адказаў малодшы, Алесь, як больш баёвы, беларускі таленавіты паэта.

Магда задумалася й нічога не адказала. Дадала да пастаўленай на стол ежы дзьве бутэлькі пітва: адну гарэлкі -- зуброўкі, другую -- слабенькага такаю, відочна, і дзеля сябе. Калі ўсё было цалкам падрыхтавана, селі за стол. Зьміцер як старэйшы адкаркаваў бутэлькі й наліў усім кілішкі.

-- Ну, як-бы там ня было, -- прамовіла Магда, узьняўшы свой кілішак, -- а сабраліся перад сьвятам разам. Дык вып'ем-жа за здароўе нас усіх!

-- І за тых, хто мо' ў гэты час у дарозе або ў такіх умовінах, якія не дазваляюць выпіць... -- дадаў Зьміцер.

І раптам ягоны позірк спыніўся на рэчах, што ляжалі на ложку.

-- А што гэта за рэчы на ложку, мамка?

-- Гэта?! А я думаю, мае найдаражэйшыя, цяперака, як мой волас стаў ужо сівым, узяць шлюб, бо раней ня было як! -- бяз цяню ўсьмешкі адказала Магда.

«Птушаняты» паставілі на стол келіхі й зьдзіўлена глядзелі на яе, чакаючы тлумачэньня. Але Магда не сказала больш нічога.

-- Мамка, але-ж ружы твае шлюбныя зусім пазавялі й павысыхалі, што гэта ёсьць?

-- Ну, вось бачыце? Пакуль я чакала на свой шлюб, дык і ружы пазавялі й павысыхалі!.. І ня дзіва, даражэнькія: шмат часу працякло!..

-- Зноў загадка, мамка! Ці гэта па нашай нацыянальнай традыцыі -- забаўляцца загадкамі перад новым годам?!

-- Паспрабуйце адгадаць.

-- А нашто, калі вы самі можаце нам сказаць, бо вы-ж заўсёды былі добрай!..

Магда выпіла свой келіх, і на ейным ператомленым твары зьявіўся румянец. Яна абаперлася лакцямі на край стала й цяжка дыхала. Сьціснула далонямі скроні. Зьміцер і Алесь перапалохана пазіралі на яе. Гэта працягвалася хвілін пяць. Потым яна, як-бы набраўшы сілы, ускінула ўверх галаву й прамовіла:

-- Вы кажаце: добрая! Можа, і нядобрая часам была, але ня хочу вас больш таміць, растлумачу вам гэтую загадку...

Падышла да ложка, узяла той, складзены ў чатыры, кавалак пажоўклай паперы й сказала:

-- Вазьміце і прачытайце!

Зьміцер асьцярожна разгарнуў паперку й пачаў:

Дачушка, любая!

Ня маем ніякай магчымасьці паведаміць табе больш падрабязна аб няшчасьці, якое звалілася нечакана на нас. Сама дагадаешся! Толькі ўсе мы просім цябе: прыгарні, з ласкі божай, вось гэтае маленства -- сваіх пляменьнікаў, Зьміцера і Алеську! Захавай ім жыцьцё! Цалуем цябе!

На тварах «птушаняткаў» выявіўся жах і непаразуменьне.

-- Што гэта значыць?! -- прамовілі разам.

-- Не дайшло да вас?!

-- Выслалі? Усіх разам? І маму й тату, і дзеда й бабку? Жудасна!..

-- Жудасна! І такіх жудасьцяў перажылі мы шмат. Такіх малых, якімі вы былі тады, бацькі кідалі на станцыях, на вуліцах і ўсюды, дзе толькі можна, каб уратаваць ім жыцьцё, бо ведалі, што знойдуцца людзі з добрым сэрцам, падбяруць іх, накормяць і ня выганяць з хаты!.. І простыя людзі, праўда, з сэрцам ставіліся да гэтых нашчасных сіротак -- жылі на жудасным пайку, але дзяліліся ім з прытуленымі...

-- Але-ж вы пераконвалі нас увесь час, што бацькі нашы атруціліся нейкімі грыбамі?

-- Гэта я выдумала, каб вам было лягчэй перажыць гэтую страту. А наяве яны ня вытрымалі выгнаньня й загінулі нейдзе ў Варкуце. Я

даўно павінна была адкрыць вам гэтую таямніцу, але то баялася вам пашкодзіць -- маладыя, загарыцеся помстай і сапсуеце сабе жыццё. То за сябе баялася, бо што-ж з вамі тады будзе, калі й мяне забяруць? То адпаведнага выпадку ня было. Можаце сабе ўявіць, якой пакутай для мяне гэта было! І я трымалася да сёньняшняга дня! А от зараз вы ўжо не маленькія, ізь сьпелымі паглядамі на жыццё, спадзяюся, ня зробіце неразумнага кроку, і выпадак якраз адпаведны трапіўся -- сустрэча Новага Году...

Зьміцер прамовіў:

-- Я дагадваюся, што шлюбная сукенка і іншыя гэтыя рэчы нейкім чынам зьвязаны з нашым жыццём!?

Магда як-бы засаромелася, але адказала:

-- Так...

-- Дык перадай нам усё да канца, калі ласка!..

Зноў пачырванела і апусьціла да долу вочы.

-- Ну, нічога! Мушу! Такая ўжо мая доля! -- падышла да ложка і ўзяла тую сінюю сукенку зь белым каўнерыкам. -- Вось у гэтай сукеначцы была я ў той дзень у школе, калі спаткала таго чалавека, якога пакахала на ўсё жыццё! Мне тады было няпоўных адзінаццаць год! Я была ў трэцяй клясе. А ён, із спазьненьнем на два гады па хатняй прычыне, прыйшоў упяршыню запісацца ў першую клясу. Нібы сёньня гэта здарылася -- так ясна стаіць у маёй памяці гэты дзень! Я, адзіная дзяўчынка на ўсю школу, сяджу на першай парце каля століка настаўніцы. Зь лінейкай у рукох яна стаіць тут-жа й робіць пераклічку вучням. «Як тваё імя?» -- пытаецца па парадку то ў аднаго, то ў другога. «Янка!» «Ага, значыць Іван! А тваё як імя?» «Яміла!» «А яшчэ як?» «Яміла, дый усё». -- адказвае хлопчык, сарамліва апусьціўшы вочы ўніз. «Як яго завуць на вёсцы?» -- пытаецца настаўніца ў дзяцей. «Так і завуць: Яміла». Настаўніца паціскае плячыма: яна ня ведае, як занесьці ў сьпіс хлапчука. Тады я ўспамінаю, што ў нашай вёсцы ёсьць другі Яміла, якога мой бацька кліча Амяльянам. І я падымаю руку: «Ну, Магда, як яго імя?» «Амяльян», -- адказваю. «Малайчына, садзіся!»

Магда на момант сьціхае, як-бы набіраючы больш паветра ў грудзі.

-- Пасьля пераклічкі настаўніца адпусьціла нас на пераменку. Дзеці бегаюць, жартуюць, крычаць, але Ямілы сярод іх няма. «Дзе ён?» -- зацікавілася я, неяк паміма сваёй волі. Гляджу, а ён стаіць

самотны каля прыгрэтай сонцам сьцяны й штосьці вылеплівае з гліны. Я падышла да яго. Ён сарамліва апусьціў уніз вочы й хуценька схаваў лепку да кішэні. «Пакажы мне!» -- загадала я. «Нічога я не рабіў», -- прамырматаў ён. «Але пакажы!» -- ён ня вымаў рукі з кішэні. Тады я сама прасунула туды сваю руку й выцягла лепку. Гэта была фігурка чалавечка, досыць добра вылепленая. І я была вельмі зьдзіўлена й глянула ў твар хлапчука. І мне здалося, што я заглянула ў нейкі баечны сьвет чысьціні і ўзвышанасьці -- такім натхнёным і цудоўным паказаўся ў той мамэнт ягоны твар! Сінія-сінія вочы, нейкія спакойныя, ласкавыя, чаруючыя і крыху нібы засмучоныя. Высокі і прыгожы лоб. Складкі вуснаў моцныя, але ня жорсткія, з адценьнем як-бы гіроніі. Мяне нібы асьвяціла сонца! Памятаючы, амаль ізь сьлязьмі на вачох, што ён так не па-сяброўску паставіўся да мяне, я яшчэ раз глянула на яго і аддала яму ягонага чалавечка. Ён хуценька схаваў яго зноў да кішэні. Потым сказаў: «Ты нікому ня скажаш?» Ён быў перакананы, што з яго будуць насьміхацца. У мяне ў кішэні былі пераводныя абразкі, якімі абдорвала нас настаўніца за добрыя паводзіны і адказы на ўроках. Я адарвала адзін зь іх -- блакітнага індыйскага сланя -- і дала Ямілу. Потым, магчыма, навет і нечакана для самой сябе, хуценька нахілілася да яго й пацалавала ў шчаку. Ён так зачырванеўся, што мне аж шкода стала яго!

-- Гэта ўжо пачыналася каханьне! -- зазначыў паэта Алесь.

-- Так, гэта быў ужо пачатак каханьня навечна, -- згадзілася Магда.

-- Ну, дык вып’ем за каханьне! -- дадаў Зьміцер.

І яны чокнуліся й выпілі яшчэ па кілішку, і Магда працягвала далей:

-- Я не ўтаіла ад маіх бацькоў таго, што ў гэты дзень зы мной здарылася. Прыйшоўшы дахаты, я весела падскочыла да мамы й сказала: «Ага! А я сабе жаніха знайшла!» Мама не падала віду, што яе гэта зьдзівіла або ўстрывожыла -- яна добра ведала мяне! І ўпаўголаса запытала, думаю, хаваючы ў душы сьмех: «Хто-ж ён такі?» «Яміла, цудоўны такі хлопчык! Я яму слоніка падарыла!» Бацька, які ўсё гэта чуў, выклікнуў: «Што яна там меле?» «Ды вось, жаніха сябе знайшла й слоніка яму падарыла, -- адказала мама. -- Яміла нейкі». «Яміла, ото, пэўна, сынок таго бедака Арцёма Кунцавога». І потым ужо досыць пагрозьліва: «Вучыцца трэба, а не

пра жаніхоў думаць у твой век! От адвязу ў места ў гімназыю, дык там за цябе возьмуцца!..» Увесну я скончыла нашу сельскую школу, і ўвосень мяне, і праўда, адвезьлі ў гімназыю. Дадому я прыязджала толькі на канікулы: перад калядамі на два тыдні, перад вялікаднем на дзесяць дзён і ўлетку на два месяцы. Але спаткацца зь Ямілам мне ніяк не ўдавалася! Прычынай гэтаму, я думаю, была вялікая розьніца ў эканамічным стане нашых сем'яў: бацька мой быў падлоўчым і лічыўся «панам», а Арцём Кунцавы -- бядняк-селянін! Я часам пыталася ў людзей пра Ямілу, але быў адзіны адказ: «выехаў некуды». Я была ўжо ў восьмай клясе. Лета, як заўсёды, праводзіла дома. Неяк раз я мыла, стоячы на кладцы, свае хусткі. Рэчка невялікая, але чысьценькая, быстрая. На мне была гімназыяльная хворма: вось гэтая сіняя спаднічка й белая блюзка. І раптам бачу: едзе воз із сенам. А каля яго ідзе хлопец -- высокі такі й тонкі, хударлявы. На галаве хлапца хворменны картуз, вышэй-пачатковага вучылішча. «Гэта-ж Яміла!» -- амаль выкрыкнула я. І пранік выскачыў у мяне з рук. Але зачапіць яго я ўсё-ткі не магу -- толькі стаю й гляджу. А воз із сенам вялікі, цяжкі. і конік ледзьве цягне яго пад гару. І раптам нешта там у збруі -- гужамі, здаецца, завецца -- ірвецца. Конік выскаквае з аглабель, і воз пачынае каціцца сам па сабе ўніз. Спачатку мне было сьмешна, як хлопец замітусіўся каля воза, каб не даць яму скаціцца ў рэчку. Але потым бачу, што тут пахне бядой: ня толькі воз можа апынуцца ў рэчцы, тут якраз дужа глыбокай, але пацягне за сабой і хлапца. Тады я кідаю ўсё і бягу яму на дапамогу. Так-сяк нам удалося воз затрымаць, і мы апынуліся разам. Глядзім адзін на аднаго, а сказаць нічога ня можам!..

-- Першае каханьне, цёця! -- уставіў Зьміцер.

-- Так, яно бярэць у палон усяго чалавека! -- згадзілася Магда. -- Ага, я стаю й гляджу яму ў твар і заўважаю: прабіваюцца вусікі ды такія прывабныя! І хочацца мне дакрануцца да гэных вусікаў -- прытуліцца да іх... І, каб ухіліцца ад спакусы, я апушчаю ўніз вочы й кажу: «Яміла, ты памятаеш, як тады я атабрала ў цябе чалавечка?» Ён узьняў на мяне вочы, і я прыкмеціла ў іх радасьць. «Памятаю, -- адказаў, -- і аж да сёньня хаваю вашага сланя...»

-- Вось гэтыя «гужы» і зьвязалі нас навечна. У гэтае лета мы спатыкаліся часьцяком. Ён ужо ня быў такім сарамлівым. І веды ягоныя перавышалі мае, нягледзячы на тое, што ён вучыўся толькі ў

трэцяй клясе ягонае школы, гэта значыць у шостай, калі лічыць на гімназыю, а я ў восьмай. Ён дужа шмат чытаў. І вучыўся маляваць і ляпіць, бо ім зацікавіліся настаўнікі й дапамагалі яму як маглі. А ў наступныя годы жыццьцё так закруцілася, што зламала не адных нас. Яміла папаў у войска й вярнуўся толькі цераз тры гады. Я была ўжо настаўніцай. Мы зноў пачалі спатыкацца. Ён часьцяком наведваў нашу хату. Бацька мой глядзеў на гэта спачувальна. Але Ямілу зноў пацягнула да навукі, ён уступіў у Акадэмію Мастацтваў. Я, як і раней, настаўнічала. Скончыў Акадэмію, пра яго сталі пісаць у газэтах як пра выключна таленавітага разьбяра. Для мяне гэта было вялікай радасьцю! Ён прыехаў пабачыць мяне. Мы вырашылі згуляць наша вясельле перад новым навучальным годам, калі я была яшчэ не занятая ў школе. Я сшыла сабе вось гэтую сукенку, купілі шлюбныя абручыкі, бацькамі маімі было падрыхтавана шмат усякага дабра: закусак, выпівак, каб хапіла для ўсіх, хто зойдзе ў хату -- такая традыцыя ў нашым народзе! Каб усё падрыхтаваць для прыйма вучняў у новым навучальным годзе, я мусіла выехаць перад самым шлюбам якраз на мейсца працы, кілёмэтраў за трыццаць ад нашай вёскі, умовіўшыся з бацькамі, што яны прыедуць па мяне ў пэўны дзень...

І вось сяджу я ў сваёй каморцы і гляджу ў вакно. Нудна мне нешта, беспакойна! Часам навет хапае за сэрца. Праз тры дні шлюб, але гэты важны для чалавека мамэнт неяк ня радуе мяне, і хочацца некуды бегчы, уцякаць, каб усё гэта мінула мяне, каб ня бачыць нікога й нічога гэтага... І бачу: пад’язджае пад школу хурманка, але коні ня нашы, і на вазу ня бацька і ня брат, які мусіў прыехаць па мяне, а браценік Андрэй і каля яго двое! Што гэта значыць?! Галава ў мяне закружылася, і з сэрцам стала дрэнна! Прадчуваньні заўсёды спраўджаюцца! Выходжу на ганак, і язык у мяне быццам адняло: хочу спытаць у браценіка, што здарылася, а язык не паварочваецца. Бачу, і Андрэй нейкі не такі, як заўжды: маўклівы, прыгнебены, разгублены!.. Стаіць і глядзіць на мяне. Урэшце ў мяне вырываецца проста із самай глыбіні душы: «Кажы!» А ён паціскае плячыма й адказвае: «Што-ж тут казаць!? Здарылася...» І выняў з кішэні вось гэтую пісульку й падаў мне.

Памятаю, як мёртвая, з апусьцелай душой, два астатнія дні перад шлюбам чакала я прыбыцьця Ямілы. Нічога не магла рабіць, ні пра што думаць. Вы, як выкінутыя з гнязда птушаняты, блукалі

без мяне па двары. Які гвалт я павінна была ўчыніць над сабой, каб думаць пра вас! Подвечар прыехаў Яміла. Калі я пачула ягоныя крокі на ганку, мне здалося, што я правалілася некуды глыбака ўніз. Ён падхапіў мяне на рукі і прамовіў: «Трымайся, даражэнькая!» І ў нейкім невытлумачальным парыве я схапіла ягоную руку й пачала яе горача цалаваць, абліваючыся сьлязьмі. І тады вы абодвы падышлі і сталі каля нас. Яміла прытуліў вас да сябе. «Я цяперака зусім выразна выяўляю цябе мамкай гэтых дзетак!» -- сказаў. Гэта выклікала новыя сьлёзы. «Але гэта ніколькі ня зьмене маіх плянаў -- ты застанешся маёй навечна!..» Я не знаходзіла слоў адказаць яму, хоць гэты адказ у душы стаяў ужо гатовым. Яміла зразумеў мяне, выйшаў на ганак і сеў на лавачку. Тады ты, Зьміцер, падышоў да мяне й сказаў: «Ты будзеш нашай мамкай? О, як добра! Мы будзем цябе любіць, бо ты заўсёды прыносіш нам цукеркі!..»

-- Няўжо я быў такім падлізьнікам!?

-- Так, ты любіў цукеркі. Але вы абодвы былі цудоўнымі хлопчыкамі.

І вось у гэты мамэнт я знайшла тыя словы, якія я павінна была сказаць яму. Я выйшла на ганак. Ён сядзеў, схіліўшы галаву на рукі. «Яміла, прабач мне -- я не магу браць шлюб...» Ён неяк адразу ўсхапіўся зь мейсца, стаяў і глядзеў мне ў вочы. «Я разумею, -- сказаў, -- ты баішся ўзяць на сябе адказнасьць за нашу будучыню пры наяўнасьці таго, што здарылася? Прысягаю табе, ты ніколі не пачуеш ад мяне ні малейшага папраку, што-б ні здарылася ў нашым жыцьці!» «Не, даражэнькі, ня гэта, -- адказала я, -- маральна я ня буду ў стане вытрымаць гэтага, разумееш? Мне заўсёды будзе здавацца, што я абкрадаю цябе, пазбаўляю цябе волі!.. Яшчэ раз прашу: прабач мне!» Ён доўга стаяў моўчкі. Павярнуўся да мяне тварам, і я ўбачыла на ім сьлёзы. «Так, я зразумеў цябе, -- прамовіў урэшце. -- Але дазволь мне, у такім выпадку, быць хоць тваім другам, каб, калі табе стане асабліва цяжка, каб... я мог прыйсьці да цябе з дапамогай!..» Мы разьвіталіся. Як п’яны, хісткай хадой, ён апусьціўся з ганку й выйшаў на вуліцу...

-- Ой, цёця! То мы вінаваты, цёця!

-- Не кажыце глупства! -- зазлавала Магда. -- Вы? Вы хочаце сказаць, я павінна была пакінуць вас?!

-- Перапрашаем, мы сказалі гэта не падумаўшы...

-- І вось часам я люблю пакласьці перад сабой гэтыя рэчы й глядзець на іх. Там маё жыцьцё, мае мары, пляны, надзеі... Але я адчуваю, што я зрабіла правідлова -- на сэрцы маім няма дакору... Я аддала маё жыцьцё вам, і я задаволена гэтым! Ніхто не папракне мяне!

-- Скажыце, а дзе ён цяпер, гэты дзіўны Яміла? -- запытаў Алесь.

-- Гэты самы хлопчык? А ён нейдзе працуе... Але, магчыма, вы яго хутка ўбачыце, вельмі хутка навет!

Насьценны гадзіньнік адзваніў дванаццаць. На вуліцы пачуліся вясёлыя галасы моладзі. Ракеты расьпісвалі ў розныя колеры неба. Гудзеў самалёт. І ў гэты мамэнт пачуліся крокі на ганку. Магда хуценька накінула на плечы цёплую хустку й выйшла ў калідор. Цераз мінуту ўвяла ў пакой ужо зусім сівога, але моцнага чалавека. Зьміцер і Алесь узьняліся зь мейсца.

-- Вось ён, гэты самы хлопчык Яміла! -- прамовіла зь хітраватай усьмешкай.

-- З Новым Годам! -- прывітаўся ўвайшоўшы.

-- Цёця, -- вырвалася ў пляменьнікаў замест адказу на прывітаньне, -- але-ж гэта наш прафэсар з Акадэміі Мастацтваў!?

-- Сёньня няма прафэсараў -- сёньня ёсьць сябры! -- адказаў той.

І яны, як найлепшыя прыяцелі, прывіталіся. Зьміцер падмігнуў цётцы й прамовіў:

-- Кажаш -- хлапчук!?.

-- Так! Цудоўны хлапчук! Ён і дапамог мне падняць вас да людзей...

-- Ну, што-ж, можа, яшчэ й ня позна?

-- Не, гэта ўжо прайшло... -- адказала.

Падышла да ложка, хутка сабрала свае рэчы й кінула іх у сундук.

--Так, «птушаняткі», пра што была мова? -- запытаў з усьмешкай прафэсар.

-- Ды вось, успаміналі справы даўно мінулых дзён, паданьні старыны глыбокай!.. Але ня так ужо й глыбокай, паколькі справы гэтыя яшчэ ў памяці...

Нью-Ёрк, 1965

Акупанты

Мацей у гэты дзень мусіў устаць рана: трэба было ехаць да млыну за дваццаць кілёмэтраў ад дому й вярнуцца назад дацямна, бо пазьней рух забаронены вайсковымі ўладамі. Выехаў яшчэ пры зорцы Вэнеры на ўсходзе. Да млыну даехаў шчасьліва: ніхто нідзе яго не затрымаў, і адказваць, куды ён едзе й што вязе, нікому ня трэ' было. Але, змалоўшы і едучы назад, на краю таго мястэчка, дзе быў млын, адразу-ж натрапіў на нямецкі патруль.

-- Halt![1]

Мацей зразумеў: трэба спыніцца.

Да возу набліжаўся ў вялікіх фільцаках немец. Пад пахай трымаў кароценькі аўтамат.

-- Was haben sei?[2] -- спытаў, паказваючы на мяхі.

Мацей і гэта зразумеў: што вязеш? Але адказаць па-нямецку ня мог. Толькі паказаў на свой рот і з ухмылкай прамовіў:

-- Гам!.. Гам!..

Немец нахіліўся над возам і памацаў мяхі.

-- Mehl?[3]

Мацей гэтага слова ня ведаў і не адказаў нічога. Жаўнеру гэта паказалася падазроным: ён меў загад затрымліваць усіх з вазамі, бо сталі частымі выпадкі падкладаньня мінаў. Азірнуўся, каб паклікаць каго, хто мог-бы дапамагчы ў перамовах, але на вуліцы нікога ня было.

---

[1] Стаяць!

[2] Што ў іх?

[3] Мука?

-- Zuruck![1] -- загадаў, паказваючы, што трэба ехаць назад. Тут Мацей інстынктам адчуў, што пачынаецца клопат. Стараўся пераканаць, як мог, немца, што на возе толькі мука й што ехаць яму далёка, а рух дазволены толькі дацямна; і што хата там засталася адна, жывёла не дагледжана; і калі-ж ён вернецца, у такім выпадку, дадому? Немец яго не разумеў, а ён -- немца. Урэшце вырваўшы з рук Мацея лейцы, немец досыць злосна нешта выкрыкнуў і, падскочыўшы, усеўся на мяхох з мукой.

На заставе, куды яны прыехалі, Мацея прымусілі зьняць з возу і аднесьці ў памяшканьне мяхі. Пакуль ён гэта рабіў -- і ад клопату, што здарылася гэтая прыкрасьць, -- ён аж спацеў. Зьдзеў кажух і, паклаўшы яго на воз, стаў каля мяхоў, каб пільнаваць муку. Белабрысы фэльдфэбаль зь зялезнай каскай на галаве загадаў жаўнерам праверыць мяхі. Два ізь іх, каб ня брудзіцца мукой, пачалі багнетамі пароць у мяхі. Мацей зь вялікім абурэньнем глядзеў на гэта, але сказаць нічога ня мог.

Праз папаротыя мяхі мука пачала сыпацца на падлогу. Фэльдфэбаль флегматычна зірнуў на гэта й пайшоў прэч, а за ім і тыя з багнетамі. Застаўся адзін толькі жаўнер, ужо стараваты, з пасівелымі вусамі, што стаяў увесь час убаку і, пакручваючы файку, моўчкі пазіраў, што робіцца наўкола. Быў ён з абветраным сялянскім тварам і з грубымі рукамі; на адным з пальцаў віднеўся срэбны шлюбны пярсьцёнак. Цяпер ён падышоў да Мацея й пачаў тлумачыць, што рэвізыя скончана й прасыпаную муку трэба сабраць у мяхі.

-- Зразумеў? -- спытаў раптам па-беларуску.

Мацей аж войкнуў ад радасьці: знайшоўся чалавек, зь якім можна пагутарыць! Падзякваў немцу за параду й спытаў, дзе ён навучыўся размаўляць «па-нашаму».

-- Тут! -- адказаў немец.

-- Так хутка!?

-- О, не! Я доўга жыў у Ашмяне й Маладзечне ў тую першую вайну...

Мацей паскардзіўся: хутка стане цёмна, а яму ехаць дваццаць кілёмэтраў, і зноў дзе-небудзь затрымаюць. У адказ на гэта стары жаўнер прасьпяваў:

---

[1] Назад!

-- Ночка цемны -- я баюса,
прывяды мне Маруса... -- і голасна зарагатаў.

Мацей таксама ўсьміхнуўся, але падумаў: «Добра яму рагатаць, калі ён на мейсцы».

-- А ты -- ехаць, ехаць! Ня бойса! -- зазначыў немец і пачаў дапамагаць Мацею класьці мяхі на воз, каб паскорыць ад'езд.

-- Ня добра вайна! -- уставіў Мацей.

-- Ja, schlecht!..[1]

Мацей з сымпатыяй зірнуў на яго і ўзьлез на воз. «От, забралі і старога, у другі раз, пагналі на чужы край, -- падумаў. -- А там, можа, таксама няма каму жывёлу дагледзець...»

-- Ну, ехаць, ехаць! Баба твой чакае -- хоча печ бліны...

Мацей гаротна зморшчыўся.

-- Няма ў мяне бабы! -- адказаў прачулена. -- Бонбай пазабівала й дзяцей і бабу, як ішоў хронт...

Жаўнер падаў яму руку й моцна паціснуў яе.

-- Ведаю, -- адказаў, -- шмат такіх!

* * *

Клопаты з затрымкай атабралі ў Мацея шмат часу, але на гэтым прыкрасьці яшчэ ня скончыліся. Пры выезьдзе за мястэчка яго зноў спынілі жаўнеры і, ня пытаючыся, куды ён едзе, паклалі на воз свае торбы з кацялкамі, запаснымі ботамі, газавымі маскамі і скруткамі коўдраў. Мацей жахнуўся: няўжо куды везьці!? Гэта-ж і так мала часу! Калі-ж ён будзе дома?

Жаўнеры падганялі.

-- Schnell, schnell, Mensch![2]

На шчасьце, немцы ехалі ў тым самым кірунку. «Пэўна, нейдзе лясныя хлопцы напракудзілі? -- падумаў. -- Добра яшчэ, што ў адну дарогу! А то, як ім вытлумачыць, што далёка дадому, а рух дазволены толькі дацямна? Гора -- без языка!» Жаўнеры намагаліся вытлумачыць яму, каб ехаў шпарчэй. Мацей і сам быў зацікаўлены ў гэтым, але для каня цягнуць гэтакі воз -- пяць асобаў, ды торбы іхныя, ды сам, ды мяхі -- было зацяжка.

---

[1] Так, дрэнна!..

[2] Хутчэй, хутчэй, чалавек!

Урэшце ён пачуў ад жаўнераў: Фасылеўка. «Ага, значыць, якраз у маю Васілеўку, дадому. Ну, дык яшчэ дзякаваць Богу! Можа, як-кольвек дабяруся...» Жаўнерык, самы малады, амаль дзіцё, атабраў у яго лейцы й пугу, усеўся побач і пачаў панукаць каня:

-- І-га! І-гі! -- па-швабску.

Але конік не разумеў немца: як жаўнерык ні намагаўся, рух заставаўся такім-жа павольным, як і раней. Кінуў пугу й лейцы й вылаяўся па-свойму. Тады і іншыя немцы пачалі жартаваць з Мацея і зь ягонага каня, які толькі пакручваў пасьля кожнага замаху ўдарыць яго сплеценым шэрымі «ваўчкамі» хвастом.

Праехалі вёску Сьвірыдаўку -- ужо недалёка ад Васілеўкі. Тут іх дагналі яшчэ хурманкі з жаўнерамі. Сярод іх быў і той стары. Убачыўшы Мацея, ён зноў засьпяваў: «Ночка цёмная, я баюся» -- і зарагатаў. Некаторыя з жаўнераў, дастаўшы із сваіх ранцаў ёміну, пачалі закусваць. І Мацей успомніў, што ён сёньня зусім нічога ня еў, і яму дужа захацелася дастаць хоць кавалак хлеба, але торба была нейдзе ў сене, пад жаўнерскімі ранцамі. «Бульбачкі-б цяпер печанай з капустай, -- падумаў, -- сопкай гэткай, цёпленькай, як, бывала, пры нябожчыцы. Зямелька ёй тамака пухам! Бог ім некалі аддзякуе за гэтыя забойствы і тым і другім -- абое рабое!..» Потым пачало ўспамінацца жыцьцё апошніх год. «Тыя, хоць і з аднаго кодла, а зусім ня дбалі пра людзей: абяцалі рай, а далі пекла!.. Пазамарылі людзей гэнымі калгасамі ды яшчэ вайну наклікалі... Вялікі саюз савецкіх народаў! У гэтых вялікіх усё на мане трымаецца!..» І Мацей упершыню адчуў да іх сапраўдную злосьць. «Хітруны! Усякім спосабам хочуць ашукаць! Мы-ж асобнае гаспадарства, а дыхнуць вольна не даюць! Няўжо мы не маглі-б неяк пагадзіцца із сваімі суседзямі, каб ухіліцца ад войнаў?! От-жа сядзяць там сабе ціха гэныя швайцары ды свэны! А тут заўсёды таўкуцца! Былі-б самі сабой, усё-ткі гэта дапамагло-б, а так «старэйшы брат» робе што хоча... А цяперака вось яшчэ гэтыя!.. Каб Бог даў перажыць як-кольвек гэта ліха!»

І Мацею горача захацелася сказаць: «У імя Айца й Сына і Духа Сьвятога» і пераксьціцца, але, каб не дражніць немцаў, ён толькі зьдзеў шапку й махнуў рукою перад галавой.

Праехалі міма паразьбіваных і папаленых панцыраў, на некаторых яшчэ відаць былі савецкія знакі. «От, абдзіралі людзей на гэтае зялезьзе, і ўсё пайшло намарна... Ды яшчэ няведама, чым гэта

ўсё скончыцца. Можа, павымрам усе з галадухі або зь якой пошасьці...»

* * *

Тут ужо набліжалася гэтая самая «Фасілеўка». Жаўнеры раптам, не ўязджаючы ў яе, разабралі свае торбы й пакінулі хурманкі. Мацей лёгка ўздыхнуў «Ну, хвала Богу! Тое добра, што добрым канчаецца -- усё-ткі дабраўся да роднага кута!» Драўляныя хаты з саламянымі дахамі шнурам паўсталі перад ім уздоўж вуліцы. У некаторых маячылі яшчэ цьмяныя агеньчыкі. На шчасьце, у вёску ня трапіла ні адна бомба; саламяныя дахі ўспыхнулі-б, як порах. Пасярод вёскі маркотна шумеў пагосцкі бярэзьнік. Паўзь яго шарэла маленькая старажытная каплічка, куды прывозілі памерлых перад пахаваньнем. Зірнуўшы на яе, Мацей успомніў нябожчыцу й дзетак, пакрамсаных на кавалкі бомбай; ляжалі ўсе ў агульнай труне...

Думка кальнула ў сэрца. Зьдзеў шапку, набажна пераксьціўся. «Тутака прыйдзецца й мне палегчы...» -- падумаў.

Пагнаў па вуліцы каня шпарчэй. Падмерзлая зямля бубнела пад коламі. Хаты нібы затаіліся -- ані гуку. І раптам, калі ён быў ужо каля дому, пачулася траскатня кулямёту. Інстынктыўна ўздрыгануўся ўсім целам. Але страляніна зараз-жа сьціхла.

Уехаў у двор. Усё выглядала як мае быць. Адпрог каня, паставіў яго ў стайню, падкінуў канюшыны. «Як крыху астыне, не забыцца-б напаіць», -- падумаў. Выцягнуў вядро вады із студні, напаіў карову. Падкінуў пару буракоў сьвінчу ў карыта. І тады толькі скіраваўся да хаты. Замок на дзьвярах вісеў на клямцы, прабой быў вырваны. Пасьпешна ўбег у хату, але тут выглядала ўсё ў парадку. Дастаў зь печы чыгунок з капустай і пачаў з апэтытам сёрбаць, закусваючы хлебам. І ў гэты мамэнт із запечка пачуўся дробненькі сьмяшок, нібы пабразгваньне спружыны будзіка. Крыху занепакоіўся, але хутка апанаваў сябе. Падняў лыжку ўгару, быццам перад ім сядзеў нехта, каму трэба трэснуць ёю па ілбу, і спакойна прамовіў:

-- А гэта яшчэ хто там?

Сьмяшок памацнеў, ператварыўся ў нейкі мэханічны клёкат, быццам у таго, хто на печы, саскочыла, як у будзіку, накручаная спружынка, і ён ужо ня ў стане цяпер спыніцца, пакуль яна цалкам не раскруціцца. Мацей зразумеў гэты сьмяшок так, як і сьлед:

чалавек пабойваецца, каб яго не ўзялі за каршэнь і задобрываецца. Не падымаючы галавы, зазначыў:

-- Дык гэта ты мне тут замкі паламаў?

-- Прішлось -- ізвініте[[[

Мацей незадаволена:

-- Ламаць замкі! І ўрывацца ў хату?! Хто ты такі, і куды нясуць цябе твае ногі?

Сьмяшок адразу-ж перарваўся. І той, хто сьмяяўся, відаць было, усеўся на печы.

-- Ты угадал" -- прамовіў. -- Хожу' брожу' а куда несут меня моі ногі' і сам не знаю[[[

І стаў апавядаць, як каля вёскі напалі на яго тры вялікія сабакі, усе рабыя. Абараняцца ня было чым і ўцякаць таксама некуды, і ён кінуўся ў рэчку. Вада студзёная, ён зьмерз і пабег у хату, якая была бліжэй, каб пагрэцца. А тут гэты замок! Ну, і зразумела, трэба было вырваць прабойчык! У хаце нікога ня было. Ён залез на печку й нечакана заснуў. І сьнілася яму, нібы зьявілася цудоўная красуня...

Мацей абрэзаў яго:

-- Ты мне байкі не апавядай: ніякіх рабых сабак у вёсцы няма, і наагул сабак амаль няма, іх пастралялі немцы, -- і потым сувора: -- Пакажы мне свае паперы! Я адказваю за цябе...

-- Паперы? Паперы? -- забянтэжыўся той. -- А на что оні тебе(

-- Прымаць людзей бяз жадных папераў цяпер забаронена: прыйдуць немцы й цябе й мяне на шыбеніцу пацягнуць...

-- А ты за немцаў?

-- Я не за тых і не за іншых!.. Я гаспадар, разумееш? Свой глузд маю! Але я мушу ведаць, хто ты такі. Ты, пэўна, адтуль, з-за хронту?

Мацей узяў апарожненую міску й накіраваўся да парогу, дзе былі палічкі для судзьдзя.

-- Ты ўгадал: я оттуда, с Тамбовской... Но ты нікуда не ході" Понімаешь(Паперы(" Хорошо' я тебе покажу моі папе-ры[[[-- Засунуў руку ў кішэню шыняля, які быў пад ім. --

Всякіе паперы бывают" -- дадаў. -- Вот’ к прімеру’ такого сорта паперы успокоят тебя("

Мацей узьняў галаву і ўбачыў скіраваны на яго наган.

Чалавек зноў закаціўся сваім хвальшывым сьмяшком.

-- Дык гэта ты такі абаронца!? -- заўважыў спакойна Мацей. -- Схавай сваю дурную цацку! -- загадаў. -- У сваёй хаце я заўсёды знайду спрыт скруціць табе рукі...

-- А’ ты хочешь еэ/ знать’ кто я такой(Хорошо" Я пріслан хлопцамі по разв/рстке для партізанкі% чтобы на послезавтра доставілі пятьдесят кіло печеного хлеба’ пять кіло жіров і двадцать пяць кіло бараніны ілі говядіны[[[Понял(

Мацей разгублена стаяў сярод хаты. «Няпрошаны госьць -- горш за татарына, -- думаў. -- Прыйдуць немцы -- павесяць і вёску спаляць! Але й гэтыя пастраляюць і спаляць! Як цяпер выправіць яго?» Успомніў, што няпоены конь і скіраваўся да дзьвярэй.

-- Гаспадар! Гаспадар! Постой’ я тебе что-то скажу% ты нікуда не ході" Імей в віду% жівым тебя спалім"[[

-- Я нікуды ня йду: конь, от, высах тамака, цэлы дзень няпоены...

-- Не помр/т твой конь"

Пакуль Мацей стаяў каля дзьвярэй, бадзяка зьлез зь печы. У зубах была цыгарка. Папрасіў запалку. Мацей паднёс каганец і ў гэты мамэнт убачыў, што рукі ў бадзякі дрыжаць.

-- Зімна?! -- усьміхнуўся Мацей.

-- Как?

-- Я пытаю: зьмерз на печы?

-- Промёрз, когда попал в реку...

-- А дзе гэта табе собіла цераз рэчку лазіць?

-- Вот собіло’ собіло[[[-- ухіліўся той ад адказу. І потым% -- Знаешь что, господар’ еслі ты попробуешь меня выдать’ будет тебе плохо[[[

-- Ды я нікуды, толькі-б каня, кажу, напаіць...

Мацей сеў на лаўку й пачаў апавядаць, чаго нацярпеўся за дзень. Думаў, можа чалавек расчуліцца, супакоіцца, і тады можна будзе выскачыць на хвілінку да канюшні.

-- А ці ты што еў? -- запытаў потым.

-- Рано -- ел’ а потом не пріходілось[Но .то нічего’ мы в лесу прівыклі жіть по-волчьі[[[

-- А праўда, жывеце, як ваўкі...

Было, мабыць, ужо каля дванаццатай ночы, калі бадзяка сядзеў над патэльняй зь яечняй за сталом.

-- А где твоя баба? -- запытаў раптам.

-- Няма ў мяне бабы -- нікога няма...

-- Как так?

-- А ўжо два гады, як усіх лішыўся: бонба ўдарыла, як хронт ішоў.. А я, на няшчасьце, дома ня быў і ўцалеў...

Чалавек памаўчаў, даядаючы яечню.

-- Хорошо ты меня угостіл’ вот кабы еэ/ бабу доставіл[[[

-- Вось пра што маскаль думае!? -- узбунтаваўся Мацей. -- Скуру сваю трэба ратаваць, а не пра бабу думаць у гэты час!..

І ў той-жа мамэнт з вуліцы пачуўся нейкі шум, крык і крокі людзей. Мацей, уперад за ўсё, прыціснуў пальцам агеньчык каганца. Потым кінуўся да вакна. Заглянуў у яго й хутка адскочыў.

-- Немцы ў касках! -- прашаптаў трывожна.

Штурхануў бадзяку ад стала й скамандаваў:

-- Уцякай! Зараз-жа ўцякай!

Бадзяка схапіў з лаўкі шынэль і выскачыў за дзьверы. Пачулася некалькі стрэлаў. Мацей пераксьціўся. За дзьвярыма ўжо тупалі сваімі цяжкімі ботамі немцы. Мацей пасьпяшыў адчыніць, і снапкі агеньчыкаў з ручных ліхтарыкаў асьвяцілі хату. Мацей стаяў як няжывы...

Поверх зеленаватых нямецкіх шынеляў віселі жаўтаватыя шнуры й бляхі палявых жандараў. Загадалі запаліць сьвятло. Адзін зь іх, старэйшы па чыну, пачаў аглядаць хату. Убачыўшы на стале патэльню, кавалак хлеба й нож з відэльцам, выкрыкнуў:

-- Partizant!?

Мацей пакруціў галавой.

Пачалася рэвізыя. Заглянулі пад лаўкі, пад печ і навет у печ. Адзін з жаўнераў узьлез на печ, але зараз-жа покатам зьляцеў адтуль.

-- Mine! -- выкрыкнуў.

Мацея абкружылі, наставіўшы на яго аўтаматы. «Удружыў няпрошаны госьць! Цяпер толькі адно: схапіць гэтую міну й сабе пад ногі». Але было позна ўжо: зь яе вынялі запальнік. Старэйшы па чыну пачаў нешта пісаць. Потым яны аб нечым спрачаліся, пазіраючы на Мацея. Пасьля ўсе ўпяцёх падпісаліся пад паперай. Адзін зь іх зьняў з крука ў сьцяне лейцы -- тыя самыя, зь якімі Мацей езьдзіў сёньня ў млын. Зрабіўшы на адным з канцоў засмаргу, выйшаў з хаты. Цяпер Мацея мог выратаваць толькі цуд, але гэтакіх цудаў у нашу эпоху не здараецца...

Вывелі Мацея з хаты. Першы немец паставіў у варотах калодку, на якой Мацей кляпаў косы й скіпаў дровы; стаў на яе й прывязаў лейцы да перакладзіны паміж шуламі. Мацей, як адубянелы, стаяў і глядзеў на ўсё гэта. «А конь так і застаецца няпоены», -- думаў. Узьняў вочы ў неба. Але неба маўчала...

Яго штурханулі й загадалі стаць на калодку. І як толькі ён гэта зрабіў, накінулі засмаргу яму на шыю й выбілі калодку з-пад ягоных ног. І ў галаве Мацея зазьвінелі званы, і яму здалося, што ён некуды ляціць, ляціць...

* * *

На сьвеце шмат няпраўды, зла, зрады... Людзі добрыя, шчырыя, сумленныя гінуць: ад куль, на шыбеніцах, у вязьніцах... Людзі зласьлівыя, хітрыя, здрадлівыя дастаюць ардэны й мэдалі, узвышаюцца й множаць зло. І няма згоды й ладу ў доме, у сям'і, паміж сябрамі й народамі... І імчыцца цераз трупы на белым кані Чорная Сьмерць з аголенай шабляй...

Нью-Ёрк, 1953-1972

Воўчым сьледам

Піліп папаўдні натапіў ёўню. Потым узяў сноп яшчэ не абмалочанага аўса і паставіў яго насупраць вакенца, крокаў за трыццаць ад ёўні -- якраз на адлегласьці вернага стрэлу з паляўнічай стрэльбы. Каб заяц сноп паваліць ці сьцягнуць зь мейсца ня мог, прывязаў яго да лазовага кусьціка, які, як наўмысьне, тут і тырчэў з-пад сьнегу.

Зайцы ўзімку, калі ўсё пакрыта сьнегам, галодныя і йдуць на жыроўку рана ў дужа марозныя дні, навет зараз-жа, як толькі пачне заходзіць сонца. Таму Піліп яшчэ завідна наважыў «засесьці на зайца». Зьняў з крука сваю пістонную дубальтоўку, падняў куркі і прадзьмухаў іх. Пістоны былі ўжо старыя, падмочаныя, і на іх

мядзянай агортцы зьявілася зялёная маса. Дастаў з карабка іншыя й паставіў на мейсца сапсутых. Абуўся ў цёплыя валёнкі, надзеў кажух і падаўся ў ёўню. Дым ужо сышоў, і цяпер у ёй было цёпла і прасторна.

Сеў на загадзя падрыхтаваныя снапы, прасунуўшы рулю сваёй дубальтоўкі ў вакенца. Ноч была ясная й марозная; месяц у поўні, як начышчаны мядзяны пятак, вісеў над бліжэйшай грамадкай сасоньніку, разьліваючы наўкола зеленаватае мяккае сьвятло, і Піліпу была добра відаць навет мушка на дубальтоўцы.

Ад няма чаго рабіць ён пачаў успамінаць свае паляўнічыя прыгоды: увосень яму «пашэнціла» -- падстрэліў на возеры пару дзікіх гусей; праўда, з-за іх яму давялося добра выкупацца ў ледзяной вадзе, але гускі былі тлустыя! «Гускі! Што гускі -- дробязь! Цяпер набой шмат каштуе, дый не дастаць! -- падумаў. -- От, каб лася дзе-небудзь падпільнаваць -- і мяса шмат, і скура спатрэбілася-б у гаспадарцы на сырамяць ці на што. Або добрага дзіка! Ну, ці хаця-б ваўка; за скуру, напрыклад, атрымаў-бы добрую прэмію!.. Ваўка!? От, каб тады была зь ім стрэльба, як у восеньскі імжлівы дзень, калі ён ціха пасоваўся па вузкай лясной сьцежцы з торбай арэхаў на плячох!.. Ага! Як напароліся тады на яго тыя два ваўкі-канятнікі! Ото было-б паляваньне...»

Раптам яго моцна пацягнула на сон, і ён клюнуў носам. Узварухнуўся, паправіў пад сабой снапы і зноў пачаў пільна ўглядацца ў вакенца: сноп і лазовы кусьцік маячылі перад вачыма, як і раней. І сон хутка зноў наляцеў на яго й салодкім датыканьнем пачаў плюшчыць яму вочы. І тады пачало блюзьніцца: роўная, сьнегам ухутаная лагчына, і ён у лёгкіх санках, з упрэжанымі ў іх аленямі, імчыцца па ёй! Алені прымчалі яго ў ледзяны горад, асьветлены сінімі, зялёнымі, жоўтымі й ружовымі агнямі. Зайцы, вавёркі, козачкі, ласі і ўсе іншыя зьвяры і зьвярушкі паўсталі перад ім у шарэнгу. Мядзьведзь затрубіў у даўгую мядзяную трубу. І тады воўк, выступіўшы наперад, узмахнуў лёгкай тоненькай трысьцінкай, і ўсе зьверы ўзгоднена засьпявалі. Якія гэта былі цудоўныя, ніколі раней ім ня чутыя сьпевы! І яму так стала прыемна, і такімі слаўнымі і прыхільнымі здаліся ўсе зьвяры і зьвярушкі, што з вачэй аж пасыпаліся сьлёзы ад прачуласьці...

Ён зноў клюнуў носам і спалохана хапіўся за стрэльбу. Але наўкола па-ранейшаму было ціха; снопік і лазовы кусьцік

заставаліся на мейсцы. Раптам да вуха дайшоў нейкі ледзьве ўлавімы шолах. «Ага, нейдзе скача зайчык», -- падумаў, павольным рухам бяручы стрэльбу. І ў гэты час на роўнай, выгладжанай вятрамі кромцы сьнегу, зьявіўся нейкі падоўжаны, зусім не падобны на зайчыны, цень; плыў ён павольна, часам на кароткі мамэнт спыняўся, як-бы той, ад каго гэты цень ішоў, да ўсяго прыслухоўваўся і прынюхваўся. Напружаны мамэнт цягнуўся так доўга, што Піліп адчуў навет нецярпліваcьць...

Ён хацеў ужо крыху нахіліцца да вакенца і ямчэй заглянуць у яго, як крокаў за дзесяць, ня больш, паўстала постаць ваўка, якая ў сьвятле месяца здавалася дужа вялікай. Прыплюшчыўшы левае вока, Піліп павёў позіркам па ліштве сваёй дубальтоўкі і потым націснуў на язычок курка. Але пачуўся толькі «пшык» -- порах у стрэльбе ляжаў доўга і адсырэў...

Воўк пачуў гэты «пшык» і павёў галавой да вакенца. Пэўна ўчуўшы пах спаленага пістона, а можа быць, і дублёнага кажуха Піліпа, ірвануўся наперад, зрабіўшы вялізарнейшы скачок! Піліп зноў падвёў мушку стрэльбы да грудзі ваўка, ужо бягучага, і націснуў на язычок другога курка. На гэты раз грымнуў стрэл, рэха якога пакацілася далёка па імшарах. Воўк перакуліўся, дрыгаючы нагамі. «Ну, вось і даў канцэрт!» -- падумаў Піліп, успамінаючы сон.

Выйшаў на двор. Абагнуў ёўню, скіраваўся да здабычы, каб паглядзець, што за яна. Але яе на мейсцы ня было. Піліп захваляваўся: «Гэта-ж цэлых сорак пяць цалкачоў!» Азірнуўся. Воўк валокся зь перабітым задам крокаў за пяцьдзесят ад яго. Кінуўся наўздагон. Падбег, замахнуўся ботам, цэлячы ў галаву. Воўк ляснуў зубамі й хапіў за халяву бота. Ірвануў яе й раздраў ад самага верху і аж да абцаса. Піліп спалохаўся, але зьвера ўпусьціць было шкада. Размахнуўся і ўдарыў яго прыкладам стрэльбы. Стрэльба хруснула, і ў рукох Піліпа засталася толькі кароценькая руля. Воўк, нібы зразумеўшы, што настаў ягоны чарод нападу, нечаканым скачком кінуўся да Піліпа, хапаючы яго за горла. Піліп адпіхнуў яго нагой. Воўк зноў скочыў на грудзі Піліпа й на гэты раз хапіў яго за твар. Вырваў амаль усю левую шчаку. Гарачая кроў заліла Піліпу рот, пацякла па вопратцы й пад вопратку. Ён моцна закрычаў і пачаў адбівацца нагамі. У зьвера, відаць, не хапіла ўжо больш сілы да нападу; ён раптам адскочыў ад Піліпа і толькі час ад часу

паварочваў да яго галаву і ляскаў зубамі. Піліп кінуўся наўцёкі, але крокаў праз дваццаць сілы пачалі яго пакідаць, і ён паваліўся на сьнег...

* * *

У Піліпавай хаце яшчэ ня спалі і стрэл чулі. Чакалі: вось ён хутка зьявіцца, як звычайна, з зайцам у рукох. Тым часам прайшло з паўгадзіны пасьля стрэлу, а потым і гадзіна, а ён не вяртаўся. Западозрылі нешта няладнае. Спусьцілі з ланцуга Палкана, які ўжо хвілін за пятнаццаць-дваццаць перад стрэлам пачаў гучна брахаць і ірвацца з ланцуга...

Сабака зараз-жа кінуўся за гумно. Пайшлі ўсьлед за ім: Палкан стаяў над Піліпам і жаласьліва візчэў, ліжучы гаспадару рукі. Піліпа паднялі й павялі да хаты, падтрымліваючы подручкі. Палкан абнюхаў сьляды ваўка й кінуўся ў кірунку імшараў...

Убачыўшы Піліпа ў крыві і з разарванай шчакой, у хаце ўсе перапалохаліся. Толькі адно слова «воўк!» мог сказаць ён. Пабеглі да настаўніцы па ядынку. Тая сама прыйшла зрабіць апатрунак...

Калі ўсё было скончана й Піліпа паклалі ў пасьцель, успомнілі пра Палкана. Мужчыны ўзброіліся калкамі і пайшлі яго шукаць. Ад мейсца стрэлу воўк прайшоў яшчэ кілёмэтры два. Палкан дагнаў яго ў імшарах. Ратуючыся ад злоснага й дужага сабакі, ён забіўся пад лапнік густой ёлкі і адтуль агрызаўся. Сабака не рызыкаваў кінуцца на яго, стаяў і злосна брахаў. І толькі тады, як падышлі з калкамі людзі, кінуўся на ваўка й пачаў яго ірваць зубамі. Зьвер выкаціўся з-пад елкі й быў прыціснуты калкамі...

1930

Пернікавае сэрца

Немцы пачынаюць аджываць. У гэтым перакананы навет наш мастак Вохра. Праўда, ня ёсьць ён мастак палітры, а па паўлітру, пасьля чаго вельмі ўдала расфарбоўвае ў розныя колеры, асабліва ў сіні, сваю жонку. Дык ён цяперака «перабудаваўся» адносна аджываньня немцаў. Раней казаў: «Бяз чужынцаў ім і за сто год ня вылезьці з руінаў. Ды яны й чакаюць толькі, каб каго зноў запрэгчы!..» А цяперака ўжо -- не, так ня кажа: немцы пачынаюць аджываць!

Вось тутака, у крайсавым, як па-нашаму, у павятовым месьце, адбыўся перадкалядны кірмаш. Зьехаліся ня толькі баўэры з усяго краю, але ўсе, хто толькі мог. І навет зь іншых мяйсцовасьцяў. А Вохра запэўнівае, што навет зь іншых панстваў-гаспадарстваў, як Гэсэн, Саксонія, Вайсрутэнія[1]... Можа й так, праверыць нам цяжка. Але пэўна тое, што людзёў, як кажа Вохра, было тутака ўсялякіх: і баварцы ў сваіх рознафарбавых туалетах, і звычайныя немцы, і,

[1] Назва Беларусі ў часы нямецкай акупацыі 1941-1944 гг.

можа, саксонцы -- Бог іх ведае! -- і вайсрутэньяны, як суседы... Гутарка тутака адбывалася на ўсемажлівых мовах.

Вось і мы з Вохрай выправіліся на кірмаш. Што датычыць мяне, то я ня так для таго, каб што купіць, бо грошы мне няма адкуль браць, каб купаваць розныя рэчы на кірмашох, -- я ішоў толькі паглядзець, паколькі Вохра запэўніваў, што пазьязджаліся людзі з розных панстваў-гаспадарстваў. Тым болей, што і вецер у гэты дзень дзьмуў якраз у тыл, калі ісьці ў кірунку места...

І праўда-ж, немцы аджываюць проста, як па пляну Маршаля![1] Колькі тут тавараў імі было павыстаўлена ўсялякага! І гэта нягледзячы на вецер, які тут ім ня дзьмуў з тылу. І міскі з самалётавага алюмінію, і розныя забаўкі, цацкі, пісталецікі, гарматкі... І ўсё гэта, як я добра прыгледзеўся, то з пабітых самалётаў, то з танкаў і іншых падобных рэчаў, так што я навет падумаў: «Рэалістычныя немцы ўрэшце знайшлі правільны кірунак жыцьця, перарабляючы зброю ў дзіцячыя цацкі, і каб усе народы (за выключэньнем, зразумела, вайсрутэньянаў, бо мы такіх рэчаў яшчэ не будавалі), каб усе народы зрабілі так, то ня трэба было-б спрачацца ні за Руру (як Вохра называе Рур), ні ў будучыні за Ўрал і Данбас. Жыцьцё пайшло-б зусім у мірным кірунку, і дзеці ўсяго сьвету былі-б цалкам задаволеныя!.. Былі тут і пернікі, выпечаныя ў розных формах: у форме Nikolaus'аў[2] зь белай барадой, сагнутых пад цяжкасьцю падарункаў, якія яны несьлі ў торбах для дзяцей; у форме сэрцаў розных якасьцяў і вялічыняў зь дзірачкамі пасярод, празь якія працягнуты шнуркі (гэта для таго, каб купіўшы зараз-жа мог яго павесіць за гузік на грудзях); і кілбасы, ліверныя і крывяныя, яблыкі -- усяго не пералічыць. І ўсё гэта, галоўнае: «onhe Karten»[3].

Вохра, хоць і яму ня было дзе браць грошаў, меў якіясьці «фэнікі». Вось мы сабе ходзім паміж баварцамі ды іншымі. Некаторыя зь іх ужо абвесіліся пернікамі-сэрцамі, адламваюць па

---

[1] Праграма аднаўленьня і разьвіцьця Эўропы пасьля другой сусьветнай вайны на аснове амэрыканскай эканамічнай дапамогі; праграма прапанавана ў 1947 годзе Дж. К. Маршалам.

[2] Сьвяты Мікалай, які прыносіць дзецям падарункі. Традыцыйны калядны падарунак -- пернікавы Nikolaus.

[3] Без прадуктовых картак.

кавалачку, смакуюць. Што датычыць мяне, то дай Божа сваё як-кольвек уцаліць! На што мне яшчэ куплёнае сэрца? Я ўсё хадзіў і то там, то тут прыцэньваўся, бо ўсё роўна ведаў, што нічога ня куплю. Але цікава так хадзіць... Што датычыць Вохры, то той усё бегаў у «Gasthaus»[1] грэцца півам, якое ён разбаўляў прынесенай у кішэні «пяцісмакаўкай» (гэта -- гарэлкай з назовам ад прозьвішча таго, хто яе гнаў, хаця я і сумняваюся, каб Пяцісмак гнаў гарэлку). Але Вохра, нагрэўшыся, хутка мяне знаходзіў.

Аднаго разу ён выйшаў з «Gasthaus'a» і досыць добра ўжо нагрэты, і не адзін, а ўдваёх. Спаткаўшы мяне, ён пачаў нас знаёміць:

-- Не знаёмыя -- знёмцеся!

-- Ды мы ўжо, здаецца, знаёмыя, -- адказаў той, каго мне рэкамэндаваў Вохра, з добрай усьмешкай на нашай роднай мове.

Мяне гэта аж зьдзівіла. Я думаў, што гэта немец: на ім, калі апісваць з ног да галавы, як гэта ўмеюць рабіць праўдзівыя пісьменьнікі, быў зялёны баварскі капялюшык зь белай вяровачкай і з пэндзэлькам на баку; такога-ж зялёнага колеру куртка зь кішэнямі збоку і з бартамі, упрыгожанымі дубовымі лістамі й рознымі зьвераняткамі і птушаняткамі, накшталт ланяў і глушцоў; спартыўныя, таксама зялёныя, штаны, прышчыпленыя да жоўтых і таксама спартыўных чаравікаў бліскучымі пражкамі. А што дзіўней: на грудзёх у яго, там, дзе месьціцца сэрца натуральнае, вісела пернікавае вялікае сэрца на белым шаўковым шнурку.

-- Не памятаю, дзе мы з вамі знаёміліся, -- адказаў я, падаючы руку.

-- Як так? На радзіме яшчэ знаёміліся й ня раз! Вы, Максім, мусіць, і цяперака ім засталіся, а я цяперака Грукацень, а раней, як вам ведама, быў Пукаліч...

Я ўспомніў: праўда, быў такі, усё сябраваў з нашым прэзыдэнтам! Ён добра ведаў, што праз прэзыдэнта і ён узвысіцца!

-- Ну, як-жа вы цяперака? Дзе прытуліліся? -- спытаў я. -- «Wie geht es Sie?»[2] -- як тыя немцы кажуць.

---

[1] Невялікі гатэль з рэстаранам.

[2] Як вы?

-- Дзякую! Жыву на прыватцы. Раней быў на ўтрыманьні UNRR'ы[1], а потым кінуў: ня варта аўчынка вырабу.

-- Што робіце? Што вы робіце для нашай радзімы?

-- Ах! Махнуў на ўсё рукою! -- адказаў Грукацень. -- Раней, як быў у лягеры, прабаваў рабіць тое-сёе, але заместа ўдзячнасьці атрымаў ад грамадскасьці толькі лаянку й няпрыязнасьць... Кінуў!

Я ўспомніў, праўда, выпускаў ён якіясьці рататарныя лісткі й лістоўкі, пісаў якіясьці памфлеты супроць асоб, якія ў чымсьці стаялі яму на дарозе, выліваў цыстэрны памыяў на сяброў, зь якімі разам працаваў і, што яшчэ горш, быццам-бы быў зь кімсьці «зьвязаны», што яго цалкам скампрамэнтавала. Людзі кажуць, што ён дужа амбітны, лезе ўверх! І абавязкова хацеў стаць камандантам, а калі не камандантам, то хоць-бы прэзыдэнтам, на мейсца сябра, які зьнік... Што датычыць мяне, то я даў-бы яму таго прэзыдэнта, хай-бы быў! Тым больш, што цяперака ў прэзыдэнтах быць досыць небясьпечна: альбо заб'юць, альбо аблаюць, альбо проста ня плацяць... Прэзыдэнт мусіць быць самаахвярным і за свае грошы ўсе справы весьці. Я ведаю аднаго прэзыдэнта, дык ён, каб паехаць на адну канфэрэнцыю, мусіў прадаць усе штаны, што былі ў ягоным куфары, застаўся толькі ў адных, у якіх паехаў. І добра, што нідзе праз плот ня трэба было лазіць, а то мог-бы застацца зусім без штаноў. Хай пабыў-бы ў прэзыдэнтах!

«Так, так! -- думаю я. -- Пернікавае сэрца! Замест каб рабіць карысную для радзімы справу, чалавек паставіў за мэту паскудзіць... Ну й дакаціўся...» Але кажу яму зусім іншае. Я яму кажу:

-- Цяжкія часіны!..

-- Што датычыць мяне, то я жыву добра, -- адказвае Грукацень.

-- Чым-жа вы цяперака займаецеся?

-- А вось тым-сім...

-- Прыехалі на кірмаш?

-- Пойдзем-жа пабачыць...

І мы, усе ўтраіх, пайшлі далей. У адным мейсцы нам спаткалася немка з псюкам. Псюк, як і ўсе той пароды псюкі: чатыры нагі, два

---

[1] UNRRA (ЮНРРА)-- United Nations Relief and Rehabilitation Administration -- Адміністрацыя Аб'яднаных Нацый для Дапамогі й Адбудовы. Усе асобы, што карысталіся дапамогай ЮНРРА, называліся displaced persons -- ДП (даслоўна: перамешчаныя асобы).

вухі і з тылу хвосьцік. Але Грукацень так зацікавіўся ім, што немка аж спалохалася, ці ня крыецца тут нешта-нейкае? Вохра кажа:

-- Кінь гэтага псюка! Пойдзем лепш пагрэемся півам!

А Грукацень стаіць над псючкам ды ўсё гаворыць яму ўсялякія прыемнасьці:

-- Псючак, які ты прыгожы! А хвосьцік, а вушкі!.. Пупсік, Мопсік, Гопсік!.. Не, ён па-нашаму не разумее. Wie heisst du?[1]

І адламаў ражок сэрца і даў яму пасмакаваць. Калі адышліся, Грукацень зьвярнуўся да мяне:

-- Як я пакахаў гэтых істотаў! Сам не падайзраваў, што ў маім сэрцы гэтулькі пяшчоты... Псюкі самыя шляхетныя з жывёлаў, што жывуць на зямлі! Сярод іх лепей, чым сярод людзей...

І яшчэ раз азірнуўся.

-- Ах, каб я ведаў, дзе кватэра гэтага псюка, яшчэ раз схадзіў-бы...

У другі раз, праўда, гэта ўжо было не на кірмашы, ён мяне зноў зьдзівіў сваёй пяшчотай да гэтых шляхетных істотаў. Я спаткаў Грукаценя ў Ратыбоне. І зноў-жа паненка йшла нам насустрач з псюкам на ланцужку. Я навет зьдзівіўся, чаму на ланцужку, калі яго можна было засунуць у тую невялічкую торбачку, што яна трымала ў руцэ. Грукацень так зацікавіўся, што аж разьзявіў рот. А калі паненка мінула, не ўцярпеў і пабег за псюкам, не разьвітаўшыся са мною.

-- Пупсік, Мопсік... Wie heisst du?

Але тое, што адбылося ўрэшце, я навет ня мог прадбачыць. А прадбачыў я шмат! Чацьвёртага верасьня трыццаць дзявятага году я прадбачыў вайну, і яна пачалася першага. Я ехаў Eilzug'ам[2]. На аднэй астаноўцы ў вагон увайшоў баварац з двума псюкамі на рукох, захінутых шалікам. Каля мяне было адно мейсца, але баварац прайшоў міма. Я быў задаволены, бо ня люблю таварыства псюкаў... І якраз не пашанцавала: баварац з псюкамі вярнуўся й сеў на тое мейсца, што было каля мяне. То ня быў баварац. То быў Грукацень. І псюкі, якіх ён трымаў, наколькі я ня мылюся, былі тыя самыя, якіх мы калісьці спаткалі. З далікатнасьці прыйшлося

---

[1] Як цябе зваць?

[2] Хуткі цягнік.

павіншаваць яго з купляй, бо мне-ж было ведама, якая пяшчота ў сэрцы майго знаёмага да гэтых істотаў. Але Грукацень быццам сем начэй ня спаў і толькі штосьці прабурчэў у адказ. Мне вельмі хацелася запытаць, ці шмат заплаціў ён за псюкаў, бо я ўжо чуў, што адзін такі псюк каштуе да двух тысяч даляраў (і гэта мяне вельмі зьдзівіла!). Але Грукацень сядзеў і гладзіў сваіх псюкаў з такой пяшчотай, што я наважыў не перапыняць яго ў гэтым. І раптам праз некаторы час зьявіліся два паліцаі. Убачыўшы псюкаў, яны адразу-ж затрымаліся, нібы зачараваныя, і адзін зь іх паказаў на Грукаценя пальцам:

-- Das ist er![1]

-- Komm! Komm![2] -- загадаў другі сувора.

І павялі Грукаценя.

Тады я зразумеў сабачы інтэрас, які раптам ахапіў майго знаёмага. Ён краў пародзістых сабачак і збываў іх у іншым мейсцы. І гэты заробак -- для такіх асоб, як Грукацень, бо заместа праўдзівага ў іх пернікавае сэрца...

1949

Першыя цаглінкі

Калі Кастусь увайшоў у двор, Сымон стругаў абручы ў прыклетніку. «Майструе баця, як заўсёды, -- з прыемнасьцю падумаў Кастусь. -- Гэта добра!» І ўспомніў, як, бывала, езьдзіў зь ім на кірмашы прадаваць ягоныя вырабы: розныя бачонкі, цабэркі, даёнкі, біклажкі і іншае. «Дасьціпны баця! Усё гарыць у ягоных рукох!» -- з гонарам падумаў зноў.

---

[1] Гэта ён.

[2] Ідзі! Ідзі!

Сымон адарваў вочы ад стругу, які гладка й лёгка рэзаў мяккую ляшчыну, і зірнуў на ўвайшоўшага, быццам-бы на хвілінку задумаўся, а потым з выразным незадавальненьнем спытаў:

-- Вам што, таварыш, патрэбна?

Кастусь усьміхнуўся, падумаўшы, што бацька хоча зрабіць зь ім жарт, і нічога не адказаў. Сымон павярнуў ляшчыну да сябе другім канцом, зацісnуў яе зноў у варштаце й нарыхтаваўся стругаць яе далей. Кастусь падышоў і ўзяў струг зь ягоных рук.

-- Баця, не пазнаеш мяне ці што?

Сымон падняў на яго вочы, павёў па ягоным схудалым твары, па вайсковай памятай і даўно ня мытай кашулі, па заношаных штанох і ботах у дзюрах, і твар ягоны раптам скрывіўся і зморшчыўся ў канвульсыях непаўстрыманага болю. Зьлез з варштат і памалу, угнуўшы галаву, пакульгаў у хату. Узышоў на ганак і тады абярнуўся да сына й зноў павёў вачыма па ягонай схудалай постаці. Сьляза выкацілася зь ягоных вачэй -- ён хуценька змахнуў яе рукавом насову. Паціху сказаў:

-- Ну, дык што-ж цяперака?! Хадзі ўжо ў хату!

Кастусь таксама адчуваў сябе нядобра й прыгнебенай, няёмкай постацьцю ўзьняўся на ганак і ўвайшоў усьлед за бацькам у хату.

-- Яшчэ аднаго вядзеш? -- вымавіла Параска. -- Няма чым частаваць!

Сымон ненатуральна -- зь нейкім нутраным болем -- зарагатаў.

-- Ты азірніся найперш уважлівей, зь кім маеш дачыненьне! -- сказаў.

-- Зь кім!? Шмат іх тутака швэндаецца -- і зялёных і чырвоных, усіх не начастуешся, каб навет маёнтак мелі!..

Раптам скоса зірнула на незнаёмага і потым усё болей і болей пачала ўзірацца ў Касьцюковыя вочы, і тады чапяла вырвалася зь ейных рук і бразнулася аб падлогу.

-- Маманька! -- выкрыкнула, хапіўшыся за сэрца Параска. -- Ой, маманька! -- і закружылася па хаце, як падстрэлены птах. -- Сыночак мой, як з таго сьвету, -- косьці ды скура.

Патэльня зь недапечаным блінам засталася стаяць на прыпечку.

-- Мама! На паўдарозе да таго сьвету, праўда, быў! -- прамовіў Кастусь, кіруючыся да маці, каб прывітацца па-сыноўску. -- Два! -- узьняў угару два пальцы. -- Два дужа цяжкія тыфусы звалілі мяне -- ледзь-ледзь выжыў!

Сеў на лаўку, быццам згубіўшы сілы.

-- От, нам і казалі, што ты памёр нейдзе там у шпіталі...

-- Хто казаў?

-- Нупрэй Міхалкаў.

-- Нупрэй!? О, праўда, спаткаў я ў сьпісе хворых ягонае прозьвішча, але паколькі рухацца ня мог, перадаў яму пісульку, а потым із мной пачаўся крызыс такі цяжкі, што мяне ўжо клалі на насілкі, каб аднесьці ў морг. На гэтым наша спатканьне й скончылася...

Сымон, як і да гэтага часу, стаяў нярухома, як прышыты да падлогі, і глядзеў на сына.

-- От, Нупрэй і падумаў, што ты пайшоў на той сьвет, -- крыўдзіцца на яго нязавашта... -- адазваўся ўрэшце.

Пацалаваўшы маці й бацьку ў шчаку, Кастусь швырнуў свой пусты ранец пад лаўку.

-- Ну, а як вы? Надакучаюць вам, чую, цяпер розныя чужыя людзі?

-- І не кажы, Костка! Кожны дзень па колькі чалавек! Дый ня хочуць, каб абы чаго! Дай ім сала, шынкі!.. Яечню сьпячы!.. Дзе-ж можа набрацца наш гаспадар усяго гэтага?!

-- Гэта ўсё надабіткі ад таго войска, што было дайшло аж да Варшавы, -- заўважыў Сымон. -- Цяпер блукаюць тутака, па вёсках ды лясох, абы не патрапіць ім зноў у рукі, бо папхнуць назад пад кулі ды шрапнэлі... Няма за што і ім ваяваць...

-- Так! Перакруцілася ўсё ўверх дном! -- прамовіў у задуме Кастусь. -- Потым, крыху пачакаўшы: -- Ну, а нашы як? Я спаткаўся ў Смаленску з адным нашым вельмі выдатным чалавекам, ён казаў, што ўсе паўцякалі ў лес ад мабілізацыі...

-- З нашага Гарадца -- усе да аднаго! Толькі ты ды Нупрэй!

Зноў задумаўся Кастусь.

-- Што -- я? Я ня быў тутака! Дый наагул із мной іншая справа: нас усіх, апроч прафэсуры, з унівэрсітэту ўзялі бараніць савецкую ўладу...

Узьняўся і зачэрпнуў кубак вады. Зноў сеў на сваё мейсца.

-- Ну, а Нупрэя злавілі на кірмашы ў Высокім і пагналі адразу пад кулі, не навучыўшы навет страляць...

Кастусю было няпрыемна слухаць гэта -- узьнікалі розныя прыкрыя думкі.

-- А ведаеца што? Як кажуць людзі: ня бывае дабра бяз зла! Было-б куды горш для нас, каб нашы не збайкатавалі мабілізацыю: Варшаву тады маглі-б узяць, і, зразумела, ня было-б ніякай гутаркі пра Беларусь! А так цяпер можа будзем мець незалежнасьць... -- урэшце заўважыў.

-- Якраз так табе і паднясуць гэтую незалежнасьць на залатой талерцы! -- запярэчыў Сымон. -- Яны хлусьлівыя, тыя чырвоныя... Такія хлусьлівыя, што ў іх на адным тыдні пяць пятніц! Яшчэ не аддаўна пануюць, а ўжо выказаліся горш за жандараў царскіх... Кажаш -- незалежнасьць! Як ім прыпячэць, як пад Варшавай, дык яны табе тады ўсё будуць абяцаць, бо ці гэта-ж адпаведныя людзі? Рабуюць народ дый ўсё!

-- Хаця ў палітыцы я ня спэц і ня люблю яе, хочу заняцца навукай, бо навука цяпер будзе рухаць жыцьцё, а не палітыка, але раней мне здавалася, што яны стаяць за народ, і гэта мне падабалася.

Параска паставіла на стол гарачанькія смачныя блінчыкі.

-- Ну, дык, сынок, падмацуйся пакуль што гэтым! А хутка будзе й вячэра.

Як сьцямнела, пачалі ісьці праведаць Кастуся бліжэйшыя суседзі. Кожны прыходзіў да яго з працягнутай рукой і казаў:

-- Як маешся, Костка?

-- А от, як бачыш.

-- Завітаў усё-ткі да бацькі? Дый ня дзіва: пяць год ня было ні слыху ні дыху...

-- А тут пра цябе пайшлі чуткі, што ты ўжо «каюк»! -- заўважыў дзядзька Ляксей, якому ўжо мінула далёка за восемдзесят, як ён казаў.

Кастусь усьміхнуўся.

-- Каюк! Татарскае слова, але трапнае: каюк! -- і ўсё тут табе! Коратка і ясна! Як умее наш народ выбіраць добрыя словы зь іншых моваў!

-- Ты кажаш -- татарскае, а як яно трапіла да нас? -- цікавіўся Ляксей.

-- Як трапіла? Шмат дарог было: праз расейскую мову, праз войны: нашы князі бралі ў палон татараў і садзілі іх на вольных землях, а здатнейшым навет і чыны давалі...

-- А хто мы? -- зноў паставіў пытаньне дзядзька Ляксей.

-- Хто мы? Раней мы былі -- Літва! А цяперака...

-- А цяперака нам прыдумалі новую мянушку -- Бела-русь...

-- Хоць гаршчком назаві, абы ў печ не садзіў, -- заўважыў нехта.

-- Ну, гэта й так і ня так! Ад таго, як нас назваць, шмат чаго залежыць. Калі белыя русы, значыць, усё-ткі русы, і тады ня рыпайся! Але-ж гэта няпраўда, што мы русы! Літвінамі мы былі, Літвой, кажу, дый Вялікай Літвой, а ня той, што можна пераплюнуць! Была яна яшчэ за памяццю майго бацькі! -- з націскам пацьвердзіў дзядзька Ляксей. -- А калі гэтак, дык і гэць ад нас: мы самі з вусамі! От тамака, у нашай Літні, -- ты, пэўне, яшчэ не забыўся -- руду цягаў з балота і я, каб ліць гарматы для твайго цёзкі, Кастусь, каб сказаць ім гэтае самае -- гэць! Але тады нам былі паны на перашкодзе...

Кастусь заўважыў:

-- Праўда! У бібліятэцы Пецярбурскага ўнівэрсітэту я натрапіў быў на некаторыя матар'ялы аб 1863 годзе, дзе ёсьць успамінак, што паўстанцы Кастуся Каліноўскага ўрахумілі закінутыя дзьве літні, у якіх выраблялася зброя для іх: адна ў балоціста-лясістай мясцовасьці на поўдзень ад Менску, гэта, мабыць, наша, а другая нейдзе каля Тэльшына ці Цэльшына, на поўнач, здаецца, ад Горадні...

Умяшаўся Нупрэй (ён таксама прыйшоў праведаць Кастуся, хоць і пусьціў пра яго непажаданую чутку, не наўмысна, пэўне).

-- А палякі з нас сьмяюцца:

Ад веку мы спалі, і нас пабудзілі,
І ў «тылэк» нам далі, і зноў палажылі...

Дзядзька Ляксей зморшчыўся.

-- Хай сьмяюцца! Але сьмяецца той, хто сьмяецца апошнім. Мы ім больш, чым яны нам, давалі ў «тылэк»! Яны навет каралёў ад нас пазычалі...

-- От, дзядзька Ляксей, трэба вас паклікаць на нашага прэзыдэнта, а то вылез тамака нейкі чарвяк! -- заўважыла цётка Аўдоля.

Па хаце пакаціўся рогат.

-- Ну, дык вось, -- зноў пачаў дзядзька Ляксей, -- дойдзе да таго, што зноў будзе Літва -- мусіць дайсьці! Толькі гэта ўжо не за маёй памяццю будзе. Але ці мала людзей паляжа, пакуль павытураць гэтых трутняў, што тамака заселі і няволяць іншыя народы. От-жа,

мне было ўжо гадоў за дваццаць, як і ў школах, і ў гмінах, і ў судох -- усюды нашая мова была! А за цароў палічылі гэта за злачынства і ў вязьніцу запіралі... Хіба-ж гэта ня трутні?!

-- Дзядзька, -- умяшаўся Кастусь, -- прыйдзе зноў наш час: бачыце, трутняў-цароў выкінулі ўжо...

-- Цароў выкінулі, але ўжо іншыя прымашчваюцца тамака, і, можа, яны будуць горшыя за цароў?!

-- То праўда, дзядзька Ляксей. Ужо відаць, што горшыя. От, дай ім гэтую самую «разьвёрстку», патомака накармі маскаля, якога паставілі табе ў хату, дай фурманку, адбудзь цягла, заплаці падатак, а патомака можа такое прыдумаць, што й жыць не захочаш! -- уставіла Аўдоля.

-- Ну, вось, -- зьвярнуўся Ляксей да Кастуся, -- а ты, відаць, за іх шмат крыві папсаваў!?

-- Было! -- прачулена прамовіў Кастусь. -- Але, падумаўшы лепей, каб гэтага ня было, дык-бы й Беларусі ня было, -- запярэчыў.

-- Ня ты яе зрабіў сваёй крывёй, а тыя, хто пайшоў у лес, заместа іхнага войска...

Кастусь маўчаў. Умяшаўся зноў Нупрэй:

-- А яны ўсюды кажуць, што ня было ў нас свае дзяржавы й чужыя князі панавалі над намі.

Дзядзька Ляксей усьміхнуўся:

-- Няма чым ваўку «а-а-а» рабіць, дык ён хоць лыкам! Хай навука сваё слова скажа! Што яны яе сфальшавалі і ўсё пазаблыталі, дык думаюць, на гэтым і канец будзе? Маладыя сілы нашы дойдуць да праўды й скажуць: была й будзе! Князі над намі нашыя былі! Паперы пісалі на нашай мове! Гаварылі паміж сабой таксама на нашай! Мова была адна -- і наша і іхная! Там, за Літвой нейдзе, былі прусы, дык гэта ўжо іншае!..

Было ўжо пад поўнач -- час ісьці ў ложак. Кастусь заўважыў:

-- Добра пагаманілі сёньня! Гэтакія гамонкі -- першыя цаглінкі на новы падмурак для нашае Бацькаўшчыны, каб яна стала сапраўды вольнай!

-- І яны йдуць ад краю да краю, гэтыя гамонкі, -- пацьвердзіў дзядзька Ляксей, бяручы шапку. -- Тое, што моладзь уцякала ў лес ад чырвонае мабілізацыі, ты думаеш, само адбывалася: голас народу -- голас Божы!

-- Так! Vox populi -- vox dei! -- прадэклямаваў Кастусь.

159

Юрка Віцьбіч

Бадай, ніхто з тут прысутных ня ведаў яго так добра, як я. Амаль на працягу сарака год мы часта сустракаліся, хоць і розныя былі па характару й жылі ў розных местах. Ён быў таксама далёка адпіхнуты ад добраў, якія прызначаліся пісьменьнікам, і не належаў да так званае «абоймы» актывістых, таксама, як і я. Нас міналі пуцёўкі на курорты й дамы адпачынку. Ён туліўся зь сям'ёй у адным пакойчыку ў аколіцах Віцебску, бяз усякіх выгад. У маім мяшканьні, таксама з аднаго пакою ў ваколіцах Менску, ня было навет электрыкі.

Юрку Віцьбічу не ўдалося атрымаць нармальным парадкам асьветы празь гімназыю ці іншую школу сярэдняй ступені ў свае юнацкія гады. Нарадзіўся ў 1905 годзе, яму было толькі год пятнаццаць, калі гімназыі і іншыя сярэднія школы былі зачыненыя. Я быў заўсёды зьдзіўлены ягонымі здольнасьцямі і ягоным талентам і, адведаўшы яго як сябра пасьля вайны ў Рэгэсбургу, у сяброўскай гутарцы запытаў:

-- Якую вы маеце асьвету?

Юрка з характэрнай стрыманай усьмешкай адказаў:

-- Нейкіх пару год школьнай навукі...

-- Але-ж паводле таго, што і як вы робіце, можна меркаваць, што вы маеце ладныя веды?

-- Самаадукацыя, галоўным чынам, пры дапамозе бацькі; ён меў асьвету духоўнай сэмінарыі й працаваў дзякам у аднэй зь Велізкіх цэркваў. Зразумела, гэтага мала было, каб стаць пісьменьнікам, а гэтую мару я насіў ад юнацкіх год. І потым, як усё супакоілася і больш-менш увайшло ў норму, я выехаў у Маскву, каб працягваць асьвету. Але там мне не пашанцавала: Масква -- гэта куток расейскага вялікадзяржаўнага шавінізму з даўніх часоў, яшчэ ад Аксакава. Я вярнуўся на Бацькаўшчыну й два гады студыяваў у адным з тэхнікумаў...

Трымаю ў рукох «Беларуса» і гляджу на партрэт Юркі: вусны сьціснуты, шэрыя вочы ўдумліва глядзяць некуды ўдалячынь -- зачараваны Бацькаўшчынай, як у сьне бача ейныя пахкія палі й пушчы, ейныя сьветлыя рэкі, ейныя ўзгоркі...

Трэба любіць Бацькаўшчыну ўсёй глыбінёй сэрца, трэба хварэць ейнай сучаснай няволяй, у якой яна ўжо больш за дзьве сотні год, каб стварыць такія бліскучыя дыямэнты, нягледзячы на жыцьцёвыя цяжары выгнанца, якія ён пакінуў пасьля сваёй сьмерці...

Успамінаецца адзін мамэнт. Нейдзе там, у верхавіне блакітнага Дунаю, у той паэтычнай Швабіі, паміж Зігмарыгэнам і Заўльгаў, мы ідзем шукаць Арбайтзамт, каб стаць на працу й атрымаць харчовыя карткі. Шырокім крокам уперадзе ідзе Юрка, я -- за ім, а за намі -- нашы сем'і. Люты 1945. Ляжыць яшчэ сьнег. Далей на паўдзённы захад грукочуць гарматы...

Я гляджу пад ногі Юркі й заўважаю ягоныя зырка пачырванелыя пальцы ног. Спыняю яго й зьвяртаю ўвагу.

-- А вы ведаеце, слухаю кананаду й думаю: от, скончыцца вайна, і паўстане наша родная Беларусь вольнай і незалежнай, каб у ёй было й жыць і працаваць вольна, а пра холад у ногі навет і забыўся.

-- Але-ж сьцюжа, прастудзіцца можна!

-- Сьцюжа, але дзе ўзяць новыя чаравікі ці хоць-бы наладзіць гэтыя? -- Потым, пачакаўшы: -- Што тады з намі будзе, калі сапраўды паўстане вольная Маці-Беларусь, -- мы звар'юем ад радасьці!

-- Не, браток, вар'яваць нам ня трэба -- лепей праўдзіва перадаць той пафас, зь якім мы вялі змаганьне, каб новае пакаленьне ведала, як прадоўжыць яго ў выпадку новай небясьпекі...

І вось здарылася! Адышоў ад нас натхнёны рамантык волі, выдатны беларус-энцыкляпэдыста, патрыёта й першарадны нарысісты-пісьменьнік!

-- Сьпі, сябра! Прыйдзе час, і твае мары аб вольнай, незалежнай і шчасьлівай Беларусі спраўдзяцца.

Летапісная Нямізa і ейнае мейсца на мапе

.. Неміз« крываві брез« не бологом,
бяхуть пос«яні' пос«яні костьмі
рускіх, сынов,[[[
Слово о пл,ку Ігорев«

Трэцяга сакавіка ў наступным годзе споўніцца дзевяцьсот год з дня бойкі на рэчцы Нямізе паміж кіеўскімі князямі Яраславічамі, братамі Ізяславам, Сьвятаславам і Ўсеваладам, з аднаго боку, і Ўсяславам, князем полацкім, з другога. Гэтае даты мы ня можам забываць, бо ёю адчыняецца пэрыяд збройнага змаганьня нашых прашчураў за сваю палітычную незалежнасьць. Варажнеча паміж кіеўскімі князямі Яраславічамі й полацкамі Ізяславічамі (Усяслаў быў унукам Ізяслава) пачалася на 87 год раней (у 980 г.) пабоішча на Нямізе. Полацкай дзяржавай у той час кіраваў Рогвалад. Ён не належаў, паводле старажытных дакумэнтаў, да роду Рурыкавічаў: «Б« бо Рог,волод, пришёл, и-заморья, имяше власть свою в Полотьск,»[1], і не ўзнаваў за сабой ніякага зьверхніцтва кіеўска-наўгародскіх князёў.

У 980 годзе Уладзімер Сьвятаславіч падступна напаў на Полацак, забіў князя Рогвалада і ягоных двух сыноў, а ганарыстую Рагнеду (дачку Рогвалада), якая яму адмовіла ў шлюбе, гвалтам забраў із сабой у Кіеў за жонку.[2]

На працягу сямі год Полацак плаціў даніну Кіеву. У 987 годзе Ўладзімер перадаў полацкі пасад свайму сыну ад Рагнеды -- Ізяславу. У Полацак, відавочна, вярнулася й сама Рагнеда. Кіеўскі-ж пасад, пасьля некаторых варыяцыяў, дастаўся аднаму з адзінаццацёх сыноў Уладзімера ад іншых жонак -- Яраславу.

Князь Ізяслаў пачаў ходаньне за канчатковае вызваленьне бацькаўшчыны сваёй пагвалчанай маці з-пад улады Кіева. Барацьба

---

[1] З «Повести временных лет». Цытуецца тут, як і ўсюды далей, паводле збору твораў і матар'ялаў «Беларусь у эпоху феадалізма», том 1, Мінск, 1959, б. 37.

[1] З «Повести временных лет». Цытуецца тут, як і ўсюды далей, паводле збору твораў і матар'ялаў «Беларусь у эпоху феадалізма», том 1, Мінск, 1959, б. 37.

цягнулася зь пераменным посьпехам на працягу шмат год, пакуль на полацкі пасад ня стаў унук Ізяслава, князь Усяслаў. Ён адхіліў усякія прэтэнзіі Кіева да Полацкае дзяржавы.

У 1067 годзе Яраславічы напалі на парубежны горад Полацкае дзяржавы Менск. Летапіс апісвае гэтую падзею наступным чынам: «*Ярославічі же тріе[[[взяша М«неск,' і іс«коша муж«' а жены і д«ті вдаша на эіты' і поідоша к Неміз« і Всеслав, поіде противу[І совокупішася обоі на Неміз«' м«сяца марта в, 3 день' і бяше сьн«г, велік,' і поідоша противу соб«[І бысть с«ча зла' і мнозі падоша' і одол«ша Ізяслав,' Святослав,' Всеволод,' Всеслав, же б«жа*».[1]

Як бачым, летапіс дакладна адзначае падзеі ў Менску, але аб далейшым, што адбылося пасьля ўзяцьця й зруйнаваньня Менску, абмяжоўваецца толькі зазначэньнем «*поідоша к Неміз«[[[і совокупішася обоі на Неміз«*», не паказваючы, пра якую Нямізу йдзе гутарка й дзе гэтая Няміза знаходзілася.

З часоў расейскіх гісторыкаў Карамзіна й Таціщава робяцца розныя здагадкі аб мейсцы знаходжаньня гэтае Нямізы і ці гэта населены пункт ці рэчка, бо ў першым выпадку гаворыцца «*поідоша к Неміз«*», значыць, можна думаць, да насельнага пункту, а ў другім «*і совокупішася обоі на Неміз«*», пэўна-ж, на рэчцы, а не на насельным пункце.

Няміга, невялікая рачулка, цяпер узятая ў бэтонныя руры, працякае цераз Менск і ўпадае ў Сьвіслач у найбольш старажытным цэнтры гэтага гораду, у так званым «Старым Месьце». Але-ж у летапісе гаворыцца «*поідоша к Неміз«' і Всеслав, поіде противу*», значыць, летапісец меў на ўвазе нейкае аддаленае ад Менску мейсца або рэчку, бо ў іншым выпадку ня трэба было-б гаварыць «*поідоша к Неміз«*», паколькі заняўшы Менск, Яраславічы ўжо былі на Нямізе. Апрача таго, і ў летапісе і ў «Слове аб палку Ігаравым» называецца «Неміза», а не Няміга. У «Слове...»:

---

[1] **Тамсама.**

«*Неміз« крованві брез« не бологом,* (дабром -- М. Ц.) *бяхуть пос«яні' пос«яні костьмі рускіх, сынов,[[[*», у летапісе «*поідоша к Неміз«*». Праўда, розьніца гэтая ў вымаўленьні назову сучаснай менскуй рачулкі Нямігі й назову летапіснай Нямізы, як гэта зазначыў беларускі гісторык В. Тарасенка[1], можа тлумачыцца асаблівасьцю беларускай мовы : *Няміга, Нямізе* (мясцовы склон), нага-назе, вада-вадзе... Але-ж ні «Слова аб палку Ігаравым», ні летапіс «Аповесьць былых часоў» не пісаны беларускай мовай.

Як відаць, летапісец меў на ўвазе нейкую іншую Нямізу, а ня менскую, і пад гэтым самым назовам -- насельны пункт.

Апрача Таціщава й Карамзіна, на цёмныя мейсцы летапісу зьвярнулі ўвагу й некаторыя пазьнейшыя ды сучасныя расейскія й беларускія гісторыкі. Некаторыя зь іх атаясамлівалі летапісную Нямігу зь Нёманам, іншыя шукалі яе на поўнач ад Менску. Выстаўляліся меркаваньні, што напад Яраславічаў на Менск застаў Усяслава пад Ноўгарадам: атрымаўшы весткі аб нападзе, ён мог вярнуцца ў Полацак для папаўненьня дружыны, і таму бойка зь Яраславічамі магла адбыцца толькі на поўначы. Гэтая тэорыя вельмі падабалася беларускім гісторыкам дваццатых гадоў.

Што датычыць В. Тарасенкі, на працах якога мы галоўным чынам і спыняем сваю ўвагу, паколькі ён праводзіў раскопкі на Замчышчы ў Менску, дык ён трымаецца іншай тэорыі. На ягоную думку, выраз у летапісе «*поідоша к Неміз«*» ў дачыненьні да Яраславічаў пасьля таго, як яны занялі Менск, «можа тлумачыцца зусім не як рух да ўтокі гэтае рэчкі, а як пераход да сярэдняга й верхняга ейнага цячэньня, на адлегласьці 2-3 км ад горада» Менску[2]. Такі аргумэнт ня можа быць прыняты навукай, бо Яраславічы, і заняўшы Менск і рухаючыся да верхавіны Нямігі ў вадлегасьці 2-3 км ад Менску, як мяркуе В. Тарасенка, усё роўна знаходзіліся на Нямізе, і летапісцу ня было патрэбы ў дадатковых тлумачэньнях.

---

[1] В. Тарасенка. Старажытны Менск. -- Матэрыялы па археалогіі БССР, Мінск 1957, б. 184.

[2] В. Тарасенка. Старажытны Менск, б. 188.

Гісторык акадэмік А. Ясінскі ў сваёй працы, зараз згубленай[1], наадварот, знаходзіць, што старажытны Менск спачатку ўзьнік на р. Менка, нейдзе кілямэтраў за пятнаццаць на паўдзённы захад ад сучаснага Менску, каля сучаснай вёскі Гарадзішча Менскуга раёну, дзе аж дагэтуль захавалася вялікае гарадзішча раньне-фэадальнай эпохі (XII-XIII ст.). Некаторым гісторыкам і архэалёгам гіпотэза гэтая здавалася праўдападобнай, тым больш, што да другой сусьветнай вайны ўсе спробы архэалёгіі знайсьці рэчавы доказ існаваньня цэнтру старажытнага Менску ў раёне ўпадзеньня Нямігі ў Сьвіслач не давалі вынікаў.

Урэшце летапісны тэкст не дае ніякіх зьвестак, адкуль прыйшоў да Нямізы, дзе адбылася бойка, Усяслаў. У «Слове аб палку Ігаравым» сказана толькі: *˘[скочі вл,ком, до Немігі с, Дудуток,*»[2]. Гісторыкамі налічана некалькі селішчаў, падобных па караню з Дудуткамі: Дуды на поўнач ад Новагорадні, Дудзічы на рэчцы Пціч, недалёка ад Менску, Дуды ў вабсягу сярэдняга цячэньня Бярозы (прытокі Нёмна) і, урэшце, Дудуткі на абшары РСФСР, каля Ноўгараду, дзе ў свой час быў кляштар, што называўся «на Дудутках».

Улічваючы ход падзей, гісторык К. Кудрашоў мяркуе, што пасьля захопу Ноўгараду (1066) Усяслаў павінен быў ісьці да Нямігі з Дудуткаў каля Ноўгараду[3]. І таму, паводле лёгікі, летапісную Нямігу трэба шукаць на поўначы ад Менску[4].

Шукаць яе там трэба ня толькі па гэтых меркаваньнях, але й па іншых. Апрача Менску, на паўдзённых подступах Полацкае дзяржавы зь ведамых нам гарадоў былі ўмацаваныя: *Друцак, Ворша і, мабыць, Копысь.*[5] Праўда, гарады гэтыя знаходзяцца на паўночным усходзе ад Менску, а не на поўначы, але гэта якраз, насуперак меркаваньням К. Кудрашова, адпавядае ходу падзеяў, як

---

[1] В. Тарасенка. Старажытны Менск, б. 186. *Заўвага:* Раскопкі 1945-1949 гг., праведзеныя сэкцыяй археалёгіі БАН, пацьвердзілі існаваньне старажытнага Менску (10-11 ст.) тыпу заходне-эўрапейскіх гарадоў.

[2] Цытуецца па «Хрестоматии древней русской литаратуры». Москва, 1962, б. 68.

[3] К. Кудрашоў. Палавецкі стэп, б. 79.

[4] К. Кудрашоў. Палавецкі стэп, б. 80.

[5] В. Тарасенка. Да гісторыі Мінска на падставе археалагічных раскопак мінскага замчышча. «Весці АН БССР», 6, 1948, б. 38.

іх паказвае летапіс пасьля пабоішча на Нямізе: «*По семь же’ м˘сяца іуля в, 10 день’ Ізяслав,’ Святослав, і Всеволод,’ ц˘ловавше крест, честный к, Всеславу’ рекше ему% ЖПріді к нам,’ яко не створім, ті злаЖ[Он же’ над˘яв,ся ц˘лованью креста’ пере˘ха в лодьі черес, Дн˘пр,[Ізяславу же в шатер пред,ідуэю’ і тако яша Всеслава на Рші у Смоліньска’ преступівше крест,’ Ізяслав, же прівед, Всеслава Кыеву’ всаді і в поруб, с, дв˘ма сынома*®[1].

Ёсьць зусім верагодным, што рэчка Няміга ці Няміза, памянёная ў летапісе і ў «Слове аб палку Ігаравым», ня мае нічога супольнага зь невялікай рэчкай, у істоце ручаінай, працякаючай цераз Менск і носячай гэты назоў. Некаторыя гісторыкі выказвалі думку, што ў летапісныя часы ўсякая малая рэчка бяз собскага ймя называлася Нямізай.

В. Тарасенка прыводзіць факт[2], што ўжо ўспамінаны намі гісторык акадэмік А. Ясінскі ў сваёй згубленай працы, спасылаючыся на «Уваскрасенскі летапіс», упамінаў горад Нямізу, які некалі знаходзіўся паміж Воршаю а Друцкам. Што такі горад існаваў, сьцьвярджае і сьпіс старажытных беларускіх гарадоў, зьмешчаны ў зборы дакумэнтаў і матар’ялаў «Беларусь у эпоху феадалізму». Пасьля пералічэньня гарадоў «польскых» і «кіевскых» у ім падаецца: *˘[[[А се літовскыі% Случеск’ Городец на Немне’ Мереч’ Клеческ’ Кернов’ Ковно’ Вілкомірье’ Мойшогола’ Вільно’ Трокы’ Крев’ Лошеск’ Галшаны’ Березуеск’ Друтеск’ Неміза’ Орша*» і інш.[3]

Праўда, у Прыдруцьці, каля мястэчка Эсмоны (па мясцоваму Есьміна), у паўдзённа-ўсходняй частцы былога Барысаўскага

---

[1] Беларусь у эпоху феадалізму, т1, б. 37.

[2] В. Тарасенка. Старажытны Менск, б. 189. Заўвага В. Тарасенкі: «Рэзюмэ рукапісу працы акадэміка А. Н. Ясінскага «Менск -- Няміга -- Дудуткі», зробленае К. Палікарповічам у 1937 г. Рукапіс захоўваўся ў Інстытуце гісторыі АН БССР і загінуў у часе нямецка-фашыстоўскай акупацыі 1941-1944 гг.»

[3] Беларусь у эпоху феадалізму, том 1, б. 112.

павету, б. Менскуй губэрні (цяпер Магілёўская вобласьць), захаваліся сьляды нейкага старажытнага гораду. Мястэчка гэта стаіць на прытоцы Друці, кілямэтраў за дваццаць ад Друцку і за сорак ад Воршы. Прытока гэтая паказаная толькі на самых падрабязных мапах, часам без назову, часам пад назовам *Усяслаўка*. Але ў народзе гэтую рачулку, між іншага, значна большую за менскую Нямігу, называюць *Услаўка*, заместа *Ўсяслаўка*, а некаторыя з старэйшага пакаленьня -- *Няміза*. На пытаньне, чаму Няміза, звычайна адказваюць: *ня мы знаем*.

Берагі гэтае рэчкі вельмі тванкія, на іх і сапраўды могуць «топнуць коні»... Правы бераг Усяслаўкі-Нямізы высокі й пясчысты, цалком заняты каля мястэчка на працягу амаль двух кілямэтраў масывам «капцоў» (курганоў). Яшчэ перад першай сусьветнай вайной іх было каля двух сот. Некаторыя зь іх маюць форму падоўжаных і досыць ёмістыя й высокія. Другія круглыя, гэтыя -- меншыя, усяго мэтраў пяць-шэсьць у дыямэтры. Яны пазарасталі багуном і сасьняком...

У народзе гэтай мясцовасьці да гэтага часу ходзіць легенда, што менавіта тут разыгралася бітва паміж князем полацкіх крывічоў Усяславам і кіеўскімі князямі Яраславічамі. Гледзячы на гэты масыў капцоў, і праўда, успамінаецца із «Слова...»: «*Неміз˘ крованві брез˘ не бологом, бяхуть пос˘яні’ пос˘яні костьмі рускіх, сынов,[[[*»

З-пад гары б’е моцны струмень крыніцы із студзёнай, як лёд, вадой. Над ёй да трыццатых гадоў стаяла каплічка з абразом цудадзейнае Божае Маці. Трэцяга сакавіка да рэвалюцыі тут штогод адбываліся набажэнствы. У другі раз набажэнства адбывалася на сьвята Сьвятога Духа. Зьбіраўся народ памаліцца і ўзяць цудагойнай вады. Цікава, што й вёска, якая разьмясьцілася ва ўпадзіне па-за гарой, называецца *Услава* (па дакумэнтах -- Усяслава).

Найбольш узвышанае мейсца правага берагу Ўсяслаўкі, дзе стаяў да рэвалюцыі (і ў першыя гады пасьля яе) дом мясцовага сьвятара, называлася «Замкам». Яго абгінаў ручай, які браў пачатак нейдзе ў лесе за в. Услава. Тут былі відаць рэшткі земляных насыпаў і равоў.

У Прыдруцьці перасякаецца некалькі вялікіх старажытных шляхоў. Шлях Менск-Барысаў-Магілёў у 1915 годзе прыстасоўвалі

да вайсковых патрэбаў: яго папраўлялі, выраўноўвалі, там-сям выпрастоўвалі й пашыралі. У часе гэтых працаў некалькі капцоў над Усяслаўкай-Нямізай раскапалі. Апрача ваенных дасьпехаў і перапаленых касьцей людзей і коняў, у іх нічога не знайшлі.

Усе гэтыя весткі аўтар артыкулу сабраў, будучы ў трыццатых гадох навуковым працаўніком Беларускай Акадэміі Навук (Інстытут мовазнаўства й літаратуры). У 1936 ці ў 1937 г. паінфармаваў аб гэтым ведамага беларускага археалёга, кіраўніка сэкцыі археалёгіі пры Інтытуце гісторыі Беларускай АН К. Палікарповіча. Вайна й новая акупацыя Беларусі, відавочна, не дазволілі Інстытуту гісторыі давесьці гэтую справу да канца.

Застаецца зрабіць яшчэ колькі заўвагаў аб летапісных паведамленьнях аб выніках пабоішча на Нямізе. «Аповесьць былых часоў» сьцьвярджае: *ˇ[[[І совокупішася обоі на Неміˇ мˇсяца марта в, 3 день[[[і бысть сˇча зла’ і мнозі падоша’ і одолˇша Ізяслав,’ Святослав,’ Всеволод,’[Всеслав, же бˇжа*». Трэба прыняць пад увагу тое, што летапіс «Аповесьць былых часоў», хаця й найранейшы з усіх, дайшоўшых да нас дакумэнтаў старажытнасьці, складзены толькі ў пачатку XII стагодзьдзя, г. зн. праз сотню год амаль пасьля пабоішча. Лаўрэньцьеўскі-ж сьпіс гэтае аповесьці зьявіўся толькі ў 1337 годзе[1]. Пры гэтым, за аснову гэтых дакумэнтаў узяты матар’ял паданьняў, легендаў і іншых формаў, галоўным чынам, вуснай творчасьці.[2] Такім чынам, нельга надаваць летапісцу стопрацэнтавай вернасьці: кажны аўтар паданьня ці легенды, захоўваючы даты падзеяў, бясспрэчна, мог надаць гэтым падзеям іншы сэнс паводле сваіх сымпатыяў і антыпатыяў.

Хутчэй за ўсё на Нямізе былі пакананыя Яраславічы, а не Ўсяслаў. На гэтую думку наводзіць той факт, што толькі праз 129 дзён пасьля бойкі на Нямізе Яраславічы з-за Дняпра пачалі вабіць цалаваньнем крыжа ў свой лягер Усяслава: *ˇ[[[Пріді к нам,’ яко не створім, ті зла[*»[3] Дзе былі й што рабілі Яраславічы

---

[1] Хрестоматия древней русской литаратуры, б. 3.

[2] Тамсама.

[3] Беларусь у эпоху феадалізму, том 1, б. 37.

гэтых 129 дзён? Ці не чакалі яны папаўненьня сваіх дружынаў, выкінутыя Ўсяславам за Дняпро нечаканым ударам Усяслава: *˘[[[скочі вл,ком, до Немігі с, Дудуток,[[[*»[1]

Князь Усяслаў памёр у 1101 годзе, праз 34 гады пасьля нямізскай бітвы. Змаганьне паміж Яраславічамі й Ізяславічамі ягонай сьмерцяй ня спынілася. У XIII стагодзьдзі род Ізяславічаў выгас, і на арэну ўзышла новая дынастыя так званых літоўскіх князёў. Кіеўская Русь спыніла сваё існаваньне, утварыўшы новы цэнтр -- Суздальска-Маскоўскі.

Новым людзям Лёдзіку і Толю
прысьвячаю

[1] Слова аб палку Ігаравым.

КУРЫЛКА

(Запіскі вучня царкоўна-прыходскай школы)

«Азы й букі»

-- От, пачакай-жа! Пойдзеш у школу, абдзярэ табе вушы настаўнік.

Так звычайна палохалі мяне за якую-небудзь дурноту. Я тады рагатаў і адказваў:

-- А от і не абдзярэ. Я буду добра вучыцца.

А сам задумваўся, як-бы так зрабіць, каб у школу не хадзіць.

Калі мне споўнілася восем год, матка прыбрала мяне ў чыстую адзежу, падперазала паяском, абышла кругом, абцягнула сарочку і сказала:

-- Ну, мае дзетачкі, сёньня ты пойдзеш у школу.

Я ўспомніў пагрозы і павесіў, як гэта кажуць, нос. Бацька ўцягнуў у новыя лапці аборы і кінуў мне іх на зачынак.

-- Абувайся ды пойдзем!

Мы выйшлі на вуліцу. Чым бліжэй мы падыходзілі да школы, тым трывожней білася сэрца. Бацька па дарозе гаварыў:

-- Ты ня дурэй! Слухай настаўніка, добра вучыся. Выўчышся -- табе карысьць, бацьку дапамога. Пісьменны чалавек -- гэта ня то,

што... Вунь як жыве наш аб’ездчык! А якое пісьменства ў яго? Ня будзеш вучыцца -- дрэнна будзе: пан Курылін сярдзіты!

Панам Курыліным называлі настаўніка.

У школе ішлі ўжо заняткі. У цёмным калідоры, куды даносіўся з клясы голас Курыліна, бацька яшчэ раз папярэдзіў:

-- Глядзі-ж! Барані бог, настаўнік паскардзіцца... Як увойдзеш, не забудзь пакланіцца...

Бацька ўзяўся за клямку й нерашуча адчыніў дзьверы. Мы, як старцы, стаялі ля парога.

-- Добры дзень, пане настаўнік.

Я пакланіўся. Бацька таксама. Курылін ішоў нам насустрач.

-- Пане настаўнік, -- загаварыў бацька, гледзячы ў вочы настаўніку й камечачы шапку ў рукох, -- хлопца от у школу, значыцца...

Настаўнік моцна, па-ваеннаму, запытаў:

-- Колькі год?

-- Восем споўнілася... улетку.

Бацька пераступіў з нагі на нагу.

-- Значыцца, дзясятая нядзеля на дзявяты...

-- Чытаць можа?

-- Яно, сказаць, пане настаўнік, ня было дзе вучыцца... значыцца. Хоць сям’я і вялікая, а пісьменных, каб так добра, нікога...

-- Ну, добра, -- абарваў настаўнік і запытаў у мяне: -- Вучыцца хочаш?

Тады была традыцыя: пытацца ў вучня -- хоча ён вучыцца ці не? Я адказаў:

-- Хочу.

Настаўнік паказаў мне на вольнае мейсца ў першых радох партаў і адвярнуўся ад бацькі. Бацька часта кланяючыся, ламаючы шапку ў рукох, выйшаў із школы. Дзьверы зачыніліся. І, здавалася, разам з гэтым зачынілася ў мяне дыханне.

У першы дзень я пісаў палачкі ў касую лінейку. На дом настаўнік загадаў вывучыць першых дванаццаць літараў з такім разьлікам, каб заўтра, ураньні, я прачытаў іх перад класам.

На двары было сыра. У хаце цесна й цёмна. Я сядзеў з букваром ля комінка. Трашчэлі смольныя карчы. Дзядзька Саўка, малодшы брат бацькі, паказваў мне, бо бацька быў зусім няпісьменны.

-- Аз, -- гаварыў ён.

Я паўтараў.

-- Аз.

-- Букі.

-- Букі.

-- Ведзі.

-- Ведзі.

-- Глаголь.

-- Глаголь.

Потым яшчэ і яшчэ, па парадку. Часамі Саўка закрываў буквар і прымушаў паўтараць прачытаныя літары напамяць. Як толькі я ўпэўніўся, што літару ведаю й не забуду, я імкнуўся ўнікнуць у яе нутраны сэнс.

-- А што гэта: азы?

-- Азы, -- адказваў настойліва Саўка.

-- А букі?

-- Букі.

-- Ведзі. Куды, каго вядзі?

-- Якая табе справа? -- пачынаў злаваць Саўка.

Але я не адставаў.

-- Букі... букі... Вуча, а сам не ведае.

Саўка шчыпаў мяне за бок. Я -- яго. Мы пачыналі біцца. Саўка быў старэй за мяне гадоў на восем, але фізычна слабы. Усё-ж плакаў я першы. Тады за мяне заступалася матка.

-- Завошта ты яго валтузіш? -- крычала яна.

Я сьмялеў і браўся за корч, каб ударыць Саўку. За яго заступаліся цётка, сястра бацькі, дзед, і ў хаце пачыналася сварка. Саўка забіраўся на печ і плакаў. Бедны Саўка, мне шкода станавілася яго.

Так праходзіў я «азы» і «букі».

Што неабходна ведаць

Назаўтра я прыйшоў у школу амаль першым. У клясе было пуста. Я выйшаў на ганак і сеў. Хутка да мяне падышоў хлопчык Мацьвей. Ён жыў па суседству й таксама вучыўся. Мы сядзелі, гаварылі.

-- Ты ведаеш, што перш за ўсё трэба ведаць?

-- Не, -- адказаў я.

-- Што будзе? Навучу.

-- Ну, што?

-- Яблык дасі?

У бацькі быў сад. Мацьвей бачыў, што ў торбе ў мяне ляжаць яблыкі.

-- Дам.

-- Вельмі б'ецца наш Курылка, -- паскардзіўся Мацьвей.

-- А хто-ж гэта Курылка?

-- Настаўнік. Ён ня ведае, што завем мы яго так. Глядзі, не скажы.

-- Не! -- даў я слова.

-- Дык вось! Будзе Курылка цягнуць цябе за вуха ўлева, ты галаву паціханьку таксама круці ўлева. Калі ўправа, дык і ты ўправа. Калі ўгару, станавіся на цыпачкі.

Мацьвейка смачна еў яблык, чмокаў языком і гаварыў далей:

-- От з лапай дык горш.

-- А што гэта -- лапа?

-- Ты ня ведаеш?

Я маўчаў. Мацьвей пачаў растлумачваць, што лапа -- гэта ёсьць лапа.

-- Ну, ведаеш? -- гаварыў ён. -- Курылка зазлуецца. Тады возьме ён, значыцца, лінейку тую, дубовую, што на стале ў яго, і будзе біць тваю лапу.

Я зразумеў.

-- Дык вось! Як размахнецца лінейкай, а ты прымеш руку ды лінейка грукне аб стол, -- гэта горш. Рукі прымаць нельга...

-- А як-жа? -- сур'ёзна і ў задуменьні запытаў я.

-- Дай яшчэ адзін яблык.

Я даў. Мацьвей зноў пачаў есьці.

-- Лепш за ўсё трошкі, ціханька пад парту апусьціўшы руку, нацягнуць на далонь рукаў сьвіткі. Тады ня так шчыпле.

Мацьвей хіхікнуў, нацягнуў рукаў на далонь і паказаў, як даваць лапу Курылку.

-- А от як на жарству ставіць, гэта кепска. Калені баляць, і нічога ня зробіш. Я дык раблю так: сачу за настаўнікам. Ён адвернецца, я прысяду, а потым, калі трэба, зноў хуценька ўсхаплюся.

Так гаварыў я з Мацьвеем. Раптам званок затрашчэў на заняткі.

Курылка стаяў ля стала сярод класа й пучкамі маленькіх, як запалкі, лазовых палачак, павязаных па дзьве, тры, пяць і дзесяць, тлумачыў другой групе другое дзеяньне арыфмэтыкі. Я нічога не разумеў, а таму й ня слухаў, што кажа Курылка. Я аглядаўся навокал. Мне цікава было, што я ў школе. Перш-наперш я ўбачыў на стале Курылкі тоўстую дубовую лінейку, расшчэпленую з абодвух канцоў. Я дагадаўся, што гэта тая самая «лапавая» лінейка. Далей, у кутку, каля групкі, стаяла скрыначка з набітай жарствой. Назначэньне гэтай жарствы я ўжо ведаў.

Раптам Курылка топнуў нагой.

-- Мацьвей, ты чым займаешся?

Мацьвей падняўся з парты і глядзеў перад сабой.

-- Ідзі сюды!

Мацьвей вылез з-за парты.

-- Адымі ад трыццаці сямі дзевятнаццаць.

Мацьвей узяў анучу, сьцёр напісанае з дошкі і паставіў названыя лічбы. А далей, як відаць, ад спалоху, ня ведаў, што рабіць.

-- Ну!

Мацьвей стаіць.

-- Ну! -- ужо моцна крычаў Курылка. -- Ты слухаў, што гаварыў я?

Мацьвей маўчаў.

Курылка падбег да Мацьвея, узяў двума пальцамі -- вялікім і паказальным -- за валасы на патыліцы й пацягнуў угару. Мацьвей зморшчыўся, падняўся на цыпачках.

-- Дык ты так? -- крыкнуў Курылка, схапіў яго за каўнер, хацеў штурхнуць да дзьвярэй. Але разагнаўся ня ў меру. Ногі Мацьвея адарваліся ад падлогі, цыркулем павісьлі ў паветры. Бацькавы валёнкі паляцелі па класе. Мацьвей адарваўся, пакаціўся па падлозе, ударыўся аб ножкі парты. У класе стаяла мёртвая цішыня. Здавалася, каб павук дзе крануўся, дык і то было-б чуваць. Я сатраснуўся...

Парада прыгадзілася

Мацьвей быў старэйшы за мяне гады на два, мацнейшы й сьмялейшы. Мы здружыліся зь ім. Я заўсёды заходзіў за ім, і мы разам ішлі ў школу. Часьцяком я даваў яму хлеб, бульбу і яблыкі.

Неяк зь першых яшчэ дзён была вельмі цёплая раніца. Мы стаялі з Мацьвеем ля сьценкі і грэліся. Заняткаў яшчэ ня было.

Раптам да нас падышоў вучань Коля. Коля быў аднагодак з Мацьвеем, але куды здаравейшы. Бацька Колі меў паравы млын і быў багаты. Яго баялася наша вёска. Навет настаўнік і той пальцам ніколі не крануў Колю, нягледзячы на тое, што ён дрэнна вучыўся й вельмі дурэў.

Коля апрануты зусім ня так, як мы з Мацьвеем. На ім было чорнае цёплае паліто, на нагах новыя боты, добрая шапка.

Коля падышоў да нас і прыціснуў знарок мне нагу новым ботам. Я штурхануў Колю ў грудзі.

-- Ну, ня штурхацца! -- агрызнуўся той і штурхнуў мяне яшчэ раз, потым яшчэ і яшчэ.

Я зірнуў на Мацьвея. Коля ў гэты час ужо добра ўчапіўся за каўнер маёй сьвіткі, гнуў маю галаву, каб паваліць мяне. Мацьвей грозна крыкнуў:

-- Кінь.

-- А ты? -- кінуў Коля.

-- Ну!

-- Што?

Завязалася бойка. Мы з Мацьвеем накінуліся на Колю. Але той не здаваўся і зваліў мяне ў пясок на бульбянішчы, а потым прыняўся за Мацьвея. Я ўчапіўся Колю за ногі. Той захістаўся й сеў мне на шыю. Так мы качаліся па бульбянішчы, нападаючы то абодвы на Колю, то Коля на каторага з нас.

У нашай школе вучылася толькі адна дзяўчынка Ніна. Гэта была дачка аб’ездчыка. Аб’ездчык меў шмат зямлі і жыў вельмі багата. Бацька ня раз прыводзіў мне прыклад: «Вучыся, вучыся. Мейсца аб’ездчыка знойдзецца».

У чыстай ружовай сукенцы Ніна сядзела на вакне і ўвесь час сьмяялася. Як прыйшлі мы з Мацьвеем у клас, яна торкала пальцам і дражніла:

-- Казлы, казлы. Але ня здужалі Колю. Ён адзін вас...

Наагул яна часта дражніла нас, і ёй сходзіла гэта. Але цяпер Мацьвей падбачэніўся й сказаў:

-- Ну, ты, можа, здужаеш?

-- А от здужаю.

У гэты-ж мамэнт Мацьвей маргнуў мне вокам. Я дагадаўся, у чым справа. Не пасьпела Ніна саскочыць з вакна, як Мацьвей штурхнуў яе ў грудзі, я падхапіў за нагу. Ніна паляцела за вакно й раўла там. Убег Курылка.

-- Што такое? У чым справа?

-- Вось гэтыя ба-а-а-ся-я-я-кі!.. -- сказала скрозь сьлёзы Ніна.

Курылка тупаў нагамі, крычаў, махаў лінейкай. У мяне халадзела ўнутры. Хутка я нацягваў рукаў сьвіткі на далонь. Але лапа была добрая, далонь пасінела й доўга шчымела. Мацьвей атрымаў па абодвых рукох і неяк балюча скрывіў твар.

Тонкая палітыка

Наша школа стаяла на пустыры сярод вёскі. Гэта была старая, крытая цёсам будыніна. Калісь у ёй была карчма. Потым карчму зрабілі новую, а для школы ўзялі стары будынак. Страха яе дзенідзе правалілася, і, як рэбры абгладанай ваўкамі жывёлы, тырчэлі кроквы і латы. Пабітыя шыбы выглядалі чорнымі плямамі. У клясе заўсёды было холадна й няпрыемна.

Ля школы быў гарод. Далей, за гародам, пачыналася балота, празь якое працякала, як казалі ў нас, рэчка. Але гэта ня была рэчка. Гэта была проста канава. Яна ўлетку зарастала травой, вада ў ёй пакрывалася зялёнай муцьцю й разносіла ўсякія хваробы.

Каля самага балота, крокаў за дзьвесьце ад школы, стаяла маленькая, чорная, зусім не пакрытая кузьня.

Уласьнік куьзні, каваль Іцка, з чорным закураным тварам, рыжаватай барадой, штодзень праходзіў ля школы ў кузьню. За ім ішлі сыны й памочнікі: Хаім, хлапец гадоў пад пятнаццаць, і Лэйзар -- гадоў пад дзесяць.

Каваль Іцка звычайна нёс на сабе якія-небудзь драбіны, стары плуг ці яшчэ што. А Хаім і Лэйзар -- жалезьзе, малаткі, абручы.

Мы любілі бываць у кузьні. Бывала, пазвоніць званок на пераменку, і мы, з крыкам і бойкамі, панясемся ў кузьню. Кожны імкнуўся першым дабегчы, каб быць ля самага горна. Цікава было! Шухае мех! На распаленых вуглях скачуць язычкі агеньчыкаў, спачатку сіняватыя, потым, калі мех пачне ямчэй разьдзімацца,

вуглі разгарацца, агеньчыкі чырванеюць і, урэшце,становяцца белаватымі. Усунуты кавалак жалеза ў вуглі становіцца цьмяным, потым, чым больш награецца, тым больш чырванее і ўрэшце стане ружова-празрыстым, напрыклад, такі, як на сонцы сьпелая маліна.

Цікава было! А яшчэ цікавей станавілася, калі Іцка крыкне Хаіму й Лэйзару.

-- А ну, хлопцы! Гоп-та-та...

І стукне сваім маленькім молатам, абцугамі трымаючы чырвонае жалеза на кавадле.

Тады сыплецца дождж агнявых іскраў з-пад молатаў Хаіма й маленькага Лэйзара, і ляцяць звонкія гукі празь дзіравую страху, і рэха працы адгукнецца ў ціхім балоце... А стары Іцка, заахвочаны працай, заспявае нейкую песьню: цягучую й нудную, такую, якую пець мог толькі наш Іцка. Ад гэтай песьні ў мяне сьцісьнецца сэрца, пакрыюцца вільгацьцю вочы. Аб чым ён пеў, нам невядома... І нам вельмі хацелася больш быць у кузьні, глядзець на веер чырвона-малінавых іскраў, слухаць песьню пад звон жалеза. А яшчэ больш хацелася біць самім молатам па гарачым жалезе, рабіць зь яго, што захочаш. Напрыклад, у мяне заўсёды з'яўлялася думка: «Лепш быць кавалём, чым вучыцца». Я навет зьбіраўся прасіць бацьку, каб аддаў ён у кузьню мяне. І тады я выкую нешта такое, што сам Іцка аж зьдзівіцца.

Часам Іцка зірне на каторага з нас, угадае наша жаданьне й скажа:

-- А ну-тка, пасапі ў мех. Тады мы ўсе кінемся да палкі, якой разьдзімаюць мех, і чуць не паб'емся за пяршынства. Але вось і званок! Неахвота пакідаць кузьню.

Любілі мы старога Іцку. Любіў і Іцка нас. Асабліва сяброўскія зносіны былі між кавалямі й Мацьвеем. Чаму? Ня ведаю. Магчыма, таму, што ў іх жыцьці было нешта агульнае. Бацька Мацьвея таксама ня меў ні зямлі, ні гаспадаркі й жыў з таго, што наймаўся пасьвіць сялянскіх кароў. Але Коля й Ніна, як я ведаю, рэдка заходзілі ў кузьню.

-- Што там? Толькі запэцкаешся ды адзежу прапаліш! -- казала Ніна.

А Коля чамусьці ня любіў кавалёў.

Курылка таксама часта лаяў старога Іцку.

Быў цёплы дзень. Сьнег камячыўся й чапляўся за ногі.

На пераменцы мы гулялі ў сьнежкі. Курылка, накрыўшыся курткай, стаяў на ганку. Гулялі ў сьнежкі мы на гародзе, празь які ланцужком бегла сьцежка ў кузьню. Раптам з вуліцы выйшаў Іцка з сынамі. Стары каваль нёс пару колаў, а маладыя -- жалеза на шыны.

У нашай школе вучыліся хлопцы й вялікія. Як толькі Коля ўбачыў кавалёў, паклікаў некалькі вучняў, нешта шапнуў ім. Хлопцы з крыкам і рогатам кінуліся на кавалёў. Першым бег Коля. За дарослымі кінуліся меншыя. Але некаторыя стаялі на мейсцы. Мацьвей ня ўдзельнічаў у бойцы. Дзеці кружыліся вакол кавалёў, хапалі сьнег, камячылі сьнежкі й кідаліся імі. Спачатку Іцка, Хаім і Лэйзар паспрабавалі абараняцца, але не пасьпеюць яны нагнуцца, як дзясяткі сьнежак ляцяць у іх твар, у нос, за каўнер. Настаўнік хіхікаў...

Кружыліся дзеці, бегалі кавалі. Бойка цягнулася мінут колькі. Кавалі былі рабымі ад сьнегу. Раптам Іцка спыніўся, сеў на кінутыя колы, схапіўся за лоб.

-- Разбойнікі! Што вы робіце?

Падняў руку, патрос ёю ў паветры, хапіўся за галаву. Рука была ў крыві. Зьдзеў шапку -- тонкім струменьчыкам кацілася кроў па твары. Іцка размазваў яе. Коля сьмяяўся. Курылка скрыўся ў школу. Мне стала страшна. Некаторыя таксама глядзелі напалохана і зьдзіўлена. І ніхто ня мог зразумець, як здарылася гэта.

-- Нехта каменем! -- сказаў Мацьвей.

А хто -- невядома. Толькі я ведаў, хто. У самы разгар бойкі ў мяне разулася нага, я падышоў да сьцяны школы, паставіў нагу на цэглы фундамэнта і пераабуваўся. І я бачыў, як Коля ціханька закамечваў у сьнег камень. Але цяпер я маўчаў.

Хутка аб здарэньні ўведала ўся вёска.

-- Школьнікі Іцку пабілі! -- гаварылі адзін аднаму.

-- Эт, вучы іх! Дурэюць! -- гаварылі бацькі.

Назаўтра дома мне загадалі:

-- Глядзі, не чапай, а то... Ён табе ня роўня!

Я сказаў бацьку, як здарылася гэта. Той адказаў:

-- Далі волю ім! -- уздыхнуў. -- Нечага гаварыць! Далі волю! Хутка й па вуліцы не прапусьцяць.

Я ведаў, што мой бацька вельмі ня любіў бацьку Колі.

Пасля таго больш ніхто не кранаў кавалёў, але амаль што ніхто й не заходзіў у кузьню.

Ку-ка-рэ-ку

Адзін раз у сем дзён у нашу школу наязджаў поп. Звычайна ён загадваў прачытаць ці прапець пару малітваў, задаваў два-тры пытаньні па Евангельлю і ад'язджаў. А іншы раз, апрача таго, мучыў падоўгу сьпяваньнем царкоўных песень, пакідаў без абеда на цэлыя гадзіны ўсю групу, ставіў на калені.

Аднаго разу поп прыехаў падвечар, на апошні ўрок. У школе ўжо станавілася цёмна. Праз дзесяць мінут вучні ўсіх груп былі выстраены ў рад па тры. Курылка ўдарыў камэртонам па парце, нагнуў галаву, прыклаў яго да вуха й працягнуў:

-- А-а-а-а...

Мы паўтаралі:

-- А-а-а-а...

Галасы былі расстаўлены. Поп цягнуў па-царкоўнаму. Курылка кіраваў хорам. Ён, як крумкач, махаў рукавамі, крывіў твар, касіў вочы, круціў галавой і тупаў нагамі на тых, хто фальшывіў.

-- Отча-анааа...ш... -- кацілася ў клясе.

Я стаяў у заднім радзе. Мацьвей ля мяне. Тут было цёмна. Мацьвей падпяваў у такт песьні:

-- Отча-а нааш... курэй краў... пад печ хаваў...

Яго голас зьліваўся з апошнімі. Але тыя, што стаялі ля нас, усё чулі. Душыў сьмех. Мы штурхалі адзін аднаго локцямі. Некаторыя хіхікалі. Сьпевы канчаліся. Тады Мацьвей у самым канцы сьпеваў прапеў пеўнем.

-- Куу-каа-рээкуу...

Здавалася, бомба ўляцела ў клясу. Так адразу стала ціха. Поп бегаў кругом нас, задзіраў галаву і кулдыячыў, як індык.

-- Хто крычаў? Хто крычаў?

Курылка захліпаўся.

-- Хто пеў?

Мы маўчалі.

-- На тры гадзіны пакінуць у клясе! -- сказаў поп.

Было цёмна. Хацелася есьці. Мы стаялі гуртам ля вакна. Месяц клаўся праз шыбы на парты. Раптам Коля сказаў:

-- За аднаго дурня ўсім дрэнна. Даць яму!

-- Табе даць! -- адказаў спакойна Мацьвей.

-- Мне? Я ня пеў пеўнем, ня дурэў.

Тады я ўступіўся за Мацьвея.

-- Ты каменем біў каваля.

-- Ну, дык што? Біць яго можна, -- адказаў спакойна Коля.

Тады крыкнуў Мацьвей:

-- За што -- біць? Каваль бедны, але ня злодзей. А твой бацька крадзе ў сялян муку...

За Колю заступілася Ніна.

-- А твой бацька пастух! -- крыкнула яна на Мацьвея.

-- А твой -- хабары дзярэ з мужыкоў, -- адрэзаў Мацьвей.

Коля ўжо круціўся ля Мацьвея. Я стаў у абарону. Ніна за Колю. Той крычаў:

-- Бі пастухоў!

Кляса разьдзялілася на дзьве часткі: большасць з намі, меншасць, хто быў падкуплены Колем, -- за іх. Пачалася бойка. Нешта стукнула нейдзе. Нехта крахтаў, плакаў. Рыпелі парты. У цемры падалі крэслы. Раптам:

-- Вы што?

Усе заціхлі. Ніна казала Курылку:

-- От, гэтыя басякі б'юць нас.

Курылка Колю й Ніну адпусьціў дамоў, а нас яшчэ пакінуў гадзіны на дзьве.

Па дарозе дахаты з галавы ў мяне ня выходзілі словы: «Аб'ездчык дзярэ з мужыкоў хабары. Колін бацька крадзе муку ў сялян». Для мяне гэта нова было.

Бацька дома спытаў:

-- Дзе шляўся так позна?

Я адказаў:

-- Ня буду аб'ездчыкам! Ён «дзярэ хабары».

Бацька ўсьміхнуўся:

-- Дурань ты! Яму даюць, от і «дзярэ».

Няпрызнаныя дасьледчыкі

Дзіўны быў хлопец Мацьвей! Вельмі дзіўны. Я блізка зь ім жыў. Разам качаліся ў пыле на вуліцы. Разам коняў, цялят пасьвілі. Шмат чаго мы разам рабілі.

Бывала, матка скажа Мацьвею:

-- Зьбегай, Мацьвейка, паўвядзерца вады прынясі.

Прынесьці вады для Мацьвея -- гэта ня толькі прынесьці вады. Ня так хутка гэта робіцца. Мала што можа сустрэцца цікавае па дарозе да калодзежа.

І возьме Мацьвей вядро, выйдзе на вуліцу, як раптам якая-небудзь птушка цікавая сядзе на ліпу, што стаіць ля калодзежа. Трэба-ж ведаць яму, што за птушка такая. Стаіць Мацьвей мінуту, дзьве мінуты, глядзіць, сочыць -- пра ваду зусім забыў.

Ці яшчэ!

Мацьвей часта хадзіў з бацькам за падпаска.

-- Зьбегай вунь кароў ад жыта адгані! -- скажа бацька.

Бяжыць Мацьвей. Раптам жук ці казюрка паўзе такая, што рэдка сустрэнеш. А што гэта за казюрка, за жук? А як яна паўзе, дзе жыве? Пераверне казюрку, ногі падлічыць. А бацька крычыць:

-- Мацьвей! Мацьвей, каровы глядзі вунь...

Мацьвей адгоніць тады.

-- Што ты там рабіў?

-- Так, нічога.

-- Нічога? Вар'ят!

Адлупіць бацька. Але Мацьвей прывык да гэтага й ніколі ня плакаў -- упарты быў хлопец.

Вельмі ўпарты быў Мацьвей. У школе, чым больш біў яго Курылка, тым горш ён вучыўся, тым больш розных штук адколваў. Здавалася, што Мацьвей ганарыцца гэтым.

Аднаго разу Курылка выклікаў Мацьвея да дошкі. Тады ён быў ужо ў другой групе.

-- Падзялі сорак пяць на тры і прыбаў дзесяць.

Мацьвей напісаў сорак пяць, паставіў дзьве кропкі, а далей.. маўчаў.

-- Ну! -- падагнаў Курылка.

Мацьвей аглянуўся, чмыхнуў носам, задраў галаву й пачаў глядзець угору.

-- Ну! -- паўтарыў Курылка ўжо мацней.

Мацьвей пераступае з нагі на нагу, пачынае сачыць за Курылкам.

-- Нууу! -- у апошні раз крычыць Курылка.

Бедны Мацьвей робіць крок убок, чакае нападу свайго ворага, кладзе мел на дошку. А між тым, я добра ўпэўнен, што Мацьвей

куды больш ведаў, чым падзяліць сорак пяць на тры. Ён ведаў, колькі бацька атрымае ад сялян хлеба, калі за лета ад каровы кожны заплаціць па дзесяць фунтаў. Ён ведаў, колькі пудоў хлеба нь хопіць у іх да наступнай восені. Усё гэта ён сам вылічаў. А от цяпер ён ня можа падзяліць сорак пяць на тры. Гэта дзіўным мне здавалася.

-- Дык ня можаш, ня ўмееш? -- спытаў Курылка. -- Гааа?

Ён падсунуўся да Мацьвея, узяў яго за вуха, падняў угору, пацягнуў убок і толькі, як відаць, хацеў ставіць на жарству, як да вакна школы падляцеў на шэрым вялікім кані нейкі начальнік. Курылка зірнуў праз вакно.

-- Садзіся, балдаўня.

Але пакараньня Мацьвей у гэты дзень ня мінуў.

У клясу ўвайшоў «благачынны». Ён да нас прыязджаў адзін раз у месяц. Пачаўся ўрок па закону божаму.

Благачынны сядзеў ля стала, шырока расставіўшы ногі ў новых валёнках і галошах, і тоненькім галаском, прыпяваючы, гаварыў:

-- ...Ну, Аўраам радзіў Ісаака, Ісаак радзіў Якава... а Якаў каго?

І благачынны выклікаў аднаго за другім вучняў. У клясе было ціха й нудна...

У гэты час на раму вакна села сініца. Яна махнула хвастом уніз, угору, крутнулася, ціўкнула й стукнула дзюбай па шыбе. Потым пачала чысьціць носік аб пер'е, растапырыўшы крылы. Я бачыў, як Мацьвей глядзеў на птушку і ўсьміхаўся. Як відаць, убачыў гэта й благачынны. Ён торкнуў на Мацьвея пальцам і сказаў:

-- Ну, ты! Як цябе зваць?

Мацьвей не пачуў спачатку і не адрываў вачэй ад птушкі.

-- Ну, як цябе там? -- крыкнуў другі раз.

Мацьвей назваў сваё імя.

-- Мацьвей? Добра! От, ты добра слухаў, -- сказаў благачынны хітра. -- Скажы, каго радзіў Якаў?

Мацьвей падняўся з парты, маўчаў.

-- Ну, што-ж ты? Ты слухаў?

-- Слухаў, -- зманіў Мацьвей.

-- Ну, дык скажы: каго-ж, па-твойму, радзіў Якаў?

Мацьвей сказаў:

-- Якаў? Нікога. Якавіха хутка родзіць, а каго -- няведама.

Благачынны спачатку аж падскочыў; у Курылкі, здавалася, валасы сталі дубка.

-- Што?.. Што ты сказаў? -- запытаўся ён.

Мацьвей маўчаў як забіты. Благачынны злосна зірнуў на Курылку.

-- Што ён сказаў?

Той паціснуў плячмі, нібы й ня ведаў. Гэта вельмі раззлавала благачыннага. Ён закружыўся па клясе, як цецярук на таку, і крычаў:

-- Што ён казаў? Чаму вы вучыце іх?.. Выыы!.. Я вас!.. Што ён казаў? Якавіха? Якая Якавіха?

Я хацеў услужыць ім абодвым і без дазволу, не падняўшы рукі, хуценька ўстаў і сказаў:

-- Якавіха, гэта суседка наша. Бабы кажуць...

-- Дурак! -- крыкнуў благачынны. -- Маўчаць! -- і зноў накінуўся на Курылку. -- Вось!.. Вось чаму вы іх вучыце!

Праз некалькі мінут благачынны сядзеў на крэсле. Я й Мацьвей стаялі ля яго на каленях: я, як навічок, на падлозе, а Мацьвей на жарстве. Доўгі падрасьнік папа зьвісаў да долу й слаўся перад намі. Коля тыркаў у нас пальцамі, паказваў фігуры. Ніна высоўвала язык. Нам было нудна й злосна...

Папоў я наагул баяўся чамусьці заўсёды. Бывала, у пост поп хадзіў па кілбасах. З кожнай хаты яму павінны былі даць ня менш чым колца кілбас. Прыйдзе поп да нас, а я -- на печ. А матка шэпча:

-- Ідзі, мае дзетачкі, пацалуй руку бацюшку.

Мяне крыўдзіла гэта. За што цалаваць яму руку? Чаму аддаваць яму кілбасы ў той час, як самі ядзім адну бульбу? І, разам з тым, узьнікалі думкі такога парадку: чаму поп так апранаецца, ня стрыжэцца. Я пытаўся пра гэта ў маткі. Матка лаялася й казала:

-- Ён іншы, чым мы... Ён «сьвяты» чалавек...

Я адказваў:

-- Калі сьвяты, дык навошта яму кілбасы?

-- Дурны ты нейкі, вось што. Шалёныя думкі табе ў голаву лезуць.

Я змаўкаў і рашэньне задачы адкладваў.

І вось зараз я стаю на каленях. І так блізка ля мяне поп. І радзілася думка: а што, калі паглядзець, як апранаецца ён? Калі так, як і ўсе, дык ён такі самы, як і мы.

У гэты час поп нешта запісваў у кнігу. Курылка корпаўся ў шафе. Вучні чыталі Евангельле. Я ціханька нагнуўся да вуха

Мацьвея і сказаў яму сваю думку. Той зараз-жа бясшумна падсунуўся трохі бліжэй да благачыннага й пачаў паднімаць пальцамі падрасьнік. Я -- у другім мейсцы. Спачатку паказалася валёнка, потым -- пад каленам чорныя суконныя штаны. Раптам я заўважыў, як Коля хіхікнуў. Благачынны крануўся, зірнуў на нас і адразу-ж ускочыў, як падпалены. Невядома, што падумаў ён у гэты час.

Усё зьмянілася ў клясе. Дзеці замерлі. Настаўнік трымаў нас за вушы. Благачынны, як відаць, ня ведаў, у чым справа. Ён думаў, што падрабілі яму нейкую іншую штуку. Ён кружыўся ваўчком па клясе, махаў рукамі -- парусам надзімаўся яго падрасьнік.

-- Ах!.. ах... ах... -- ахкаў ён.

Твар перакрыўлены. Вочы блішчаць. Нос раздуты, дрыжыць, зрабіўся сінім. Мы прапалі! Нас білі пасьля, як ніколі. Коля строіў нам рожы.

Мацьвею абвясьцілі, што вучыцца ён ня можа. Мой учынак занесьлі ў школьную кнігу.

А як выйшлі дамоў, Мацьвей крыкнуў на Колю:

-- Абдзірала!

Ніна ў адказ:

-- Пастух!

Я за Мацьвея:

-- Хапунка!

-- Пастух!

Мы памянулі жывых і мёртвых. Потым узяліся за каменьне...

Твор

Вучыўся я лёгка і ніколі не сядзеў над кніжкамі доўга. Але затое ня раз маўчаў на ўроку. І не таму маўчаў, што ня ведаў яго. Не. Я быў настолькі нясмелым і забітым, што, бывала, дрыжэў перад Курылкам. А вось ды ня тое, ды ня так, што тады будзе? Ну й дасьць...

Аднаго разу, неяк перад вольным днём, Курылка загадаў кожнаму вучню трэцяй групы напісаць свой асабісты твор. Кожны павінен быў апісаць якое-небудзь здарэньне.

У той дзень я ішоў са школы ў задуменьні. Жартачкі -- напісаць твор. Увечары на камінку трашчэлі смольныя карчы. Бацька плёў лапці. Маці прала кудзелю. Я сядзеў перад сшыткам на ўслончыку.

Часьцяком я падымаў галаву, глядзеў на палаючы агонь і запісваў свае думкі. Так радзіўся мой твор.

Назаўтра Курылка прыйшоў у школу кульгаючы.

Трэба сказаць, што Курылка любіў гуляць. Бывала, перад сьвятам пойдзе ён у мястэчка, дзе была воласьць, двукласная школа, і загуляе. Дзень няма, другі няма, на трэці -- прыходзіць зь сіняком пад вачамі, зь перабітай рукой, рассечанымі губамі ці яшчэ зь якой-небудзь адзнакай. У такія дні быў ён маўклівы й вельмі сярдзіты. Часьцяком без аніякай віны ён тады забіваў вучня да страты прытомнасьці.

Сёньня Курылка быў такім самым. Пачаліся заняткі. Ён сядзеў ля свайго стала, паклаўшы нагу на нагу. Адна была ў боце, а другая ў галошы й тоўстай суконнай панчосе. Спачатку была арыфмэтыка, потым чытанка ў другой групе, потым гісторыя ў нашай групе і, усьлед за тым, Курылка пазяхнуў і патрабаваў сшыткі па пісаньню. Мы падалі. Мусіць, у кожнага з нас, як і ў мяне, трапятала ў гэты момант пад лыжачкай. Я адчуваў, што твор напісаў я складна й добра, і яшчэ больш хваляваўся. Хутка Курылка паклікаў мяне. Я падышоў.

-- Ты пісаў? -- запытаў ён, гледзячы ў мой сшытак.

Я заўважыў у яго вачах нейкія нядобрыя агеньчыкі й ціха, заікаючыся, сказаў:

-- Яяя...

Настаўнік зірнуў мне ў твар. Я схаваў вочы.

-- Адкуль ты пісаў?

-- Ніадкуль.

Я бачыў, як па твары Курылкі распаўзалася чырвань.

-- Ніадкуль?

Курылку, як відаць, мой адказ паказаўся абразай. Яго вочы павісьлі на мне. Рукі дрыжэлі. Кульгавая нага калыхалася, як калода. Як так? Колькі біў ён мяне за тое, каб я адказаў яму ўрок, біў за пісаньне, за няскладнасьць пры пераказе прачытаных твораў, а тут... Сам пісаў? Хлусіць! Так, відаць, думаў настаўнік. Сьпісаў аднекуль! Але адкуль сьпісаў, Курылка ня мог давесьці.

-- Хлусіш ты, ты хлусіш! Чуеш, сьпісаў? -- крыкнуў на ўсю школу.

Я маўчаў і стаяў перад ім, як на агні. Я ня ведаў, што сказаць. Усе думкі вылецелі ў мяне з галавы.

Курылка схапіў за вуха, моцна, як нажом, сьціснуў пазногцямі. Я зморшчыўся, але не заплакаў. Я ведаў, што будзе горш. Курылка ірвануў вуха да сябе, сагнуў маю галаву.

-- Глядзі, як дрэнна перапісаў! Дзьве памылкі зрабіў на старонцы. Ну, гавары! Пень, пень! -- гавары.

Закруціў маё вуха, зноў нахіліў галаву й стукнуў ілбом у тое мейсца стала, дзе ляжаў мой сшытак.

-- Лапаць, лапаць! Сьпісаў, лапаць ты! Адкуль сьпісаў?..

Я зрабіў крок назад.

-- Дык ты так!

Курылка схапіў лінейку, стукнуў ёю аб стол. З-пад лінейкі ад удара, здавалася, пасыпаўся пыл. Аловак, што ляжаў на стале, падскочыў і бразнуў на падлогу. Вучні ўздрыгануліся. Коля хіхікнуў. Я сьцяў зубы і яшчэ адступіў, адступіў інстынктыўна. Гэта, як відаць, яшчэ больш раззлавала Курылку.

-- Дык ты так!

Я спалохаўся й рашыў зманіць. Хай ня я напісаў, абы цэлым застацца.

І я ціха прашаптаў:

-- Я-я-я, пан настаўнік, сьпісаў...

-- Ага, сьпісаў, лапаць! Адкуль сьпісаў?..

Я папаўся. Адкуль сьпісаў? Сэрца, я чуў, разрывалася. Слёзы душылі мяне. Адкуль я сьпісаў? Хто паможа сказаць, адкуль-бы я мог сьпісваць? Што рабіць? У вачах пацямнела. У галаве зрабілася пуста. Толькі рукі Курылкі, яго твар, яго чырвоныя, недаспаўшыя вочы я бачу да падрабязнасьці.

-- З кніжкі сьпісаў, пан настаўнік! З кніжкі.

-- З кніжкі!? Зь якой кніжкі!?. -- чую я, быццам скрозь сон. -- З кніжкі! Ах ты, падлюка!.. Ах ты!..

Курылка стукнуў лінейкай па маёй галаве. У вушох зазьвінела, пацямнела ў вачох. Я захістаўся. Курылка ірвануў мяне да сябе, тармасіў мае вушы, але я ўжо нічога ня чуў.

-- Усё роўна! -- мільганула адзіная думка. -- Хай б’е.

Ногі аслабелі, гнуліся ў каленках. Курылка крычаў:

-- Ах ты!.. ах вы... сьвіньні, сьвіньні! У сьвінушнік вас, а ня вучыць...

Праз гадзіну я йшоў дамоў. Вушы гарэлі. Было нудна й сорамна -- неяк сорамна самому за сябе. Мацьвей сустрэў мяне ля сваёй хаты.

-- Прыходзь увечары, будзем пускаць ваўчка.

Мацьвей выняў з кішэні й паказаў мне гэтую цацку.

-- Сам зрабіў?

-- Сам!

Я зьдзівіўся і згадзіўся прыйсці.

Іцка вярнуў мне жыцьцё

Назаўтра ўставаць не хацелася. Ламала ўсё цела. Я сядзеў на зачынку й памалу абкручваў ногі, абуваўся ў лапці. Матка пякла бульбу на сьнеданьне, бацька зьбіраўся ў лес.

-- Ты што -- так позна? -- спытаўся бацька.

-- Пасьпею! -- адказаў я.

Я ўзяў некалькі бульбін у кішэню й выйшаў.

Быў нейкі чорны пахмурны дзень. У стрэхах сьвістаў і выў вецер. Слупы сьнежнага пылу курэлі па вуліцы. Нейдзе выў галодны сабака.

Хадзіць у школу мне зараз здавалася нейкім нудным заняткам. Перад вачыма паўставалі малюнкі ўчарашняга, і ў тумане гэтых малюнкаў выплываў і мільгаў чырвоны твар п'янюжкі Курылкі.

Вось і школа. Адчыніўшы чутачку дзьверы, я заглянуў у дзірачку й прыслухаўся. Заняткі йшлі. Вучні сядзелі, як мёртвыя цені, над партамі. Перад імі кавыляў храмы Курылка. Я зноў прычыніў дзверы і ўспомніў словы Мацьвея, зь якім я ўчора правёў вечар.

-- Не хадзі больш у школу.

-- Бацька будзе біць, -- адказаў я.

-- Эт, бацька... Мой дык -- ані! Каб ты не хадзіў, мы-б насеклі дроў, завезьлі-б у мястэчка й прадалі-б.

-- Не! Я ня буду хадзіць у школу, -- рашыў я.

І страх, учарашні страх, зноў усяліўся ў маё цела, скаваў мне мазгі, затуманіў сьвядомасьць. Мне здавалася, як толькі пераступлю парог, Курылка зноў накінецца на мяне, пачне біць і крычаць.

Але, разам з гэтым, уьзнікла пытаньне: а куды-ж мне ісьці? Вярнуцца дамоў? Немагчыма! Расказаць шчыра бацьку -- той

наўрад ці пашкадуе. Пайсьці да Мацьвея? Усё роўна ўведаюць. Куды-ж мне дзецца?

Я выйшаў са школы, прытуліўся да сьцяны й доўга стаяў у задуменьні, паглядаючы ў чорную далячынь... Вецер сварыўся пад страхой, нейдзе ляпаў адарванымі дошкамі.

Раптам у школе затрашчэў званок. Гэта на перапынак. Я скочыў зь мейсца й пабег сьцежкай па сьнезе да кузьні.

Кузьня была на замку. Я сеў на мяліньне, прытуліўшыся плячамі да сьцяны. Доўга й бяз мэты я ўглядаўся ў цёмны небасхіл. Потым выняў з торбы кніжку, паклаў яе на калені й пачаў чытаць. Па сьнежнай корцы сьцелецца пыл. У небе плывуць чорныя воблакі. Вецер шчыпле за рукі, за твар, кідае сьнегам у вочы.

Мне стала холадна. Я паставіў каўнер сьвіткі. Але вецер, здавалася, заходзіў з другога боку, забіраўся пад сьвітку, пад сарочку, як іголкамі, калоў маё цела.

Я далей залазіў у сьвітку й плакаў. Усьлед за тым мне захацелася спаць. Па целе пабегла нейкая млявасьць. Стала цёпла. Сыпучы сьнег мітусіцца перад вачмі, віхрам падымаецца ўгору, сіпіць, паўзе ўсё бліжай і бліжай да мяне, закрываючы ногі. Але мне ня хочацца крануцца. І скрозь сон я бачу, як у віхры разам са сьнегам кружыцца Курылка, ён танцуе, усьміхаецца, ківае пальцам, пагражае. Але я не баюся. Мне прыемна.

-- Ты пісаў! Ты пісаў! -- сіпіць настаўнік, як сьнег. -- Ты адкуль сьпісаў?

-- Я ня сьпісаў. Ня сьпісаў я! -- крычу. -- Сам шмат думаў. Сам шмат працаваў. Рад быў... Быў рад, што напісаў...

І яшчэ горш заліваюся сьлязмі. Яны, сьветлыя і цёплыя, коцяцца па твары, пападаюць у рот. Я не страсаю іх. Мне прыемна, салодкая млявасьць разьлілася ў целе. А на сэрцы радасьць і спакой.

Раптам я бачу, Курылка спыніўся. Віхры сьнегу завылі каля ног. А Курылка ўсё бліжай і бліжай плыве да мяне.

-- Хадзем! Хадзем у школу! Ты добра вучыўся... Старанны...

Мне прыемна ад гэтага, я больш плачу й крычу...

-- Не пайду! Не пайду... я-я-я... сам напісаў...

Мне хочацца адпомсьціць настаўніку...

Прачнуўся я ўжо дома. Ля мяне стаяў каваль Іцка і матка. Твар гарэў агнём. Балюча стукала ў віскох. Ногі й рукі закручаны ў анучы. Яны тоўстыя, як бярозавыя калоды, і баляць. Матка кажа:

-- А мае дзетачкі! Што гэта такое з табой?

-- Не чапайце яго! -- кажа Іцка. -- Не чапайце! Зьмёрз трохі... Хлопец зьмёрз... Хай пасьпіць.

Назаўтра ў мяне гарэла ўсё цела. Ламала рукі й ногі. Галава, здавалася, была наліта волавам, нацягнута абручамі. Матка давала нешта цёплае піць. Яно было горкае й жоўтае. Бацька злаваў і лаяўся.

-- Каўзель! Каўзель усё гэта! І-і-іх! Лапцей не набрацца.

Я рашыў маўчаць да канца.

Увечары зноў прыйшоў Іцка.

-- Ну, як малы? -- спытаў у бацькі.

Умяшалася матка.

-- От, дзякаваць добраму чалавеку. Прынёс хлопца на руках, выратаваў. А мой ты Іцачка! А мае вы дзетачкі!

Далей Іцка расказваў:

-- Іду гэта ў кузьню, бачу: сядзіць хлопец, кніжку чытае. Думаю: што-б гэта значыла? Падыходжу. «Ты што?» -- кажу. Маўчыць і не шавяльнуўся. «Што такое?» Падыходжу бліжэй, рукі на кніжцы й белыя нейкія, нібы косткі; на твары -- ручаёчкамі замерзьлі сьлёзы. Тармаснуў -- рукі аж зьвіняць! А сэрца, чую, яшчэ трапечацца. Тармаснуў другі раз. «Не пайду. Не пайду. Я пісаў...» -- крычыць. Ды так неразборчыва, нібы праз сьлёзы, што я сам ледзь не заплакаў. «Э-э-э! Справа кепская!» Я за яго -- ды праз агароды, нацянькі. Бягу й баюся: хаця-б хутчэй! А тут ужо матка, вось яно як...

Іцка падумаў і дадаў:

-- Кепскі пан настаўнік. Ах, які кепскі...

Бацька замаргаў вачыма.

Я хварэў аж да вясны.

Чорныя крумкачы

Курылка ўвесь час рыхтаваўся паступаць вучыцца далей. Увесну ён паехаў у Вільню. У вёсцы казалі: «Пайшоў наш настаўнік у афіцэры». На самай-жа справе, як потым казала настаўніца, ён паступіў у юнкеры.

Настаўніца прыехала позна. Гэта была маладая, але ўжо худаватая, нібы пажылая, жанчына.

З першага-ж дня яна загадала называць яе ня йначай, як Вера Аляксандраўна. Апрача таго, вывела з школы жарству, як метад выхаваньня, і менш білася лінейкай. Усё-ж білася.

Праўда, каб баяліся й добра вучыліся, яна праз дзень пасылала Колю, сына млынара, на балота па розгі. Пучок гнуткіх лазовых пруцікаў заўсёды ляжаў у яе на стале.

Але ўсё-ж было вальней, чым пры Курылцы. Што датычыць да пруцікаў, дык мы іх, як выходзіла настаўніца з клясы, хавалі ці проста кідалі ў печ. Усё-ж вучыліся лепш, чым раней, і некалькі вучняў, у тым ліку і я, у гэтым годзе рыхтаваліся да экзаменаў.

Апрача заняткаў з дзецьмі, Вера Аляксандраўна імкнулася наладзіць нейкую працу і з дарослымі, з бацькамі вучняў.

Аднаго разу, неяк увечары, яна сабрала ў школу нас і бацькоў і чытала нейкую кніжку, здаецца, «Вечера на хуторе бліз Діканькі» Гогаля.

Мужчыны, мусіць, не разумелі і дрэнна слухалі. Настаўніца сказала:

-- Вось вы ня слухаеце, а жывеце, як сьвіньні. Вучыцеся жыць. Жыць трэба лепш!

Бацькі кранулiся. Пасыпаліся пытаньні. Школа загула.

-- Як лепш жыць?

-- Навучы!

-- Гаворка!..

Адзін навет сказаў:

-- Лепш жыць?! Зямля наша ў пана. Скажы нам, парай, як зямлю атабраць?

Настаўніца спалохалася. І «сход» разагнала.

Як відаць, пра гэта здарэнне пранюхаў поп. У хуткасьці ён прыехаў у школу. Пакуль поп злазіў з вазка і йшоў, Вера Аляксандраўна мітусілася ў класе.

Поп пачаў экзаменаваць нас па гісторыі. У нашай трэцяй групе спытаў:

-- Ад чаго на Русі была «смута»?

Усе маўчалі. Кожны баяўся сказаць, каб не памыліцца. Я задумаўся.

Мой дзед часта расказваў нам, дзецям, як цяжка жылося пры прыгоне. Расказ дзеда мяне хваляваў. Я ўяўляў малюнкі бунту сялян супроць памешчыкаў і пытаўся ў дзеда:

-- А што рабіў цар?

-- Цар? Што цару! Ён сам быў памешчык.

-- Дык народ быў супроць цара?

-- От, які ты! -- дзівіўся дзед. -- Табе ня трэба гэтага ведаць.

Дзед змаўкаў, але расказы яго заставаліся ў памяці. Я рабіў вывад, што памешчыкі душылі сялян, а цар дапамагаў памешчыкам, і народ быў супроць цара. Зараз я ўспомніў пра гэта і зблытаў з тым, што чуў у школе аб «смутным часе». Мяне нібы хто падбухторваў падняць руку.

-- Ну! -- сказаў поп.

-- Ад таго, што народ не хацеў цара...

Поп зморшчыўся, бліснуў чорныма вачымі на Веру Аляксандраўну й моўчкі паехаў. Вера Аляксандраўна плакала. Я дагадаўся, што віной гэтаму мой адказ. Мне было шкода настаўніцы.

Настаўніцу выклікалі ў мястэчка праз два дні, і больш яна не вярталася. А праз некалькі дней ад нечага рабіць я ляжаў на печы з кніжкай. Раптам у хату ўвайшоў ураднік. Бацька падняўся насустрач.

-- Цябе патрабуюць у мястэчка! -- сказаў ураднік.

-- Мяне?! -- зьдзівіўся бацька.

-- Ну, а каго-ж?

Ураднік зірнуў на печ, падміргнуў неяк хітра мне. У мяне забілася сэрца. Мне было й страшна, і нейкая злосць, якую я ня мог перамагчы, брала за сэрца. Бацька апранаў новы кажух.

-- Завошта? -- спытала матка.

Ураднік маўчаў, надзьмуўшы чорныя вялікія вусы.

Матка пачала плакаць. Як толькі бацька апрануўся й дрыжачымі рукамі пачаў адразаць кавалак хлеба, матка заплакала ўголас.

-- Куды?.. За што?..

За ёй заплакалі дзеці. Сэрца маё ня вытрымала. Я задыхаўся й ня мог стрымаць сябе. Схапіўшы качалку, я босы саскочыў зь печкі і з плачам і грозным крыкам кінуўся на ўрадніка. Той адштурхнуў мяне нагой, крыкнуў:

-- Шчанё!

Потым узяўся за нагайку. Але бацька ўвесь пачарнеў, суха й коратка папярэдзіў:

-- Не чапаць!

У хату ўвайшоў дзед. Дзед мой быў вельмі высокі і здаровы. Ураднік схаваў нагайку.

Калі выйшлі на двор, ураднік убачыў, што ў каня перарэзаны лейцы.

-- Хто нарабіў? Га! Хто? -- пытаўся ён гучна.

Бацька паціскаў плячамі. Лейцы зьвязалі й паехалі. Пасьля гэтага ў хаце было так нудна, нібы на лаўцы ляжаў нябожчык.

-- Сабакі! Крумкачы! Як чорныя крумкачы, носяцца... -- крычаў бацька ўвечары, калі вярнуўся зь мястэчка й нешта пачаў гаварыць матцы. Я хацеў падслухаць, але бацька грозна тупнуў нагой і адагнаў. Яшчэ некалькі разоў бацьку патрабавалі ў мястэчка.

А Мацьвей пасля мне прызнаўся, што лейцы перарэзаў ён тады, калі ўраднік быў у нас у хаце.

-- Навошта? -- спытаў я.

-- А так.

Пасьля гэтага мы зноў ня вучыліся тыдні тры. Колю й Ніну тады-ж аддалі вучыцца ў горад. Куды ім з намі! Потым, якраз к новаму году, зноў прыслалі настаўніцу.

Хто ня ведае літары яць...

Зноў пачаліся заняткі. Да экзамену новая настаўніца рыхтавала нас траіх, больш паспяваючых: мяне, Нічыпара й сірату Алёшу.

Уся ўвага была адведзена нам. Мы даганялі прапушчанае за тры тыдні. У школе мы займаліся цэлы дзень. Потым заняткі канчаліся, вучні ішлі дахаты, а мы зноў прыходзілі ўвечары.

Мы рашалі задачы, пісалі пад дыктоўку, займаліся гісторыяй, малявалі.

Настаўніца дамагалася, каб у нашым пісаньні ня было ні адной памылкі. Але гэта ніяк не ўдавалася. Літара яць заразала нас. Тады настаўніца садзіла нас у кружок каля лямпы і загадвала вучыць усе так званыя карэнныя словы напамяць. Мы хорам паўтаралі: «звёзды, сёдлы, гнёзды»... А пісалі іх праз яць: «звѣзды, сѣдлы, гнѣзды». Нам здавалася гэта дзікім.

Была блытаніна й з напісаньнем літары «ы» пасля «р». Гэты склад у некаторых словах выгаварваўся цьвёрда, а пісаць трэба яго мякка, праз «і». Мы ніяк не маглі запомніць гэтага правіла, і настаўніца таксама загадвала вывучаць напамяць словы: пры... вры... жры...

Я яшчэ не паправіўся, як сьлед, ад хвароб і з набліжэньнем экзамену слабеў і слабеў. Урэшце зусім страціў сілы. Бывала, вучні гуляюць на перапынку, а я з клясы зусім ня вылажу. Думкі аб «яць» ня выходзілі з галавы. Гэта літара, здавалася, усюды са мной. Яна точыць маё сэрца і, як балячка, раз'ядае цела, кручкамі разрывае мазгі.

Перад самай вясной я зусім захварэў. Часта ў клясе страшэнна кружылася галава. З вачэй сыпаліся іскры, і плылі кругі: зеленаватыя, сінія, агнявыя. Я зрабіўся маўклівым. На ўроках часьцяком ня мог адказаць таго, што добра ведаў.

Была пераменка. Дзеці з крыкам, як галкі, насіліся па двары, а я схіліў галаву на парту й сядзеў нярухома. Падышла настаўніца.

-- А ты чаго ня гуляеш?

Я ўзьняў галаву і, мусіць, дзіка глянуў на настаўніцу. Празь мінуту яна паклікала вучняў і загадала:

-- Выцягніце яго ды добра адкамячце!

Вучні падхапілі мяне і, як мурашкі трутня, пацягнулі на двор. Я не спрачаўся.

-- Растармасіце яго! Дайце! Дайце!

Дзеці рады.

Яны камечаць сьнежкі, б'юць імі мяне. Я ляжу на сьнезе й плачу. Сам ня ведаю, чаго плачу.

Пасьля гэтага я некалькі дзён зноў не хадзіў у школу. Але й тут не пакідала літара «яць». Яна стаяла перад вачыма, нібы крывілася, усьміхалася, пагражала мне сваімі рожкамі...

Як-бы ўцячы

Вось і вясна на дварэ. Буслы ў чырвоных ботах мераюць поле. На загонах цягнуцца худыя коні. Рыпіць саха.

-- Но-о-о! Каб цябе! -- чуюцца крыкі на палосах.

Нас пачалі адрываць ад заняткаў усё часьцей і часьцей. Настаўніца злавала. Урэшце Алёша зусім кінуў вучыцца. Я зайздросьціў яму.

Заўтра экзамен. На дварэ мажуць колы павозкі. Бегае настаўніца то да нас, то ў школу. Дзед мой, які павязе нас на экзамен, накладае ў торбу харчы. Матка дала мне чыстую адзежу. А як-жа? Ого! Хлапец едзе на экзамен, да чужых людзей, за трыццаць вёрст ад свае вёскі, -- трэба-ж хлопца прыбраць!

Вось мы й выехалі. Бацька нешта шапнуў дзеду й грозна папярэдзіў мяне:

-- Глядзі-ж! А то... шкуру зьдзяру.

У Выдрыцу, дзе павінен адбыцца экзамен, мы прыехалі рана. Пастух выганяў у поле кароў. Ля кожнай хаты ён спыняўся, падымаў трубу ўгару й трубіў. Труба аблівалася ўзыходзячым сонцам і ярка блішчэла.

-- Хутка экзамен, -- падумаў я. -- Як-бы так уцячы?!

Мы заехалі ў маленькі дворык. Усю ноч ліў дождж. Мы былі мокрыя. Старая бабулька, гаспадыня тае хаты, мне й Нічыпару сказала:

-- Лезьце на печ, пасьпіце! Яшчэ рана!

Мы палезьлі. Дзед мой павёў пасьвіць коні. Настаўніца некуды зьнікла. Я быў змораны й хутка заснуў.

У дарозе настаўніца нам расказвала, хто будзе на экзамене, як будуць пытацца і як трэба адказваць. Я ўжо ведаў, што ў камісіі будуць папы, земскі начальнік, прыстаў і яшчэ нейкія страшныя людзі. Ужо тады я прыдумваў прычыну для ўцёкаў.

Пасьля сну ў галаве пасьвятлела. Я надумаў такі плян: прабадзяцца дзе-небудзь гадзіны тры, нібы незнарок, нібы заблудзіўшыся, з такім разьлікам, каб прыйсьці ўжо ў канцы экзамену. Такім чынам я спадзяваўся выратаваць сваю шкуру і ад бацькі.

Я нікому нічога не сказаў, выйшаў на двор, пералез цераз плот, улез на нейкі нізенькі хлеўчык і азірнуўся навокал. Лес быў далёка. Але тут-жа, за вёскай, сярэбранай істужкай круцілася па залітым сонцам зялёным лузе рачушка. Дзе-нідзе, схіліўшы галовы, над ёй стаялі вербы. Я рашыў схавацца пад гэтымі дрэвамі.

Я сядзеў пад вярбой і глядзеў на свой цень у люстэрку вады. Па твары каціліся кроплі сьлёз. Яны пападалі ў рот, мачылі вочы, і мне неяк рабілася прыемна. Тут-жа, на лузе, пасьвіліся коні. Барабанілі званкі ля іх шыяў. Між імі хадзіў спутаны наш белагрывы й Нічыпараў гняды.

-- От, я сяду на каня й паеду дамоў, -- падумаў я.

Раптам на вуліцы пачуўся крык. Усьлед за тым на луг выбег Нічыпар, за ім -- дзед, за дзедам, як качка, на высокіх абцасах кавыляла, спатыкаючыся, настаўніца. Я дагадаўся, што шукаюць мяне. Дзе мне дзецца? Уцячы! Ужо позна. Убачаць. Сядзець на мейсцы? Значыцца, выдаць намер. А дзед скажа потым бацьку. А бацька?.. Ой, і бацька! Я рашыў выдаць свае сховы, нагнуўся над рэчкай і стаў мыцца. Крышталёвая вада змыла сьлёзы з твару. Мяне ўбачылі!

-- Што ты робіш тут?

-- Чаго ты ўцёк?

-- Дзе ты быў?

Усе пыталіся разам. Я сказаў:

-- Прыйшоў памыцца.

Дзед зірнуў мне ў твар, але нічога ня ўбачыў. Уцячы не ўдалося.

Экзамен

Мы ішлі ў школу. Сонца схавалася за невялікае воблачка, і на зямлю лёг цень. У мяне балюча сьціснула грудзі. Цямнела ў ваччу. Настаўніца, як відаць, угадала мой настрой. Яна сказала:

-- Ты ня бойся! Яны ня ўкусяць цябе.

Я падумаў: «Укусяць, гэта нічога...»

А яна навучала:

-- Ты ўсё ведаеш. Кажы, што будуць пытацца, вось і ўсё...

Гэтыя словы яшчэ горш палохалі мяне.

Мы падняліся па ўсходцах на ганак. У калідоры настаўніца спынілася, прапусьціла ўперад Нічыпара, а мяне затрымала. Яна ўзяла аднекуль з кутка белы кубачак і працягнула мне.

-- На, выпі! Гэта нічога, салодка.

Я спачатку адмаўляўся, потым выпіў. Настаўніца ўсьміхнулася. Адразу-ж мне стала нібы весялей. Нешта цёплае і прыемнае цякло па жылах, бадзёрыла сэрца, стукала ў скроні. Стала горача ўнутры.

-- Ну, а зараз ідзі, -- сказала настаўніца. -- Толькі не забудзься, як толькі ўвойдзеш, направа пакланіцца старэйшаму папу зь вялікім крыжам на грудзёх. Я ўвайшоў і адразу ўбачыў папа з крыжам. Я бухнуўся яму ў ногі. Поп не зьвяртаў на мяне аніякай увагі. А

настаўніца не сказала: доўга ляжаць перад папом ці зараз-жа падняцца. І я ляжаў. Настаўніца ўвайшла ўсьлед за мной і кранула мяне нагой. Я падняўся. Настаўніца ўказала мне мейсца ля Нічыпара. Потым я даведаўся, што той, каму я кланяўся, -- вялікі папоўскі начальнік, і застаўся вельмі давольным маёй увагай да яго.

У клясе было каля дваццаці вучняў з розных царкоўна-прыходскіх школ нашай акругі. За сталом, пакрытым зялёным сукном, сядзелі члены камісіі. Той стары, якому я кланяўся, быў пасярод. Абапал яго два папы, маладзейшыя й па ўзросце і, як відаць, па чыну. Каля іх, з аднаго боку, у чорным касьцюме, зь вялікімі рыжымі вусамі, якія штомінуты шавяліліся ў бакі, як у сома, сядзеў земскі начальнік. З другога -- прыстаў у залатым пенснэ, з пагонамі, зь вялікім шнурам праз грудзі і з шабляй. Ён часта перакладаў нагу на нагу. Зьвінелі шпоры. Каля яго з чорнымі, страшэнна надзьмутымі вусамі, аблакаціўшыся на стол, сядзеў ураднік. Усе здаваліся страшней адзін другога.

Пачаліся экзамены. Спачатку былі закрытыя задачы. Нягледзячы на тое, што ад нечага выпітага ў мяне ўсё больш і больш шумела ў галаве, з задачай я справіўся амаль першым, але вось усьлед за задачай той старэйшы, якому я кланяўся, паклікаў нашу настаўніцу. Я ўвесь аж загарэўся. Мусіць, памылку ў задачы ўляпіў?! Што гэта будзе? Але, бачу, настаўніца ўсьміхнулася. Поп узяў да сябе паперку, на якой, пасьля я ўбачыў, стаялі ўсе прозьвішчы вучняў. Потым паклікаў мяне.

-- Прапаў! -- пранеслася думка ў мазгох.

І, разам з гэтым, сэрца ірванулася, здалося, у бакі. Галава павяла ўправа. Ногі нібы раскірэчыліся, не хацелі ісці. Я абапёрся аб парту, выйшаў на клас, стаў перад камісіяй. Я адчуваў, як дрыжэлі мае павекі.

Старэйшы запытаў яшчэ раз прозьвішча, імя, імя па бацьку, колькі год і пачаў экзаменаваць. Я адказваў. Ён прасіў гаварыць мацней. Што ён пытаўся, ні тады, ні цяпер я сказаць не магу. Пытаньне пападала ў адно вуха, я адказваў, і яно ляцела далей, праз другое. І як я адказваў, таксама ня памятаю. Больш за ўсё мне запомніўся твар старога, таго, што пытаўся. І цяпер я помню яго намазаныя нейкай тлустасьцю бліскучыя чорныя валасы, рабаватыя тоўстыя шчокі, чорныя бровы й вочы, вялікі, пасінелы на кончыку нос.

Чым больш стаяў я перад камісіяй, чым больш пыталіся ў мяне, тым больш і больш разьбірала выпітае. Тым мацней і мацней кружылася ў мяне галава.

Урэшце падлога, здавалася, кранулася ў мяне пад нагамі, усё загушкалася, закружылася навакол. Стары і ўся камісія перавярнуліся ўверх нагамі й паплылі ў нейкім тумане. Твары іх расплываліся, толькі вочы сачылі за мной. Потым усё зьмяшалася, здавалася, загуло й паляцела ў нейкую прорву. Я хацеў крыкнуць, але да вушэй, нібы аднекуль здалёку, данеслася:

-- Хопіць!

Пакаціліся сьлёзы. Я выскачыў на двор. У галаве стаяў нейкі чад. Мяне ірвала. Балеў жывот. Гарэла ў грудзёх, у роце была кісла і сьлізка. Але хутка мяне ўзяў у свае абдымкі сон.

Ні мы, ні настаўніца ня ведалі, вытрымаў я экзамен ці не.

Бацька неяк сказаў:

-- Што-ж, наймайся ганяць у поле жывёлу!

Мы з Мацьвеем наняліся пастухамі.

Лексычны камэнтар

Творы Міколы Цэлеша адлюстроўваюць пэўныя фанэтычныя, лексычныя і граматычныя асаблівасьці, уласьцівыя беларускай мове 30-х гадоў і мове паваеннай эміграцыі.

Лексычны камэнтар уключае словы (устарэлыя, рэдкаўжывальныя, вузкаспэцыяльныя, дыялектныя) і вобразныя ўстойлівыя выслоўі, якія выяўляюць моўнае майстэрства аўтара.

Тлумачэньне слова ці выразу даецца апісальна або падборам сіноніма. Прыклад з тэксту ілюструе ўжываньне слова ці выразу ў кантэксьце. Знак «...» паказвае на рэдактарскае скарачэньне.

У зборніку максімальна захаваны асаблівасьці аўтарскага правапісу.

Аб'е́здчык. Служачы лясьніцтва, які адказвае за пэўны ўчастак лесу, працу лясьнікоў. *Вунь як жыве наш **аб'ездчык!*** Курылка.

Аблога. Даўно ня воранае поле. *Для тых, хто ня пісаўся ў калгас, зямлю адмерыў у Дубнікох на закінутых **аблогах.*** На межах.

Абое рабое. Аднолькава. *У вайну Масквы з Варшавай наш народ у бальшыні стаяў убаку. Так? Ні туды ні сюды -- **«абое рабое».*** Вярнуўся чалавек.

Абора. Вераўчаная або раменная завязка ў лапці. *Бацька ўцягнуў у новыя лапці **аборы** і кінуў мне іх на зачынак.* Курылка.

Агіці́рнік. Агітатар. *За ім праехаў Антон Балабон -- хітрунок, падлізьнік, боты чысьціў і штаны падцягваў пры патрэбе, бывала, пану -- іхны сучасны важны **агіцірнік!*** На межах.

Агу́л. Каляктыў. *Іхная-ж тут карысьць: будуць сядзець на карку **агулу** ды гарэлку смактаць.* У імя догмы.

Аддаць астатні ўздых. Памерці. *І вось ён прыйшоў сюды **аддаць**, бачу, **астатні ўздых.*** Вярнуўся чалавек.

Адкалоць. Тут: зрабіць або сказаць нешта нечаканае, недарэчнае. *У школе, чым больш біў яго Курылка, тым горш ён вучыўся, тым больш розных штук **адколваў.*** Курылка.

Адсе́дка.Тэрмін зьняволеньня**.** *І калі-б у камары было хоць крыху вальней, ён палічыў-бы гэта за лепшае да канца **адседкі.*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Азярод. Пярэплат**.** Прыстасаваньне са слупоў і жэрдак для дасушваньня збажыны, травы. *Будоў ніякіх ня было -- толькі там-сям **азяроды**, частакол агародзікаў ды яблынькі й дулі...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Аі́р. Аер**.** Балацяная шматгадовая расьліна. *Падышлі да новае вялікае выгарыны, суцэльна зарослай **аірам**, пухоўнікам, чаротам...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Алаві́к. Аловак**.** *Тонкі хвост ягоны **алавіком** выпрастаўся й дрыжэў.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Амбі́тны. Амбіцыйны. З празьмерным пачуцьцём асабістай годнасьці, самалюбства. *Людзі кажуць, што ён дужа **амбітны**, лезе ўверх!* Пернікавае сэрца.

Амэрыка́нка. Турма ў Менску. *Толькі час ад часу недзе далёка, мабыць, у **«амэрыканцы»**, аб існаваньні якой ён чуў, недзе там ляскалі нейкія зялезныя запоры.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Аняго. Так, сапраўды, няўжо**.** -- *Што, пайшоў? -- спытаў. -- **Аняго**! Ня будзе-ж ён тут спаць, як ты!* Партыйны таварыш.

Апрычоны. Своеасаблівы, адасоблены. *І яшчэ тады, калі ўсё наша **апрычонае**, не падобнае ні на расейскае, ні на польскае, каралася законам і вынішчалася, зьявіліся волаты нашага новага паўстаньня зь мёртвых...* Ападкі.

Атопак. Стары зношаны чаравік, бот. *Ёй было пад дваццаць. На нагах мела старыя **атопкі** ад бацькавых ботаў.* Партыйны таварыш.

Аўву́л. Аул. Паселішча на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. *Чыноўнікі партыйнага апарату «...» разьязджаюцца па хвабрыках, заводах, шахтах, сёлах, вёсках і **аўвулах.*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ба́гнет (польск.). Штык. *Кузьма стаяў і чамусьці доўга глядзеў на кончык **багнета**, добра адточаны й таксама заліты сонцам.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Балагол. Той, хто займаецца перавозам грузаў ці людзей на ўласнай фурманцы. *Завуць гэтага **балагола** Шаем.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Барджэй. Хутчэй**.** -- *Аняго, так табе й адчыняць **барджэй** дзьверы: калі ласка, гаспадар, мейце ахвоту выйсці...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ба́ўэр (ням.). Селянін, жыхар сельскай мясцовасьці. *Зьехаліся ня толькі **баўэры** з усяго краю, але ўсе, хто толькі мог.* Пернікавае сэрца.

Бачы́на. Старонка**.** *А назаўтрае ў газэце зьявілася цэлая **бачына**, прысьвечаная «барацьбіту за лепшую будучыню чалавецтва Хвёдарку Скуратку»...* У імя догмы.

Благачы́нны. Сьвятар, які кіруе цэрквамі некалькіх прыходаў. *У клас увайшоў **благачынны**.* Курылка.

Браць сябе ў рукі. Быць стрыманым, валодаць сваімі пачуццямі. *Але ён **бярэць сябе ў рукі** й падыходзіць да вакна.* Дзікі вецер.

Бага́й. Тут: начная балотная птушка сямейства чапляў, празваная так за тое, што вясной самец яе, апусьціўшы дзюбу ў ваду, утварае гукі, падобныя да рову бугая -- быка. *У багнах каля Птычы трубіў **бугай**...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Будзёнаўка. Чырвонаармейскі суконны шлем. *Кідае на брудны ложак сваю **будзёнаўку**...* Дзікі вецер.

Бу́дзік. Будзільнік. *Сьмяшок памацнеў, ператварыўся ў нейкі суцэльны мэханічны клёкат, быццам у таго, хто на печы, саскочыла, як у **будзіку**, накручаная спружжынка...* Акупанты.

Быць на языках. Заўсёды помніць, думаць, гаварыць пра каго або што-небудзь. *Вось вам усім: **буду** ў вас **на языках** аж да вашага скананьня...* Дзікі вецер.

Валасы сталі дубка. Пра пачуццё жаху, вялікага страху, зьведанага кім-небудзь. *У Курылкі, здавалася, **валасы сталі дубка.*** Курылка.

Ваўчкі́. Травяністая расьліна з учэпістымі калючкамі. *Тады і іншыя немцы пачалі жартаваць з Мацея і зь ягонага каня, які толькі пакручваў пасьля кожнага замаху ўдарыць яго сплеценым шэрымі «**ваўчкамі**» хвастом.* Акупанты.

Вашэці, вашэць. Ваша міласьць. Ужываецца пры ветлівым звароце да мужчыны. *Пастанова гаворыць толькі: гаспадаркі* ***вашэцяў*** *зьяднаць у адну гаспадарку.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Вечары́на. Вечар. *Раніца выдалася цудоўная -- ціхая й цёплая, як учарашняя* ***вечарына.*** Ападкі.

Ве́чка. Верхняя частка скрыні. *Калі ўзьнялі* ***вечка****, на дне, сярод усякае дробязі, убачылі невялікі плецены кошык.* У імя догмы.

Вой. Воін. *На фабрыцы, у войску і то кожны работнік і кожны* ***вой*** *розныя...* У імя догмы.

Воласьць. Найдрабнейшая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая ўваходзіла ў склад павета, у дарэвалюцыйнай Беларусі. *Бывала, перад сьвятам пойдзе ён у мястэчка, дзе была* ***воласьць****, двухкласная школа, і загуляе.* Курылка.

Воўк у авечай скуры. Крывадушны чалавек. *Аддаю рацыю нашым нацдэмам, якіх, прызнаюся, раней не разумеў, -- парваць сяброўства* ***з ваўком у авечай скуры****!* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Вужла́к. Зацьвярдзеньне на целе. *Пазногці ўпіліся ў далоні -- шурпатыя, патрэсканыя ад працы, з шэрымі* ***вужлакамі*** *мазалёў...* На межах.

Вы́вараць. Вываранець. Вывернутае з коранем дрэва. *Здавалася ім: вось зараз выскача з-за* ***выварацi*** *мядзьведзь.* На межах.

Вы́гар. Выгарына. Участак лесу, балота, сенажаці, выпалены агнём, пажарам. *Выбухалі трывожным крыкам на* ***выгарах*** *спалоханыя лісам ці ваўком крыжны...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Вы́жла. Выжал. Гончы сабака. -- *Ну, дык-жа ў добры час! -- зірнуў на Лорда. -- Якраз --* ***выжла****?* Хмары над Бацькаўшчынай.

Вы́йгада. Выгода. -- *Эх, -- уздыхнуў Ігнат, --* ***выйгада*** *ім тутака!* Хмары над Бацькаўшчынай.

Вы́люднены. Тут: апусьцелы. *Зь дзевятнаццаці двароў застаўся цэлым толькі адзін: васемнаццаць* ***вылюднены****, павысланы, зьнішчаны.* У імя догмы.

Вы́пек. Пляма на скуры. *Намёк быў ясным, і на твары Маўры зьявіліся чырвоныя* ***выпекі.*** Пёрка й іншыя.

Вы́церабіць. Тут: зьнішчыць. ***Выцерабяць*** *нас нанава, як у 1863!* Хмары над Бацькаўшчынай.

Вы́шкі. Паддашак, гарышча, гара. Мейсца ад столі да страхі. *Калі бялізна ўжо вісела на вышках, прыйшла суседка Аўгіньня...* Пёрка й іншыя.

Вы́шук. Сьледства. *Прыехаў неўзабаве прадстаўнік ДПУ з карагодам міліцыянэраў і з вышуковым сабакам і распачаў* ***вышук.*** У імя догмы.

Вязьні́ца. Турма. *Забралі каго... у* ***вязьніцу****?* У імя догмы.

Галаме́нь. Дрэва без галін або малагалінастае. *Вецер сьвішча, гоне з поля хвалі сьнегу, кідае яго на сосны й круце ля* ***галамнёў.*** Дзікі вецер.

Галéнь. Галёнка**.** *Зьняў абодвы боты, паказваючы пакрамсаныя ікры* ***галеняў.*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Галота. Галеча, бедната. *Рыбкі хоча* ***галота****?! Я пакажу табе рыбку!* Дзе праўду шукаць.

Га́ля (польск.). Зала. Тут: вялікае памяшканьне. *Прайшоў разы два па* ***галі****, кінуў позіркам на ложак Кузьмы.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Гамава́ць (польск.). Тармазіць. *Цяжка сапучы, паравік* ***загамаваў*** *рух і спыніўся на паўстанку.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Га́ра. Тут: гарэлка. *Калі ён і быў барацьбітом, дык толькі за бутэльку* ***гары...*** У імя догмы.

Гарла́ч. Збан з вузкім горлам. *Узяла з паліцы вялікі гарлач і выйшла.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Гарт. Стойкасьць, выносьлівасьць, сіла волі. *І я сам нарадзіўся тут, атрымаў ад маіх бацькоў* ***гарт*** *жыцьця...* Партыйны таварыш.

Га́чак (польск.). Кручок. *А больш за ўсё рыба тыркала добра, толькі на* ***гачак*** *не чаплялася.* Шчупак.

Глузд. Розум, развага. *Я гаспадар, разумееш? Свой* ***глузд*** *маю!* Акупанты.

Гмі́на (польск.). Адміністрацыйны цэнтр самай дробнай тэрытарыяльнай адзінкі ў Польшчы. *От-жа, мне было ўжо гадоў за дваццаць, як і ў школах, і ў* ***гмінах****, і ў судох -- усюды нашая мова была!* Першыя цаглінкі.

Гне́біць. Гнібіць. Прыніжаць, прыцясьняць, зьнішчаць. *Усіх* ***гнебіла*** *адна й тая-ж думка, адна й тая-ж цяжкая роспач, скруха.* У імя догмы.

Горан. Кавальская печ. *Кожны імкнуўся першым дабегчы, каб быць ля самага горна.* Курылка.

Гра́дка. Града. Выцягнутае ў даўжыню ўзвышша. *Матузок схіляе галаву, глядзіць у вакно, за якім, як-бы ў сьне, разьлягліся шырака балоты, лысеюць пясчаныя* ***градкі.*** На межах.

Гру́пка. Грубка. Невялікая пакаёвая печ для абагрэву. *Далей, у кутку, каля групкі, стаяла скрыначка з набітай жарствой.* Курылка.

Гэст (польск.). Жэст. *Учора я ня быў п'яны й дасканала памятаю ня толькі кожнае маё слова, але й* ***гэст****, зь якім яно было выказана.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Даваць бухлянкі. Моцна штурхаць, біць. *Ён* ***дае*** *мне* ***бухлянкі****, а я злаўчыўся ды ўкусіў яго з-пад нізу.* Вярнуўся чалавек.

Двохто́нка. Аўтамашына грузападымальнасьцю ў дзьве тоны. *Я даў загад з гаража ўзяць крытую* ***двохтонку*** *-- у ёй будзе куды выгадней і вам і вашым сабачонкам...* Партыйны таварыш.

Дзе Макар цялят ня пасьвіў. Вельмі далёка (трапіць, выслаць). *А сам ты паедзеш туды,* ***дзе Макар ніколі цялят ня пасьвіў...*** У імя догмы.

Дзе сабака закапаны. Пра сутнасьць справы, сапраўдную прычыну чаго-небудзь. *Вось* ***дзе сабака закапаны?*** Пёрка й іншыя.

Дзесяці́на. Мера зямельнай плошчы, роўная 1,09 га, якой карысталіся да ўвядзеньня мэтрычнай сыстэмы. *Жыў сабе проста, гаспадаркі вялікае ня меў: шэсьць* ***дзесяцінаў*** *зямлі, добры конь, са тры каровы, авечкі, сьвіньні ды іншае.* У імя догмы.

Дзякуй у шапку. Выказваньне нязгоды з чыёй-небудзь няпрымальнай прапановай. ***Дзякуй*** *табе й тваёй партыі* ***ў шапку!*** На межах.

Доба (польск.). Суткі. *Ці я калі адлучыўся з дому хоць на адну* ***добу?*** Дзікі вецер.

ДПУ. Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленьне пры Народным камісарыяце ўнутраных спраў БССР (НКУС). *Прыехаў унезабаве прадстаўнік* ***ДПУ*** *з карагодам міліцыянэраў і з вышуковым сабакам і распачаў вышук.* У імя догмы.

Дра́бкі. Драбіны, лескі**.** ***Драбкі*** *таксама былі крыху закароткія, тым ня менш Славік палез па іх да гнязда.* Галчыны дзеці.

Ду́бальтам (польск.). Падвойны, у два разы. *Ігнат* ***дубальтам*** *звaліў дзьве, але Кандрат на гэты раз хібіў.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ду́ля. Летні сорт ігруш зь вялікімі салодкімі пладамі. *Я хочу выкапаць ямку ў садку, Ага! Пад тэй* ***дуляй...*** На межах.

Дупля́к. Дупель. Балотная птушка. *А* ***дуплякоў*** *і цецярукоў -- няма веры колькі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ды́хта (польск.). Фанера. *На вуліцы ён знайшоў скрыначку з* ***дыхты.*** Галчыны дзеці.

Е́йны. Яе. *Берагі* ***ейныя*** *хваліся ў гушчарох лазьняку й альшэўніку.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ё. Ёсьць. *Брат у мяне, праўда, за мяжой* ***ё****, ты-ж сам ведаеш!* Дзікі вецер.

Ёміна. Харчы, прадукты. *Некаторыя з жаўнераў, дастаўшы із сваіх ранцаў* ***ёміну,*** *пачалі закусваць.* Акупанты.

Ёўня. Асець. Прыбудова да тока, у якой сушаць снапы. *Піліп папаўдні натапіў* ***ёўню.*** Воўчым сьледам.

Жарства́. Драсва. Дробныя каменьчыкі. *А от як на* ***жарству*** *ставяць, гэта кепска.* Курылка.

Жэрліца. Рыбацкая снасьць для лоўлі драпежнай рыбы на жыўца. -- *Пэўна,* ***жэрліцы*** *там паставіў нанач! -- зазначыў Ігнат.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Завада́ты. Завадатай, завадатар. Верхавод, зачыншчык. *Мінуў Дзяніс Галуза на пары коняў, з плугам на возе -- самы* ***завадаты*** *«іхны»...* На межах.

Заварот кішок. Тут: неспадзяваная падзея. *Без вайны цяпер ніяк усяго гэтага не разблытаеш... Або здарыцца які-небудзь* ***заварот кішок****!?* Дзікі вецер.

Замыкаць граніцу на замок. Надзейна ахоўваць. *Дваццаць тры гады балбаталі пра абарону, умацоўваліся, ачышчаліся, зьнішчалі ворагаў, **замыкалі граніцу на замок...*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Заносіцца. Тут: быць падобным. ***Не заносіцца** на тое, каб ён выйграў...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Заскочыць (польск.). Тут: зьдзівіць. *Пытаньне, відаць, дужа **заскочыла** Балевіча.* Партыйны таварыш.

За́смарга. Вузел са свабоднай пятлёй, завязанай адным канцом. *Адзін зь іх зьняў з крука ў сьцяне лейцы, «...» зрабіўшы на адным з канцоў **засмаргу**, выйшаў з хаты.* Акупанты.

Засьце́нак. Хутар або невялікае паселішча дробнай шляхты, якая арандавала гэтыя землі. *Жыў у нас на **засьценку** чалавек.* У імя догмы.

За сэрца хапіць. Хваляваць. Моцна ўразіць. *І ў гэты час чую голас Захараў, але такі няпэўны, слабы, што мяне аж **за сэрца хапіла.*** Вярнуўся чалавек.

За́ўвуч. Завуч (ад руск. заведуюэій учебной частью). Загадчык навучальнай часткі ў школе, вучылішчы. *Часам да іх падыходзіў «...» **заўвуч** або й зусім хто-небудзь зь незнаёмых...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Зачы́нак. Выступ варыстай печы. *Бацька ўцягнуў у новыя лапці аборы і кінуў мне іх на **зачынак**.* Курылка.

Збоку прыпёку. Лішні, непатрэбны. *Я тут зусім **збоку прыпёку**.* Дзікі вецер.

Збэсьціцца. Тут: даць волю языку. *І ты таксама, Кузьма, сёньня нешта **збэсьціўся**...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Зводзіць канцы з канцамі. Знаходзіць выйсьце зь цяжкага матэрыяльнага становішча. *Яна ніяк не магла **зьвесьці канцы з канцамі**.* Пёрка й іншыя.

З глузду зьехаць. Страціць розум, звар'яцець. *Ото-ж ужо ад вялікага розуму **з глузду зьехаў**!* Ападкі.

Здрантава́ны. Здратаваны. Патаптаны, вытаптаны (звычайна пра пасевы). ***Здрантаванае** жыта мітусіцца ў ягоных вачох.* На межах.

Зелянізна. Зеляніна, зелень. *Там-сям рэчка срэбрам пабліскавала з-за густой **зелянізны** расьлін.* Хмары над Бацькаўшчынай.

З козырам зьявіўся. Ганарліва, з форсам. *З сотні двароў нашае вёскі толькі ён адзін **з козырам зьявіўся** на пункт.* Вярнуўся чалавек.

Злы́дзень. Тут: нягода, бяда. *Перакінешся яшчэ раз у нашы родныя мясьціны, дзе кружылі мы ў жыцьці сьцежкамі-дарожкамі, ня раз спатыкаючы й **злыдзень**, і галечу, і незаслужаную крыўду-зьдзек...* Ападкі.

Зьбіць з панталыку. Заблытаць. Выклікаць замяшаньне. *І гэта **зьбіла** некаторых **з панталыку**.* Партыйны таварыш.

Зэдлік. Услончык. *Нёс таксама складаны **зэдлік**, каб ямчэй было сядзець каля рэчкі.* Ападкі.

Імша́ра. Мохавае балота. *Направа ляжала катлавіна балацяных **імшараў**.* Партыйны таварыш.

Інтэнцыя (польск.). Намер, закід. *Як гэта ня дзіўна, Кузьма зарагатаў, зарагатаў ад усіх гэтых бязглуздых **інтэнцыяў** і выдумак.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

І ў вус ня дзьмуць. Ні пра што не клапаціцца, не зьвяртаць увагі. *Той, ад каго гэта залежа, **і ў вус не падзьме**, як яны будуць замярзаць.* У імя догмы.

Кага́л (стараж.-яўр.). Тут: каляктыўная гаспадарка. *І ці праўда таксама, што хутка пачнецца вялікі згон да **кагалу**?* Хмары над Бацькаўшчынай.

Кагане́ц. Сьвяцільнік з кнотам, у якім гарыць тлушч. *Мацей паднёс **каганец** і ў гэты мамэнт убачыў, што рукі ў бадзякі дрыжаць.* Акупанты.

Кагу́цік (польск.). Певень. *Выйдзе вось гэтакі **кагуцік** і пачынае кукарэкаць аб «адпаведнасьці вытворчых адносін вытворчым сілам...»* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Казе́льчык. Лугавы конік. *Недзе каля варот цвыркаў **казельчык.*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Калга́н. Тут: калгас. *Пазамарылі людзей гэнымі «**калганамі**»... ды яшчэ вайну наклікалі...* Акупанты.

Каломна (польск.). Калона. *З захапленьнем і, разам з тым, з роспаччу пазіраў на бронзавыя **каломны** волатаў-дрэваў; з роспаччу таму, што мала ўжо іх уцалела.* Партыйны таварыш.

Каляі́сты. Каляіністы. З глыбокімі каляінамі. *Хурманка кацілася па **каляістай** і няроўнай дарозе.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ка́мара. Камера. *І калі-б у **камары** было хоць крыху вальней, ён палічыў-бы гэта за лепшая да канца адседкі.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Камэртон. Прылада для настройкі музычных інструмантаў і вызначэньня асноўнага тону ў харавых сьпевах. *Курылка ўдарыў **камэртонам** па парце, нагнуў галаву, прыклаў да вуха і працягнуў: -- А-а-а-а...* Курылка.

Каміна́к. Выемка ў варыстай печы, дзе раскладаецца агонь для асьвятленьня хаты і гатаваньня ежы. *Увечары на **камінку** трашчалі смольныя карчы.* Курылка.

Каморнік. Спэцыяліст па межаваньню зямельных надзелаў. *Ён быў інжынэр-**каморнік** і ўсё жыцьцё выкладаў у Полацкім каморніцкім вучылішчы.* Пёрка й іншыя.

Капліч́ка. Невялікі царкоўны будынак зь іконамі бяз алтара, малельня. *Шарэла маленькая старажытная **каплічка,** куды прывозілі памерлых перад пахаваньнем.* Акупанты.

Картыга. Картыжнік. Заўзяты ігрок у карты. *А зь ім заходзіць і сакратар партыйнай ячэйкі, Янук Бізун, асоба таксама выдатная: **картыга**, выпіваха, хабарнік; у дзевятнаццатым папоў усё «расстрыгаў».* У імя догмы.

Карчма́. Пітны дом з начлегам у дарэвалюцыйнай Беларусі. *Гэта была старая, крытая цёсам будыніна. Калісь у ёй была* ***карчма.*** Курылка.

Каршэнь. Карак**.** *Але той схапіў яго за* ***каршэнь*** *і з такой сілай тузануў, што хлопец кулём падкаціўся яму пад ногі.* Дзе шукаць праўду.

Каса ўзаемадапамогі. Добраахвотнае аб'яднаньне працаўнікоў для ўзаемнай матарыяльнай дапамогі. *Узяла пазычку з* ***касы ўзаемадапамогі****, а потым цяжка было выплачваць.* Пёрка й іншыя.

Касы́. Тут: заяц. *Але* ***касы*** *ўсё яшчэ недзе ляжаў, прыціснуўшы да галавы вушы: авось, не заўважаць!* Партыйны таварыш.

Катля́к. Цурбак, цурбан. Кароткае бервяно. *Другі, кароценькі й гладкі, як* ***катляк****, з галавой, уросшай у плечы, тупаў за ім дробненькімі крокамі.* Партыйны таварыш.

Каўзе́ль. Коўзаньне. Катаньне на лёдзе. *Бацька злаваў і лаяўся. --* ***Каўзель! Каўзель*** *усё гэта! І-і-і-іх! Лапцей не набрацца.* Курылка.

Ка́чур. Качар. ***Качур*** *перавярнуўся пузам угару й шлёпнуўся на ваду.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Класьці зубы на паліцу. Галадаць, быць у нястачы. *Цяпер на рынку нічога ня купіш, хоць* ***зубы кладзі на паліцу.*** У імя догмы.

Клу́тня (польск.). Сварка. -- *А бачыце, што з гэтага выйшла?!* ***Клутні*** *й няшчасьці, кажуць, -- уставіў Кандрат.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ключ. Тут: чарада птушак (гусей, жураўлёў), якія ляцяць клінам. *Пачынаў успамінаць родны край і родны кут: бэз пад вакном, вазёрную глядзь, шумы бароў,* ***ключ*** *дзікіх гусей над галавой, калі яны вяртаюцца ўвесну на Бацькаўшчыну...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Кляпа́ць. Тут: нагаворваць. *Верыў Міхалку: Зьмітрачок* ***кляпае*** *на яго! Вычуў гэта й сам ня раз.* Дзікі вецер.

Кодла. Пагардліва пра групу людзей, аб'яднаных агульным інтарэсам. *Тыя, хоць і з аднаго* ***кодла****, а зусім ня дбалі пра людзей: абяцалі рай, а далі пекла!* Акупанты.

Контра. Контррэвалюцыянер. -- *Адысьці ад сьцяны! -- крыкнуў. -- Стаць па чатыры!* ***Контра*** *-- асобна, шпана -- асобна!* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Корба. Ручка, якой прыводзяць што-небудзь у рух. *Ляпей жабрачы лёс, у рукі кій, за плечы торба; ляпей страха нябёс, бясконцы шлях і леры* ***корба.*** Партыйны таварыш.

Краж. Тут: старая магутная сасна. *Кілёмэтры за паўтара, праўда, сінела смуга маладога сасоньніку, сярод якога вылучаліся й старыя магутныя* ***кражы.*** Партыйны таварыш.

Кроквы. Апоры страхі. *Страха яе дзе-нідзе правалілася, і, як рэбры абгладанай ваўкамі жывёлы, тырчэлі* ***кроквы*** *і латы.* Курылка.

Крут. Тут: вугал. *Заяц пад прамым* ***крутам*** *ірвануўся ўбок і мячом пакаціўся па грэбню ўзгорка.* Партыйны таварыш.

Крыжна. Крыжанка, крыжань. Вадаплаўная птушка сямейства качыных. *Выбухалі трывожным крыкам на выгарах спалоханыя лісам ці ваўком **крыжны**...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Крымінáл. Тут: асуджаныя па крымінальнай справе. *Кузьма добра ведаў, што ў няволі **крыміналу** лепей, ніж палітычным.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Крынка. Збан. *Паднёс да роту **крынку** і гвалтам уліў ёй глыток вільгаці.* У імя догмы.

Кулáк. Міраед. У савецкі час -- заможны, спраўны гаспадар, залічаны ўладай да ворагаў народа. *Адно зьдзекі з народу нашага: былі нацдэмы -- вучняў забіралі ў турмы, а цяперака **кулакі** -- высылкі ў сібірскую немарач...* У імя догмы.

Кулдыя́чыць. Гаварыць нявыразна, неразборліва. *Поп бегаў кругом нас, задзіраў галаву і **кулдыячыў**, як індык.* Курылка.

Кулёк. Мужчынская верхняя вопратка прамога пакрою з сукна або паўсукна без падкладкі (вядома больш на Віцебшчыне й Магілёўшчыне). *На ім быў шэры **кулёк** з сукна хатняга вырабу, якія ў нас насілі тады, як мелі права браць воўну ад сваіх авечак для хатніх патрэб.* Вярнуўся чалавек.

Ку́ля (польск.). Тут: зямны шар. *Хіба тут, у гэтай бяздомнай птушцы, не відавочны намёк на пралетарскую клясу, вясковую беднату й ліквідацыю прыватнай уласнасьці на аднэй шостай зямной **кулі**?* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ку́ндаль (польск.). Сабака. *Жыву на правох **кундаля**: захоча -- пакіне, не захоча -- скажа «пайшоў вон!»...* Пёрка й іншыя.

Ку́па Куча. *Асьцярожна згарнуў сшыткі да **купы** і недзе схаваў, падалей ад вачэй людскіх.* У імя догмы.

Купава́ць (польск.). Купляць. *Грошы мне няма адкуль браць, каб **купаваць** розныя рэчы на кірмашах.* Пернікавае сэрца.

Ла́ты. Жэрдкі, прымацаваныя ўпоперак крокваў. *Страха яе дзе-нідзе правалілася, і, як рэбры абгладанай ваўкамі жывёлы, тырчэлі кроквы і **латы**.* Курылка.

Лаху́дра. Неахайны, апушчаны чалавек. *А ну, адчыняй там, кулацкая **лахудра**!* Дзікі вецер.

Ле́ра. Ліра. Даўнейшы народны беларускі струнны музычны інструмант з клавішамі і корбай. *Ляпей жабрачы лёс, у рукі кій, за плечы торба; ляпей страха нябёс, бясконцы шлях і **леры** корба.* Партыйны таварыш.

ЛесБел. Орган дзяржаўнага кіраваньня лясной гаспадаркай БССР. *Плян нарыхтовак лесу нашы бюракраты склалі, у Маскве зацьвердзілі й перадалі **ЛесБелу** для выкананьня, а пра тое, што няма каму й няма на чым вывезьці лес, забыліся...* Партыйны таварыш.

Лётнішча (польск.). Аэрадром. *Ня ведаю, дзе цяпер сям'я. Жыла тут недалёка, на **лётнішчы**.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Лі́тня. Рудня, рудніца. Невялікі завод, дзе выплаўлялі жалеза, медзь, чыгун. *Паўстанцы Кастуся Каліноўскага ўрахумілі закінутыя дзьве **літні**, у якіх выраблялася зброя...* Першыя цаглінкі.

Лі́штва. Драўляная планка. *Піліп павёў позіркам па **ліштве** сваёй дубальтоўкі і потым націснуў на язычок курка.* Воўчым сьледам.

Лонка (польск.). Луг. *А я ведаю такія цудоўныя мясьціны: лес, рэчка, як люстэрка, **лонка** з краскамі!..* Пёрка й іншыя.

Макі́тра. Макацёр. Гліняная пасудзіна, вузкая ўнізе і шырокая зьверху, у якой звычайна труць мак, ільняное і канаплянае семя. *У слоіках ды **макітрах** ляжала масла ды сыры.* У імя догмы.

Ма́па (польск.). Геаграфічная карта. *Прытока гэтая паказаная толькі на самых падрабязных **мапах...*** Летапісная Няміза.

Мех. Тут: прыстасаваньне для нагнятаньня паветра ў кавальскім горне. *Потым, калі **мех** пачне ямчэй разьдзімацца, вуглі разгарацца...* Курылка.

Млосьць. Млоснасьць. Няпрыемнае пачуцьцё слабасьці. ***Млосьць** разьліваецца па целу.* Дзікі вецер.

Мры́йнік. Той, хто мрые, марыць; лятуценьнік. -- *А ўсё-такі прыехалі?!* -- *зьдзівіўся* -- *Гэта ўжо ня **мрыйнікі**, а цэлыя пакутнікі...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Мунду́р (польск.). Мундзір. *Бачыш, цурацца цяпер стаў нашага мужыцкага побыту, як начапіў энеральскія лычкі на **мундур**... Ападкі.*

Мутаўза́. Моцны вецер са сьнегам. *Але вось у **мутаўзе** мяцеліцы вымалёўваюцца будынкі Гарасёвага хутара.* Дзікі вецер.

Муштáрда (польск.). Гарчыца. *Гледзячы на яго, роіліся ўспаміны з гадоў мінулых, і тады, быццам-бы наяве, пахла смажанай скваркай, вясковай каўбаскай: з часначком, перчыкам і нямолатай **муштардай**.* Партыйны таварыш.

Мя́ліньне. Адыходы ад цёртага лёну. *Кузьня была на замку. Я сеў на **мяліньне**, прытуліўшыся плячамі да сьцяны.* Курылка.

Мянтэжыць. Непакоіць, трывожыць. *Зенька пайшоў, а тое, што ён сказаў, яшчэ доўга **мянтэжыла** Богушавых.* У імя догмы.

Мястовы. Гарадскі. *Вы людзі **мястовыя**, адукаваныя, дык-жа мусіце ведаць усё...* Хмары над Бацькаўшчынай.

На́вет. Нават. *Вось бачыце, **навет** птушкі дзякуюць прыродзе, што яна дала ім магчымасьць пражыць дзень!* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Навонкі. Тут: наверх. *Я-ж кажу, цяперацькі, пасьля таго вусатага, усё гэта выкрываецца **навонкі**...* Вярнуўся чалавек.

На́дысь. Нядаўна, надоечы. ***Надысь** дык завязалі дзьверы знадворку ў хаце Міхалкі...* У імя догмы.

Напраку́дзіць. Зрабіць кепскае, няпрыемнае. *«Пэўна, дзе-небудзь лясныя хлопцы **напракудзілі**?» -- падумаў.* Акупанты.

На́пята. Насьцеж. *І тады Раіна з усёй сілы кінулася да дзьвярэй, штурханула далоньню засаўку і адчыніла зусім **напята** дзьверы.* У імя догмы.

На́рты (польск.). Тут: лыжы. *Ішоў ён да нас шырокімі крокамі, быццам **нартамі** соўгаў; на правым плячы дубальтоўку трымаў.* Партыйны таварыш.

Наруга́цца. Насьмяхацца; рабіць, гаварыць назло каму-небудзь. *Язь «...» то нырне глыбока й перакуліцца жоўтым пузам угару, то мільгне маланкай перад вачыма, то моцна плёхне вадой, як-бы некаму **наругаецца.*** Шчупак.

Насоў. Верхняе адзеньне з даматканай тканіны. *Сьляза выкацілася зь ягоных вачэй -- ён хуценька змахнуў яе рукавом **насову.*** Першыя цаглінкі.

Насмарава́ць (польск.). Змазваць. *Можна **насмараваць** нашы стрэльбы й схаваць іх надалей.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Нахра́пам. Тут: неасьцярожна, сілай. *Казаў табе: не цягні **нахрапам.*** Шчупак.

Нацдэм. Нацыянальны дэмакрат. Па вызначэньні сакавіцкага (1924) пленума ЦККП(б)Б нацыянальна-дэмакратычная ідэалёгія («нацдэмаўшчына») заключалася «ў адмаўленьні дыктатуры пралетарыята і ў імкненьні да палітычнага раўнаваньня сялянства з рабочым класам, у стаўцы на кулацкія элемэнты ў вёсцы, адмаўленьні класавага расслаеньня ў ёй, у імкненьні да ўплыву з боку інтэлігенцыі на дзяржаўны апарат, у правядзеньні беларускага шавінізму». *-- Выцерабяць нас нанава, як у 1863! «...» -- Дык, кажаш, выцерабяць? -- А ты што, ня бачыш і ня чуеш? «...Адсячы галаву **нацдэмаўскай** гадзіне...» Заклік: выбіць нашу інтэлігенцыю, пакінуць народ без кіраўнікоў.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Начы́ньне. Тут: набор прадметаў, інструмантаў для выкананьня якой-небудзь работы. ***Начыньня** няма, цьвік або ломіцца, або гнецца, ня йдзе.* Пёрка й іншыя.

Наш закрыты. Гл. Разьмеркавальнік. *Ты быў у **нашым закрытым**? Не? зойдзеш калі-небудзь паглядзець. Балыкі, асятры, сёмга амурская, шынкі -- усё гэта вэндзанае, толькі ў рот кладзі!* Дзікі вецер.

Наяў. Наяве. *-- Перапрашаю! -- сказала, імкнучыся ня даць магчымасьці вырвацца **наяў** свайму гневу.* Пёрка й іншыя.

Неаднокраць. Не адзін раз. *Капейкаў Султан **неаднокраць** зьбіваў іх з тропу...* Партыйны таварыш.

Не́вашта. Нешта. *Яны пра **невашта** доўга спрачаліся...* У імя догмы.

Недзялі́мцы. У часы грамадзянскай вайны прыхільнікі адзінай і недзялімай Расіі пад уладай цара. *«**Недзялімцы**» наступалі з Дону, саветчыкі арганізоўвалі абарону на мясцох, і ў чырвені дзевятнаццатага мяне паклікалі ў войска.* Аўтабіяграфія.

Ні пяра ні пуху. Пажаданьне посьпеху, удачы ў якой-небудзь справе. *Ну, дык **ні пяра ні пуху**.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Ні слыху ні дыху. Ніякіх вестак. *Дый ня дзіва: пяць год ня было **ні слыху ні дыху**...* Першыя цаглінкі.

НКУС. Народны камісарыят унутраных спраў БССР. *А тут якраз і трэба найбольш высьцерагацца, бо **НКУС**, бясспрэчна, ведае прыказку: «Што ў цьвярозага ў галаве, тое ў п'янага на языку».* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ня варта аўчынка вырабу. Пра справу, ня вартую намаганьняў, затрачаных сродкаў. *Раней быў на ўтрыманьні UNRR'ы, а потым кінуў, **ня варта аўчынка вырабу**.* Пернікавае сэрца.

Нязáвашта. Ні за што. *От, Нупрэй і падумаў, што ты пайшоў на той сьвет, -- крыўдзіцца на яго **нязавашта**... -- адазваўся ўрэшце.* Першыя цаглінкі.

Ня йсьці ў галаву. Не запамінаецца, не засвойваецца. *Узяў у рукі кніжку, але чытаньне **у галаву ня йшло**.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ня кіем дык палкай. Аднолькава, бяз розьніцы. -- *Зьяднаць?! Гэта значыць: **ня кіем дык палкай!** -- выклікнулі разам Ігнат з Кандратам.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Паварочваць аглоблі. Тут: вяртацца да старога. *Дык **паварочвай**, брацец, **аглоблі** назад.* Вярнуўся чалавек.

Павесіць нос. Адчайвацца, маркоціцца. *Я ўспомніў пагрозы і **павесіў**, як гэта кажуць, **нос**.* Курылка.

Павéт. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імпэрыі і ў СССР да 1924 г., уваходзіла ў склад губэрні. -- *Няма цяперака ніякіх **паветаў**, -- запярэчыў Богуш, -- раёны ўсюды...* У імя догмы.

Пагосцкі. Могільнікавы. *Пасярод вёскі маркотна шумеў **пагосцкі** бярэзьнік.* Акупанты.

Падкула́чнік. Селянін, які дзейнічаў у інтарэсах кулака. ***Падкулачнік** я! **Падкулачнік**! Хай ужо будзе й гэтак...* На межах.

Падлоўчы. Старшы аб'ездчык, лясьнічы. *Бацька мой быў **падлоўчым** і лічыўся «панам»...* Цётка Магда.

Падносак. Частка падэшвы ў абутку ад наска да палавіны ступні. *І яшчэ адно: якраз у гэты час у адным зь ягоных чаравікаў адарваўся **падносак...*** Пёрка й іншыя.

Падпáсак. Памочнік пастуха, звычайна падлетак. *Мацьвей часта хадзіў з бацькам за **падпаска**.* Курылка.

Падсту́пна. Вераломна, каварна. *У 980 годзе Ўладзімер Сьвятаславіч **падступна** напаў на Полацак...* Летапісная Неміза.

Пáйка. Паёк. Пэўная колькасьць ежы, выдзеленая адпаведна ўстаноўленай норме (вайсковая, турэмная пайка). *Куды ні пойдзеш, зь кім ні*

пагамоніш, чуеш толькі адно: няма дроў, нехапае ***пайкі****, дзеці галодныя, не дастаць абутку, няма кватэры, усюды чарга...* Пёрка й іншыя.

Пайсьці на той сьвет. Памерці. *От, Нупрэй і падумаў, што ты* ***пайшоў на той сьвет...*** Першыя цаглінкі.

Паканáны. Зьнішчаны. *Хутчэй за ўсё на Нямізе былі* ***пакананыя*** *Ярославічы, а не Ўсяслаў.* Летапісная Няміза.

Памарáнчык (польск.). Апельсін. *Любенькая, купіце мядку зь кілаграмік, ды сьлівачнага масьліка, ды яечак зь дзесяць,* ***памаранчыкаў****, ды зварыце ўсё гэта разам, ды папаіце ім хлапчука -- усю хворасьць як рукой здыме.* Пёрка й іншыя.

Пáнцыр (ням.). Браня, танк. *Ты чуеш, Алесь, як недзе грукочуць* ***панцыры****?* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Панявéрка. Тут: зьнявага. *Беларускі народ нясе іхныя імёны на сваіх шчытох і па-сёньня, не зважаючы на тэрор і* ***паняверку...*** Ападкі.

Папýкаць (польск.). Пастукаць. *Калі сьцямнела, Богуш па агародах дабраўся да школы і ціха* ***папукаў*** *пальцам па шыбе.* У імя догмы.

Паравíк. Паравоз, поезд з паравозам. *Цяжка сапучы,* ***паравік*** *загамаваў рух і спыніўся на паўстанку.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Пардвá (польск.). Белая курапатка. *Улетку на гэтых імшарах, сярод досыць густых, але дробных зарасьляў, было даволі шмат цецярукоў і* ***пардвы.*** Партыйны таварыш.

Парубéжны. Пагранічны. *У 1067 годзе Ярославічы напалі на* ***парубежны*** *горад Полацкае дзяржавы -- Менск.* Летапісная Няміза.

Пархýма. Парфума (франц.). Тут: пах. *Сена ляжала й у копах, ад яго пахла размаітымі* ***пархумамі*** *траў.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Пастронак. Частка збруі -- рамяні або вяроўкі, якія злучаюць ворчык з хамутом. *Падбег, замахнуўся сякерай па* ***пастронках.*** На межах.

Пáтас, тое, што і **пафас.** *Не, браток, вар'яваць нам ня трэба -- лепей праўдзіва перадаць той* ***патас****, зь якім мы вялі змаганьне, каб новае пакаленьне ведала, як прадоўжыць яго ў выпадку новай небясьпекі...* Юрка Віцьбіч.

Патомака. Потым. *А* ***патомака,*** *можа, такое прыдумаюць, што й жыць не захочаш...* Першыя цаглінкі.

Паўкватэркі. Палова кварты. Кварта -- даўнейшая мера вадкіх і сыпкіх рэчываў, роўная чацьвертай частцы гарца, або 0,7 літра. *Паставіў чарку на найбольшую мерку -- прыблізна з* ***паўкватэркі*** *-- і наліў у яе агністай вадкасьці.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Пáчка. Тут: група людзей. *Гэта, як я ўспамінаю, пачалося ад тае першае* ***пачкі****, што напісаліся ў гэты самы хаўрус.* У імя догмы.

Паяды́нка (польск.). Аднастволка. -- *Пэўна, не адзін ён тут,* -- *заўважыў Кандрат, пасьпешна заганяючы новы набой у сваю* ***паядынку.*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Перабіраць і перамываць костачкі. Абгаворваць, пляткарыць. *Але вельмі хутка спаўзае на тэму пра суседзяў:* ***перабірае і перамывае*** *ім* ***костачкі.*** Пёрка й іншыя.

Перамы́тнік (польск.). Кантрабандыст. *Ён нас у* ***перамытнікі*** *ўпісаў; за мяжу, кажа, хадзілі, разам з таварам весткі пераносілі.* Дзікі вецер.

Піліпа́ўка. Тут: пост перад калядамі. *Падыходзе да ўслончыка, на якім стаіць вядро з вадой, і смачна, нібы то каляды, а ня* ***піліпаўка,*** *п'е ваду.* Дзікі вецер.

Пі́пка. Люлька для курэньня. *Зенька не выпускаў з зубоў* ***пі́пку*** -- *ціснуў яе зубамі, грыз, пыхкаў ёю, хоць у ёй ужо нічога й ня было.* У імя догмы.

Плюга́ўства. Кепства, подласьць. *Як ападкі, «...» гэтак і яны зьнікнуць бясьсьледна з памяці свайго народу, стаўшы служакамі чужынцаў у сваёй уласнай хаце й згодныя на ўсялякае* ***плюгаўства****, усхваляючы ўсё чужое!* Ападкі.

Помрак. Страта розуму. *Думаю: у* ***помраку*** *ад «гары» нехта ня можа знайсьці тропу.* Вярнуўся чалавек.

Прамга́с. Прамысловая гаспадарка. *Не па мерцы купленыя ў* ***прамгасе*** *штаны зь вялізарнейшай ластавіцай торбамі матляюцца вакол ягоных ног.* На межах.

Пра́нік. Плоскі драўляны брусок з ручкай для выбіваньня бялізны пры мыцьці ці для абмалоту лёну, канопляў, лубіну. *І* ***пранік*** *выскачыў у мяне з рук.* Цётка Магда.

Прапазы́цыя. Прапанова. *Учора, казаў Міхалка, Зьмітрачок езьдзіў з новымі «****прапазыцыямі****» у раён,* -- *успамінае Гарась.* -- *Якія там у сабакі прапазыцыі?!* Дзікі вецер.

Прапу́стка (польск.). Пропуск. *Пад аркай стаяла будка для міліцыянера, які ва ўсіх уваходзячых пільна правяраў* ***прапусткі.*** Пёрка й іншыя.

Пра́ўнік. Юрыст. *Я, як* ***праўнік****, мушу вам сказаць: вы зрабілі вялікае злачынства...* Партыйны таварыш.

Прыва́тка. Прыватная кватэра. *Жыву на* ***прыватцы.*** Пернікавае сэрца.

Прыгне́бены. Прыгнечаны, занепакоены. *Кузьма «...» быў усхваляваны або, праўдзівей,* ***прыгнебены.*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Прыкле́тнік. Прыбудова да клеці; ганак перад клецьцю, сьвірнам. *Калі Кастусь увайшоў у двор, Сымон стругаў абручы ў* ***прыклетніку.*** Першыя цаглінкі.

Пры́мус. Награвальны прыбор з помпай, якая падае газу ў гарэлку. *Раптам перадумала: зьняла рундальчык із пліты й паставіла на* ***прымус,*** *мяркуючы, што тут суп хутчэй згатуецца..* Пёрка й іншыя.

Прыўла́шчыць (польск.). Прысвоіць. ***Прыўлашчыў**, значыць, народную працу...* Дзе шукаць праўду.

Прышы́ць. Тут: абвінаваціць, абылгаць. *Баіцеся, каб ня **прышылі** месяцаў пяць за спазьненьне?* Пёрка й іншыя.

Псюк (польск.). Сабака. ***Псюкі** самыя шляхетныя з жывёлаў, што жывуць на зямлі!* Пернікавае сэрца.

Пухоўнік. Пухоўка, рогаз. Водная і балотная шматгадовая травяністая расьліна. *Падышлі да новае вялікае выгарыны, суцэльна зарослай аірам, **пухоўнікам**, чаротам, а там, дзе крыху віднелася дно, асакой.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Пы́са. Тут: твар. *Капейка цягнуў за імі Саладуху. -- Ну, ідзі, ідзі! А то дам у **пысу**!* Партыйны таварыш.

Пэндзлік. Тут: **кутасік.** *Зялёны баварскі капялюшык зь белай вяровачкай і з **пэндзалькамі** на баку...* Пернікавае сэрца.

Пяць пятніц на тыдні. Пра таго, хто часта, лёгка мяняе свае намеры. *Але хіба ёсьць у іх што-небудзь пэўнае, станоўкае? **Пяць пятніц на тыдні.*** Дзікі вецер.

Пячу́рка. Невялікая ніша ў сьцяне печы. *Нацягнуўшы на плечы кажух, Гарась падышоў да **пячуркі**, узяў ключ і выйшаў.* Дзікі вецер.

Рага́тка. Тут: рыбацкая снасьць. *Але на возера былі пушчаны **рагаткі** з жыўцамі, і ён баяўся, што хвалі занясуць іх куды-небудзь вельмі далёка...* Дзе шукаць праўду.

Разабра́цца. Распрануцца. *Як толькі вярнуўся, зноў **разабраўся** і лёг на ложак.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Размаі́ты (польск.). Неаднолькавы, разнастайны. *Сена ляжала й у копах, ад яго пахла **размаітымі** пархумамі траў.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Разьвёрстка. Тут: прадразьвёрстка. Сыстэма нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў савецкай дзяржавай, якая абавязвала сялян здаваць дзяржаве ўсе лішкі хлеба і іншых прадуктаў па цьвёрдых цэнах. *От, дай ім гэтую «**разьвёрстку**», патомака накармі маскаля, якога паставілі табе ў хату, дай фурманку, адбудзь цягла, заплаці падатак...* Першыя цаглінкі.

Разьмеркава́льнік. Спэцыяльная крама, якая абслугоўвала толькі партыйна-савецкую эліту. *А што будзем есьці ў наступным годзе, ён пра гэта ня дбае, ён будзе сваё мець з **разьмеркавальніка**!* На межах.

Расстрыга́ць. Пазбаўляць сьвятара сану або манаха -- манаства. *А зь ім заходзіць і сакратар партыйнай ячэйкі Янук Бізун, асоба таксама выдатная -- картыга, выпіваха, хабарнік; у дзевятнаццатым папоў усё **расстрыгаў**.* У імя догмы.

Ратáтарны. Зроблены на шапірографе. *Я ўспомніў: праўда, выпускаў ён якіясьці* ***рататарныя*** *лісткі і лістоўкі...* Пернікавае сэрца.

Рýля. Дула. Ствол агнястрэльнай зброі. *Сеў на загадзя падрыхтаваныя снапы, прасунуўшы* ***рулю*** *сваёй дубальтоўкі ў вакенца.* Воўчым сьледам.

Рýндальчык (польск.). Каструля з ручкай. *Раптам перадумала: зьняла* ***рундальчык*** *із пліты й паставіла на прымус, мяркуючы, што тут суп хутчэй згатуецца...* Пёрка й іншыя.

Рýра (польск.). Труба. *Няміга, невялікая рачулка, цяпер узятая ў бэтонныя* ***руры****, працякае цераз Менск і ўпадае ў Сьвіслач...* Летапісная Няміза.

Сабатоўнік. Сабатажнік. Той, хто сьвядома зрывае выкананьне пэўнай справы. *Ён цябе таксама ў перамытнікі ўпісаў! Раней -- падкулачнік, зрыўшчык,* ***сабатоўнік...*** Дзікі вецер.

Савéтчык. Прыхільнік савецкай улады. *«Недзялімцы» наступалі з Дону,* ***саветчыкі*** *арганізоўвалі абарону на мясцох, і ў чырвені дзевятнаццатага мяне паклікалі ў войска.* Аўтабіяграфія.

Салáш. Шалаш, будан. Часовае жыльлё з гальля, саломы ці жэрдак. *Сядзіш у сваім* ***салашы*** *й душы ня чуеш: ні пагутарыць зь кім, ні чаркі выпіць.* Дзе шукаць праўду.

Самаабкладáньне. Збор сродкаў на мясцовыя грамадскія патрэбы, вызначаныя быццам-бы добраахвотна самім насельніцтвам, рабочым каляктывам. *Перастаўляе сьветлячок на край стала, раскладае паперы:* ***самаабкладаньне****, падаходны, цягла (гужавая павіннасьць), культурны збор...* Дзікі вецер.

Самі з вусамі. Ня горш за іншых. *А калі гэтак, дык і гэць ад нас:* ***мы самі з вусамі!*** Першыя цаглінкі.

Свэны. Швэды. *От-жа сядзяць там сабе ціха гэныя швайцары ды* ***свэны.*** Акупанты.

Скіпáць. Шчапаць, калоць, секчы дровы. *Першы немец паставіў у варотах калодку, на якой Мацей кляпаў косы й* ***скіпаў*** *дровы...* Акупанты.

Скірт. Сьцірт**.** Укладка, рад насечаных дроў. *На двары, каля сьвірна, сохлі ў* ***скіртах*** *пашчапаныя дровы...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Скурáт. Кавалачак, абрывак скуры. *Замахваецца зноў секчы пастронкі, моцны* ***скурат*** *гойдаецца, не падаецца.* На межах.

Слухáўка (польск.). Тэлефонная трубка. *Падкаблук узяўся за адзін з трох, стаячых на стале, тэлефонаў. Потым перадумаў, паклаў* ***слухаўку*** *на мейсца і зьвярнуўся да Кузьмы...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Смочка (польск.). Нарост, лядзяш. *Богуш ні то сядзеў, ні то ляжаў у перадку вазка, час ад часу мацаючы вусы й бараду і скідаючы зь іх* ***смочкі*** *намёрзшага лёду.* У імя догмы.

Смык. Тут: вузкая палоска зямлі. *З правага боку, на пясчаным* ***смыку****, чарнеў перасохлы лубін.* Партыйны таварыш.

Сноўдацца. Хадзіць туды-сюды (часта -- бяз мэты). *Насупраць вёскі, паміж іх,* ***сноўдалася*** *бялявая постаць чалавека зь сеткай-таптухай на доўгім кіі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Собіць. Трапіцца, прыйсьці ў галаву. *А дзе гэта табе* ***собіла*** *цераз рэчку лазіць?* Акупанты.

Собскі. Уласны. *Некаторыя гісторыкі выказвалі думку, што ў летапісныя часы ўсякая малая рэчка бяз* ***собскага*** *ймя называлася Нямізай.* Летапісная Няміза.

Соўгаць. Рухацца паволі, зь цяжкасьцю. *Ішоў ён да нас шырокімі крокамі, быццам нартамі* ***соўгаў****; на правым плячы дубальтоўку трымаў.* Партыйны таварыш.

Спалу́чына. Сувязь. *Гэта* ***спалучына*** *з грамадствам, з вашай функцыяй у ім...* Пёрка й іншыя.

Спаць як забіты. Вельмі моцна. *Ён бегаў, як юнак, ня ведаў ніякіх хваробаў, спаў як забіты...* Ападкі.

Спраўнасьць навесьці. Давесьці ўсё да ладу. *Трэба, кажа, раней у гаспадарцы* ***спраўнасьць навесьці****, а потым ужо пра стрэльбы думаць.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Спусьці́ць. Тут: збавіць цану. *Доўга таргаваліся, урэшце ён крыху* ***спусьціў****, мы набавілі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Стадола. Канюшня, вялікі хлеў. *І ў гэты-ж мамэнт рыпнулі вароты ў* ***стадоле.*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Станоўкае. Станоўчае. *Але хіба ёсьць у іх што-небудзь пэўнае,* ***станоўкае****?* Дзікі вецер.

Ста́рац. Жабрак. *Мы, як* ***старцы****, сталі ля парога.* Курылка.

Ста́рка. Тут: старая птушка. ***Старка****! Малых пахавала, а сама для адводу вачэй узьнялася...* Хмары над Бацькаўшчынай.

Стасу́нак (польск.). Адносіны, сувязь. *Ягоная зямельная палітыка ў* ***стасунку*** *да нашых умоў вельмі ўдалася.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Стопка. Варыўня. Невялікая гаспадарчая пабудова для захоўваньня бульбы, гародніны. *Адчыні сваю* ***стопку****, трэба замкнуць гэтага чалавека, пакуль прыедзе пагранічная ахова...* Ападкі.

Стравіць. Пашкодзіць, зьнішчыць (пра пасевы). *Жыта тваё коні* ***стравілі****...* На межах.

Страхка́са. Каса сацыяльнага страхаваньня. ***Страхкаса*** *заплаціла толькі шэсьцьдзесят працэнтаў...* Пёрка й іншыя.

Струг. Тут: інструмант для апрацоўкі драўніны. *Сымон адарваў вочы ад* ***струга****, які гладка й лёгка рэзаў мяккую ляшчыну, і зірнуў на ўвайшоўшага.* Першыя цаглінкі.

Сувора. Сурова, строга. *І потым* ***сувора:*** *-- Пакаж мне свае паперы.* Акупанты.

Судзьдзё. Тут: кухонны посуд. *Маўра «...» выцерла й паставіла на мейсца* ***судзьдзё...*** Пёрка й іншыя.

Сызорак. Сьцізорык (польск.). Невялікі складаны кішэнны нож. *За* ***сызорак*** *купіў каня, ды такога маладога?!* Хмары над Бацькаўшчынай.

Сьвірэпка. Пустазельле. *Што будзе тады, як замест збажыны на нівах парасьце* ***сьвірэпка****?!* На межах.

Сьві́тка. Доўгая сялянская верхняя вопратка з сукна. *Але вецер, здавалася, заходзіў з другога боку, забіраўся пад* ***сьвітку****, пад сарочку, як іголкамі, калоў маё цела.* Курылка.

Сьціга́ць. Прасьледваць, даганяць. *Я, як праўнік, мушу вам сказаць, што вы зрабілі вялікае злачынства, і ён цяпер вас усюды* ***сьцігае...*** Партыйны таварыш.

Талён. Талон. Паперка, якая дае права набыць пэўную рэч, атрымаць паслугу. *Мабыць, прыйшоўся й вам* ***талён*** *на пашыўку паліто альбо гарнітура ў атэлье?* Пёрка й іншыя.

Та́мака. Там. *У мяне* ***тамака*** *ё шчупак.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Тапча́н. Пакаёвая шырокая лаўка, звычайна са сьпінкай. *Становіцца каленкамі на* ***тапчан*** *і мацае рукою за абразамі -- тут у яго квіткі, уся «канцылярыя».* Дзікі вецер.

Таргсі́н (ад руск. торговля с иностранцами). Назва крамаў, якія існавалі ў СССР у 30-я гг. і гандлявалі на золата і залатую валюту, пераважна з чужаземцамі. *Але два срэбныя пярсьцёнкі і два такіх самых крыжыкі, за якія тое-сёе можна было набыць у «****Таргсіне****», падзялілі паміж сабой.* У імя догмы.

Тва́нкі. Тваністы. *Берагі гэтае рэчкі вельмі* ***тванкія*** *-- на іх і сапраўды могуць «топнуць коні»...* Летапісная Няміза.

Тлу́стасьць. Тлушч. *І цяпер я помню яго намазаныя нейкай* ***тлустасьцю*** *бліскучыя чорныя валасы...* Курылка.

Тоня. Вадаём, дзе ловяць рыбу закідным невадам. *Я аблюбаваў ужо некалькі год таму назад такія віры і ведаў, дзе трэба сесьці, куды й на якой* ***тоні*** *закідаць.* Ападкі.

Траха. Трохі. -- *Горача сёньня **траха!** -- прамовіла Марына, пазіраючы на нас зь вясёлай усьмешкай.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Троп. Тут: дарога. *Думаю: у помраку ад «гары» нехта ня можа знайсьці **тропу.*** Вярнуўся чалавек.

Трохполка. Трохпольле. Сыстэма паляводства з падзелам ворнай зямлі на тры палі, якія засяваліся спачатку азімымі, потым -- яравымі, а на трэці год пакідаліся пад папар. *Вясковыя люмпэны -- прадукт палітыкі 1861 года, якіх **трохполка** й цераспалосіца парабіла жабракамі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Трыгу́біца. Рыбацкая снасьць. *На плоце сушыліся: **трыгубіца**, лыкавыя лапці з анучамі й шэрыя нагавіцы, запэцканыя водарасьцямі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Тры́зна. У старажытных славянаў заключная частка пахавальнага абраду з ваеннымі гульнямі, спаборніцтвамі, а таксама памінальнай вячэрай. *У дахрысьціянскай эры на нашай Бацькаўшчыне спраўляліся **трызны.*** Галчыны дзеці.

Трымаць вуха востра. Быць асьцярожным, абачлівым. *Падкапаюцца й пад сьцяну, атруцяць і сабаку -- тут **трымай вуха востра**!* Дзікі вецер.

Ту́така. Тут. *Схадзіў-бы ты да Сукеніка, усё-ткі ён начальнік **тутака**, у павеце.* У імя догмы.

Ты́лак (польск.). Зад. *Але сьмяецца той, хто сьмяецца апошнім. Мы ім больш, чым яны нам, давалі ў «**тылэк**».* Апошнія цаглінкі.

Ты́ркаць. Тут: кляваць (пра рыбу). *Знайшоў човен і, як звычайна, забраўся ў сітнікі, дзе рыба найбольш **тыркала.*** Дзе шукаць праўду.

Тыркацэ́ць. Ехаць з грукатам. *За Антосем **тыркацелі**: Сымон, Паўлюк, Гіляр, Рыгор -- усе дванаццаць -- «дванаццаць юдаў»...* На межах.

Тэчка (польск.). Партфель, сумка. *Паказаў на груд ардэноў і мэдаляў, выкладзеных з **тэчкі.*** Вярнуўся чалавек.

У гэтым і ўвесь цьвік. Пра сутнасьць справы. *Дык-жа вось у **гэтым і ўвесь цьвік**: што Маскве да нас?* Хмары над Бацькаўшчынай.

Удаводніць (польск.). Даказваць, пераконваць. *Ён мерыўся перабегчы на другі бок з дачкой белагвардзейскага ахвіцэра -- гэта я дакладна **ўдаводніў**!* Партыйны таварыш.

Удáрнік. Работнік сацыялістычнай вытворчасьці, які перавыконваў нормы... *Учора былі запрошаны толькі «перадавікі-**ўдарнікі**», а Базыль у іх ня лічыўся.* Пёрка й іншыя.

Узяць сэрца ў кулак. Авалодаць сваімі пачуццямі, настроем. ***Вазьмі сваё сэрца ў кулак*** *і скажы яму, каб яно маўчала.* У імя догмы.

Унезаба́ве. Неўзабаве. *Прыехаў на райкомаўскай машыне й Сукенік, а* ***ўнезабаве*** *й пракурор.* У імя догмы.

Упакара́ньне. Тут: асуджэньне. *Мы мусім ведаць ня толькі тое, што выклікае спачуваньне, але й тое, што* ***ўпакараньне...*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

У пух і прах. Поўнасьцю, да тла. *А разьляцелася ўсё гэта* ***ў пух і прах*** *за няцэлыя дваццаць тры гадзіны.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ура́днік. Ніжэйшы чын павятовай паліцыі ў дарэвалюцыйнай Беларусі. *Раптам у хату ўвайшоў* ***ураднік.*** Курылка.

Урахо́міць. (польск.). Пускаць у ход, прыводзіць у дзеяньне. *Паўстанцы Кастуся Каліноўскага* ***ўрахумілі*** *закінутыя дзьве літні, у якіх выраблялася зброя для іх...* Першыя цаглінкі.

Усімі фарбамі душы. Усімі фібрамі душы. Вельмі моцна, страсна (любіць, ненавідзець, пагарджаць). *Гэта мая Бацькаўшчына! Люблю я яе* ***ўсімі фарбамі мае душы!*** Партыйны таварыш.

Ускочыць у прысак. Трапіць у няпрыемнае, небясьпечнае становішча. *Зусім за нішто* ***ўскочыў у прысак.*** «Янка сеяў -- людзі жалі».

Услончык. Пераносная лаўка на ножках. *Я сядзеў перад сшыткам на* ***ўслончыку.*** Курылка.

Утока. Вусьце ракі. *Выраз у летапісе «пойдоша к Немізе» «...» «можа тлумачыцца зусім не як рух да* ***ўтокі*** *гэтае рэчкі, а як пераход да сярэдняга й верхняга ейнага цячэньня...* Летапісная Няміза.

Утранча́цца (польск.). Умешвацца. *І ратунку няма ніадкуль: ніхто не захоча* ***ўтранчацца*** *ў гэтую справу.* Дзікі вецер.

Уца́ліць (польск.). Зьберагчы, выратаваць. *Што датычыць мяне, то дай, Божа, сваё як-кольвек* ***уцаліць****! На што мне яшчэ куплёнае сэрца?* Пернікавае сэрца.

Фа́йка (польск.). Трубка для курэньня. *Застаўся адзін толькі жаўнер, ужо стараваты, з пасівелымі вусамі, што стаяў увесь час убаку й, пакурваючы* ***файку****, моўчкі пазіраў, што робіцца наўкола.* Акупанты.

Фатэля (польск.). Крэсла. *Сядзіш сабе на мяккай* ***фатэлі*** *ды пакурваеш, ды ў вакенца пазіраеш...* Партыйны таварыш.

Фільца́к (ням.). Валёнак, фетравы бот. *Да воза набліжаўся, у вялікіх* ***фільцаках****, немец.* Акупанты.

Фузэя (польск.). Крамянёвая гладкаствольная стрэльба. *Мог-бы й ты набыць новую* ***фузэю...*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Футура́л (польск.). Футляр, кабура. *Мундур ягоны ў гэты час як-бы няўзнак расхінуўся, і я ўбачыў пад ім* ***футурал*** *ад браўнінга.* Ападкі.

Фуфа́йка. Тут: куртка, падбітая ватай, ватоўка. *Некаторыя зь іх яшчэ ў даўнейшых дублёных кажухох, досыць ужо паношаных; другія ў ватных* ***фуфайках*** *фінскага тыпу.* Вярнуўся чалавек.

Фэльдфэбаль (ням.). У царскай і некаторых замежных арміях -- званьне старшага ўнтэр-афіцэра ў пяхоце. *Белабрысы* ***фэльдфэбаль*** *зь зялезнай каскай на галаве загадаў жаўнерам праверыць мяхі.* Акупанты**.**

Фэнік. Пфэнінг (ням.). Германская дробная манета, адна сотая маркі. *Вохра, хоць і яму ня было дзе браць грошаў, меў якіясьці «****фэнікі****».* Пернікавае сэрца.

Ха́ліпа. Кепскае мокрае надвор'е, слата. *І* ***халіпа*** *якраз, склізка.* Вярнуўся чалавек.

Хаўру́с (яўр.). Суполка, аб'яднаньне, саюз. *Гэта, як я ўспамінаю, пачалося ад тае першае пачкі, што напісаліся ў гэты самы* ***хаўрус.*** У імя догмы.

Хмы́ліцца. Касавурыць вочы, прыціскаць вушы (пра коней). *Коні* ***хмыляцца****, прыпыняюцца, а потым скачуць цераз Матузка.* На межах.

Ходаньне. Тут: змаганьне. *Князь Ізяслаў пачаў* ***ходаньне*** *за канчатковае вызваленьне бацькаўшчыны сваёй пагвалчанай маці з-пад улады Кіева.* Летапісная Няміза.

Ходнік. Тратуар. *Пёрка крышыла бліжэйшыя тыны, здымала дошкі з драўляных* ***ходнікаў*** *і навет крыжы на бліжэйшым магільніку.* Пёрка й іншыя.

Хоць вока выкалі. Нічога ня відаць; вельмі цёмна. *Іду, цемра* ***хоць вока выкалі.*** Вярнуўся чалавек.

Хоць кол на галаве цяшы. Пра немагчымасьць пераканаць некага; пра ўпартага, няўступчывага чалавека. *І сумленьня ў іх, падобных яму, ніякага,* ***хоць ты кол на галаве цяшы****!* Ападкі.

Хэўра(яўр.). Група людзей, аб'яднаных для разбою, злачынства; банда. *Проста ўтварылася* ***хэўра*** *злачынцаў, і зьдзекваюцца зь людзей.* У імя догмы.

Цалка́ч. Сярэбраная манета вартасьцю ў адзін рубель. *Піліп захваляваўся: «Гэта-ж цэлых сорак пяць* ***цалкачоў****!»* Воўчым сьледам.

Цераспалосіца. Разьмяшчэньне зямельных надзелаў адной гаспадаркі палосамі ўперамежку з суседнімі надзеламі. *Вясковыя люмпэны -- прадукт палітыкі 1861 года, якіх трохполка й* ***цераспалосіца*** *парабіла жабракамі.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Цыду́лька (польск.). Запіска, пісулька. *Патрэбны ёй гэтыя **цыдулькі**?!* У імя догмы.

Цыпэлін. Цэпелін. Дырыжабль зь металічным каркасам, абцягнутым тканінай. *У гаспадарцы спатрэбіцца, як сказала адна бабуля, становячыся ў чаргу, дзе ёй сказалі, выдаюць **цыпэліны.*** Пёрка й іншыя.

Цыранок. Дзікая качка. *На заваротах утвараліся затокі, і на аднэй зь іх мы заўважылі чародку **цыранкоў.*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Цэтлік. Тут: пропуск, дазвол. *Мне-б вось **цэтлік** атрымаць на выйсьце адсюль -- зусім заніштo ўскочыў у прысак...* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Ця́гла. Адзінка абкладаньня павіннасьцямі. *Знайсьці цяпер хурманку амаль немагчыма з тае прычыны, што кожны стараецца збыць каня, калі мае яго, бо дужа вялікія і падатак і **цягла.*** Хмары над Бацькаўшчынай.

Цяпе́рака. Цяпер. *Вы, Максім, мусіць, і **цяперака** ім засталіся, а я **цяперака** Грукацень, а раней, як вам вядома, быў Пукаліч...* Пернікавае сэрца.

Цяпе́рацькі. Цяпер. *Як-жа вы **цяперацькі** будзеце безь мяне?* У імя догмы.

ЧК (руск. Чрезвычайная Коміссія). У 1917-1922 гг. назва рэпрэсіўнага органа, створанага для барацьбы з контррэвалюцыяй і сабатажам. *Колькі нявінных тамака, у той **ЧаКа**, палягло?!* Вярнуўся чалавек.

Чырвонец. Грашовы крэдытны білет вартасьцю ў дзесяць рублёў, які быў ва ўжытку ў СССР з 1922 да 1947 г. *А то ў кішэні ў чалавека нічога: адно **чырвонец** недзе валяўся, які некалі прыслала дачка Раінка.* У імя догмы.

Шалапу́т. Легкадумны, пусты чалавек; свавольнік. *І тады Богуш зноў ірвануўся да сякеры, але Янук загарадзіў яму дарогу. -- Куды, **шалапут**!* У імя догмы.

Швайца́р. Тут: швайцарац, жыхар Швайцарыі. *От-жа сядзяць там сабе ціха гэтыя **швайцары** ды свэны?!* Акупанты.

Шворан. Мэталічны з плешкаю стрыжань ў перадку калёс. *-- А то вось: найлепшая зброя, без аніякага гуку! -- узяў з-пад лавы **шворан**: -- Дзёбнуць -- і гатова!..* Дзікі вецер.

Шка́па (польск.). Худы, замораны конь. *-- Шая, як ты можаш пускацца ў дарогу на такой **шкапе**?* Хмары над Бацькаўшчынай.

Шмат, шмата. Адарваны кавалак тканіны, паперы. *Разгарнуўшы **шмат**, у які быў загорнуты хлеб, асьцярожна, каб адмераць па-роўнаму й не пакрышыць, разрэзаў яго на дзьве часткі.* На межах.

Шнур. Тут: вузкая палоска зямлі. *На адным з **шнуроў** ляжалі кучкі неразьбітага гною.* Хмары над Бацькаўшчынай.

Шпана́. Злачынцы, бадзягі, бяспрытульныя. *Калі былі выведзеныя й жанчыны, іх таксама пачалі ставіць па тым-жа прынцыпе: контра -- асобна, **шпана** -- асобна.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Шпі́цаль (польск.). Шпік, даносчык. *Сярод іх няма «ворагаў народу» і **шпіцаляў**.* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Шу́ла. Слуп ці брус, на які падвешваецца створка дзьвярэй. *Першы немец паставіў у варотах калодку, на якой Мацей кляпаў косы й скіпаў дровы, стаў на яе й прывязаў лейцы да перакладзіны паміж **шуламі**.* Акупанты.

Шурт. Рад, укладка сьпілаванага лесу. *Усюды ляжаў павалены лес: і ў **шуртах**, і проста калодкамі на зямлі.* Партыйны таварыш.

Шыкава́ць (польск.). Тут: рыхтаваць. *На ворагаў усё **шыкуюцца**!* «Янка сеяў -- людзі жалі».

Шынге́льсы (англ.). Дранка, драніца, гонта. Тонкія дошчачкі для абіваньня сьцен пад тынкоўку або для крыцьця даху. *Бывала, кладу **шынгельсы** і прыбіваю іх цьвікамі; раптам зьяўляецца цікавая думка, вобраз, пасаж...* Да чытача.

Этажэрка. Некалькі разьмешчаных адна над другой паліц на стойках. *Потым падышоў да **этажэркі** і ўзяў сямейны альбом.* Пёрка й іншыя.

Яды́нка. Ёд. *Пабеглі да настаўніцы па **ядынку**.* Воўчым сьледам.

Які-колечы. Які-небудзь. *На целе Скуратка ня было нічога такога, што паказвала-б на сьмерць ад забойства ці іншага **якога-колечы** гвалту...* У імя догмы.

Як рукой здыме. Пройдзе, прападзе. *Усю хворасьць **як рукой здыме**.* Пёрка й іншыя.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Аб паказальных калгасах. Надрукавана: «Шляхі калектывізацыі», 3, 1929, б. 21-22.

Аб падрыхтоўцы кадраў для паляўнічай гаспадаркі. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 10, 1931, б. 12-13.

А воз і зараз там: Аб захаваньні шэрай курапаткі. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 10, 1931, б.13-14.

Акупанты. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана: «Беларуская думка», 16-17, 1973-1974, б. 22-26. Пад назвай **Галгофа** надрукавана: «Беларус», 12(18), 4 кастрычніка 1952; 13(19), 18 кастрычніка 1952. Подпіс Мартын Люціч.

Апавяданьні паляўнічага. Менск, 1931, 56 б. Зьмест: **Аповесьць пра ваўчыцу. На воўчых сьцежках. Сьмелы драч. Чарнавухая кумка.**

Ападкі. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана: «Бацькаўшчына», 31-32(515-516), 14 жніўня 1960, подпіс Марцін Люціч; «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 68-76.

Аўтабіяграфія. Машынапіс (Архіў БІНіМа).

Барацьба за шкуркі. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 3, 1932, б. 8-9.

Бязбожнікі (Апавяданьне). Надрукавана: «Сакавік», 1(2), 1948, б. 22-23. Подпіс Максім Лагода.

Воўчым сьледам. Надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 88-91.

Вярнуўся чалавек. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад назвай **Чалавек вярнуўся... н**адрукавана: «Баявая Ўскалось», 8, 1969, б. 12-17.
Вясна ў паляўнічай гаспадарцы: **За прадукцыйнасьць паляўнічых промыслаў.** Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 2, 1932, б. 13-15.

Галгофа. Гл. **Акупанты.**

Галчыны дзеці. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 92-95.

Дабіцца бальшавіцкіх тэмпаў у пушна-механарыхтоўках. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 11, 1931, б. 1-2.

Да канца пяцігодкі -- ніводнага ваўка. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 4, 1931, б. 6-7.

Да чытача. Машынапіс (Архіў БІНіМа).

Дзе шукаць праўду. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 77-84.

Дзікі вецер. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад назвай **Кроў** надрукавана: «На крыжы». Апавяданьні. Менск, 1943, б. 26-39. Подпіс М. Лясун. Пад назвай **Помста** надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 18-27.

Дзічы прыбавілася. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 8, 1929, б. 5.

Жыдоўскае вясельле. Надрукавана: «Голас вёскі», 44 (51), 11 сьнежня 1942; «На крыжы». Апавяданьні. Менск, 1943, б. 52-62; «Беларускі работнік», 36, 3 верасьня 1944. Подпіс М. Лясун.

За новае шчасьце. Гл. **Цётка Магда.**

Зарніцы. Надрукавана: «Полымя рэвалюцыі», 10, 1939, б. 105-109.

Каральнік літасны, праўдзівы (Апавяданьне). Надрукавана: «Раніца», 5(225), 17 студзеня 1945; 6(226), 21 студзеня 1945; 7(227), 24 студзеня 1945, подпіс Максім Лагода; «Аб'яднаньне», 7, 1948, б. 8-16, подпіс Максім Лагода.

Курылка. Запіскі вучня царкоўна-прыходскай школы. Надрукавана: «Полымя рэвалюцыі», 4, 1934, б. 33-50. Асобным выданьнем: Курылка. Запіскі вучня царкоўна-прыходскай школы. Менск, 1935, 56 б. зь ілюстрацыямі. Рэцэнзіі: С. Куніцкі. «Полымя рэвалюцыі», 9, 1935, б. 143-146; С. Шушкевіч. «Літаратура і мастацтва», 49. 1935.

Летапісная Няміза і ейнае мейсца на мапе. Надрукавана: «Беларуская моладзь», 25, ліпень 1966, б. 4-6.

Лістапад. Надрукавана: «Беларус», 17(23), 13 сьнежня 1952; 18(24), 25 сьнежня 1952. Подпіс Мартын Люціч.

Лясныя шумы. Надрукавана: «Іскры Ільліча», 3, 1940, б. 12-13.

Мера гвалту. Гл. **На межах.**

Метыс: Нарыс пра сабаку. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 9, 1930, б. 19-20.

М. Мусоргскі. Надрукавана: «Веда», 2(7), люты 1952, б. 44-45. Подпіс Мартын Люціч.

Мы ня хочам быць абкрадзенымі. Надрукавана: «Беларуская газэта», 70 (188), 15 верасьня 1943. Подпіс М. Лясун.

На крыжы. Гл. **У імя догмы.**

На межах. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад назвай **Мера гвалту н**адрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 27-34. Пад назвай **Чужая зямля** надрукавана: «Голас вёскі», 12 (66), 26 сакавіка 1943; «На крыжы». Апавяданьні. Менск, 1943, б. 40-51; «Беларускі работнік», 19, 7 травеня 1944. Подпіс М. Лясун.

Пад знакам Задзіяка. Гл. **У імя догмы.**

Падрыхтавацца да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 10, 1931, б. 10-11.

Палескія мрыйнікі. Гл. **Хмары над Бацькаўшчынай.**

Паляўнічая і рыбацкая каапэрацыі павінны быць аб'яднаны. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 3, 1931, б. 8-9.

Партыйны таварыш. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 34-51.

Пекла. Надрукавана: «Голас вёскі», 39 (93), 3 кастрычніка 1943. Подпіс Мікола Лясун.

Пёрка й іншыя. Машынапіс (Архіў БІНіМа).

Пернікавае сэрца. Рукапіс (Архіў БІНіМа).

Першыя крокі: Трусагадоўля Мінскага гарадскога таварыства паляўнічых. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 3, 1931, б. 11-13.

Першыя цаглінкі. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана: «Беларус», 180, красавік 1972. Заўвага: «Урывак з аповесьці "Укрыжаваныя", над якой цяпер пісьменьнік працуе».

Помста. Гл. **Дзікі вецер.**

Правакацыя працягваецца (Пісьмо ў рэдакцыю). Надрукавана: «Беларускі голас», 46, чырвень 1958.

Простыя людзі. Гл. **Цётка Магда.**

Прыязьнь. Надрукавана: «Беларуская газэта», 63 (181), 21 жнівеня 1943.

Са стрэльбай і сабакам. Апавяданьні паляўнічага. Менск, 1932, 190 б.

Слава (Апавяданьне)**.** Надрукавана: «Работніца і калгасьніца Беларусі», 21, 1935, б. 10-11.

Спозьненае каханьне. Надрукавана: «Бацькаўшчына», 12-13(242-243), 25 сакавіка 1955. Подпіс Мартын Люціч.

Сьмелы драч: Малюнак з натуры**.** Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 5, 1930, б.12-13; у кнізе: «Апавяданьні паляўнічага». Менск, 1931.

«Трагэдыя Расеі». Ч. II. Надрукавана: «Бацькаўшчына», 8-9(190-191), 28 лютага 1954. Заўвага: «Першую часьць артыкулу гл. Н 49». Подпіс Мартын Люціч.

У імя догмы. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад назвай **Пад знакам Задзіяка н**адрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 5-17. Па назвай **На крыжы** надрукавана: «Голас вёскі», 21 (75), 28 травеня 1943; 22 (76), 3 чэрвеня 1943; 23 (77), 10 чэрвеня **1943;** «На крыжы». Апавяданьні. Менск, 1943, б. 7-25**.** Подпіс М. Лясун.

Хмары над Бацькаўшчынай. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад назвай **Палескія мрыйнікі н**адрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 51-68**.**

Цётка Магда. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Пад рэдакцыйнай назвай **За новае шчасьце** надрукавана: «Бацькаўшчына», 7(591), 8 красавіка 1962; 8(592), Вялікдзень 1962. Заканчэньне апавяданьня пад назвай **Простыя людзі** (патрабаваньне аўтара) надрукавана: «Бацькаўшчына», 9(593), 20 травеня 1962.

Чалавек вярнуўся... Гл. **Вярнуўся чалавек.**

Чатыры блакітных плюс энтузіязм. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 6, 1932, б. 7-9.

Чорныя мроі. Надрукавана: «Беларуская газэта», 44(262), 3 чырвеня 1944; 45(263), 7 чырвеня 1944; 46(264), 10 чырвеня 1944; 47(265), 14 чырвеня 1944. Подпіс Максім Лагода.

Чужая зямля. Гл. **На межах.**

Шапка. Надрукавана: «Беларуская газэта», 42 (160), 5 чэрвеня 1943. Подпіс Мікола Лясун.

Шчупак. Машынапіс (Архіў БІНіМа). З падзагалоўкам «Апавяданьне, узятае з архіву» надрукавана: «Бацькаўшчына», 5(84), 3 лютага 1952. Надрукавана ў кнізе: «Дзесяць апавяданьняў». Нью-Ёрк, 1965, б. 84-87.

Юрка Віцьбіч. Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана: «Беларус», 216, красавік 1975.

Як зьнішчыць скуранога авадня. Надрукавана: «Шляхі калектывізацыі», 10, 1932, б. 14.

«Янка сеяў -- людзі жалі», Машынапіс (Архіў БІНіМа). Надрукавана: «Бацькаўшчына», 31-32(162-163), 16 жніўня 1953; 33-34(164-165), 30 жніўня 1953; «Ля чужых берагоў», Мюнхэн, 1965, б. 195-215. Подпіс Мартын Люціч. Аўтарскі пераклад зь беларускай мовы: Мартин Лютич. «Янка сеял -- люди жали». Надрукавана: «Пёстрые рассказы». Сборник эмигрантской прозы. Под ред. В. Александровой. Нью-Йорк: Изд. Чехова, 1953, б. 147-182.

Ярылаў агонь. Надрукавана: «Бацькаўшчына», 6(541), 5 лютага 1961; 7(542), 12 лютага 1961.

Яшчэ раз пра ягады і грыбы. Надрукавана: «Паляўнічы Беларусі», 7, 1932, б. 14.

Пераклады

С. Розанаў. Прыгоды Траўкі. Для дзяцей малодшага ўзросту. Пераклад з расійскае мовы **М. Цэлеша.** Менск, 1934, 55 б. зь ілюстрацыямі.

Гэрмінія Цурмулен. Сыны Айшы. Казка. З расійскае мовы пераклаў **М. Цэлеш.** Менск, 1929.

Зьмест

Палімпсэст, або Ўратуе нітка, што ня будзе рвацца.
Крытычны нарыс Лявона Юрэвіча..... VII
Slava Celesz Brown. Memory..... XXXI
Вітаўт Кіпель. Аб Міколу Цэлешу... колькі словаў..... XXXII
Аўтабіяграфія..... XXXIV

Хмары над Бацькаўшчынай
Да чытача..... 2
Хмары над Бацькаўшчынай..... 4
У імя догмы..... 22
На межах..... 43
Дзікі вецер..... 52
Партыйны таварыш..... 63
Пёрка й іншыя..... 82
Дзе шукаць праўду..... 102
Ападкі..... 110
«Янка сеяў -- людзі жалі»..... 117
Вярнуўся чалавек..... 151
Галчыны дзеці..... 160
Шчупак..... 164
Цётка Магда..... 168
Акупанты..... 181
Воўчым сьледам..... 193
Пернікавае сэрца..... 198
Першыя цаглінкі..... 205
Юрка Віцьбіч..... 213
Летапісная Няміза і ейнае мейсца на мапе..... 216
Курылка..... 226
Лексычны камэнтар..... 263
Бібліяграфія..... 292
Зьмест..... 298

In the same series:

! 1. **Натальля Арсеньнева.** Між Берагамі. Выбар паэзіі.
New York -- Toronto, 1979. 350 p. + XXXIX

! 2. **Алесь Салавей.** Нятускная краса. Збор твораў.
New York -- Melborne, 1982. 373 p. + XVI

! 3. **Аляксандра Саковіч.** У Пошуках Праўды. Апавяданьні й аповесьці.
New York -- Cleveland, 1986. 245 p.

! 4. **Міхась Кавыль.** Міжагнёўе. Выбраныя творы.
New York, 1990. 344 p. + XXI

! 5. **Уладзімер Дудзіцкі.** Напярэймы жаданьням. Збор твораў.
New York, 1994. 312 p. + XXIX

! 6. **Мікола Цэлеш.** Хмары над Бацькаўшчынай. Апавяданьні.
New York, 1995. 299 p. + XXXV